**Уладзімір Гніламёдаў**

# Упоравень з векам

*Артыкулы, эсэ, штрыхі да партрэтаў*

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1976

# 1

# Артыкулы, эсэ

# З ЛЕНІНЫМ У СЭРЦЫ

## *(Беларуская паэтычная Ленініяна)*

Ленін на сэрцы шчаслівым,
Леніна ў сэрцы заветы,
Ясныя думак парывы
Песняй імкнуцца над светам.
*Янка Купала*

Ёсць поўны збор твораў, фатаграфіі, сведчанні сучаснікаў, кінахроніка, навуковыя даследаванні і каментарыі — з усяго гэтага на ўвесь рост паўстае перад намі вобраз выдатнага рэвалюцыянера-камуніста і Чалавека з вялікай літары Уладзіміра Ільіча Леніна. Але, апрача ўсяго, ёсць у нас яшчэ адна важная, нават, можна сказаць, незаменная крыніца для пазнання і ўяўлення ленінскай асобы — мастацкая літаратура аб ім — Ленініяна, якая, расказваючы пра падзеі і справы, звязаныя з імем Леніна, раскрывае ўнутраны свет Ільіча, перадае яго думкі, пачуцці, імкненні, перажыванні ў іх, магчыма, найбольшай паўнаце і значнасці.

Калі б сабраць вершы, паэмы, балады, песні — усё, што было напісана беларускімі паэтамі пра У. І. Леніна за паўвека існавання Беларускай ССР, то атрымалася б ёмістая і цікавая кніга, якая шмат магла б расказаць чытачу пра Леніна — рэвалюцыянера, правадыра, чалавека, вучонага-мысліцеля, пра пяцідзесяцігадовую гісторыю нашых сацыялістычных перамог, якія з'яўляюцца жывым працягам ленінскай справы.

Ад самага пачатку лёс беларускай савецкай паэзіі, прывабнасць і паўнакроўнасць яе сацыялістычнага ідэалу, багацце і разнастайнасць мастацкіх фарб арганічна звязаны з імем Леніна, з тэорыяй і практыкай ленінізма. Само ўзнікненне і развіццё беларускай савецкай культуры і літаратуры з'явілася, безумоўна, адным з праяўленняў асноўнай стратэгічнай ідэі Леніна аб тым, што сацыялістычная рэвалюцыя ўзнімае вякамі прыгнечаныя грамадскія «нізы» да свядомай і актыўнай гістарычнай творчасці, у якой пераўтвараецца і вырастае сам чалавек.

Ленінская тэма і неадрыўная ад яе тэма партыі, рэвалюцыі, народа даўно стала традыцыйнай і адной з цэнтральных у беларускай савецкай паэзіі. Па яе выяўленні можна з поўнай падставай меркаваць не толькі аб узроўні палітычнай свядомасці нашых паэтаў, але і

аб тых складаных шляхах, якія прайшла савецкая паэзія ў сваім мастацкім развіцці.

Вобраз Леніна гістарычны. І не толькі па чалавечай велічы і эпахальнасці асобы Леніна-мысліцеля, але і па тым руху, развіцці, росце і абнаўленні, якія характэрны для гістарычнай фігуры такога маштабу, як У. І. Ленін, заснавальнік першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы. Бо зусім зразумела, што пры захаванні галоўнага і істотнага — уласцівага Леніну, правадыру і чалавеку, пры жыцці — напрыклад, у 30-я гады ён уяўляўся некалькі іншым, чым, скажам, у 20-я, калі на дзіва простым і чалавечным адкрылі яго нам Маякоўскі і Горкі; і сёння, зазначым, вобраз Леніна ў нашай паэзіі таксама ўзбагаціўся ў параўнанні з 40-мі, 50-мі гадамі, стаў больш глыбокі і чалавечны.

Цяжка, а можа, і немагчыма сказаць сёння, хто з беларускіх паэтаў першы звярнуўся да вобраза Леніна — Міхась Чарот ці Алесь Гурло, Змітрок Бядуля або Паўлюк Трус. А можа, самымі першымі былі творы фальклорныя?.. Імя Леніна сустракаецца ўжо ў перыядычных выданнях часоў рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Гэта вершаваныя, блізкія да фальклору творы, часта без подпісу. Ва ўяўленні аўтараў Уладзімір Ільіч — «брат свабоды», «смелы і непераможны арол», «любімы правадыр».

Цікавасць да вобраза Леніна ўзнікла ва ўсёй савецкай паэзіі ўжо ў самым пачатку 20-х гадоў. У гэты час былі напісаны вершы Д. Беднага «Праўдзівае прывітанне», Г. Якубскага «Правадыру» і інш., а крыху пазней — паэмы ўкраінскіх паэтаў У. Сасюры «Навокал» (1921), В. Палішчука «Ленін» (1922), І. Куліка «Перамога» (1923). Нягледзячы на тое, што гэтым творам неставала паэтычнага вопыту ў стварэнні вобраза Леніна і што вобраз гэты не заўсёды быў у іх цэнтральны, творы ў цэлым адыгралі станоўчую ролю на шляху паэтычнага ўвасаблення ленінскай тэмы.

Між іншым, да вопыту гэтых твораў звярнулася ў свой час і беларуская паэзія. Янка Купала пераклаў на беларускую мову паэму В. Палішчука «Ленін».

Пераклад паэмы быў змешчаны ў першым нумары часопіса «Полымя» за 1924 год. У ёй паэт усхвалявана расказвае аб ленінскіх справах і планах, разам з Ільічом марыць аб тых часах, калі загудуць

Маторы электрычныя ў сёлах,
Каб у рух пайшлі машыны й маслабойкі
У суперніцтве гартаваных камун,—
Тады для нас вясёлая пара надыдзе.
А як па медных нервах пацячэ

Ў бядачку хату электрычнае святло,—
Тады прыветная гарачая зайграе ўсмешка
На задуменных тварах.

Такая глыбокачалавечая мара была агульнай для ўкраінскага рабочага і беларускага селяніна, і гэта разумелі савецкія паэты. Таму іх прыцягвала, збліжала і ўзаемаўзбагачала ленінская тэма ў паэзіі, тэма, у якой знайшоў увасабленне пралетарскі інтэрнацыяналізм і гуманізм, прасякнуты дзяржаўным клопатам аб чалавеку, аб яго будучыні.

У гэтым жа нумары «Полымя» была надрукавана паэма Міхася Чарота «Ленін», якая і азначыла сабою паварот нашай паэзіі да ленінскай тэмы. Вобраз Леніна даецца ў паэме праз успрыняцце селяніна Мікіты, які ад сына-салдата першы ў вёсцы даведаўся пра Леніна і паверыў у ленінскія ідэі (такі мастацкі прыём выкарыстаў у той жа час у рускай паэзіі М. Ціханаў у паэме «Самі»).

І не раз
На сходзе вясковым,
Калі бедных зганялі свістам,
Мікіта смела браў слова
І гукаў:
— Я і мой сын — камуністы...
На бедных свіст гэты...
Таварышы!
Дзе ваша сумленне?!
Багатыя свішчуць —
Ліхая прыкмета!
Таварышы!
Рабіце, як кажа Ленін!

Чаротава паэма і сёння кранае шчырасцю і пяшчотаю сваіх радкоў. Вось Мікіта ўглядаецца ў партрэт Ільіча:

Мікіту здавалася часта,
што партрэт —
                на сценцы гавора,
што папера — словамі шастае,
як Мікіта кажа пра гора.

У першых сваіх творах пра Леніна беларускія паэты засведчылі ўсенародную любоў да правадыра, які даў працоўным масам зямлю і вольную бацькаўшчыну, даў веру ў шчаслівую будучыню. Таму такім цяжкім горам абрушылася вестка: «Не стала Леніна».

Заўчасная смерць Уладзіміра Ільіча ўзрушыла мастакоў слова.

Многія беларускія паэты — сярод іх А. Гурло, Я. Журба, П. Трус, А. Вольны, А. Дудар, Н. Чарнушэвіч — прысвячаюць свае вершы памяці вялікага Леніна — «нястомнага камунара», «кормчага рэвалюцыі»,

хто «напісаў закон нанова». У гэтых вершах паслядоўна праходзіць матыў вернасці ленінскім запаветам: «У нястомнай сваёй барацьбе мы вернымі будзем табе» (Я. Журба). Вернымі, чэснымі, сумленнымі і дысцыплінаванымі — такімі выхоўваў камуністаў Уладзімір Ільіч, такімі ён хацеў бачыць іх заўсёды. Вершы беларускіх паэтаў гэтага часу напоўнены гарачым заклікам мацаваць рады рабочага класа, партыі, камсамола, працягваць справу Леніна.

У той час была напісана і паэма Зм. Бядулі «Чырвона-чорная жалоба» (1924) — адно з цікавых мастацкіх увасабленняў ленінскай тэмы. Два колеры — чырвоны і чорны,— якія адлюстраваны ў назве і праходзяць праз увесь твор, ствараюць атмасферу смутку і жалобы, падкрэсліваюць трагізм падзеі, гора сусветнага пралетарыяту.

Паэма «Чырвона-чорная жалоба» стваралася пад уздзеяннем жудаснай весткі аб смерці любімага правадыра. Трапнымі дэталямі перадае Зм. Бядуля жалобна-суровую атмасферу тых дзён на вуліцах Мінска:

На раніцу увесь горад знаў...
Бы глюгі чорныя агідных каршуноў,
Трубкі тэлефонаў клявалі вушы,
І злавяшчунным клёкатам
Хрыпелі словы два:
«Памёр Ленін».

Галоўнае ў паэме — яснае разуменне маштабнасці асобы Леніна: адусюль ідуць «работніцка-сялянскія грамады» «к свайму Леніну», пачынаючы

Ад Афрыкі пякуча-шэрай,
Ад вод блакітнага Ганга,
Ад старых сцен Кітая,
Ад тундраў малочна-мглістага Сібіра,
Ад зямель Калумба
Да паўстанчых змрочных пушчаў Беларусі...

Маштабнасць вобраза Леніна вынікае з інтэрнацыянальнасці яго вучэння і справы: сусветны пралетарыят «чуе сваю страту».

У паэме «Чырвона-чорная жалоба», хоць яшчэ не вельмі выразна, намецілася тая асаблівасць ленінскага вобраза, у якім прарочая веліч правадыра натуральна спалучалася з прастатою і даступнасцю звычайнага чалавека.

Гаворачы пра творы М. Чарота, Зм. Бядулі і іншых паэтаў аб Леніне, трэба зазначыць, што беларуская паэзія ўжо ў гэты час мела свае адметныя нацыянальныя асаблівасці ў абмалёўцы вобраза Уладзіміра Ільіча.

Бядняк Мікіта з паэмы М. Чарота перажывае смерць Леніна як страту самага роднага чалавека, а «беларуская кабета ў шэрай вёсцы» (паэма «Чырвона-чорная жалоба») «галошанне дзядоўскае заводзіць, пранізанае горам, аплецenae вобразамі старасвецкіх дзён, як узор на паясах вясковых». Зм. Бядуля выкарыстоўвае фальклорную форму народнага плачу:

На каго ж ты нас пакінуў, ой, татуленька!
Асіраценi без цябе мы, ой, зязюленька!

Паэты разумеюць, што «кожны край па-свойму веліч яго славіць». I хоць у гэтым разуменні шмат было і наіўна-абстрактных уяўленняў, аднак, напрыклад, паэма Зм. Бядулі нават у тых сваіх месцах, дзе маштабы і роля Уладзіміра Ільіча зусім нечакана прыпадабняюцца да ролі вядомых гістарычных і міфалагічных асоб накшталт Вашынгтона і Будды, Напалеона і Майсея і іншых, і сёння чытаецца з хвалюваннем.

З вышыні 70-х гадоў, з вышыні амаль 60-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі мы не павінны папракаць паэта за недахоп канкрэтна-гістарычнага падыходу да стварэння вобраза вялікага правадыра, хоць падобнымі недахопамі і «грашыла» наша паэзія 20-х гадоў.

Такую акалічнасць, акрамя ўсяго, можна вытлумачыць яшчэ і тым, што ў паэзіі 20-х гадоў, асабліва ў маладой, выразна адчувалася «касмічна-планетарнае» ўспрыняцце рэчаіснасці, у якім былі і свае, народжаныя гэтым бурным часам, станоўчыя моманты. Усё, што рабілася тут, побач, у нас абавязкова сувымяралася з сусветным, з інтэрнацыянальным, якое, на думку паэтаў, шмат у чым залежала ад таго, як пойдуць справы ў нас. Цікава спалучаюцца гэтыя матывы ў вершы дваццацідвухгадовага камсамольца Паўлюка Труса:

Песню «Ленін»
красуні дзяўчаткі
прапяюць у жніво пад капою,—
прапяе
і пастух каля статку
пад зялёна-кудравай вярбою...
Ты заснуў...
на магілу прыбраную,
след куды не зацьміцца ніколі,
прынясём з недалёкага рання
кветку шчасця —
сусветнае волі!..

Паэт дае клятву быць прадаўжальнікам справы вялікага правадыра, памяць аб якім заўсёды будзе жыць у народзе, у яго песнях і

думах, у яго рэвалюцыйным імкненні да «сусветнае волі». Так — актыўна — разумее паэт ленінскі наказ.

І гэтае разуменне стала глыбокім перакананнем усёй нашай паэзіі, якая натхнёна ўслаўляла бяссмерце ленінскіх ідэй, веру, што «вечно будет ленинское сердце клокотать у революции в груди» (Ул. Маякоўскі).

Мы верым, што сэрцы не могуць згараць,
І хай мы згарым у імкненнях,
А будзе натхняць
І другіх запаляць
Імя непаўторнае
«ЛЕНІН».

*(Ю. Таўбін).*

Ленінская тэма — гэта тэма дваццатага стагоддзя, яго шляхоў і сацыяльных перспектыў. «Няма ніводнай колькі-небудзь значнай для чалавецтва падзеі,— гаварыў вядомы дацкі пісьменнік-камуніст Марцін Андэрсен-Нексё і якая не была б звязана з Леніным і рэвалюцыяй». (Зб. «Глазами человечества (Иностранные писатели и общественные деятели о В. И. Ленине)». М., 1957, стар. 96).

Гэтая сувязь выразна паўставала ў нашай паэзіі ўжо ў 20-я гады, калі з'явіліся першыя вершы аб Леніне са спробаю зразумець і ацаніць змест і значэнне ленінскай спадчыны. Такой унутранай заглыбленасцю ў тэму, імкненнем удумацца ў лёс веку, убачыць яго будучыя абрысы вылучаецца верш А. Дудара «Ленін».

Шлях вякоў туманамі спавіты;
іх бяздоння нельга запаліць...
Толькі з вечна цвёрдага
граніта нашым векам высечан Ільіч.

Сёння поруч; з вёскаю зялёнай
дружна стаў бунтар адвечны — горад:
гэта Ленін згуртаваў калоны
ленінскай мяцежнае кагорты.

Ад Дняпра да докаў Нью-Йорка,
да далёкіх ўсходніх акіянаў
ясна свеціць ленінская зорка
ўсім прыгнечаным і ўсім загнаным.

І цяпер, хоць вечным сном скаваны
наш Ільіч у Маўзалеі,
вечна будзе рычагом паўстання
імя —Л е н і н.

Па меры таго, як ленінскі план пабудовы сацыялізме набываў у нашай краіне абрысы жывой рэальнасці, як ён рабіўся самой рэчаіснасцю, больш гістарычна-канкрэтным, жывым і рэальным станавіўся ў паэзіі вобраз Уладзіміра Ільіча.

Калі чытаеш творы аб Леніне, нязменна думаеш пра вялікую маральную адказнасць мастака, які звяртаецца да ленінскага вобраза. Прасцей за ўсё ўславіць правадыра «знешнімі словамі», з пафасам прызнацца ў сваёй любові, паставіць усюды клічнікі і на гэтым скончыць. Або — другі варыянт — пераказаць эпізод з біяграфіі, расчуліцца чалавечай прастатою і дэмакратызмам Ільіча. Да гонару беларускіх паэтаў: яны ў мастацкім вырашэнні ленінскай тэмы пазбягалі такіх — лёгкіх — шляхоў. Мастацкі ўзровень у асэнсаванні вобраза Леніна ўзнімаўся адпаведна з творчай сталасцю беларускай паэзіі.

Наша паэзія 30-х гадоў — сведчанне духоўнага ўзмужнення савецкага грамадства. Сцвярджаючы ідэал цэласнага і актыўнага чалавека, да канца адданага справе камунізма, беларускія паэты звяртаюцца да рэвалюцыйных і патрыятычных традыцый савецкага народа. Героі вызваленчай барацьбы, салдаты і правадыры рэвалюцыі, байцы грамадзянскай вайны, мужныя бальшавіцкія камісары, што праславіліся ў рэвалюцыйным змаганні, уваходзяць у паэзію 30-х гадоў як улюбёныя і слаўныя яе героі, акружаныя арэолам рэвалюцыйнай чэснасці і самаахвярнасці. Праўда, далёка не ўсе з шматлікіх паэм і вершаў на гэтую тэму змаглі вытрымаць праверку часу, аднак у іх шэрагу стаяць і такія значныя паэтычныя дасягненні, як паэмы Я. Купалы «Барысаў» (1934) і П. Глебкі «Мужнасць» (1934) і «У тыя дні» (1937), дзе паэт здолеў намаляваць пераканаўчы вобраз Леніна — правадыра, арганізатара Кастрычніцкай рэвалюцыі і заснавальніка першай у свеце Савецкай дзяржавы.

Яго упартасць,
Волю,
Мудрасць,
Што абняла прастор і час,
Яго вялікасную мужнасць
Нясе увесь рабочы клас.
Яна згаіла нашы раны,
Пякучы патушыла боль,
Яна ішла заўсёды з намі,
Вяла і павядзе у бой.

Першы раз ленінская тэма прагучала ў творчасці П. Глебкі яшчэ ў 1926 годзе, калі ў часопісе «Беларуская вёска» быў надрукаваны яго верш «Памяці У. І. Леніна». У паэме «Мужнасць» яна атрымала далейшы працяг і асэнсаванне.

Паэт пераканаўча даводзіць, што гэтыя дзесяць год пасля смерці Леніна былі пражыты з Леніным («Вялікі і магутны Ленін сярод жывых ідзе жывы»), што ён удзельнік нашых сацыялістычных перамог, што яго ідэі рэалізуюцца ў дзейнасці Камуністычнай партыі, у пралетарскай мужнасці рабочага класа.

П. Глебка не адзін раз звяртаўся да вобраза У. І. Леніна. Тэма правадыра гучыць у паэме «У тыя дні» (1937). Ленінскія «Лісты здалёку», вяртанне Ільіча з эміграцыі, сустрэча правадыра на Фінляндскім вакзале, Першы з'езд Саветаў, дзе Ленін выгукнуў сваё магутнае «Ёсць такая партыя!», падрыхтоўка да Кастрычніцкага штурму і сам штурм, першы Дэкрэт аб зямлі — ва ўсіх гэтых гістарычных эпізодах вобраз Леніна раскрываецца ў яго цеснай еднасці з народам. Паэт у гэтым бачыць сілу Леніна, непераможнасць яго ідэй. Адсюль, відаць, і рысы той манументальнасці, якая нададзена вобразу правадыра ў паэме П. Глебкі: — «А ён, вялікі і магутны, і радасны, як светлы дзень».

Паэзія 30-х гадоў у стварэнні вобраза Леніна шырока звярталася да мастацкага вопыту Горкага і Маякоўскага. П. Глебка, наследуючы традыцыі Ул. Маякоўскага, імкнецца манументальнасць і велічнасць ленінскай постаці на фоне гістарычнай эпохі спалучыць з паэзіяй глыбокай чалавечнасці правадыра, эпічнасць задумы — з лірычнымі інтанацыямі паэтычнага выказвання.

Паэмы П. Глебкі вылучаюцца ў паэзіі 30-х гадоў сваім публіцыстычным гучаннем, трыбунна-дэкларатыўнымі заклікамі, маршавымі рытмамі.

Вопыт такіх твораў, як паэмы П. Глебкі, ажыў пазней, у нашай паэзіі часоў Айчыннай вайны, ён мае немалое значэнне і цяпер, жывячы сабою пошукі маладой паэзіі ў сферы гераічнага.

Вобраз Уладзіміра Ільіча глыбока хваляваў народнага паэта БССР Янку Купалу. Паэму «Барысаў» ён напісаў «да адкрыцця помніка Леніну», які быў пастаўлены на сродкі рабочых. І Купала кажа:

Не ахвяры гэта,
І гэта не грошы,
Што ўносіў рабочы,
Старшы і малодшы,—
А крупінку сэрца
Хацеў кожны ўнесці,
Каб ленінскай славы
Йшлі йшчэ далей весці.

Паўстаў помнік, каб нашчадкі ведалі, які быў іх горад раней і які ён стаў сёння — «горды сваёй сілай», вольны і шчаслівы.

Ленінскі вобраз не раз натхняў Я. Коласа. Асабліва вялікае месца ён павінен быў заняць у паэме «На шляхах волі», над якой паэт працаваў многія гады. Аднак гэтае шырокае эпічнае палатно аб чалавечых лёсах «на шляхах да волі» ў перыяд паміж Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыямі засталося незавершаным. Захаваўся надрукаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва» адзін урывак (які, дарэчы, не ўвайшоў у 12-томны збор твораў народнага паэта), дзе Я. Колас малюе вобраз Леніна, гаворыць аб яго грамадзянскіх пазіцыях:

Ён — непакорны дух народу,
Ён жыў у сэрцах бунтароў,
У песнях-сказках песняроў,
Ён волат той, чый дзень прыходу
Чакалі людзі з году ў годы,
Ён — іх надзея, іх любоў.

(«Літаратура і мастацтва», 18 красавіка 1937 г.).

Я. Колас разумее рэвалюцыйную актыўнасць Леніна ў гістарычным працэсе: «Ён выступае за галоту і час крутога павароту на сцягах піша баявых».

Пры ўсім адзінстве ідэйных пазіцый, з якіх беларускія паэты звярталіся да вобраза Леніна, кожны з іх увасабляў гэтую тэму пасвойму, у адпаведнасці са сваёй творчай індывідуальнасцю. Публіцыстычнасць П. Глебкі розніцца ад мяккага лірызму Я. Купалы, ад эпічнай непаспешлівасці Я. Коласа.

Ідэйны пафас беларускай паэзіі 30-х гадоў, сталасць сацыялістычнай свядомасці саміх паэтаў асабліва відавочна выявіліся ў тым, якое месца заняла ў іх творах тэма непарыўнай еднасці партыі і народа як аднаго з важнейшых запаветаў Леніна. Гэтай тэме паэты Беларусі прысвяцілі творы, многія з якіх сталі падзеяй у тагачаснай нашай літаратуры,— такія, як «Над ракой Арэсай» Я. Купалы, як вершы П. Броўкі «Гады, як шторм» і Т. Кляшторнага «У мільёнаў б'ецца ленінскае сэрца», як творы Я. Коласа, М. Лужаніна, Ул. Хадыкі, А. Куляшова, А. Пруднікава, К). Лявоннага і інш. Але, мне здаецца, куды важней за гэтыя асобныя творы тое, што адчуванне непадзельнага духоўнага адзінства савецкага чалавека з партыяй камуністаў арганічна ўвайшло ў думы і песні беларускіх паэтаў. Калі, скажам, Я. Купала ў вершы «Шляхі (XVIII з'езду партыі бальшавікоў)», праніклёна гаворачы аб дружбе савецкіх народаў — дружбе «мільёнаў раскаваных, ...людзей магутных, гордых, вольных»,— як аб вялікай заваёве сацыялізма, складае гімн «камуне», заклікаючы «на свеце шчасце ўвекавечыць», калі М. Лужанін урачыста дэкларуе: «Павінны па ўсім сусвеце гучаць — словы і справы Ільіча», калі для М. Чарота

нацыянальнае адраджэнне і росквіт беларускага народа абумоўлены «сцягам бальшавіцкай перамогі» («Я ўспамінаю год дваццаты...»), а ў маладога А. Русецкага спадчына Леніна — савецкая дзяржава — увасабляецца ў справах свайго пакалення, якое будуе новы свет (верш «Спадчына»),— то ўсё гэта былі розныя мастацкія ўвасабленні адной і той жа думкі пра мудрасць ленінскіх Ідэй, пра сілу партыйнага кіраўніцтва, пра новую сацыялістычную Бацькаўшчыну.

Вобраз савецкай Радзімы, якая непазнана змянілася пад сонцам сацыялізма, робіцца ў гэтыя гады цэнтральным вобразам усёй нашай паэзіі.

30-я гады пераканаўча даказалі ўсяму свету жыццёвую сілу ленінскага вучэння, якое прыйшло некалі «з падполля праз цемень і краты», разбудзіла гнеў працоўных мас і ўдарыла залпам «Аўроры». Пра тое, як сёння «Леніна простае слова ідзе па заводах і нашых будовах»,— хораша сказаў Андрэй Александровіч, адзін з самых папулярных у 20-30-я гады беларускіх паэтаў:

Ты стала святое святых чалавецтва,
Вялікая Праўда ў грудзях тваіх б'ецца.
Як носьбіт свабоды
І дружбы народаў,
Ты ходзіш па свету, гучыш на ўсіх мовах —
Леніна мудрае слова.

Да ленінскага вобраза, да бурных кастрычніцкіх дзён звяртаюцца паэты малодшага пакалення 30-х гадоў. Міхась Калачынскі піша верш «Прамень са Смольнага — успаміны петраградца», сведкі і ўдзельніка Кастрычніцкай рэвалюцыі, які сам бачыў, як Ленін адчыніў акно «ў новы век для нас усіх». І гэты верш М. Калачынскага быў важкім доказам таго, як трывала ўваходзілі ідэі Леніна, ідэі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў свядомасць савецкіх паэтаў малодшых пакаленняў.

У канцы 30-х гадоў у савецкай паэзіі ўзмацняліся матывы мужнасці, самаахвярнасці, гераізму. Падзеі ў Еўропе і цэлым свеце, дзе ўжо разгаралася полымя новай вайны, падказвалі паэтам — неабходна трымаць лірычны порах сухім, каб, калі прыйдзецца, надзейна бараніць заваёвы сацыялізма ад фашысцкай навалы.

У верасні 1939 года ў беларускую савецкую паэзію ўліваецца цэлы атрад таленавітых майстроў мастацкага слова Заходняй Беларусі. Гэта былі людзі, якія на ўласным вопыце ведалі, што такое фашызм і што трэба гартаваць сілы для будучага змагання з ім. Можа, таму матыў абароны ленінскіх, сацыялістычных заваёў так моцна гучыць у вершах паэта-камуніста П. Пестрака, які разам з М. Танкам, М. Ва-

сількам, М. Машарам, М. Засімам, В. Таўлаем і іншымі заходнебеларускімі паэтамі прыходзіць у гэты час у савецкую літаратуру.

А думы мераць даль, і сэрца кажа: Ленін!
Бо з нетраў цёмных, з-за сляпых акон,
Ён за сабой павёў да шчасця пакаленні
Цяперашніх і будучых вякоў.
І сыпнуцца ад струн гарачыя праменні,
І пойдуць маршам сніць аб долі залатой,
Якую ўсім навек прынёс Вялікі Ленін,
Якой не аддамо нікому ні за што!

*("Аб Леніне вялікім")*

Верш Пестрака напісаны ў 1941 годзе, напярэдадні Айчыннай вайны. Вайны жорсткай і трагічнай. Вайны, што скончылася вялікай перамогай ленінскіх ідэй. І вялікі ўклад у нашу перамогу ўнесла савецкая літаратура, паэзія, якая натхняла і ўздымала народ на барацьбу. Адной з крыніц нашай ідэйнай сілы, якую савецкае грамадства даказала ў Вялікай Айчыннай вайне, з'явіўся ленінізм, вернасць ідэям вялікага Леніна. Лепшы твор беларускай паэзіі гэтага перыяду пра Леніна — верш Я. Коласа «Жыве між нас геній», напісаны ў суровы 1943 год. Паэт гаворыць аб народнасці ленінскага вучэння, якое ўвабрала ў сябе «жыватворчы народны дух», яго «праўду і мудрасць», каб шчодра і поўна вярнуць усё гэта працоўным, «каб споўніць народу наказ».

Ён зрокам прарочым угледзеў разлогі,
  Што людзям нябачны былі.
Ён, Ленін, азначыў, акрэсліў дарогі
  У новую праўду зямлі.

Вобраз Леніна — цэнтральны ў гэтым вершы, ён больш канкрэтны і выразны ў параўнанні з тым фрагментам з паэмы «На шляхах волі», пра які мы гаварылі.

Паэт пазбягае пышных слоў, палкай рыторыкі, гаворыць спакойна, засяроджана. Такія рысы творчага стаўлення да рэчаіснасці заўсёды былі ўласцівы мастацкаму стылю Я. Коласа, паэта-эпіка. І сёння нельга без душэўнага хвалявання чытаць гэтыя прачулыя радкі аб Леніне:

Жыве ён з Чырвонаю Арміяй нашай
  І дзеліць паходы яе,
І сэрцу героя, і волі бясстрашных
  Імя яго сілу дае.

Між нас жыве Ленін, як сонца, як зоры,
  Як мудрасць вялікай зямлі,
І сее праменні, агні непакоры,
  Каб людзі шчасліва жылі.

На працягу паўстагоддзя Уладзімір Ільіч нязменна астаецца ў сэрцы савецкага чалавека, натхняе яго, узнімае яго дух.

Так было і ў нялёгкія першыя пасляваенныя гады, калі краіна залечвала раны вайны, адбудоўвала гаспадарку, уставала з руін. Паэзія, гордая нашай перамогаю, ізноў звяртаецца да любімага вобраза. К гэтаму часу ў ёй трывала замацаваліся эстэтычныя традыцыі Купалы і Коласа ў падыходзе да вырашэння ленінскай тэмы. Яны выразна адчуваюцца ў творах М. Танка і П. Броўкі, П. Панчанкі і А. Куляшова, у вершах К. Кірэенкі, Р. Няхая, А. Бялевіча, М. Гамолка А. Вялюгіна і інш. Пасля вайны паэты не раз пабывалі ў тых мясцінах, дзе калісьці жыў Ленін, і гэтыя падарожжы нарадзілі новыя думкі, новыя адчуванні.

Адышла, адгрукала навала,
Ленінград, ты здужаў ў барацьбе!
Бранявік з Фінляндскага вакзала,
Мы стаім з пашанай ля цябе.

Перамогу ленінградцаў, якія адстаялі свой горад, іх згуртаванасць і мужнасць П. Броўка звязвае з падзеямі ў Вялікім Кастрычніку, калі ленінскія словы прабілі «бронь старога свету навылёт». Паэт глыбока адчувае рэвалюцыйную традыцыю, якая аб'ядноўвае пакаленні барацьбітоў-ленінцаў адзінаю воляю, адзіным імкненнем.

Гэтая сувязь пакаленняў, змацаваная традыцыямі абароны рэвалюцыйных заваёў, выразна прасочваецца ў вершы А. Вялюгіна «Пасведчанне». У Штабе Рэвалюцыі Смольным «у дзень абвяшчэння свабоды» Уладзімір Ільіч уручае матросу Лявону Лагодзе пасведчанне камендатуры:

Тады правадыр вартавому сказаў,
Як сыну:
— Таварыш Лагода,
Важнейшая справа між сённяшніх спраў —
Здабытая намі свабода.
Змагацца яшчэ нам не дзень і не год,
Патрэбна надзейная варта.
Я знаю: вы будзеце ў часе нягод
Даверу народнага варты...

Ленінскія словы аб «здабытай намі свабодзе» перадаюцца ад бацькі да сына, ад сына да ўнука як наказ бараніць ад ворагаў заваёвы Кастрычніка.

Новыя рысы да ленінскага вобліку дадаюць вершы П. Броўкі «Дом у Пароніне», «Там, дзе хадзіў калісьці Ленін...», М. Танка «Хата гураля», К. Кірэенкі «Сцяг», Р. Няхая «Помнік Леніну», П. Панчанкі «Нас

ленінскі сцяг парадніў», А. Зарыцкага «Гузік», М. Гамолкі «Ля помніка Леніну».

Усе гэтыя творы — даніна любові і павагі вялікаму правадыру і настаўніку. У партрэце Леніна паэтам бачыцца звычайны чалавек — самы «дарагі і блізкі»:

Аблiччам — рускі.
Воблік — просты.
Не вылучаецца нічым —
Ні сілай волата, пі ростам.
Але яго не змераць спраў
І параўнаць яго няма з кім.
Свайму народу ўсё ён даў,
Што толькі ў сне было ды ў казках.

Такім бачыць Уладзіміра Ільіча паэт А. Астрэйка (верш «Партрэт», 1955 г.).

1956 год — год XX з'езда нашай партыі, з'езда, які шмат зрабіў для таго, каб узмацніць у нашым грамадстве ленінскія нормы жыцця, аднавіць ленінскі стыль у працы. З твораў гэтага часу пра Уладзіміра Ільіча вылучаецца майстэрствам паэма П. Броўкі «Заўсёды з Леніным». Да ленінскай тэмы паэт падыходзіць вельмі асабіста, звязваючы са справаю Ільіча ўласны лёс:

Мы ўсе з ім
Свой ранак сустрэлі.
Жыццё
Перайшлі разам з ім,
Хоць скроні мае пабялелі,
Стаю перад ім я малым.
Я помню —
Між лесу глухога
І чэзлых, спустошаных ніў
Угледзеў мяне ён, малога,
Што з торбай на паству хадзіў.

Вобраз лірычнага героя ў паэме П. Броўкі — гэта не толькі вобраз самога паэта. Гэта шмат у чым тыповая фігура, у якой Можна пазнаць цяперашняга беларуса, якому Ленін адкрыў «да шчасця дарогу» і з якім сёння лічацца ўсе народы свету.

Паэма пачынаецца малюнкам вясенняга абуджэння прыроды: «Вясна. Красавік. Адыходзяць счарнелыя даўна снягі...» Для паэта сімвалічна, што Ленін нарадзіўся якраз у красавіку:

І кожнай вясной,
Як праменні
Пачнуць халады разганяць,
Мы славім

Яго нараджэнне,
Аб смерці не хочам мы знаць!

Сёння ідэі Леніна, ленінізм, належаць усяму свету: «Не знойдзецца ў свеце мясціны, куды б не прынёс ён святло». Паэт падкрэслівае народнасць і дэмакратызм Уладзіміра Ільіча: «Яго не адрозніш з народу, па выгляду многа такіх». Леніна знаходзяць «між усіх» па мудрых прарочых думках. П. Броўка шырока ставіць у сваёй паэме праблему Ленін і сучасны свет. Працяг ленінскай справы паэт бачыць у нашай барацьбе за мір, у тым, як «калоніі, плечы ўзняўшы, скідаюць свае ланцугі», як пачынаюць мацнець інтэрнацыянальныя рады працоўных усёй планеты. Разам з тым П. Броўка прыгадвае этапы нашай сацыялістычнай рэвалюцыі: абуджаныя сёлы і гарады, сялянскія сходкі, камбеды і рэўкомы, калектывізацыя і індустрыялізацыя, нашы сацыялістычныя перамогі... Голас паэта набывае сапраўдны пафас і лірычную пранікнёнасць:

Мой друг
І таварыш далёкі!
Не месціцца сэрца ў грудзях,
Калі ты трымаеш
Высока
Нязгасны, праслаўлены сцяг.

Сіла і моц нашай партыі ў яе вернасці ідэалам Леніна. І гэтыя ідэалы яшчэ раз былі пацверджаны на ХХ з'ездзе.

Не быў я
На з'ездзе дваццатым,
Нас многа там быць не магло.
Але хоць не меў я мандата,
Ды сэрца ў той зале было.

Кожны твор пра Леніна ўносіць сваю рысу ці фарбу ў дарагі вобраз. Дух ленінізма актывізуе нашу паэзію, жывіць у ёй здаровы грамадзянскі непакой, вымушае паэтаў і пісьменнікаў да творчага партыйнага заглыблення ў працэсы рэчаіснасці.

Ленін быў і астаецца нашым сцягам, нашым сумленнем, узорам ідэальнага чалавека. Ва ўяўленні савецкага мастака вобраз Уладзіміра Ільіча па сутнасці азначае і заўсёды азначаў вобраз усебакова развітага чалавека камуністычнага грамадства. Такім ён і паказаны ў нашай мастацкай Лeнініяне, якая асабістыя чалавечыя якасці Уладзіміра Ільіча не аддзяляе ад грамадска-палітычнай дзейнасці Леніна-правадыра і змагара. Такім уяўляе сабе Леніна ўвесь савецкі народ.

Змяншаецца колькасць старых байцоў, якім выпала некалі шчасце бачыць і чуць Леніна. Сённяшняе пакаленне павінна данесці да нашчадкаў жывыя рысы Ільіча — «і рокат ленінскае мовы, і востры

зірк, і ўзнёслы рух, і ўсё, за што былі гатовы ўзняцца міліёны рук». Гэтая адказнасць адчуваецца ў паэме М. Лужаніна «Жывыя рысы Ільіча» (1957). Паэт узнаўляе эпізоды з жыцця Леніна — правадыра і чалавека, у якіх ярка выступаюць жывыя рысы яго характару — цвёрдасць волі і мужнасць, незвычайная дэмакратычнасць і чуласць да народных патрэб, пяшчотнасць у адносінах да таварышаў, замілаванне да дзяцей, упэўненасць у іх будучыні. М. Лужанін бачыць, як «жывыя рысы Ільіна» выразна выступаюць сёння, у рэчаіснасці нашых дзён, калі «да высненага шчасця... нам астаецца столькі часу, што толькі песню прапяеш».

У нас няма, на жаль, магчымасці спыніцца на ўсіх дасягненнях сучаснай паэмы. Тым не менш нельга прамінуць паэму А. Вялюгіна «Вецер з Волгі», дзе паэт звярнуўся да «вытокаў найвялікшага ў свеце жыцця», да маленства і юнацтва Уладзіміра Ульянава. «Ленін пачынаўся, як пачынаецца магутная Волга...,— піша А. Вялюгін у прадмове да паэмы.— У неспакойным юнаку-гімназісце мне адразу пабачыўся арганізатар Кастрычніцкага штурму». І сапраўды: менавіта такім паўстае Уладзімір Ульянаў у паэме А. Вялюгіна. Галоўныя рысы характару Леніна — чалавека і рэвалюцыянера — былі закладзены тут, на беразе Волгі, якая нібыта ўвабрала ў сябе боль, тугу, мары і спадзяванні ўсяго народа:

Рассінелася круча,
адкуль
па-арлінаму
глянуў
яснавокі,
картавы —
не такі, як усе,
быў такі, як усе.
Сціплы,
шчыры, як праўда,
вялікі і просты,
як радасць,
пачынаецца Ленін,
нібы Волга ў глушы...

Паэме пра У. І. Леніна А. Вялюгін аддаў некалькі год настойлівай творчай працы. Ён грунтоўна вывучаў успаміны пра Леніна, не раз пабываў ва Ульянаўску, хадзіў Ільічовымі сцежкамі, дыхаў волжскім паветрам, мысленна «ўжываўся» ў асяроддзе, якое акружала Леніна-юнака.

Жыццё Уладзіміра Ільіча, яго біяграфія, здавалася б, добра вядомыя нам, аднак, пераказаныя паэтам, яны не перастаюць хваляваць.

Пры гэтым А. Вялюгін шчодра выкарыстаў права мастака выбраць галоўнае, найбольш тыповае і важнае для сваёй паэтычнай задумы.

З першых жа радкоў паэма А. Вялюгіна выклікае вялікую цікавасць, нягледзячы на тое, што мы шмат ведалі пра дзіцячыя гады Валодзі Ульянава і да гэтага. Паэт дэталёва вывучыў не толькі мясціны, звязаныя з дзяцінствам і юнацтвам Валодзі Ульянава, жыццё і побыт сям'і Ільі Мікалаевіча, а і саму эпоху — Расію 70-80-х гадоў мінулага стагоддзя. Чуткі пра тое, што адбывалася ў сталіцы — у далёкім Пецярбургу,— даходзілі сюды, у «пазаштатны» Сімбірск. Пакаранне Пяроўскай і Кібальчыча хвалявала і прымушала задумацца гімназістаў, моладзь Сімбірска. Паэма поўная свежых асацыяцый. У аўтарскіх унутраных маналогах перадаюцца трывогі Валодзі Ульянава і яго равеснікаў, калі яны думаюць пра лёс нарадавольцаў, пра тых, хто гіне за народную справу.

Схаваўся снег у засень,
Дзе шумна ля акон
абняўся з вязам ясень,
з таполяй — гонкі клён.

Чакаючы цярпліва,
пасталі ля варот.
Няўжо з такіх шумлівых
збіваюць эшафот?

У кронах поўна ветру,
а ў шуме — дабраты.
Яны гамоняць ветла,
як сёстры і браты.

З самага пачатку паэмы чытач, асабліва малады, мае магчымасць пранікнуць, заглыбіцца ў душэўны свет Валодзі Ульянава, у тыя абставіны, сярод якіх гадаваўся хлопчык Ульянаў.

Адзін з самых хвалюючых вобразаў паэмы — вобраз вялікай рускай ракі Волгі, «Волгі Сцяпанаўны», як называе яе паэт:

Раздолле... Утопіцца вока там
у пеннай бяскрайняй красе,
дзе Волга Сцяпанаўна з рокатам
на Астрахань крыгі нясе.

Вобраз магутнай Волгі, якая ўвабрала ў сябе боль і слёзы ўсяго народа, вельмі характэрны для рускай класічнай паэзіі, для рускай народнай песні. А Вялюгін дадае сюды сваю рысачку:

Маркотна ў рускай песні днела
над воляй Волгі і лугоў.
Мая, дняпроўская звінела

жалезнай скаргай ланцугоў.

Паэт засяроджвае ўвагу на тым, што фарміравала характар юнака Ульянава. Велічнае відовішча магутнай Волгі, якая бачна была белагаловаму хлопчыку нават з акна Сімбірскай класічнай гімназіі, душэўная шырыня рускай прыроды: і рускага народа, сіла і магутнасць якога асабліва дакладна і поўна ўвасоблены ў вобразе каваля Парфірый, і побач з гэтым мора зла і несправядлівасці, духоўны прыгнёт, «кричащие», як потым назаве іх Ленін, супярэчнасці тагачаснага грамадскага жыцця.

У славесным арсенале беларускай мовы паэт знаходзіць сродкі, якія вельмі ярка і праўдзіва малююць Валодзю Ульянава — будучага генія чалавецтва. Галоўная ўдача паэмы — абаяльны, мастацкі паўнакроўны вобраз маладога Леніна. У яго характары ўжо ўгадваецца гатоўнасць да будучых рэвалюцыйных бітваў. І разам з тым ён «такі, як усе». Паэма добра перадае яго звычайнасць, блізкасць і зразумеласць нашаму маладому сучасніку.

Адначасова з буйнымі паэтычнымі жанрамі другой палавіны 50-х гадоў з'яўляюцца шматлікія вершы беларускіх паэтаў аб Леніне: А. Зарыцкага «На ўскраіне Лейпцыга», С. Грахоўскага «Красавік» і «На Волзе», М. Хведаровіча «Перад помнікам Леніну», М. Лужаніна «У Кастрычніку», А. Бялевіча «Размова з Леніным», А. Дзеружынскага «Марыў наш вялікі Ленін...». Паэты імкнуцца спасцігнуць значэнне і ролю У. І. Леніна як тэарэтыка навуковага сацыялізма, як вялікага будаўніка-практыка і проста як чалавека ў нашай сучаснасці, у жывой плыні сацыялістычных будняў. Нездарма С. Дзяргай у адным з вершаў гаворыць :

Мне цяпер уявіць немагчыма —
Нікне розум, маўчыць уяўленне,—
Чым была б ты, мая айчына,
Каб да сонца не ўзняў цябе Ленін?!

Думкі, справы, запаветы, увесь вобраз Леніна найбольш поўна ўвасабляе ў сабе наша сацыялістычная рэчаіснасць.

Думку гэтую пераканаўча сцвярджае Максім Танк:

Мы ўглядаемся
У партрэты Леніна.
Але найбольш жывы ён паўстае
У вобліку Радзімы нашай.
Таму часцей глядзіце на хлеб, соль,
На столь, што выплаўляем,
На агні электрастанцый,
На трасы міжпланетных караблёў,
На славаю акрытыя сцягі,

На рукі,
злучаныя непарыўнай дружбай,
На кнігі,
поўныя святла і мудрасці яго.

Асоба Леніна заўсёды была для паэтаў невычарпальным аб'ектам мастацкага пазнання. Колькі будзе існаваць паэзія, яна будзе адкрываць новае і новае ў Лепіце, у яго чалавечым обліку. Без Леніна мы но здолеем колькі-небудзь глыбока зразумець прынцыпы сацыялістычнага гуманізму.

Тэма Леніна ў літаратуры непадзельна звязана з тэмай партыі, рэвалюцыі і сацыялістычнай дзяржаўнасці. Натуральнае адзінства гэтых паняццяў трывала замацавалася ў памяці «вясковага летапісца» з верша М. Лужаніна «У Кастрычніку», багатага на жывыя псіхалагічныя дэталі, непаўторныя падрабязнасці вясковага побыту першых месяцаў Савецкай улады. У вёску прыйшлі газеты з Ленінскім Дэкрэтам аб зямлі, сяляне ідуць дзяліць панскую зямлю:

Натоўп сачыў тады спаважна,
Як беларускі чалавек
Адмерваў саматужным сажнем
Шырокі клін.
Сабе.
Навек.

Так, гэты час нельга аддзяліць у нашай свядомасці ад нараджэння беларускай дзяржавы — БССР. І гэты момант нязменна жыве ў творах сучаснай паэзіі аб Леніне. Пра гэты гістарычны акт вершы П. Макаля «Нараджэнне дзяржавы», А. Бачылы «Горда ідзе наша слава» і «Успаміны аб 1924 годзе», А. Лойкі «Квітней, зямля!» і іншых паэтаў. Усе яны, зразумела, розныя па сваёй мастацкай каштоўнасці, але вельмі блізкія шчырай любоўю і павагай да Ільіча — увасаблення нашай рэвалюцыі.

Сучасныя паэты засяроджваюць сваю ўвагу на розных гранях гэтай вялікай тэмы, на розных этапах жыцця і дзейнасці У. І. Леніна, зараджэння, развіцця і барацьбы Камуністычнай партыі. Савецкія мастакі ідуць да Ільіча заўсёды па нешта важнае, за неабходнай парадай, як наведвалі яго калісьці пры жыцці шматлікія «хадакі» — простыя працоўныя людзі. Хатка І з'езда РСДРП у Мінску (М. Аўрамчык), Ленін у Пароніне (Р. Барадулін), Кастрычнік (М. Лужанін), Ленін у Смольным (М. Калачынскі), вясковая партячэйка 20-х гадоў (П. Броўка), Ільіч і дзеці (А. Вольскі), Ленін на суботніку (У. Паўлаў), лямпачка Ільіча (В. Вітка) — вось далёка не поўны тэматычны пералік творчых інтарэсаў паэтаў, якія звярнуліся да ленінскай тэмы, яшчэ раз засведчыўшы яе вялікую актуальнасць для нашых дзён.

І сучасная, беларуская паэтычная Ленініяна мае ў сваім актыве шмат значных паэтычных заваёў. Заўсёды хвалюешся, калі чытаеш вядомы верш А. Куляшова «Мой прэзідыум» — спавядальныя і, як кожная споведзь, вельмі асабістыя радкі пра тое галоўнае, што складае нязменную ідэйна-маральную перакананасць чалавека, каму «з песняю сёння за сорак», каму «суровы выдаўся лёс».

Народжаны ў век наш гразовы,
На мітынгах людных яго
Я сам выбіраў ганаровы
Прэзідыум сэрца свайго.
Займаюць пачэсныя месцы
З тых дзён
на чале з Ільічом.
Матросы, чырвонаармейцы
За песні шумлівым сталом...

Шчырасць гэтага верша не выклікае сумнення. У ім адлюстраваліся думкі, перажытыя і вынашаныя паэтам, пранесеныя ім праз усё жыццё. Леніну, партыі, нашай сацыялістычнай яве А. Куляшоў прысвяціў усю сваю творчасць. Яны сталі галоўным у паэтычнай свядомасці мастака. І, зразумела, не аднаго яго. Шмат цудоўных вершаў прысвяціў Уладзіміру Ільічу П. Панчанка, паэт з яркім талентам лірыка-публіцыста, заўсёды ўсхваляванага, страснага. І нейкім шчымлівым пачуццём вее ад яго верша «Калі падступаюць слёзы».

Пад гул барабанаў і горнаў
І лёгка, і цвёрда, і горда,
Каб кожны іх крокі пачуў,
У залу ідуць піянеры,
Што нам, камуністам,
так вераць,
Як верым мы ўсе Ільічу.
І слёзы тады падступаюць...

Садружнасць пакаленняў савецкіх людзей выступае ў паэзіі П. Панчанкі, як «эпохі гарачая зварка», як поўнае сацыяльнае і маральнае адзінства нашага грамадства, мэты і ідэалы якога асветлены ідэямі Леніна. Сам жа паэт «з таго пакалення, над калыскай чыёй з першых дзён, з першых год клапатліва схіляўся з усмешкай Ленін».

Алесь Звонак крыху старэйшы за П. Панчанку, ён — з пакалення «арлянят-маладнякоўцаў», чыя неспакойная маладосць рушыла ў дарогу пры жыцці Леніна. Верш А. Звонака называецца «Ільіч з намі». І гэта ўнутраная еднасць паэта з вялікім правадыром.

Пошукі глыбіні і праўдзівасці ў адлюстраванні ленінскага вобраза спалучаюцца ў сучаснай беларускай паэзіі з яе асабліва актыўным унутраным ленінскім пафасам.

Не выклікае здзіўлення, што сённяшнія такія неабходныя нам ідэйныя крытэрыі і маральныя «эталоны» гуманізму паэзія шукае ў ленінскіх традыцыях і запаветах. Менавіта з гэтымі традыцыямі, на наш погляд, звязана ўмацаванне маральна-гуманістычнага акцэнту ў жыцці і ў сучаснай паэзіі. Усе мы былі сведкамі гэтага плённага, асвяжальнага працэсу, які пачаўся ў сярэдзіне 50-х гадоў у нашай літаратуры. Як некалі Уладзімір Маякоўскі адкрыў у Леніне не толькі веліч мысліцеля, але і сціплую прастату і дэмакратычнасць правадыра, так сучасныя паэты, у нечым дапаўняючы яго, пераканальна даказваюць, што Ленін быў па-сапраўднаму добры, што яго рэвалюцыйны гнеў і рашучасць у барацьбе выраслі якраз з найбольшай дабраты і пяшчотнасці да чалавека.

Ленін быў вялікім жыццялюбам і аптымістам — адзін з вершаў А. Вярцінскага так і называецца — «Ленінскі смех»:

Ленінскі геній ведаў даўно:
Рэвалюцыю робіць дабро,
а не зло, Д
абро рэвалюцыю параджае,
Рэвалюцыю дабро сцвярджае.
Дабру не да твару змрочныя шоры.
Яму падавай марш мажорны,
Сонечны май ды светлую мару —
Усмешка дабру больш да твару.
Усмешкай той
　　　　　　і быў надзелены
Ільіч — носьбіт народнай надзеі...
Я ленінскага смеху не чуў,
Ды верны жывому Ільічу,
Спасціг я альфу і амегу
Таго выбуховага смеху.
То мудрасць смяялася над тупасцю,
Над уяўнай глыбакадумнасцю.
Смяялася праўда
　　　　　　над маною чорнай.
Наша заўтра —
　　　　　　　над нашым учора...
Мы вучымся верна у Ільіча
Быць пільнымі, ворага біць з пляча.
Мы вучымся ў Леніна змагацца —
Будзем вучыцца ў яго смяяцца.

Шмат хто з беларускіх паэтаў малодшага пакалення з поспехам звяртаюцца да тэмы Леніна і партыі. «Размова з Уладзімірам Ільічом» А. Наўроцкага, «Ленін» Н. Гілевіча, верш Р. Барадуліна «Таварыш Партыя», С. Гаўрусёва «Штрыхі да партрэта», К. Цвіркі «Помнік Ільічу», Г. Бураўкіна «Да Ільіча», пераконваюць нас, што гэта не выпадковыя паэтычныя матывы, а надзённая неабходнасць нашай маладой паэзіі, для якой вобраз Леніна самае святое, патрэбнае сэрцу, самы дарагі душэўны набытак. Да яго ідуць паэты «на споведзь строгую». «На плошчах кінуў ён душы прамень і сам астаўся ў людскім патоку»,— гаворыць пра Леніна Юрась Свірка.

Вершы нашых маладзейшых паэтаў, прысвечаныя Ільічу, вылучаюцца шчырасцю, унутранай цеплынёй, асабістасцю душэўных парыванняў. Даверлівая, амаль інтымная інтанацыя Алеся Наўроцкага па-сапраўднаму хвалюе.

Пагаварыў з Вамі —
і адразу
На душы маёй
стала лягчэй.

Размова з Леніным... Пра што яны гутарылі, паэт і правадыр? Паэт разважаў пра сябе, пра сённяшнія поспехі краіны, аб памылках і цяжкасцях, аб тых, хто пагражае нам атамнаю бомбаю, і як ад каланіяльнай палітыкі імперыялізму «сыплецца парахня». Праўда, гэты верш у апошнія разы друкаваўся ў новай рэдакцыі. І, не ўтоім, першая рэдакцыя (кніга «Неба ўсміхаецца маланкаю», 1962), на наш погляд, была лепшаю, больш выразнаю. Аўтар чамусьці выкінуў радкі пра чалавека, які «заняў толькі тое месца, дзе Вы стаялі, а цалкам Вас замяніць не мог...» Дарэмна: гэтыя радкі, на маю думку, патрэбны ў гэтым вершы.

Цікавы сваёй прынцыповасцю верш Р. Барадулін^ «Таварыш Партыя», дзе паэт вельмі арганічна звязвае ленінскую тэму і тэму партыі з нашай сучаснасцю, не пазбягаючы недахопаў, якія сустракаюцца на шляху да камунізма. І ён мае рацыю: шлях гэты не ўяўляецца нам сёння роўным і простым. Паэт — верны камуністычным ідэалам нашага грамадства — знаходзіць правільныя шляхі для плённага сінтэзу сучаснай праблематыкі. Сцвярджальна, аптымістычна гучыць у яго вершы зварот да партыі, выпеставанай Леніным:

Хачу, каб ты заўжды была
Такой, як ёсць,— праўдзівай,
шчырай.
Бо з-пад твайго бярэ крыла
Узлёт
наш камсамольскі вырай!

Галоўная і самая важная думка, якая складае ідэйную і маральную сутнасць «камсамольскага выраю» ў нашай паэзіі,— «мы — наследнікі Ільіча, мы — прадаўжальнікі яго справы, ва ўсім будзем падобны на Леніна». Такое крэда нашай паэзіі — маладой і немаладой — шмат да чаго абавязвае. Яно заклікае паэтаў да грамадзянскай актыўнасці, да поўнай душэўнай аддачы, да барацьбы за камуністычныя ідэалы. Гэтага патрабуе тая вялікая спадчына, якую пакінуў нам Уладзімір Ільіч Ленін і якую нам трэба развіваць і памнажаць дзеля чалавечага шчасця.

Мы, зразумела, не змаглі сказаць пра ўсе вершы і пра ўсіх паэтаў, якія прысвяцілі свае творы Уладзіміру Ільічу, якія ўнеслі свой уклад у беларускую Лэніяну. Наша нацыянальная Ленініяна багатая і ўвесь час папаўняецца новымі творамі. Зразумела, не ўсе з гэтых твораў шэдэўры — кожны паэт уносіць сюды свой пасільны ўклад. Аднак, што датычыцца нашых дзён, паэзіі нашага часу, то ўзровень мастацкага асэнсавання ленінскай тэмы ў ёй значна ўзрос у параўнанні з папярэднімі перыядамі. У «Дні паэзіі» 1967 года цікавы верш змясціў П. Пестрак — новы па матэрыялу, да якога звярнуўся паэт, па маштабу мыслення і глыбіні паэтычнай задумы. У гэтым жа «Дні» знаходзім вершы П. Броўкі, Ул. Дубоўкі, М. Лужаніна, шмат твораў аб радзіме і Камуністычнай партыі. І сапраўды невычарпальныя тыя крыніцы, якія жывяць грамадзянскія пачуцці нашай паэзіі, яе чалавечнасць і гуманізм.

Вышэйшым крытэрыем мастацкага твора з'яўляецца пранікнутая ленінскім духам партыйная ацэнка, глыбока народная па сваёй эстэтычнай сутнасці. Яна самая дарагая для паэта, бо гэта крытэрый праўдзівасці і патрэбнасці, актуальнасці твора. Гэта — адзін з ленінскіх запаветаў для мастакоў. Некалі, у гады суровага бальшавіцкага падполля, на партыйных лістоўках пісаліся словы «прачытай і перадай другому». Максім Танк, успамінаючы гэтыя словы, гаворыць:

Толькі я хацеў бы скласці песню,
На якой бы у маім райкоме
Напісалі дарагія словы:
«Прачытай і перадай другому!»

Уладзімір Ільіч Ленін заклікаў дзеячаў літаратуры і мастацтва: «Бліжэй да жыцця. Паболей увагі да таго, як рабочая і сялянская маса на справе будуе нешта сваё ў сваёй будзённай рабоце». Уладзімір Ільіч сфармуляваў прынцыпы партыйнасці і народнасці літаратуры і мастацтва сацыялістычнага рэалізму. Пісьменнікі Савецкай Беларусі, верныя прынцыпам партыйнасці і народнасці сацыялістычнага мастацтва, заўсёды трымалі ў чысціні нашу магутную ідэйную зброю

— марксісцка-ленінскую ідэалогію, пастаянна ўдасканальваючы сваё майстэрства, аддаючы ўсе свае сілы і здольнасці палітычнаму, маральнаму, эстэтычнаму выхаванню савецкіх людзей. Росквіт нашай літаратуры, росквіт сацыялістычнай культуры савецкіх народаў непарыўна звязаны з імем Уладзіміра Ільіча Леніна. «Няма нічога больш узвышанага і высакароднага, чым браць прыклад з Леніна, самаадданага змагацца за справу, якой ён прысвяціў усё сваё жыццё»,— гаворыцца ў пастанове ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна».

Ленін заўсёды ў сэрцы беларускіх мастакоў слова. Яго вучэнне, жыццё, чалавечы воблік «вялікага камуніста» жывіць творчыя пошукі нашых паэтаў і пісьменнікаў, якія імкнуцца раўняць свае ідэалы па Уладзіміру Ільічу.

# ЛЮДЗІ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ГАРЭННЯ

## *(Вобраз камуніста ў беларускай літаратуры)*

Ёсць, мне здаецца, нешта вельмі сімвалічнае ў тым, што своеасаблівым, можна сказаць, «вечным» спадарожнікам аднаго са старэйшых нашых паэтаў Петруся Броўкі на ўсім працягу яго творчага шляху стаў вобраз камісара Будая — балтыйскага матроса, першага бальшавіка на радзіме паэта ў Мала-Долецкім сельсавеце, што на Ушаччыне, якога прыслала сюды партыя, даверыўшы адказнае заданне — правядзенне рэвалюцыйных пераўтварэнняў у гэтым, адным з адсталых куткоў Беларусі.

Пад чырвоным бантам грудзі,
Шабля пры баку.
Ёсць яму сказаць што людзям
Як бальшавіку.
Думна раіцца з усімі,
Як сысці з бяды...
Прад маімі ён вачыма
Гэткі праз гады.

Такім душэўным і шчырым — «мог заплакаць з беднякамі, пана пакараць» — запомніўся паэту першы камісар, што ўпершыню яму — вясковаму падлетку — «раскрыў праўду свету і азначыў шлях». Можа, таму ён і сёння ўладна вабіць паэта да сябе — сваёй дэмакратычнасцю, прыхільнасцю да простага чалавека.

У палацы на прыгорку,
Скуль скаціўся пан,
Зацягнуцца дай махоркі,
Патрымаць наган.

*(«Першы, камісар»)*

Паэзія Броўкі багата на яркую мастацкую дэталь, якую нічым не замяніць, калі гаворка ідзе пра часы, аддаленыя ад нас. У свеце падобных дэталей, падрабязнасцей тагачаснага побыту і паўстае арыгінальная постаць Будая.

А вось яшчэ радкі пра яго з другога верша:

Быў камісар на рост адменны,
Падлога гнулася пад ім,
Ён гаварыў — дрыжалі сцены,
І думаў я тады аб тым,

Што недзе ў Петраградзе вольным,
Які відно з усіх краін,
Палац, які завецца Смольны,—

Са смольных сосен ці ялін.

І мне здавалася ўсё проста,
Калі наш камісар такі,
Напэўна,— ўсе вялікі ростам,
Каго завуць бальшавікі.

У іх жа плечы па сажэні,
Бо ўсе паны баяцца іх,
За ўсіх жа большы, пэўна, Ленін,
Бо ён галоўнейшы за ўсіх.

Цудоўная, кранальная наіўнасць дзіцячага мыслення, успрыняцця свету! Шмат пра што яна сёння нам гаворыць. І, пэўна, перш за ўсё — пра шлях, пройдзены народам з тых часоў пад кіраўніцтвам нашай партыі, пра змены, што адбыліся ў жыцці і ў самой чалавечай свядомасці, якая, вядома, пачала фарміравацца яшчэ тады і не без дзейнага ўплыву Будая.

Наш камісар раскрыў нам тайны,
А я не мог узяць у толк,
Што Ленін ў кепачцы звычайнай
І ў простым чорным паліто.

*("З дзён маленства")*

У новай кнізе прозы П. Броўкі «Разам з камісарам», што выйшла з друку зусім нядаўна і прыцягнула ўвагу грамадскасці, ізноў сустракаемся з нашым старым знаёмым Будаём. Вось ён бярэ на працу ў валасны камісарыят Федзю Марцінёнка, растлумачвае маломў: «Ты такі мужыцкі сын, як і я. Толькі што меншы. Дык, можа, і шчаслівейшы. Вось і сядзі цяпер у панскім пакоі спакойна. Наша цяпер гэта, разумееш?» («Пачатак»). Ці, скажам, дзеліць паміж беднатой зямлю фальваркоўца, захоўваючы пры гэтым поўную справядлівасць («З драўляным сажнем»); або вылоўлівае бандытаў («Вечарынка») — усюды камісар падае прыклад рэвалюцыйнай чэснасці і бясстрашша, паслядоўна адстайваючы народныя інтарэсы.

Адна з прычын поспеху Броўкі-празаіка — па-мастацку яркі і жыццёва праўдзівы вобраз камісара, бальшавіка Івана Рыгоравіча Будая, які даўно палюбіўся нам і стаў надзвычай блізкі.

Цікавасць нашай літаратуры да камуніста, яго ідэйна-духоўнага свету, маральнай змястоўнасці асобы заўсёды была надзвычай высокай. І гэта зразумела: у вобразе камуніста, які ідзе наперадзе, незвычайна яскрава і ёміста адлюстроўваецца час, сама эпоха з яе пафасам і імкненнем па шляху прагрэсу. Жыццё і справы камуністаў,

увесь іх грамадзянскі воблік і ідэалы служаць натхнёным прыкладам для мільёнаў людзей. У літаратуры і мастацтве менавіта з гэтым вобразам, думаецца, непасрэдна звязана вырашэнне праблемы станоўчага героя, якая была і застаецца адной з галоўных у тэорыі і практыцы сацыялістычнага рэалізму.

Назіранні над своеасаблівасцю выяўлення вобраза камуніста ў літаратуры і мастацтве, развіццём тэмы партыі ў творчасці савецкіх мастакоў могуць дапамагчы глыбей зразумець рух літаратурна-мастацкага працэсу, заканамернасці ўзбагачэння эстэтычных прынцыпаў метаду сацыялістычнага рэалізму, логіку станаўлення новага чалавека.

Сягоння, калі ўвесь свет з узрастаючай увагай углядаецца ў наш вопыт будаўніцтва новага грамадства, цікавасць да камуністаў, як передавой сілы грамадства, усё больш і больш павялічваецца. І гэта літаратараў да многага абавязвае.

Сённяшні высокі ўзровень сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця настойліва патрабуе ад пісьменнікаў далейшых мастацкіх пошукаў і новых здзяйсненняў. «У літаратуру і мастацтва,— гаварыў П. М. Машэраў у дакладзе на XIII пленуме ЦК КПБ,— «просіцца» новы герой — чалавек эпохі сталага сацыялізма і навукова-тэхнічнай рэвалюцыі з уласцівымі яму выдатнымі рысамі і глыбокім пранікненнем у складаны свет грамадскага быцця. Цяперашні час усё вышэй узнімае ў цане якасць маральнай сталасці, дзелавітасці, высокага прафесіяналізму, дзяржаўнага мыслення мастака, а галоўнае, патрабуе ад яго новага ўзроўню ведаў і культуры, здольнасці з большай ідэйна-эстэтычнай сілай абагульнення раскрываць глыбіню і шматграннасць духоўнага свету сучасніка».

Пералічаныя якасці ўсё глыбей пранікаюць у характар сучаснага савецкага чалавека, становяцца адметнымі рысамі яго асобы.

Савецкая літаратура, мастацтва, публіцыстыка ва ўсе перыяды развіцця імкнуліся зразумець і стварыць сваімі мастацкімі сродкамі вобраз камуніста — таленавітага арганізатара, чалавека передавога, паказаць ва ўсёй паўнаце яго неардынарны характар. Прасачыць, як узбагачаецца ўнутранае жыццё камуніста сёння, як пашыраецца яго ідэйны кругагляд, зразумець, у чым канкрэтна праяўляюцца ўласцівыя яму актыўныя, творчыя адносіны да жыцця, якія новыя рысы набывае ён сёння,— ці варта даказаць, як усё гэта важна, актуальна і неабходна для кожнага мастака.

Ідэйны, эстэтычны і маральна-этычны вопыт, накоплены нашай літаратурай і мастацтвам па стварэнні вобраза камуніста, вельмі багаты.

Калі думаеш над мастацкім асэнсаваннем у літаратуры вобраза камуніста, перш за ўсё ўспамінаеш, зразумела, класічныя характары, створаныя савецкімі пісьменнікамі. На памяць прыходзяць героі М. Горкага і У. Маякоўскага, А. Серафімовіча і Ф. Гладкова, Ю. Лібядзінскага і Л. Сяйфулінай, М. Астроўскага і А. Фадзеева, Б. Лаўранёва і В. Катаева, Л. Ляонава і К. Федзіна. А таксама такія вобразы, як камуніст-падпольшчык Пекляванаў у п'есе Ус. Іванава «Браняпоезд 14-69», Безайс і Матвееў у аповесці В. Кіна «Па той бок», Мар'я — бальшавічка з аднайменнай аповесці А. Няверава, Чапаеў і камісар Клычкоў з рамана Дз. Фурманава «Чапаеў», жанчына-камісар з п'есы Ус. Вішнеўскага «Аптымістычная трагедыя», незабыўныя Давыдаў і Нагульнаў з «Узнятай цаліны» М. Шолахава, палітрук Юрый Бранскі з рамана А. Ганчара «Сцяганосцы», сельскі актывіст Свірыд Мірашнічэнка з вядомай трылогіі М. Стэльмаха і многія-многія іншыя. Вось яно — эстэтычнае багацце савецкай літаратуры! У гэтых яркіх, высокамастацкіх дасягненнях замацаваўся той высокі ідэйна-маральны крытэрый, якім вымяраецца грамадзянская баявітасць, сацыяльна-грамадская значнасць і чалавечыя вартасці сённяшняга камуніста.

Стрыжань гэтых розных характараў — камуністычная перакананасць і гераізм. У аповесці Д з. Фурмана ва «Мяцеж» ёсць эпізод, калі некалькі камуністаў на мітынгу былі акружаны натоўпам мяцежнікаў. У гэтых напруясаных абставінах на трыбуну ўзнімаецца Фурманаў, каб сілай волі, ідэйнага перакананання, эмацыянальнага ўплыву камуніста пераламаць настрой дэзарганізаванай ворагам масы, павесці яе за сабой. А калі не ўдасца, калі «быць канцу,— значыцца, трэба яго ўзяць такім, як лепш нельга. Гінучы пад кулакамі і прыкладамі, памірай агітацыйна! Памры так, каб і ад смерці тваёй была карысць...

Памірай мужна. Напруж сілы, усё выверні з нутра свайго, усё мабілізуй у сабе — і ў мазгах, і ў сэрцы, не шкадуй, што шмат растраціш энергіі,— гэта ж твая апошняя мабілізацыя!»

Трэба сказаць, што ў рэчышчы гэтай тэмы шмат папрацавалі беларускія літаратары, пачынаючы з далёкіх 20-х гадоў. Вялікім укладам беларускіх пісьменнікаў у мастацкую распрацоўку вобраза камуніста з'явіліся вобразы Сяргея Карагі з аднайменнага апавядання Я. Коласа 20-х гадоў, падпольшчыка Нявіднага з аповесці «Дрыгва», бальшавіка Галубовіча з выдатнай трылогіі Я. Коласа «На ростанях», цвёрдых духам герояў рамана М. Гарэцкага «Віленскія камунары», рабочага Панаса з аповесці П. Галавача «Спалох на загонах», створанай у 30-я гады, Зеленюка з рамана М. Зарэцкага «Вязьмо», напісанага ў той жа перыяд, камісара Тураўца ў «Мінскім напрамку» І. Мележа,

сакратара падпольнага абкома партыі Васіля Саколіча ў «Векапомных днях» М. Лынькова, камісара партызанскай брыгады Лясніцкага ў аповесці І. Шамякіна «Глыбокая плынь», змагара за народную справу, члена КПЗБ Андрэя Касцевіча ў рамане П. Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах» і другіх. У гэтых вобразах выявіліся важнейшыя рысы камуніста: ідэйная пераконанасць, пралетарскі інтэрнацыяналізм, духоўная моц, адданасць рэвалюцыі, арганічная народнасць. Герой гэты — барацьбіт, стваральнік, камуніст — праходзіць праз усю нашу літаратуру, выяўляючы лепшыя рысы і творчыя памкненні народа.

Чырвоны камандзір часоў грамадзянскай вайны Сяргей Карага загартаваны ў класавых бітвах, да канца адданы справе рэвалюцыі. Ён добра ведае, якая вострая барацьба ідзе ў сферы ідэалогіі, і таму выкарыстоўвае кожны ўдалы момант, каб ідэйна прасвятліць чалавека, узбагаціць яго духоўна, вывесці на правільны гістарычны шлях,— хай гэты чалавек пакуль што знаходзіцца ў стане ворага, бо, ашуканы, не ўсё разумее, як гэта было з канваірам Карагі. Палымяны прапагандыст, Карага кінуў ім у душы зерні бальшавіцкае праўды і мы ўпэўнены, што яны абавязкова прарастуць... Камуніст Карага якраз з тых, хто калі памірае, то, як казаў Фурманаў, памірае «агітацыйна», гераічна.

У вобразе Сяргея Карагі і іншых вобразах камуністаў таго часу адбіўся пафас і своеасаблівасць перыяду грамадзянскай вайны, сам працэс нараджэння рыс камуністычнага характару. Варта адразу ж падкрэсліць, што гэта быў у аснове сваёй характар гераічны, характар чалавека, які быў гатовы на подзвіг у імя грамадскіх інтарэсаў і рэвалюцыйных ідэалаў і які здзяйсняў подзвігі.

Менавіта такі характар намаляваны ў вершы Я. Купалы «На смерць Сцяпана Булата» (1921), прысвечаным аднаму з кіраўнікоў партызанскага руху ў часы белапольскай акупацыі. Паэт рамантызуе свайго героя як магутную асобу («Ты хапаў за косы сонца, думаў думку аб Пяруне, што дух збудзе ўсёй старонцы...»),, падкрэслівае яго патрыятызм, хараство ідэалаў, адданасць роднаму народу, веру ў яго шчаслівую будучыню:

Забуяе ў славе буйнай,
Зазвініць залатаструнне
Родны край адной Камунай...
— Сні, таварыш, аб Камуне!

Не стала Сцяпана Булата — таленавітага народнага самародка, барацьбіта за камунізм, але жыве яго мара аб Камуне, жыве яго справа.

20-я гады — перыяд паскоранага развіцця літаратуры, яе тэматычнага і жанрава-стылёвага ўзбагачэння. Гэта перыяд эксперыментаў, пошукаў новага зместу і новых мастацкіх форм, перыяд нястрымнага імкнення адлюстраваць тагачасны настрой рэвалюцыйнай акрыленасці мас, абуджаных рэвалюцыяй.

У 20-я гады, асабліва ў другой палове, у беларускай літаратуры і мастацтве з'явілася шмат твораў на гісторыка-рэвалюцыйную тэму. Пісьменнікі, якія прыйшлі ў маладую літаратуру, хацелі расказаць аб сваім рэвалюцыйным вопыце.

Ц. Гартны актывізуе работу над раманам «Сокі цаліны», які быў пачаты ў 1914-1916 гадах. Пісьменнік імкнецца паказаць вобраз рэвалюцыянера, яго авангардную ролю ў сацыяльна-вызваленчай барацьбе працоўных мас. Герой рамана, сын местачковай беларускай «цаліны» Рыгор Нязвычны адольвае агромністы шлях да рабочага — прафесійнага рэвалюцыянера. Праўда, гэты шлях паказаны часам даволі знешне, механічна, без глыбокага пранікнення ў псіхалагічнае жыццё персанажа, увесь час падкрэсліваецца выключнасць героя, незвычайная рамантычнасць яго характару. У працы над гэтым вобразам адмоўна адбіліся вульгарызатарскія ўстаноўкі рапаўскага ўхілу, скіраваныя супроць глыбокага сацыяльна-псіхалагічнага раскрыцця характару рабочага чалавека ў літаратуры, бо ён, маўляў, «просты, у яго няма «складаных» душэўных перажыванняў».

Пры ўсіх недахопах, большай часткай абумоўленых самім часам, «Сокі цаліны» Гартнага мелі станоўчае значэнне. Наша літаратура набіралася вопыту ў буйных раманных формах, набіралася вопыту ў вырашэнні праблемы станоўчага героя.

Цікавай спробай стварыць вобраз рэвалюцыянера, падпольшчыка, чалавека, які прыходзіць да бальшавіцкае праўды, былі раманы М. Зарэцкага «Сцежкі-дарожкі» і Р. Мурашкі «Сын». Пісьменнікі, намацваючы шляхі падыходу да стварэння вобраза рэвалюцыянера — важака мас, паказваюць вялікія арганізатарскія здольнасці сваіх герояў, іх валявыя якасці, талент непаказной дэмакратычнасці, сувязь з людзьмі. Героі гэтых твораў — выхадцы з вёскі — шукаюць і знаходзяць адказы на свае пытанні ў рабочым асяроддзі, у бальшавікоў.

Раман «Сцежкі-дарожкі» М. Зарэцкага (1927) таксама, як і «Сокі цаліны», прысвечаны падзеям рэвалюцыйнага змагання. Гаворка ідзе пра пошукі інтэлігенцыяй свайго месца ў барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне народа. Галоўны герой рамана — з сялян, гэта былы семінарыст Васіль Лясніцкі. Цяжкім і складаным быў шлях гэтага чалавека, «кінутага ў кіпучы кацёл рэвалюцыйных перажыванняў», да палітычнай сталасці. З кім толькі не даводзіцца яму су-

стракацца! Колькі дробнабуржуазных ілюзій даводзіцца пераадолець! І толькі рабочы Андрэй, камуніст, раскрывае яму гістарычную сутнасць тых падзей, што адбываюцца навокал,— Лютаўскай рэвалюцыі, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай вайны.

Андрэй у нечым нагадвае «цвёрдакаменнага» рэвалюцыянера Рыгора Нязвычнага, аўтар больш завастрае ўвагу на яго сацыяльна-палітычным вобліку, а не на духоўным жыцці героя. Але нягледзячы на ўсё гэта, раман «Сцежкі-дарожкі» адыграў станоўчую ролю ў асабістым творчым развіцці Зарэцкага, у накапленні эстэтычнага вопыту ўсёй маладой беларускай літаратурай.

Рабочы паказаны як вядучая сацыяльна-палітычная і маральная сіла грамадства і ў гісторыка-рэвалюцыйным рамане Р. Мурашкі «Сын» — у вобразе Ігнася. У рамане, пры ўсіх яго мастацкіх недахопах, пэўным схематызме, дадзена шырокая панарама жыцця беларускага народа напярэдадні і ў часе рэвалюцыі 1905 года. Сучаснікі сведчаць, што гэта быў вельмі папулярны некалі твор. Чытачы захапляліся яго рэвалюцыйным пафасам і рамантыкай. Аднак ужо ў той час крытыка адзначала, што вобразы ў рамане часта не носяць канкрэтна-жывога характару, а служаць тыповым выяўленнем пэўнай класавай групіроўкі. Многім вобразам нестае, як на цяперашні погляд, культуры ў паказе «дыялектыкі душы», псіхалагічнай глыбіні. Аднак попыт на гэты твор значны і сёння. Чытача, асабліва маладога, вабіць да сябе рамантыка гераічнай барацьбы рабочага класа і яго баявога авангарда, якому пісьменнік і прысвяціў свой раман,— бальшавіцкай партыі.

Пра такіх, як Рыгор Нязвычны, Ігнась і Арон, Лясніцкі і Андрэй, гавораць: «Яны былі першымі». Таму нялёгкія былі іх «сцежкі-дарожкі», але не звілістыя, не здраджвалі камуністы сваім прынцыпам і пераконанням.

Мастацка-эстэтычнае асэнсаванне шматмернага характару камуніста, абагульненне яго ў жыццёва перакананьны і гістарычна дакладны вобраз-тып рухалася (як гэта відаць па творах Ц. Гартнага, Р. Мурашкі, М. Зарэцкага) далёка не гладкімі пуцявінамі, пры некаторых і, дададзім, зразумелых эксперыментатарскіх выдатках.

Мастацка-эксперыментатарскі характар «Сцежак-дарожак» і іншых твораў маладых (і не толькі маладых) пісьменнікаў 20-х гадоў відавочны. Ён абумоўлены навізной самога жыцця, рэвалюцыйнай рэчаіснасці, а таксама разнастайнасцю эстэтычных прынцыпаў, маладосцю самой літаратуры.

Падобныя цяжкасці перажывала і руская літаратура, малюючы рэвалюцыйныя падзеі і вобразы бальшавікоў. У шэрагу твораў анар-

хісцкая стыхія засланіла паказ арганізаваных сіл рэвалюцыі, а вобразы камуністаў падмяняліся аскетычнымі фігурамі «скураных куртак».

Пошукі героя праходзілі ў барацьбе са схематызмам і эмпірызмам, у імкненні зразумець і раскрыць складаны свет чалавечай душы. Літаратура ўсё больш свядома схілялася да раскрыцця сацыяльна-псіхалагічнай глыбіні, шматмернасці і шматграннасці чалавечай асобы. Паказ «толькі асноўных тэндэнцый» руху жыцця саступаў месца мастацкаму выяўленню чалавека ў багацці і непаўторнасці жыццёвых сувязей, імкненню да глыбокага мастацкага даследавання жыцця.

Ужо на самым пачатку свайго шляху беларуская савецкая літаратура выявіла прагу да самастойных мастацкіх адкрыццяў, у якіх знайшоў адбітак марксісцка-ленінскі светапогляд нашых літаратараў, усе прыкметы і асаблівасці метаду сацыялістычнага рэалізму, якім яны паступова авалодвалі. І ля самых сваіх вытокаў яна выявіла глыбокую цікавасць да вобразаў змагароў за лепшую будучыню, за справу працоўных мас, людзей, што аддалі ўсе сілы «самаму цудоўнаму ў свеце — барацьбе за вызваленне чалавецтва». Так былі закладзены тыя, дарагія нам сёння ідэйна-эстэтычныя традыцыі ў паказе камуніста, па якіх пайшло далейшае развіццё нашай літаратуры.

Жыццё ў першыя паслярэвалюцыйныя і ў 20-я гады было надзвычай стракатае і складанае. Каласальны палітычны і духоўны ўздым мас натыкаўся на вострае супраціўленне капіталістычных элементаў, якія яшчэ мелі некаторую перавагу ў эканоміцы. Рэчаіснасць абнаўлялася незвычайна бурліва, энергічна, усё больш і больш прыцягваючы да сябе ўвагу літаратараў, даючы ім багаты матэрыял для работы. У літаратуры 20-х гадоў, як, дарэчы, 30-х, галоўным з'яўляецца сацыяльна-класавы канфлікт, заснаваны на бескампраміснай барацьбе новага, народжанага рэвалюцыйнай рэчаіснасцю, са старым, аджываючым светам. Рухаючай сілай жыцця, сапраўднымі сынамі свайго класа, партыі з'яўляліся перш за ўсё камуністы.

Камуністычная партыя Савецкага Саюза выступала вядучай і накіроўваючай сілай на ўсіх гістарычных этапах будаўніцтва новага грамадства. І ёй заўсёды дапамагала ў гэтым савецкая літаратура, ствараючы вобразы тыповых герояў свайго часу, удзельнічаючы гэтым самым у камуністычным выхаванні працоўных мас.

Адзін з найцікавейшых твораў канца 20 — пачатку 30-х гадоў — раман-хроніка М. Гарэцкага «Віленскія камунары», які працягвае ў беларускай літаратуры традыцыю гісторыка-рэвалюцыйнага рамана, шмат у чым узбагачаючы яе і, можа, у першую чаргу — дакументалізмам. Ю. С. Пшыркоў у прадмове да «Віленскіх камунараў»

называе гэты твор лепшым творам М. Гарэцкага, якім ён «замацаваў сваё месца ў гісторыі беларускай літаратуры».

Пісьменнік расказвае аб рэальных падзеях і паказвае сапраўдных удзельнікаў аднаго з этапных перыядаў барацьбы беларускага і літоўскага народаў за перамогу Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі. Ён знаёміць нас з кіраўнікамі віленскіх камунараў 1918-1919 гадоў: камуністамі Ромам, Шымілевічам, Вярбіцкім і іншымі — людзьмі знешне вельмі сціплымі, але стойкімі змагарамі за перамогу Савецкай улады. Хроніка падзей і чалавечыя характары паказваюцца праз успрыняцце галоўнага героя Мацея Мышкі. Вось якім бачыцца яму адзін з кіраўнікоў Віленскай камуны Ром:

«...цвёрдая, асцярожная, але, мусіць, захавана-страсная натура; захаваная рашучасць на ўсё; гэты чалавек не пабаіцца рашучых учынкаў... І было мне гэта ў ім прыемна. Ён мне падабаўся.

Трымаўся ён з усімі незвычайна проста і скромна, па-таварыску, па-кампанейску. Чалавек быў у абыходзінах самы сардэчны. І толькі ўвесь час адчувалася ў ім далікатнае захаванне свае асабістае годнасці. І гэта мне ў ім падабалася: відаць, што чалавек культурны і інтэлігентны.

Усе рабочыя яго палюбілі...»

Людзі з чыстым сумленнем — такімі паказаны камуністы на лепшых старонках кнігі М. Гарэцкага «Віленскія камунары». Не заўсёды, праўда, яны займаюць там галоўнае месца, але гэта абумоўлена жанравымі ўласцівасцямі хронікі. Найбольшая ўвага аддадзена развіццю асобы цэнтральнага героя кнігі Мацея Мышкі.

У вобразе Мацея Мышкі, яго бацькі, бліжэйшых сяброў пісьменнік паказаў выспяванне палітычна ўсвядомленай класавай нянавісці да эксплуатататараў сярод лепшых сыноў беларускага народа, у якіх галоўнай справай жыцця стала барацьба за камунізм. Мацей Мышка — рабочы (бацька яго з сялян). М. Гарэцкі дае разгорнутую, падрабязную перадгісторыю свайго героя, пачынаючы ад прадзеда, гаворыць пра свабодалюбства, пра тое, як бацька Мацея трапіў у Вільню і стаў гарбаром.

Дакументальная аснова рамана (многае ў ёй з біяграфіі самога М. Гарэцкага) шырокая, яна ўключае гісторыю рабочага руху ў Вільні, пачынаючы з 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Пісьменнік імкнецца паказаць, як аб'ектыўная логіка жыцця і гісторыі прыводзіць Мацея Мышку ў рады барацьбітоў за ідэі Кастрычніцкай рэвалюцыі.

30-я гады — адзін з найменей вывучаных у гісторыі беларускай літаратуры перыяд — вызначаюцца паглыбленай увагай літаратуры да тэмы горада, індустрыяльнай працы, рабочых будняў. Праблема

станаўлення характару новага чалавека — вось што асабліва хвалявала пісьменнікаў, заўсёды будзіла іх творчы энтузіязм.

Бурная эпоха 30-х гадоў адлюстравалася ў многіх творах і вобразах савецкай, у тым ліку беларускай, літаратуры. Гэта быў час асабліва шчыльных кантактаў пісьменнікаў з абноўленай явою жыцця, з народам. Літаратура адкрывала новыя тэмы, канфлікты, новы тып героя нават у тых выпадках, калі асэнсоўвалася мінулае, нядаўнія падзеі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

Працу над вобразам камуніста Я. Колас працягваў у аповесці «Дрыгва» (1933). Камуніст-падпольшчык пад псеўданімам Нявідны «вядзе агітацыю супраць акупантаў і раскрывае сапраўднае іх нутро. Рызыкуючы сваёй галавою, пераходзіць ён з месца на месца, арганізуе новыя ячэйкі, падтрымлівае, дапамагае ўжо арганізаваным».

У артыкуле «Паказаць кіруючую ролю нашай партыі», напісаным у 1933 годзе, калі была закончана праца над аповесцю «Дрыгва», Я. Колас вельмі востра ставіць пытанне аб стварэнні вобраза камуніста: «Мы павінны выходзіць з таго палажэння,— гаворыць ён,— што мы з'яўляемся ўдзельнікамі і сведкамі стварэння новага жыцця і зусім новай эпохі на зусім новых прынцыпах. І зусім правільна нас дакараюць тым, што мы, пісьменнікі, не змаглі даць вобраз паўнакроўнага жывога бальшавіка».

Сказана вельмі самакрытычна, многае, як мы бачылі, ужо было зроблена, у тым ліку самім Я. Коласам. Адзін з доказаў таму — вобраз Нявіднага, які ў буры грамадзянскай вайны «нутром адчувае нараджэнне новай эпохі і замацаванне яе на зямлі». «Вось чаму,— гаворыць Колас,— ён так упэўнена ходзіць у гэтым віры. Кажуць, хто сее вецер, той пажынае буру. Невысокі хударлявы чалавек — сейбіт буры: праз буру прыйдзе новы лад і народзіцца новы чалавек».

Мы добра разумеем аб'ектыўныя цяжкасці творчага, эстэтычнага, метадалагічнага характару, што стаялі ў той час перад пісьменнікамі. Гранічна ясна было адно: праблема станоўчага героя была цесна звязана паказам, паводле слоў Я. Коласа, «паўнакроўнага жывога бальшавіка», таму што новае, перадавое найбольш увасабляецца ў характарах камуністаў.

Кожны перыяд у жыцці краіны і, натуральна, у развіцці савецкай літаратуры адзначаны пэўнай своеасаблівасцю, што адбілася і ўвасобілася ў характарах літаратурных герояў, у тым ліку ў вобразах камуністаў. Скажам, камуністам 20-30-х гадоў у значнай меры ўласціва рыгарыстычнасць, адмаўленне ад асабістага, ад клопатаў «пра сябе» ў імя агульнага, грамадскага. Падобныя рысы характэрны Макару Нагульнаву з «Узнятай цаліны» М. Шолахава. У гэтым кала-

рытным вобразе знайшоў высокамастацкае адлюстраванне тыповы воблік камуніста 20-30-х гадоў з усімі непаўторнымі прыкметамі самой эпохі. Намаляваны таленавітым мастаком, вобраз Нагульнава заўсёды будзе хваляваць нас жыццёвасцю свайго чалавечага зместу, гераізмам характару, бескампраміснасцю класавага пачуцця, аддадасцю рэвалюцыі, «сусветнай рэвалюцыі», дзеля якой, як ён лічыць, член партыі камуністаў павінен адмовіцца ад усяго, ад усіх радасцей жыцця.

Сёння мы з'яўляемся сведкамі далейшага ўзрастання цікавасці і ўвагі пісьменнікаў да сацыяльна-маральных, філасофска-этычных праблем жыцця. Валявы пачатак станоўчага героя, яго энергічнасць і рашучасць узбагачаюцца чуласцю да людзей, уменнем паважаць чужую думку, чалавечнасцю і дабратой. Быць камуністам — не спецыяльнасць, не прафесія, а прызванне. Менавіта да такой думкі схіляешся, калі знаёмішся з героямі сучаснай літаратуры.

Па-ранейшаму шмат увагі ідэйным і маральным перакананням камуніста аддае руская літаратура, асабліва багатая на мастацкі яркія вобразы камуністаў — перадавых людзей свайго часу.

Успомнім Аляксея Краюхіна з «Солі зямлі» Г. Маркава, інжынера Бахірава з рамана Г. Нікалаевай «Бітва ў дарозе», Веньку Малышава з «Жорсткасці» і «Выпрабавальнага тэрміну» П. Ніліна, бацьку і сына Губанавых з фільмаў Ю. Райзмана «Камуніст» і «Твой сучаснік», урача Усціменку з трылогіі Ю. Германа «Справа, якой ты служыш», палітрука Сінцова з трылогіі К. Сіманава «Жывыя і мёртвыя», капітана Новікава з аповесці Ю. Бондарава «Апошнія залпы», герояў яго ж рамана «Гарачы снег», што выстаялі ў неймаверна цяжкіх умовах... У глыбокім роздуме, якім насычаны гэтыя вобразы, адчуваецца абвостранае ідэйна-маральнае ўспрыняцце рэчаіснасці, аналітычны падыход да няпростых жыццёвых пытанняў, непрымірымасць да ўсяго таго, што перашкаджае грамадству рухацца наперад.

Непрымірымасцю да сучаснага мешчаніна-ўласніка з яго хцівасцю, двудушшам, абывацельскай абыякавасцю да грамадскіх спраў, з яго чыста спажывецкімі інтарэсамі прасякнута творчасць П. Панчанкі. Яго верш «Расказ аб загінуўшай дружбе» пабудаваны як маўклівы дыялог дзвюх жыццёвых філасофій: індывідуаліста-хутараніна і камуніста, якому дарагія перш за ўсё грамадскія інтарэсы. Некалі ў юнацтве гэтых людзей аб'ядноўвала моцная дружба, пранесеная праз суровыя гады вайны. Аднак прайшоў час і жыццёвыя дарогі дружбакоў разышліся. І тут выпадковая сустрэча. Дом у два паверхі, камоды, парасяты ў хляве, вуллі мёду, фальварковы пышны сад і — цікавая дэталь! — «пад вокнамі ніводнай кветкі, часнок ды памідораў жар».

Такі воблік індывідуаліста, паэтавага антыпода, які да таго ж прыдбаў усё гэта бруднымі махінацыямі. Матэрыяльны дабрабыт — рэч натуральная і зразумелая. Важна, аднак, каб ён не зрабіўся самамэтай, не засланіў чалавеку свет, не асляпіў яго. А па-другое, самая высакародная мэта ператворыцца ў нізкую і антычалавечую, калі яна здабываецца несумленным, антыгуманным шляхам. П. Панчанка вуснамі свайго лірычнага героя задае субяседніку вельмі істотнае пытанне:

Няўжо аб гэткім шчасці марыў,
Калі, паклаўшы на траву,
Табе Радзіма белай марляй
Забінтавала галаву?

Чалавек перарадзіўся ў індывідуаліста, і як збяднеў ад гэтага яго духоўны свет! Паэт пераканаўча даводзіць, што якраз такое разуменне шчасця далёка ад тых гуманістычных мэт, якія ставіць перад нашым грамадствам праграма камуністычнага будаўніцтва. У гэтым — маральна-грамадзянская актыўнасць яго пазіцыі.

Сёння нашы пісьменнікі, дзеячы мастацтваў звяртаюцца да вобраза камуніста, партработніка, працягваючы цудоўную традыцыю савецкай літаратуры ў выяўленні гэтага гераічнага характару, паказваючы — у новых умовах — яго грамадзянскую актыўнасць і наступальнасць.

Калі ўспамінаеш найбольш удалыя, змястоўныя вобразы камуністаў, створаныя беларускімі пісьменнікамі ў апошнія гады і дзесяцігоддзі, на памяць прыходзяць Апейка з палескай хронікі І. Мележа, Яраш, Шыковіч і Антанюк з вядомых раманаў І. Шамякіна «Сэрца на далоні» і «Снежныя зімы», Малашкін з рамана П. Пестрака «Серадзібор», камісар Будай — герой многіх і розных твораў П. Броўкі, вобразы лепшых рабочых у рамане «За годам год» Ул. Карпава, сакратар райкома партыі Андрэй Шэмет з кнігі М. Лобана «Гарадок Устронь», старшыня калгаса Каравай з камедыі А. Макаёнка «Таблетку пад язык», Сотнікаў з аднайменнай аповесці В. Быкава, Зазыба з рамана І. Чыгрынава «Плач перапёлкі», Флёра з «Хатынскай аповесці» А. Адамовіча, партызаны і падпольшчыкі ў трылогіі І. Навуменкі... Магчыма, не кожны з гэтых герояў належыць да партыі камуністаў, але яны камуністы па сваіх поглядах, пераконаннях, па сваёй грамадзянскай сутнасці. І нягледзячы на тое, што ў большасці твораў гаворка ідзе пра падзеі мінулага, гэтыя вобразы — актуальныя па сваім ідэйным пафасе, па багацці гуманістычнага зместу, па глыбіні і маштабнасці сацыяльна-гістарычнага мыслення мастакоў, якія іх стварылі. Беларуская літаратура яшчэ і яшчэ раз паказвае,

што галоўныя рысы духоўнага, маральнага аблічча нашага сучасніка, камуніста фарміраваліся ў гады рэвалюцыі, загартоўваліся ў агнявыя гады грамадзянскай і Айчыннай вайны, у героіцы сацыялістычнага будаўніцтва. Творы беларускіх пісьменнікаў адлюстроўваюць гісторыю фарміравання чалавека новага складу. I з гэтым працэсам цесна звязана развіццё літаратуры, рост і ўзбагачэнне яе еацыяльна-эстэтычнага ідэалу, ідэйна-маральная сталасць.

Падзеі, што адбываюцца ў дылогіі І. Мележа («Людзі на балоце», «Подых навальніцы»), адбываюцца ў 20-30-я гады — час небывалых рэвалюцыйных зрухаў і перамен па ўсёй краіне, у тым ліку і на беларускім Палессі. Аўтар — пасля столькіх гадоў! — вяртае нас у асмасферу напружанай класавай барацьбы ў перыяд калектывізацыі. Адзін з самых цікавых вобразаў у раманах І. Мележа — камуніст Апейка, які нясе на сваіх плячах галоўную адказнасць за лёс калектывізацыі ў раёне, за яе гуманістычны сэнс, за чалавека, які падымаецца да новага жыцця.

Бурная эпоха калектывізацыі знайшла адбітак у шматлікіх творах розных жанраў — у тым ліку і ў напісаных па гарачых слядах часу. Такіх, напрыклад, як аповесць «Спалох на загонах» (1930-1932) П. Галавача, дзе цэнтральны герой — рабочы, камуніст Панас шмат чым падобны да шолахаўскага Сямёна Давыдава. Чалавек з чыстым сумленнем, чэсны і праўдзівы, у мінулым удзельнік грамадзянскай вайны, ён паслядоўна змагаецца — ва ўмовах шалёнага супраціўлення кулацтва — за інтарэсы свайго класа, за сацыялізм у беларускай вёсцы.

Панас гіне ад рукі ворага, і гэта, вядома, трагедыя. Але гэта той выпадак, які ў «Аптымістычнай трагедыі» Ус. Вішнеўскага акрэслены вельмі дакладнай афарыстычнай думкай: «I смерць бывае партыйнай работай». Чытачы таго часу на гераізме Панаса вучыліся мужнасці і вернасці ідэі.

Падобная сацыяльная праблематыка распрацоўваецца ў другім творы тых год — рамане М. Зарэцкага «Вязьмо», у якім намаляваны абаяльны вобраз камуніста Зеленюка. Зелянюк — малады рабочы — накіраваны ў вёску з горада, каб дапамагчы сельскаму актыву ў правядзенні калектывізацыі. Ён умее цярпліва растлумачваць людзям вялікія перавагі калгаснага ладу — той адзінай дарогі, што здольна прывесці селяніна да сацыялізма. Але выбраць і пайсці па гэтай дарозе селянін павінен свядома. І тут вось з Зеленюком уступае ў адкрытую супярэчнасць Карызна, зацяты адміністратар, які «не можа чакаць» і фарсіруе стопрацэнтную калектывізацыю. Асноўны — класавы — канфлікт дапаўняецца другім канфліктам — паміж

markdown
рознымі стылямі кіраўніцтва, рознымі адносінамі да чалавека. «Прадстаўнік горада Зелянюк,— піша сучасны даследчык рамана «Вязьмо» («Беларуская літаратура. Раман і аповесць», Мінск, 1971, стар. 141),— у сваёй дзейнасці калгаснага арганізатара паступова прыходзіць да глыбокай перакананасці, што пра сацыялізм трэба гаварыць не ўсім адразу, а кожнаму паасобку. І ў гэтым ён бачыць сутнасць і сілу рэвалюцыі для кожнага асобнага, а праз кожнага — для ўсіх». Перамагае Зелянюк, таму што яго пазіцыя па-партыйнаму гуманная, заснаваная на веры ў чалавека і даверы да яго.

Побач з Панасам і Зеленюком можна паставіць Зосю («Трэцяе пакаленне» К. Чорнага), рабочага Такарнага («Новая дарога» С. Баранавых), Алеся Дзераша («Сонца пад шпалы» Ф. Шынклера), Паўла Будніка («Праз гады» П. Галавача), Васіля Баранава з аднайменнай паэмы А. Куляшова і іншыя вобразы станоўчых герояў, камуністаў, якія адлюстравалі свет перамагаючага сацыялізма, шырокую панараму жыцця з яго вялікімі заваёвамі і складанымі канфліктамі, працэс станаўлення характару новага чалавека, сцвярджэння сацыялістычнай маралі і этыкі. Гэтым самым літаратура з свайго боку пераконвала, што новае, сацыялістычнае ўсё больш і шырэй перамагала ў справах і ўнутраным аблічча людзей.

Тэма партыі становіцца адной з вядучых у літаратуры 30-х гадоў.

Шчыра ўславіў гераічныя подзвігі камуністаў 20-30-х гадоў А. Дудар у сваёй паэме «Слуцак».

Вам, што здолелі Слуцак па-новаму вырасціць,
разгарнуўшы звычайныя годы ў вякі,
вам складаю я словы захаплення і шчырасці,
слуцкія бальшавікі.

З украінскіх стэпаў ці з Сібіры далёкае,
ад Дзвіны ці ад Нёмна прыходзілі вы,—
вы шагалі наперад жалезнымі крокамі,
не шкадуючы галавы.

Вы ішлі без вагання, крутыя, упартыя,
на бандыцкі абрэз, на балотную твань.
Вы жылі баявымі загадамі партыі.
Хто з вас сіл шкадаваў?!

Такімі паўстаюць камуністы ў творах 30-х гадоў, у праблематыцы якіх знаходзяцца ў зародку многія з тых пытанняў, якія актыўна распрацоўвае сучасная літаратура.

Камуністы Апейка і Шэмет — героі сучасных эпічных палотнаў І. Мележа («Палеская хроніка») і М. Лобана («Гарадок Устронь») таксама жывуць і працуюць у 30-я гады. Мы вельмі добра адчуваем атмасферу той эпохі. Традыцыя, пераемнасць тут праяўляюцца вельмі выразна. Але плённая традыцыя, як вядома, не стаіць на месцы, а ўвесь час развіваецца разам з самім жыццём, пад уплывам паглыблення сацыяльна-гістарычнай зоркасці, мастацка-філасофскага мыслення, удасканалення майстэрства.

Перад намі парадаксальны на першы погляд выпадак, калі аддаленне ў часе не толькі не зацямняе духоўнае аблічча герояў тых дзён і характар іх учынкаў, але робіць іх — з пазіцый сучаснасці — больш блізкімі нам і зразумелымі.

І. Мележ пільна ўглядаецца ў свайго героя, у яго адносіны да жыцця, працы, да людзей, не выпускаючы са свайго мастакоўскага поля зроку ўвесь змест яго творчай актыўнасці. Апейка ва ўсім кіруецца сумленнем камуніста, патрабавальнай любоўю да людзей. Партыйнае сумленне і гуманізм дапамагаюць Апейку арганізаваць куранёўцаў на пабудову грэблі, якая звязала Курані з раённым цэнтрам, установамі ўлады, школай і бальніцай. Калектывізацыя, у разуменні Апейкі, здзяйсняецца ў інтарэсах селяніна, даючы яму шырокую перспектыву свабоднага развіцця — адзіна магчымае выйсце з тупіка прыватнага ўласніцтва. Ён хоча, каб самі сяляне зразумелі, якія перавагі мае калектыўны шлях жыцця, і зрабілі самастойны выбар. Чэснасць, павага да чалавека ў арганічнай еднасці з партыйнай прынцыповасцю, патрабавальнасцю, дзяржаўным падыходам да справы, сапраўднай народнасцю — усё гэта робіць камуніста 30-х гадоў Апейку нашым сучаснікам. Мы вучымся ў яго па-партыйнаму рашаць пытанні, якія ставіць перад намі жыццё, думаць, змагацца...

Андрэй Шэмет — герой рамана М. Лобана «Гарадок Устронь» — таксама прыйшоў да нас з 30-х гадоў, мяркуючы па рамане, добра вядомы аўтару. Прынцыповы камуніст, чалавек высокай духоўнай культуры, Шэмет, як і Апейка, увасабляе ў сабе паводле задумы пісьменніка рэвалюцыйныя ідэалы працоўных мас, чалавечнасць новага ладу. Працуючы начальнікам палітаддзела Устронскай МТС, затым сакратаром райкома партыі, Шэмет — у процівагу некаторым сваім калегам (Марозу, Гаварушку, Журавінку) — ладзіць свае адносіны з людзьмі, і з падначаленымі ў тым ліку, на глебе ўзаемнага даверу, шчырасці, ён не церпіць фальшу, шуміхі і параднасці.

«Чалавек — гэта, брат, пацёмкі,— разважае насуперак пераконанням Шэмета Мароз,— ты яму верыш, а ён табе такое каленца выкіне, што вочы на лоб палезуць». Андрэй Шэмет не прызнае такой

«філасофіі». Гэта натура дзейсная, актыўная, і адносіны яго да людзей па-сапраўднаму партыйныя, камуністычныя.

«Асцерагайцеся хлусні і фальшу, ні пры якіх акалічнасцях не карыстайцеся гэтымі сродкамі. Як бы вы ні хавалі фальш, ён будзе тырчаць, як казліныя рогі ў мяшку...» Гэтыя словы Шэмет гаворыць Конану Ляху, аднаму з сельскіх актывістаў. Праўдзівасць, павага да чалавека, імкненне зразумець яго і адначасова патрабавальнасць дапамагаюць Шэмету будаваць і новае, калгаснае жыццё, заснаванае на калектыўных пачатках у чалавечых узаемаадносінах. У той жа час у дзеяннях Шэмета выразна выяўлены класавы падыход да праблем калектывізацыі. Ён добра ведае, што «ў барацьбе з воўчай ідэалогіяй няможна быць агнём... Там, дзе ёсць барацьба, там нельга быць чалавекам наогул». І гэта адна з асноўных думак рамана, насычанага паказам тых складанасцей і цяжкасцей, у якіх вырастаў і гартаваўся характар савецкага чалавека, камуніста. «Гарадок Устронь», гаворыцца ў кнізе «Раман і сучаснасць», падрыхтаванай кафедрай тэорыі літаратуры і мастацтва Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС (выд. «Мысль», М., 1971), «сучасны і надзённы сваім гуманізмам, непрымірымасцю да скрыўленняў ленінскіх норм партыйнага і грамадскага жыцця».

Вострыя класавыя сутычкі і бітвы 20-30-х гадоў патрабавалі ад камуністаў пільнасці, мужнасці, напружання ўсіх сіл. І адначасова загартоўвалі характар, вучылі партыйнаму погляду на жыццё. Заслуга нашых пісьменнікаў не толькі ў тым, што, паказваючы гэты суровы час сёння, яны імкнуцца захаваць непаўторны каларыт той гераічнай эпохі, але і ў тым — а гэта галоўнае,— што яны плённа вывучаюць урокі мінулага, ні на хвіліну не забываючы пра сучаснасць, што іх гістарызм спалучае праўдзівы паказ жыцця ва ўсёй яго складанасці з ясным бачаннем перспектыў нашага руху наперад.

Звяртаючыся да мінулага, сучасная літаратура яшчэ і яшчэ раз імкнецца прааналізаваць — ад самых вытокаў — запасы нашай духоўнай моцы, сілу ідэйна-маральнай загартоўкі, глыбіню камуністычнай перакананасці, сталасць светапогляду. І вельмі часта яна гэта робіць на матэрыяле Вялікай Айчыннай вайны.

Гераічны характар савецкага воіна даўно і трывала замацаваўся ў беларускай літаратуры. Пра гэта красамоўна сведчыць паэзія А. Куляшова. Адзін з запамінальных вобразаў палымянага змагара і патрыёта ён стварыў у паэме «Баранаў Васіль» (1937), у якой расказваецца пра воіна-пагранічніка, бясконца адданага сваёй сацыялістычнай Радзіме, пра яго ідэйную, маральную, інтэлектуальную перавагу перад прадстаўнікамі буржуазнага свету. Малюючы вобразы

патрыётаў сваёй Радзімы, раскрываючы адданасць савецкіх людзей партыі і народу, паэзія А. Куляшова ўмацоўвала характар савецкага чалавека, узбагачала яго ідэйна, выхоўвала мужнасць.

Характар камуніста ў літаратуры перыяду вайны, відаць, найбольш яскрава ўвасобіўся ў гераічным вобразе камісара брыгады Заруднага з цудоўнай паэмы А. Куляшова «Сцяг брыгады». Вобраз Заруднага прасякнуты пачуццём высокага грамадзянска-патрыятычнага абавязку савецкага чалавека ў хвіліну грознай небяспекі, што навісла над Радзімай. Пазней, пасля вайны, Куляшоў напіша свой выдатны верш «Камуністы», які, у пэўнай меры абагульняючы вопыт паэта ў стварэнні вобраза камуніста, у ярка публіцыстычнай форме намалюе яго ідэйна-маральнае аблічча.

Камуністы — гэта Леніна салдаты,
Воляй партыі з'яднаныя рады.
Упісаны перамог сусветных даты
Іх крывёю ў каляндар на ўсе гады.

Незабыўных не забудзем мы ахвяраў,
Да канца за нашу справу пастаім,
Сцяг чырвоны векапомных камунараў
Нашай змене для палёту аддадзім.

Так і я аддам, як спадчыну, дазвання,
Барацьбы агонь, што ў сэрцы берагу.
Камуністы!.. Гэты заклік да змагання
Вымаўляць без хвалявання не магу.

Гэтым словам, гэтым імем самым чыстым
Самых блізкіх мне я клічу не адзін,
Я хачу, каб называўся камуністам
Родны сын мой, а таксама сынаў сын.

Тэма вайны не перастае хваляваць беларускіх пісьменнікаў. «За апошнія гады,— адзначаецца ў пастанове ЦК КПСС «Аб рабоце па падбору і выхаванні ідэалагічных кадраў у партыйнай арганізацыі Беларусі», прынятай у 1974 годзе,— з'явіліся таленавітыя творы, якія раскрываюць высокія маральныя якасці савецкіх людзей, гістарычны подзвіг народаў нашай краіны ў барацьбе супраць фашысцкіх захопнікаў».

Трэба сказаць, што беларуская літаратура набыла вялікі вопыт у паказе чалавека на вайне, а таксама ў распрацоўцы партызанскай тэмы. Бяспрыкладны подзвіг народа адлюстраваўся ў аповесцях К. Чорнага перыяду вайны, у «Векапомных днях» М. Лынькова, «Трыво-

жным шчасці» і іншых раманах І. Шамякіна, «Мінскім напрамку» І. Мележа, «Згуртаванасці» М. Ткачова, аповесці «Рэха ў гарах» Т. Хадкевіча, творах А. Кулакоўская «Расстаёмся ненадоўга» і «Сустрэчы на ростанях», трылогіі І. Навуменкі, у аповесцях В. Быкава, дакументальнай трылогіі І. Новікава, раманах Ул. Карпава, М. Аляксеева, М. Кругавых, Л. Арабей, у дакументальным творы А. Адамовіча, Я. Брыля, Ул. Калесніка «Мы з вогненнай вёскі». Значныя дасягненні такіх пісьменнікаў, як Р. Барадулін, Г. Бураўкін, І. Пташнікаў, Б. Сачанка, І. Чыгрынаў і многіх-многіх іншых. Сярод беларускіх літаратараў няма, бадай, ніводнага, хто б не меў дачынення да гэтай тэмы...

Беларускія пісьменнікі шмат зрабілі для таго, каб паказаць накіроўваючую дзейнасць партыі ў часе вайны.

Эпічную панараму народнай барацьбы, партызанскага руху намаляваў М. Лынькоў у рамане «Векапомныя дні». У цэнтры барацьбы — камуністы Васіль Саколіч, Вадзім Слышэня, Канстанцін Заслонаў і іншыя, якія ўсё робяць дзеля нашай перамогі. «Векапомныя дні» даўно атрымалі сталую ацэнку крытыкі і занялі пачэснае месца ў гісторыі беларускай літаратуры як твор, які пераканаўча паказвае авангардную ролю партыі ў барацьбе з фашызмам.

Працягваючы работу над раманам «Мінскі напрамак», І. Мележ шмат намаганняў аддаў таму, каб больш пераканаўча, аб'ёмна і пластычна намаляваць постаць камісара брыгады Нічыпара Тураўца. Вайна ёсць вайна: партызаны часта траплялі ў жорсткія абставіны, у амаль безвыходнае становішча. Брыгада, камісарам якой быў Туравец, трапіла ў акружэнне карнікаў. Адзін з камандзіраў узводаў Калібярда ўпаў духам, разгубіўся. Камісар выклікае яго на шчырую, адкрытую гаворку. Так, становішча сапраўды невясёлае. Але якраз таму нельга хныкаць. «Тут ніхто не пашкадуе,— даводзіць камісар,— не вытра слёзы. Людзям самім горка. А фашысты не разумеюць жаласных слоў».

І. Мележ раскрывае свет нялёгкіх думак камісара:

«Ён думаў пра тое, што жыццю людзей, жыццю ўсёй брыгады пагражае небяспечная хвароба — нявер'е ў поспех. Што яна, хвароба гэтая, будзе аслабляць людзей, падрэзваць пад корань баявы дух, што трэба зараз жа, не марудзячы, выганяць яе. Зрабіць гэта будзе нялёгка, бо абставіны спрыяюць хваробе. Трэба, каб усе камандзіры, палітрукі як след зразумелі, як небяспечна цяпер, у іх становішчы, бязвер'е, бязвольнасць.

Так, так,— ніякага вагання, ніякага сумнення, што пераможам мы. У гэтым цяпер галоўнае!

Перадаць гэтую веру ўсім! Запаліць усіх гэтай вераю! Гэта трэба зрабіць што б там ні было!» — Так дзейнічалі камуністы ў складаны ваенны час.

Будні вайны, такія, якімі яны былі — без прыкрае,— паўстаюць у аповесцях В. Быкава.

Вялікая ўдача сучаснай беларускай літаратуры — вобраз Сотнікава ў аднайменнай аповесці В. Быкава, напісаны паводле лепшых традыцый гераічнага характару камуніста 20-30-х гадоў. Перыяд вайны паўстае ў творах В. Быкава ва ўсёй паўнаце жыццёвай праўды як адзін з самых гераічных і драматычных у гісторыі нашай краіны. Вайна з'явілася суровым выпрабаваннем сацыялістычнага ладу, праверкай сілы нашай ідэалогіі і маралі. Герою аповесці — былому камбату Сотнікаву — даводзіцца трымаць экзамен на ідэйную стойкасць і перакананасць у неймаверна жорсткіх абставінах партызанскай барацьбы. Логіка яго мыслення складаная, яго максімалізм часам і супярэчлівы, але нязменна вабіць да сябе высокая духоўнасць гэтага чалавека, што дае яму вялікую перавагу над ворагам, яго, паводле выразу А. Адамовіча, «гераічнае сэрца». Менавіта ў камуністычнай перакананасці карані чалавечай — духоўнай і фізічнай — вытрымкі, нязломнасці Сотнікава, вытокі здзейсненага ім подзвігу.

Антыпод Сотнікава — Рыбак, у якога не хапіла запасу ідэйнай моцы ў гэтых надзвычай жорсткіх акалічнасцях. Пісьменнік з уласцівай яму псіхалагічнай дакладнасцю прасочвае шлях Рыбака ў бяздонне здрады. Тым ярчэй свеціцца і глыбей хвалюе гераічны подзвіг Сотнікава.

Гераізм камуніста асабліва яскрава праявіўся ў гады вялікіх выпрабаванняў, у гады вайны, у цяжкі пасляваенны час. Які ж, аднак, ён, камуніст, сёння? Такі, які быў раней, якім мы ведалі яго па класічных творах савецкіх пісьменнікаў, ці да яго характару, унутранага свету нешта дадалося з вопыту сучаснага жыцця?

На ўсесаюзнай нарадзе пісьменнікаў і крытыкаў у Тбілісі, прысвечанай тэме «Партыя — розум, гонар і сумленне эпохі», першы сакратар ЦК кампартыі Грузіі т. Э. А. Шаварднадзе ў сваім выступленні звярнуў увагу літаратараў на тое, што вобраз чалавека працы, камуніста сёння вельмі складаны, глыбокі і незвычайна цікавы, што член партыі сягоння не вылучаецца так выразна і ясна, як у 20-30-я гады і пазней, паколькі цяпер «радавы», «просты» чалавек пад уплывам выхаваўчай работы партыі непараўнальна вырас у палітычным, маральным, духоўным плане.

Стрыжань камуністычнага характару, яго партыйна-класавая накіраванасць засталіся ранейшымі. Па-мастацку пераканаўча і

яскрава гэта паказана ў нарысах Я. Брыля «Сэрца камуніста» (1957), «Партрэт старэйшага таварыша» (1958) праз вобразы Паўла Жалезняковіча, Рафаіла Сяржанта, Уладзіміра Царука, Івана Сяржанта. Мужнасць змагароў-рэвалюцыянераў, іх высокая грамадзянскасць і крыштальная чэснасць, бясспрэчны ідэйна-маральны аўтарытэт — вось што найбольш хвалюе ў гэтых людзях, якія прысвяцілі сябе справе вызвалення працоўных. Менавіта пра такі тып камуніста, рэвалюцыянера, партработніка гаварыў У. І. Ленін у прамове, прысвечанай памяці Я. М. Свярдлова: «У той кіпучай барацьбе, якой з'яўляецца рэвалюцыя, на тым асобым пасту, на якім стаіць усякі рэвалюцыянер, аграмаднае значэнне мае буйны, заваяваны ў ходзе барацьбы, бясспрэчны маральны аўтарытэт, які чэрпае сваю сілу, зразумела, не ў абстрактнай маралі, а ў маралі рэвалюцыйнага барацьбіта, у маралі радоў і шарэнгаў рэвалюцыйных мас» (У. І. Ленін. Творы, т. 38, стар. 77).

Гэта і ёсць галоўны пачатак у характары сапраўднага камуніста. Але свет кожнага чалавека — у тым ліку камуніста — уключае, апрача ўсяго іншага, і бытавыя адносіны, сямейныя, інтымныя і г. д., у якіх таксама праяўляецца і чалавечы характар, і своеасаблівасць часу. У творах на ваенную тэму не заўсёды ёсць магчымасць паказаць сямейна-бытавы бок жыцця. Але затое які прастор для роздуму над чалавечы»! гераізмам, мужнасцю, самаахвярнасцю, высакародствам! Якія цудоўныя багацці душы раскрываюцца тут!

Многія з гэтых чалавечых рыс вельмі пераканаўча выявіліся ў дакументалістыцы — «Людзі асобага складу» В. Казлова, «Партызанскі край» В. Лівенцава, «Партызанская рэспубліка» П. Калініна, «Сыны народа» Н. Каралёва, «Нёманскія казакі» Я. Брыля, «Партызанскія агні» Г. Шчарбатава і інш. Творы гэтыя, зразумела, не раўнацэнныя па сваіх мастацкіх якасцях, але ў іх адлюстраваліся пошукі шляхоў для перажытага савецкім народам у часе вайны.

Якуб Колас пасля вайны працягваў працу над трылогіяй «На ростанях». Значнае месца ў заключнай частцы трылогіі, завершанай у пачатку 50-х гадоў, ва ўсёй яе праблематыцы займае вобраз бальшавіка Галубовіча, які зрабіў вялікі духоўны ўплыў на галоўнага героя трылогіі Лабановіча. Сустрэліся яны — сялянскі сын, настаўнік Андрэй Лабановіч і піцерскі рабочы, бальшавік па палітычных пераконаннях Аляксандр Галубовіч — у астрожнай камеры. Адбылося гэта ў 1907 годзе, калі рэвалюцыйны рух, як зазначыў Галубовіч, «прыціхшыўся». Аднак абодва яны разумеюць і адчуваюць, што рэвалюцыйны рух хоць і «прыдушаны, але не спынены — ён жыве... Рэвалюцыйны рух — жывая вада, што тоіцца ў нетрах зямлі, у сэрцы і пачуц-

цях народа. Яна выб'ецца на паверхню, праложыць сабе дарогу і пазносіць усё, што скоўвае незлічоныя сілы людскія».

Галубовіч пакінуў свайму сябру запавет — трымацца партыі бальшавікоў:

«Не палічы гэта за нейкую пропаведзь. Я звяртаюся да цябе, як да чалавека, якому веру. Бальшавікі адкідаюць прыгожыя словы, мы не цураемся самай чорнай работы ў імя рэвалюцыі. Трэба абудзіць народ, выхаваць, згуртаваць і павесці на рашучы і ўжо астатні штурм царызму. Ты не павінен застацца ў баку ад гэтага штурму».

«Гэты запавет,— так заканчваецца трылогія,— і стаўся асноваю жыцця і дзейнасці Андрэя Лабановіча ў далейшым вандраванні па новых дарогах».

Трылогія «На ростанях» стваралася аўтарам на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. Гэта твор гістарычны па сваёй праблематыцы, па матэрыялу і створаных вобразах. У літаратуры 50-х гадоў ён займае вельмі віднае месца, стоячы, аднак, наводдаль ад твораў, якія непасрэдна былі звязаны з сучасным жыццёвым матэрыялам.

Такіх твораў было шмат і былі яны разнастайныя, нягледзячы на тое, што пасляваеннае дзесяцігоддзе не заўсёды стымулявала работу пісьменніка ў бок паказу ўсёй складанасці сувязей чалавека і грамадства, поўнага ўзнаўлення праўды жыцця. Сваё, адметнае аблічча меў і станоўчы герой.

Прыкладна дзесяцігоддзе раздзяляе з'яўленне раманаў «Святло над Ліпскам» М. Паслядовіча і «Серадзібор» П. Пестрака, першы з якіх быў напісаны ў пачатку 50-х гадоў, другі — у пачатку 60-х гадоў. Абодва — пра пасляваеннае жыццё вёскі, але розніца ў трактоўцы падзей, цэнтральных персанажаў відавочная. І справа не толькі ў непадабенстве творчых індывідуальнасцей іх аўтараў — рух часу абазначыў тут таксама і рух характараў.

Старшыня калгаса Дзямід Сыч — герой рамана М. Паслядовіча — вобраз далёка не абстрактны і не надуманы. Аўтар падгледзеў яго ў гушчы жыцця. У мінулым партызанскі камандзір, ён і цяпер, у мірныя дні, схільны ставіць на першае месца дысцыпліну ў вайсковым разуменні гэтага слова. Сёння асабліва добра відаць, што Дзямід Сыч, якога калгаснікі — а сярод іх шмат былых партызан — па-ранейшаму завуць «камандзірам», уяўляў сабою распаўсюджаны ў той час тып валявога кіраўніка. «Пачуцці,— разважае ён,— павінны... ісці ці бегчы — як каму даспадобы — следам за загадам... Калі ідзе рашаючая бітва, не можа быць скідак на асабістыя перажыванні чалавека». Дзямід Сыч — таксама свайго роду максімаліст, які думае ў першую чаргу пра справу і ўсяго сябе ёй аддае. Але калектыў, людзі

з іх вялікім і малым клопатам, «асабістыя перажыванні чалавека» — гэта не трапляе ў поле яго ўвагі...

Такі стыль кіраўніцтва, што быў уласцівы пэўнаму тыну кіраўнікоў, не вытрымаў праверкі часам. І ў жыцці і ў літаратуры ён саступіў месца людзям шырокіх ідэйна-маральных далягдядаў.

Раман П. Пестрака «Серадзібор» (1963) стаў у свой час значным крокам нашай літаратуры ў асэнсаванні праблем беларускай вёскі першых пасляваенных год, авангарднай ролі сельскіх камуністаў. Цікава, з веданнем справы напісаны вобраз першага сакратара райкома партыі Сцяпана Малашкіна, які з першых дзён вызвалення разам са сваімі таварышамі кіруе вялікай працай па аднаўленні разбуранай вайной гаспадаркі ў адным з аддаленых раёнаў беларускага Палесся. А час быў вельмі цяжкі. Па лясах туляецца банда былога паліцая Гусака, тэрарызуючы насельніцтва, па-зверску забіваючы актывістаў. Дзейнічаюць таксама замаскіраваныя ворагі. Руіны, папялішчы, свежыя магілы пакінула пасля сябе вайна. Не хапае людзей. Не лёгка прыходзіцца ў гэтых умовах Сцяпану Малашкіну, які востра адчувае сваю партыйную адказнасць за ўсё, што адбываецца ў раёне. Яму дапамагае актыўная вера ў людзей, у кожнага асобнага чалавека, у калектыўную думку партыі, у сілу яе выхаваўчага ўздзеяння на масы. Такія рысы вызначаюць стыль работы Малашкіна як партыйнага кіраўніка, важака мас.

Надзвычай абаяльная чалавечая асоба Сцяпана Малашкіна. Вопыт і майстэрства пісьменніка, веданне жыцця і талент дапамаглі паказаць скіраванасць героя рамана ў будучыню, яго акрыленасць, здольнасць марыць аб рэальным. Такім ён і бачыцца нам у штодзённай, някідкай героіцы раённых будняў,— разумны, разважлівы, дзейсны і энергічны. «Малюючы вобраз партыйнага работніка,— пісаў І. Навуменка, разглядаючы раман П. Пестрака «Серадзібор»,— наша проза нават у нядаўнім мінулым імкнулася паказваць яго героем ва ўсіх адносінах ідэальным, як кажуць, «без сучка і задзірынкі». У такога героя заўсёды былі ў запасе гатовыя адказы, развязкі для самых складаных, супярэчлівых пытанняў. Гіпертрафіравана падкрэсліваліся валявыя якасці героя, які ніколі не ведаў сумненняў. Пісьменнікі пераважна бачылі свайго героя на трыбуне, у яго інтымнае, прыватнае жыццё заглядвалі мала. Пры ўсіх добрых намерах іншы раз атрымліваўся вобраз-ікона, вобраз-схема».

П. Пестрак не ўтаіў ад чытача пачуцця глыбокага і чыстага кахання Малашкіна да Сашы, вельмі блізкай яму сваёй духоўнай змястоўнасцю, сур'ёзнымі адносінамі да жыцця. Словам, аўтар ідзе па шляху раскрыцця ўсёй шматмернасці рэчаіснасці, складанасці жыц-

цёвых сувязей. Такая логіка яго мастацкага пошуку, скіраванага на больш глыбокае даследаванне ўнутранага свету камуніста як «чалавека новага складу» з ягонай духоўнай гарманічнасцю, усебаковым развіццём асобы. Рысы будучага прарастаюць у сённяшнім.

Некаторая аскетычнасць і максімалізм у камуністаў 20-30-х, нават 40-х гадоў былі абумоўлены і апраўданы сваім часам, але яны выглядалі б архаічна сёння. Камуністы нашага часу жывуць поўным, шматгранным жыццём. Багаты і змястоўны іх унутраны свет, высокія духоўныя запатрабаванні. Карл Маркс, адказваючы на адно з анкетных пытанняў, казаў пра сябе: «Нішто чалавечае мне не чужое». Мне здаецца, што камуніст — наш сучаснік — мог бы сказаць аб сабе нешта падобнае. І ён гаворыць — словамі паэта Э. Межэлайціса (з яго кнігі «Чалавек»):

Так стою:
Прекрасный, мудрый, твердый,
Мускулистый, плечистый.
От земли вырастаю до самого солнца
И бросаю на. землю
Улыбки солнца...
Так стою:
Я, человек,
Я, коммунист.

*(Пераклаў В. Слуцкі)*

Узбуйнілася асоба камуніста — нашага сучасніка, узбагаціўся яго ідэйны і маральны вопыт, вырасла ўменне бачыць складанасць жыцця, вырашаць нярэдка вельмі складаныя пытанні, грунтуючыся на гуманістычных прынцыпах нашай палітыкі, ідэалогіі, маралі, этыкі.

Наш час развівае ў асобе камуніста лепшыя якасці: упартасць у барацьбе за камунізм, адданасць партыі і народу, калектывізм, здольнасць да поўнага і свядомага зліцця асабістага з агульным. І гэта імкнецца паказаць літаратура.

Цэласным паўнакроўным жыццём жывуць героі рамана І. Шамякіна «Сэрца на далоні» камуністы Шыковіч і Яраш. Не ведаючы разладу паміж асабістым і агульным, паміж правам і адказнасцю, яны здольныя на высакародныя і рашучыя грамадзянскія ўчынкі ў імя сацыялістычнай законнасці і гуманізму. У гэтых вобразах, відаць, з найбольшай паўнатой выявіўся талент пісьменніка бачыць добрае, чалавечае ў чалавеку і даць гэтым рысам усебаковае раскрыццё. Ён паказвае ўнутраную гатоўнасць сваіх герояў усе сілы і веды аддаць на карысць чалавеку, абараняць праўду і справядлівасць. Побач з імі ў

рамане дзейнічае старшыня гарсавета Гукан. Яго вобраз неадналінейны. Ёсць у Гукана пэўныя заслугі перад партыяй і народам, але на першым плане ў гэтага чалавека — свой, асабісты, вузка-эгаістычны інтарэс. У спрэчцы і барацьбе з ім перамагаюць Яраш і Шыковіч. Бескарыслівая, дзейсная ўвага да чалавека, адкрытасць да чужога гора — у гэтым яны бачаць свой партыйны і чалавечы абавязак. Кніга прасякнута думкай аб тым, што савецкі спосаб жыцця патрабуе глыбокай павагі да чалавека, гуманнасці і веры ў яго.

Цікавасць да вобраза камуніста характэрна сёння ўсім без выключэння жанрам літаратуры — вершам і паэмам, раманам і п'есам, аповесцям і апавяданням, нарысам і рэпартажам.

На вышыню шырокіх мастацка-філасофскіх абагульненняў узнімае тэму партыі Максім Танк.

Кожнаму з нас
Не хацелася быць
Коласам адзінокім —
І мы сталі полем жытнёвым,
Якое корміць свет.

Кожнаму з нас
Горка было б узвышацца
Асобнай вяршыняй —
І мы сталі горным кражам,
Які падпірае плячмі небазвод.
Кожнаму з нас
Сумна было б
Адчуваць сябе кропляй дажджу,
А ўсе — сталі мы акіянам,
Які несціхана пяе.

І калі ўсяго гэтага мала было
Нашым вачам і рукам,
Нашым сэрцам і марам —
Мы сталі Партыяй.

*("Мы сталі Партыяй")*

Не меншае публіцыстычнага запалу і грамадзянскай страсці ў лірычным голасе Аркадзя Куляшова, аўтара славутых «Камуністаў». Трагедыя Чылі балюча ўдарыла ў яго сэрца, сэрца камуніста-інтэрнацыяналіста:

Гавораць, далёка ад Мінска да Чылі.
Няпраўда! Я ў гэта не веру зусім:
Калі аўтаматы Альендэ прашылі —
Прайшлася чарга і па сэрцы маім.

Як Пабла Неруду свабода хавала,
То кідала жменьку з крывавай зямлёй
Пад гукі адважнага «Інтэрнацыянала»
У сэрца маё, а не ў ямку з труной.

А як паляваць пачалі генералы
І трапіў Луіс Карвалан у бяду,—
Шаптаў я штоноч : «Сакратар генеральны,
Не дайся, трымайся, я выйсце знайду...»

*(«Іменем Свабоды»)*

У такім жа публіцыстычным ключы раскрываецца аблічча сучаснага камуніста ў паэзіі А. Звонака:

Трэба ўсюды паспець —
будзь то цэх ці прастор каласісты.
Ці крывавых змаганняў далёкі рубеж агнявы,
Бо жыве неспакоем заўсёды душа камуніста,
Бо завешчан яму ад Кастрычніка дух баявы.

*(«Камуністы»)*

Аблічча камуніста, Героя Сацыялістычнай Працы Д. І. Барашкіна паўстае ў дакументальнай аповесці А. Савіцкага «След пракладае першы». Біяграфія і рысы характару вядомага сталявара Д. І. Барашкіна, адзначаныя пісьменнікам, шмат у чым тыповыя для перадавых прадстаўнікоў рабочага класа нашых дзён.

Сярод твораў апошняга часу, якія звярнулі на сябе зацікаўленую ўвагу чытачоў, былі нарысы В. Якавенкі «Акно на плошчу», «Шляхам жыцця» і «Прыручэнне зямлі» з цыкла «Каласы веку», прысвечаныя сённяшняму сялу, у прыватнасці жыццёвай дарозе рэальнай асобы — Ульяны Феакцістаўны Крышталевіч, сакратара Докшыцкага райкома партыі. В. Якавенка — нарысіст параўнаўча малады, тым больш радуе мастацкі поспех, якога ён дасягнуў у сваіх нарысах і які несумненна ў многім быў прадвызначаны тым, што літаратару пашанцавала сустрэць і «адкрыць» па-сапраўднаму цікавага, ва ўсіх адносінах змястоўнага чалавека, якім з'яўляецца рэальны прататып — гераіня нарыса. Пра гэта думаеш перш за ўсё, даруючы аўтару некаторую нявопытнасць, паспешлівасць там, дзе хацелася б затрымацца даўжэй, падумаць. Вельмі свежы і актуальны жыццёвы пласт, закрануты пісьменнікам. Наперадзе ў аўтара, відаць, шмат работы, і мне, прызнацца, усе тры, добрыя ў цэлым, нарысы ўяўляюцца асновай для далейшай працы над заяўленымі ў іх характарамі і праблематыкай.

Што перш за ўсё вабіць і хвалюе ў гераіні нарыса — гэта багацце чалавечага ў ёй і бязмежная адданасць справе партыі і народу. Адно

звязана з другім. Будучы адказным партыйным кіраўніком, яна застаецца чалавекам у вышэйшай ступені натуральным, рэальным, з усімі яго зямнымі рысамі і асаблівасцямі, разнастайнымі жыццёвымі сувязямі, застаецца глыбока народнай. Паўната адчування жыцця, пастаянная пагружанасць у яго дапамагаюць ёй, як гэта і належыць камуністу, асабліва кіраўніку, увесь час быць з масамі, з народам. Адсюль і аўтарытэт камуніста. Нездарма ў раёне павялося так, што калі чалавек на месцы не знаходзіў патрэбнай увагі, то казаў: «Пайду да Ульяны». Ішоў ці не ішоў, зазначае аўтар, аднак гэта мела пэўнае значэнне.

У вобразе галоўнай герaіні гарманічна спалучаюцца інтэлект і актыўнасць, роздум і дзейнасць, аналіз і сінтэз. Менавіта такой імкнецца паказаць яе аўтар нарысаў — удумлівай і дзелавой, натурай мэтанакіраванай, глыбока перакананай камуністкай. Адчуваецца, што задума В. Якавенкі — цыкл нарысаў — дастаткова ёмістая, каб стварыць яркі вобраз нашага сучасніка — камуніста, сапраўднага грамадзяніна, паказаць веліч і чалавечнасць яго дум і здзяйсненняў, што вызначаюцца нашым, савецкім ладам жыцця.

Вопыт В. Якавенкі асабліва паказальны як вопыт мастака ў жанры нарыса, які вядзе разведку новых характараў людзей сацыялістычнай працы, герояў пяцігодкі, сапраўдных камуністаў, шукае новых, вострых канфліктаў, новыя праблемы, імкнецца ісці ў глыбіню народнага жыцця.

Блізкае знаёмства з працоўнымі Докшыцкага раёна, з яго кіраўніцтвам, у тым ліку і партыйным, натхніла М. Калачынскага на цэлы цыкл вершаў «Докшыцкі каравай», які нядаўна выйшаў з друку асобнай кніжкай. Аўтар імкнецца расказаць пра значныя дасягненні гэтага некалі вельмі адсталага раёна, перадаць паэзію нялёгкай, але пачэснай працы і хлебароба, і партыйнага работніка.

Не пазбаўлены прыцягальнасці, на мой погляд, «Апавяданні пра Сяргея Лусту» П. Кавалёва. У цэнтры іх вобраз першага сакратара абкома партыі Сяргея Міхайлавіча Лусты. Пісьменнік паставіў перад сабой нялёгкую задачу стварыць пераканальны вобраз сучаснага партыйнага кіраўніка вялікага маштабу. Чатыры апублікаваныя апавяданні — пакуль што толькі пачатак рэалізацыі задумы, якая мае мэту паказаць у вобразе Сяргея Міхайлавіча змястоўную чалавечую асобу, талент партыйнага кіраўніка, здольнага павесці за сабой масы. Цяжка сказаць, наколькі выбраны жанр кароткага апавядання будзе садзейнічаць стварэнню вобраза сакратара абкома ва ўсёй яго жыццёвай паўнаце, аднак гэтая пісьменніцкая ініцыятыва варта, як мне здаецца, увагі.

Сягонняшні камуніст акумуліруе ў сабе высокія этычныя якасці свайго народа, яго сацыяльныя прынцыпы, энергію, мары і надзеі. Грамадзянская смеласць думкі, ініцыятыўнасць, уменне адчуць перажыванні іншага як свае ўласныя і такім чынам пранікнуць у душу чалавека ўласцівы, скажам, гераіні кінафільма «Сібірачка». Гэта вельмі сучасны па сваім ідэйна-маральным пафасе вобраз камуністкі, сакратара райкома партыі. Яна лічыць неабходным, калі бачыць, што праўда на яе баку, да канца адстойваць свой пункт погляду, нават калі гэта мае і пэўную долю рызыкі. Каб захаваць мармуровую гару, якая ўяўляе вялікую каштоўнасць, сакратар райкома ставіць пад пагрозу нават сваё жыццё. І ў гэтым нам бачацца рысы характару сучаснага камуніста, якому невядомы разрыў паміж сваім і агульным.

Такім чынам, ленінскае ўяўленне аб рэвалюцыянеры-камунісце поўнасцю захавала сягоння сваё прынцыповае ідэйнае значэнне і застаецца вельмі актуальным. Уладзімір Ільіч глядзеў у будучыню: на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва ўзрастанне кіруючай ролі партыі асабліва відавочна. Глыбока ўсвядомленая камуністычная перакананасць нараджае ў кожнага камуніста пачуццё адказнасці перад таварышамі, перад народам за агульную справу, за свой час.

Цяпер шмат спрачаюцца пра героя сучаснай літаратуры, мастацтва, ставячы асабліва высока (гэта справядліва) такія яго якасці, як высокая тэхнічная, гаспадарчая кампетэнтнасць, бездакорная «функцыянальнасць», дзелавітасць. Аднак трэба мець на ўвазе, што ўсё гэта — нішто без высокай ідэйнасці, глыбокага ведання марксісцка-ленінскай тэорыі, багатай духоўнасці, адчування сацыяльнай перспектывы, чуласці і ўважлівасці да людзей.

«Нам патрэбны,— гаварыў Л. І. Брэжнеў у сваёй прамове ў Кіеве 27 ліпеня 1973 года,— вельмі патрэбны дзелавыя людзі нашай сацыялістычнай фармацыі, якія спалучалі б кампетэнтнасць і прадпрымальнасць з глыбокай партыйнасцю, з клопатам аб агульнанародных інтарэсах».

Гэта надзвычай важна.

Сённяшняя літаратурная крытыка адзначае паглыбленне сацыяльна-гістарычнага мыслення пісьменнікаў, якое арганічна спалучае паўнату адлюстравання рэчаіснасці з раскрыццём галоўных, вызначальных працэсаў гісторыі і сучаснасці, з выразным бачаннем перспектыў развіцця, ясным адчуваннем іх мэтанакіраванага, жыццесцвярджальнага характару. Гаворка ідзе пра каласальны гістарычны і духоўны вопыт, накоплены сучасным савецкім мастацтвам, пра тое, што з такой сілай эмацыянальнага ўзрушэння адгукнулася ў радках П. Броўкі:

Я, можа быць, на перавале,
Ой, што мне бачыцца цяпер!..

Такія незвычайна шырокія далягляды мастакоўскага бачання дазваляюць цвёрда спадзявацца на новыя поспехі літаратуры і мастацтва ў стварэнні мастацкай біяграфіі краіны, у імкненні даць адказ на галоўнае пытанне: «Які ж ён, герой нашага часу — камуніст?»

У нас праароблена вялікая праца па абагульненні, тыпізацыі вобраза камуніста. Аднак наўрад ці маем мы поўнае права сказаць, што нашы літаратура, мастацтва, журналістыка даюць сёння зусім дастатковы матэрыял для роздуму пра тое, якім з'яўляецца камуніст менавіта сённяшняга дня, эпохі развітага сацыялізма і інтэнсіўнай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, калі на вачах ва ўсіх адбываюцца кардынальныя перамены сацыяльнага і навукова-тэхнічнага парадку, калі вырастае, удасканальваецца народжаны сацыялізмам чалавек новага складу, які, як адзначаў Л. І. Брэжнеў у выступленні ў Берліне на ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным 30-годдзю ГДР, б кастрычніка 1974 года, «ганарыцца сваёй сацыялістычнай Радзімай, адданы ідэям камунізма, не аддзяляе клопат пра сваю дзяржаву ад інтарэсаў усёй садружнасці братніх краін».

Стварэнне праўдзівага, сапраўды высокамастацкага вобраза камуніста — першачарговая задача нашай літаратуры і мастацтва.

«Паказаць сёння авангардную ролю камуніста,— казаў нядаўна на Усесаюзнай канферэнцыі літаратуразнаўцаў, крытыкаў, пісьменнікаў у г. Кішынёве Леанід Навічэнка,— значыць, адлюстраваць чалавека не толькі ў дзеяннях, учынках, але і асвятліць яго знутры, раскрыць яго маральны свет, перадаць, у прыватнасці, напружанне яго думкі, якая шукае адказу на няпростыя, часам вельмі цяжкія жыццёвыя пытанні».

Сама гісторыя ўсклала на савецкую літаратуру вялікую і пачэсную задачу: адлюстраваць для сучаснікаў і патомкаў геранчныя вобразы камуністаў, верных сыноў і дачок ленінскай партыі. Паказаць па-сапраўднаму значны, аб'ёмны, тыповы характар камуніста 70-х гадоў — героя сучаснасці — важнейшы абавязак літаратуры. Таленавітыя творы пра перадавых змагароў за ідэалы камунізма, у чыіх справах і памкненнях праяўляюцца лепшыя рысы камуніста нашых дзён, будуць натхняючымі спадарожнікамі людзей, якія рухаюць наперад камуністычнае будаўніцтва.

## ПАЭЗІЯ ВЫСОКАГА АБАВЯЗКУ

### *(Пра публіцыстычную лірыку)*

— Не, не сказаць, каб асабліва радавала сённяшняя паэзія — вельмі сцішанай і задумёнай яна стала.

— А хіба няма пра што думаць?

— Слушна, але ці не здаецца вам, што гэтае «ўдумванне» часта ператвараецца ва ўяўную глыбакадумнасць, у дробную філасафічнасць, якая заклікана маскіраваць недахоп вопыту? Замест думкі — апісанне думкі, замест пачуцця — апісанне...

— А, разумею... Вы прывыклі, відаць, да бадзёрай патэтыкі. Дык магу нагадаць вам «маладнякоўцаў»...

Не ведаю, чым скончылася гэтая спрэчка паміж двума аматарамі паэзіі, і наогул, ці магла яна скончыцца, бо, урэшце, густ ёсць густ, і кожны густ мае права на існаванне. Мае такое ж права на існаванне і кожны паэтычны жанр, у тым ліку і тая паэзія, якую мы называем публіцыстычнай і да якой ставімся нярэдка з недаверам, забываючы на тое, што ад паэзіі «нам патрэбны ісціны простыя, як хлеб, і праўдзівыя, як плач дзіцяці» (П. Панчанка) і што такія ў вышэйшай ступені каштоўныя ісціны можа адкрыць нам публіцыстычная лірыка.

Публіцыстычная лірыка — у адрозненне, скажам, ад інтымнай у яе розных увасабленнях і жанрах — заўсёды звернута, і па змесце і па форме, да шырокай грамадскасці. Тэмы і праблемы, якія яна закранае, пры ўсёй сваёй разнастайнасці, абавязкова маюць значнае грамадска-сацыяльнае, палітычнае значэнне, тычацца вельмі многіх і ў многіх знаходзяць водгук. І народжаны яны часцей за ўсё сённяшнім днём, гарачым дыханнем сучаснасці. Зрэшты, у гэтым, здаецца, нікога не трэба асабліва і пераконваць...

Таму можна смела сцвярджаць, што публіцыстычная паэзія заўсёды была і застаецца надзвычай актуальнай, патрэбнай, бо ў ёй знаходзіць прамое выяўленне грамадзянская актыўнасць паэта — нашага сучасніка, увесь яго сацыяльны вопыт, страсць і тэмперамент мастака. Публіцыстычную лірыку нярэдка папракаюць у празмернай рытарычнасці, але рыторыка бывае розная. Яна ў прынцыпе здольна несці вялікі эмацыянальны зарад, аднак — не рыторыка і дэкларацыя вызначаюць сёння публіцыстычную паэзію...

Цудоўныя ўзоры публіцыстычнай лірыкі ёсць, безумоўна, у кожнай нацыянальнай паэзіі.

Неператўзыдзены да сённяшняга дня грамадска-публіцыстычны дар У. Маякоўскага, які «ўсю сваю звонкую сілу паэта» аддаў народу, сацыялістычнаму будаўніцтву.

І ў нас таксама: Купала і Колас, Чарот і Александровіч і многія іншыя паэты далі запамінальныя прыклады лірыкі баявітай, тэмпераментнай, па-сапраўднаму выбуховай, якая ўмела і магла выклікаць у адказ вялікую актыўнасць народных мас.

Уся савецкая паэзія ваенных год у сваёй пераважнай частцы публіцыстычная, яна і сёння выклікае актыўнае суперажыванне ў чытача. Многія яе якасці — праўдзівасць і шчырасць, гераічнасць і мужнасць, высокі напал пачуццяў — знайшлі працяг і творчае развіццё ў паэзіі 60-х гадоў.

«Жанравая разнастайнасць,— гаворыць І. Бехер,— ёсць вынік шырокага размаху паэтычных пошукаў. Новы герой, які думае і адчувае, паступова пачынае звяртацца да палітычных і маральных праблем сучаснасці — і вось адраджаецца і абагульняецца жанр філасофскай, інтэлектуальнай грамадзянскай лірыкі. Новы лірычны герой можа быць іранічны, насмешлівы — і вось вам умова для адраджэння гумару ў паэзіі. Ён можа быць рэзкі і бязлітасны — і вось вам уздым сатыры. Ён вольны ў выяўленні сваіх любоўных пачуццяў — і вось вам росквіт лобоўнай лірыкі. Ён не хавае свайго захаплення прыгажосцю прыроды — вы бачыце ажыўленне пейзажнай лірыкі і г. д. Для яго няма забароненых сфер».

І ў кожным асобным выпадку публіцыстычная паэзія нясе на сабе адзнаку творчай манеры, стылю, спосабу мыслення мастака. Але амаль ніхто не ўжывае ў гэтым жанры ўскладненыя метафары і вобразы. Задача публіцыстычнай паэзіі — дайсці да чалавечых сэрцаў найкарацейшым шляхам. Публіцыстычная паэзія не прэтэндуе на ўсеагульнасць ахопу жыццёвых з'яў і праблем. Майстэрства паэта заключаецца і ў тым, каб ведаць аптымальныя магчымасці жанру і правільна іх скарыстоўваць.

Значна ўзмацніліся публіцыстычныя матывы ў нашай паэзіі апошніх год. З'явілася нямала гарачых, трапяткіх вершаў, прысвечаных залатому юбілею Саюза ССР. П. Панчанка прысвяціў яму адзін з самых лепшых вершаў сваёй новай кнігі. Гэты верш і даў назву кнізе — «Снежань». У ім паэт дзеліцца тым «пачуццём сям'і адзінай», якім прасякнута дружба савецкіх народаў-братоў. Напісаны свежа, чыстымі, празрыстымі фарбамі, ён уражвае паўнатой адчування жыцця, незамглёнасцю лірычнага погляду на свет. Прыгадаем некалькі строф з гэтай кнігі, асабліва для тых, хто зняве-

рыўся ў паэтычных магчымасцях публіцыстычнага напрамку ў лірыцы:

Добры дзень, суседзі!
Будзем век сябрамі.
Добры дзень, суседкі!
Светлая зіма...
Нас усіх радзіма
у сям'ю сабрала,
Нават тых, адважных,
каго ўжо няма.
Брацкія імёны
злічыць не бяруся;
Кожная рэспубліка —
у сваёй красе.
А на абелісках
нашай Беларусі,
На суровых помніках
знойдзеш іх усе.
Вам паклон сардэчны,
воіны-паплечнікі,
З кім зямлю я родную
разам бараніў.
Слаўлю службу верную,
Слаўлю дружбу вечную!
Нарадзіў Кастрычнік нас,
снежань парадніў.

Пімен Панчанка па справядлівасці лічыцца адным з лепшых майстроў лірычна-публіцыстычнага верша ў нашай паэзіі. Ён быў і застаецца паэтам шчырым, тэмпераментным, палымяным публіцыстам, хоць у яго паэзіі апошніх год значна пабольшала роздуму, нават рэфлексіі.

Зразумела, гэты верш («Снежань») характарызуе толькі адну з граней лірычнага таленту Панчанкі. А талент яго разнастайны, ён добра спалучае лірыку з сатырай, бо надзелены вострым зрокам, які здольны пранікаць у сутнасць з'яў і рэчаў. Яго — паэта-камуніста, грамадзяніна — цікавяць кардынальныя пытанні эпохі, за фактам ён імкнецца ўбачыць з'яву. «Што нам нясе шалёны век? А хто такія мы? А што мы? Якім ты станеш, чалавек? Ад сколькіх ісцін адрачыся і адцурацца хіб якіх, каб жыць прасцей, а не ўрачысцей, ды і чысцей на ўсе вякі?» (***«Ламае час былыя звычкі...»).

Сёння літаратурная крытыка зусім справядліва адзначае развіццё філасофска-медытатыўнай тэндэнцыі ў сучаснай паэзіі. Ад дэкларатыўных заклікаў, абяцанняў і прызнанняў тыпу «перад

дарогаю трошкі падумаць хачу» (К. Кірэенка) паэзія пераходзіць да пэўных эстэтычных здзяйсненняў, вынікам якіх з'явіліся шырока вядомыя і агульнапрызнаныя па сваёй мастацкай каштоўнасці паэтычныя кнігі П. Броўкі, А. Куляшова, М. Танка, П. Панчанкі, М. Аўрамчыка, А. Пысіна, А. Вярцінскага і іншых паэтаў, дзе востра і бескампрамісна пастаўлены «вечныя» і «нявечныя» праблемы чалавечага існавання, якія так хвалююць нашага сучасніка.

Такое — змястоўнае — наватарства непасрэдна звязана, на маю думку, з актывізацыяй ідэйна-творчых пазіцый мастакоў, якія напружана шукаюць новых шляхоў мастацкага пазнання свету.

Філасафічнасць і медытатыўнасць, аднак, не заўсёды дапамагаюць узмацненню праблемнасці. Праблемы не выдумляюцца з галавы ў вольны час, яны звязаны перш за ўсё з жыццёвым вопытам паэта, з узроўнем яго грамадскай свядомасці. «Для стварэння праблемнага твора,— пісаў яшчэ ў 1940 годзе крытык А. Дэрман у адным з сваіх артыкулаў («Праблемнасць як фактар мастацкай творчасці»),— неабходна, каб пісьменнік адчуў тую ці іншую праблему іменна як асабістую, каб ён зазнаў з вялікай сілай націск унутранай патрэбы высветліць сабе гэтую праблему». І далей: «...выкрышталізаваўшыся ў ім у якасці чагосьці асабіста неабходнага, яна (праблема.— У. Г.) вяртаецца ў грамадскае асяроддзе ў якасці аб'ектыўнай каштоўнасці».

Узняць праблему — тое самае, што падняць трывогу, звярнуўшы тым самым увагу грамадскасці на нешта вельмі важнае і неадкладнае.

Задача публіцыстычнай лірыкі — не толькі праўдзіва сведчыць пра свой час, але і актыўна ўздзейнічаць на яго духоўныя працэсы, выкрываць і выкараняць кансерватыўнае, тое, што аджыло, што з'яўляецца перашкодай на нашым шляху, і, з другога боку, падтрымліваць перадавое, прагрэсіўнае.

Праблемнасць паэзіі — родная сястра публіцыстычнасці. Я ні на ёту не хачу прыніжаць філасофскага жанру ў паэзіі. Наадварот, цяпер ёсць усе магчымасці для яго росквіту. Згадаем прыведзеныя вышэй словы І. Бехера. Па развіццю гэтага жанру можна меркаваць пра ўзровень эстэтычнай культуры паэзіі. Разам з тым пра ўсё гэта можна меркаваць па ступені развіцця публіцыстычнай лірыкі, дзе талент грамадзянскасці выяўляецца яшчэ больш непасрэдна, дзе асоба паэта або яе адсутнасць бачны здалёк і адразу, дзе лірычны характар праяўляецца як істота грамадская ў кожным сваім душэўным руху і валодае магутнай сілай уздзеяння.

Неад'емная рыса публіцыстычнай паэзіі — канкрэтнасць і вастрыня праблематыкі, да якой звяртаецца паэт.

На маю думку, многае збліжае публіцыстычную паэзію з празаічнай публіцыстыкай, нарысам: эмацыянальная ўзрушанасць, сэнсавая яснасць і выразнасць, а галоўнае — абавязковасць праблемнага мыслення з яго апалітычнасцю, дапытлівасцю, упартым сцвярджэннем ісціны, маральным прысудам усяму адмоўнаму, розным чалавечым і сацыяльным заганам. Мяшчанству, напрыклад, з яго спажывецка-ўласніцкай псіхалогіяй. Вось радкі П. Панчанкі:

Ілюзіі, ілюзіі...
Як густа вы наслоены!
Травы не бачу ў лузе я,
Хаджу занепакоены.

Сады. Сланечнік з макам.
Кругом асабнякі.
Не сенам — пухам мяккім
Набіты сеннікі.

Мяшчанства атлусцелае
І тук, і сок тут чэрпае.
І думаю дзень цэлы я
Пра гэта племя чэрствае.

*("***Ілюзіі, ілюзіі...")*

В. Зуёнак у адным з артыкулаў вызначыў лірызм панчанкаўскай паэзіі як драматычны лірызм. У гэтым шмат праўды, бо паэт бачыць жыццё ва ўсёй яго складанасці, сведчанне гэтага — і верш «*** Ілюзіі, ілюзіі...».

Нязгода, абурэнне паэта ўвасабляюцца тут у словах з'едліва саркастычных, якія выкрываюць і судзяць дробнабуржуазную, індывідуалістычную псіхалогію «чэрствага племені» судом камуністычнай маралі:

Тут справы чалавечыя
У смех ператвараюцца,
Тут баязліўцы хцівыя
Глядзяць на нас героямі,
Халтуршчыкі пачцівыя
Сігнуць уверх настроены.

Для паэта гэты свет з яго спажывецкімі адносінамі да ўсяго арганічна непрыймальны, варожы. Сваю пазіцыю паэт акрэслівае правільна: «Я ім не прапаноўваю нішчымныя пайкі... Каб жыў народ па-новаму, на смерць ішлі палкі...».

Лірыка, сатыра, сарказм Панчанкі ўвасабляюць у сабе розныя бакі аднаго багата змястоўнага характару, адной гуманістычнай ідэі.

Некалі адзін з удзельнікаў дыскусіі на старонках ЛіМа катэгарычна заявіў: «Публіцыстыка — гэта, калі гаварыць коратка, палітычная лірыка, у якой аўтар выступае па вальнейшых грамадзянскіх падзеях». Такое разуменне публіцыстычнай паэзіі ўяўляецца нам да некаторай ступені збедненым і павярхоўным, бо яно вядзе да газетнага святкавання падзей і дат, не ўлічвае таго, што трэба народу, партыі, дзяржаве перш за ўсё, што сёння самае галоўнае, не ўлічвае высокаразвітага ў паэта пачуцця асобы.

Прыведзенаму вышэй выказванню справядліва, хоць, відаць, залішне катэгарычна, пярэчыў другі ўдзельнік дыскусіі: «Жанру публіцыстыкі няма ў паэзіі, тэорыя гэтага жанру — гэта тэорыя рыторыкі». І ён мае рацыю ў тым сэнсе, што актуальнасць тэмы не можа падмяніць сабою грамадзянскую актыўнасць паэта, самую яго асобу пры багатай яе духоўнай змястоўнасці,— адным словам, усяго таго, без чаго публіцыстычная лірыка ператворыцца ў халодную рыторыку. Да гэтага трэба дадаць і аптымістычны, жыццесцвярджальны погляд на свет — фактар у выключнай ступені станоўчы і дабратворны для развіцця паэзіі.

Публіцыстычнасць, такім чынам, азначае пэўны тып эстэтычных адносін паэта да рэчаіснасці, які характарызуецца глыбокім жыццесцвярджальным пафасам, высокай узрушанасцю паэтычнага перажывання, партыйнай вынашанасцю думак і пачуццяў, якія выказвае паэт.

Творчая індывідуальнасць Г. Бураўкіна акрэслілася вельмі выразна. Ён таксама ўмее ў з'яве разгледзець праблему і завастрыць на ёй увагу, даследаваць паэтычнымі сродкамі пэўную з'яву жыцця.

Застаючыся ў многіх выпадках адкрыта публіцыстычнай па форме, паэзія Бураўкіна ўсё больш уважліва і засяроджана ставіцца да жыцця, больш і больш адчувае сваю перад ім адказнасць.

Вершам «Кампрамісы» Г. Бураўкін пераклікаецца з П. Панчанкам — «Ах, кампрамісы, кампрамісы — улева крок ці ўправа крок. І ўжо жандар праходзіць міма, і ўжо не ўзведзены курок». Кампрамісы — рэч спакуслівая,— гаворыць паэт,— але вельмі і вельмі небяспечная: «Ты толькі збоч, ты толькі збойся, зняверся ў нечым хоць на міг — і лоўка прашмыгне забойца тваіх сяброў, ідэй тваіх». Верш адстойвае ідэю маральнай загартоўкі і непахіснасці. Па-іншаму, у вобразах пазітыўнага сцвярджэння, паўстае гэтая ж ідэя ў такіх вершах Бураўкіна, як «Камісары», «*** О, век дваццаты...», «Я — твой трубач».

Адчуваецца, што ён плённа вучыцца ў П. Панчанкі, у П. Броўкі, які таксама даволі часта звяртаецца да фарбаў публіцыстыка яркіх,

да слова простага, унутрана перакананага. Успомнім хоць бы некаторыя радкі верша П. Броўкі «А ты ідзі!» :

Няхай звісаюць цемрай ночы,
А ты й праз ноч — удаль глядзі,
Няхай пясок і золь у вочы,
А ты ідзі, А ты ідзі!..

Няхай! Абы ты верыў прагна,
Няхай жуда, няхай адзін,
Няхай каменне, твань і багна...
А ты ідзі!..

Побач з гэтым вершам знаходзіцца другі, які сведчыць, што паэт бачыць жыццё шматбакова, бачыць нават розныя плямы, што, на жаль, яшчэ пападаюцца нярэдка. І тады завастраецца яго публіцыстычнае пяро:

Крыўдна да жалю, крыўдна да болю,
Крыўдна — хтось кінуў скарынку
малую.
Крыўдна, што колас застаўся на полі,
Крыўдна — сявярня пад снегам
зімуе.

*(»Крыўдна»)*

І далей ад быту пераходзіць да пытанняў яшчэ больш важкіх і значных — «крыўдна — з надвор'ем не ў поўнае згодзе, крыўдна — не цалкам камандуем небам» і г. д., голас паэта гучыць усхвалявана і адначасова заклапочана. Павялічваецца грамадзянскі патэнцыял паэзіі Броўкі.

Публіцыстычная лірыка, можа, як ніякая іншая, патрабуе сталасці светапогляду, выразнасці ідэалаў, вострай рэакцыі на падзеі рэчаіснасці. Гэта не лёгкі «жанр». Тут не абысціся аднымі дэкларацыямі, няхай сабе і самымі «агністымі». Суб'ектыўны пафас паэта павінен арганічна спалучацца з аб'ектыўнымі заканамернасцямі жыццёвага «матэрыялу».

Прыкметы публіцыстычнага стылю не цяжка адшукаць і ў паэзіі А. Зарыцкага. Гіра гэта сведчаць яго вершы «Не толькі паэты», «У палкавой школе», «На гарадской ускраіне» і іншыя, пазначаныя прамоўніцкімі інтанацыямі. Свядомая ўстаноўка на паэзію публіцыстычнага запалу ёсць у яго вершы «Паэзія» :

Ты для адных — ціхуткая рэчка,
Дзе шэпчуцца млява чарот і трысцё.
А для мяне
Ты — са смерцю спрэчка,
Вечны бой за жыццё.

У шэрагу адкрыта публіцыстычных, па-грамадзянску натхнёных твораў Н. Гілевіча знаходзіцца прыцягальны па свайму пафасу верш «Будзь жа, браце мой, мудрым!..». У ім паэт сцвярджае ідэю сумленнага служэння народу, Радзіме:

Будзь жа, браце мой, мудры —
Лепшай долі няма.
Будзь сумленны і мужны,
Як Радзіма сама!

Будзь нязломны і цвёрды
Перад тварам нягод.
Як твой слаўны і горды
Гераічны народ!

У вершы выразна люструюцца рысы, уласцівыя ўсёй паэзіі Гілевіча — афарыстычнасць думкі, эмацыянальная пераканаўчасць, арыентацыя на народныя ўяўленні і духоўныя каштоўнасці. Разам з тым хацелася б, каб у вершах паэта было больш канкрэтнага перажывання, ім, на маю думку, шкодзіць празмерная абагульненасць.

У замежным цыкле К. Кірэенкі, які склаў у яго «Кнізе ста песень» эмацыянальна насычаны раздзел «Далёка ад дому», вельмі востра крытыкуецца капіталістычны свет бізнесу і нажывы, антычалавечнасць буржуазнага спосабу жыцця, паэт выступае палымяным патрыётам сваёй сацыялістычнай Радзімы.

Вядома, што ідэям часу адпавядаюць свае формы. У нечым, мне здаецца, змяніла ці мяняе сваё аблічча публіцыстычная паэзія. Гэта заўважана ў многіх кнігах нашых паэтаў. Публіцыстыка, кандэнсуючы ў сабе суб'ектыўны тэмперамент паэта, глыбей і глыбей пранікае сваімі карэннямі ў пласты аб'ектыўнай рэальнасці, чэрпае адтуль самае істотнае, важнае для ўсіх.

Апошняе дзесяцігоддзе адзначана тым, што павялічылася кола тэм і праблем, якія прыцягваюць увагу паэтаў, пашырылася сацыяльна-філасофская аснова ўсёй паэзіі, у тым ліку публіцыстычнай. Узрос яе ідэйна-інтэлектуальны патэнцыял. Публіцыстычная паэзія выходзіць сёння на праблемы філасофскай значнасці, такія, як, скажам, ўзаемаадносіны чалавека і прыроды. Яны асэнсоўваюцца ў творчасці П. Панчанкі, А. Куляшова, М. Танка, А. Русецкага, В. Віткі, К. Кірэенкі і многіх іншых паэтаў.

Добра запомніўся верш Куляшова «Сасна і бяроза», у якім паэт — з пачуццём асабістай адказнасці папярэджвае людзей: беражыце зялёны свет зямлі, беражыце сасну і бярозу. Вялікая любоў да прыроды, павага да тых тонкіх, ледзь улоўных працэсаў, якія адбываюцца ў ёй,

жывяць тэмпераментны верш Панчанкі «***Прырода на дзіва праўдзіва...».

Зрэшты, публіцыстычная лірыка тэматычна надзвычай разнастайная. Высокую тэму абрала для свайго верша «Прызнанне» Д. Бічэль-Загнетава — Радзіма, яе людзі. Аднак, мне здаецца, гэты твор пра Радзіму гучыць празмерна камерна. «Мне цёпла, утульна, лёгка. Нішто так не грэе погляд, як світка з твайго лёну, акраец шэрага поля». Па-чалавечы аўтара можна зразумець, але хацелася б, каб у паэтычным поглядзе Д. Бічэль-Загнетавай на сучаснасць было больш грамадскай шырыні, канкрэтных рыс сённяшняга дня.

Абавязковыя патрабаванні да публіцыстычнай думкі, як мы ўжо гаварылі,— канкрэтнасць і выразнасць. Імі ў значнай меры пазначаны многія вершы М. Лужаніна, В. Віткі, Ю. Свіркі, Л. Дайнекі і іншых паэтаў розных пакаленняў. Моцны сваім антываенным пафасам верш М. Лужаніна «*** Я дзесьці прачытаў: тэатр ваенных дзей...». Узнаўляючы сцэны з гэтага «тэатра», паэт раскрывае ўвесь драматызм і жудасць вайны. Творчасць Лужаніна вылучаецца высокім узроўнем моўнай культуры, уменнем па-майстэрску карыстацца ўсімі фарбамі слова.

Публіцыстычныя ноты моцна гучаць у творчасці Ю. Свіркі, для якога, здаецца, раней не надта характэрны быў публіцыстычны запал. А нядаўнія кнігі «Крэўнасць», «Аўтограф» сведчаць аб выразным росце яго грамадзянскасці.

З усяго гэтага можна зрабіць вывад, што публіцыстычная лірыка ў творчасці сучасных беларускіх паэтаў становіцца лірыкай праблемнай, аналітычнай, больш і больш грамадскі зацікаўленай. Таму расце яе ўдзельная вага ў фарміраванні ідэйнага і эмацыянальнага аблічча нашага сучасніка.

Як паказвае вопыт апошніх дзесяцігоддзяў, публіцыстычная паэзія — гэта далёка не заўсёды фарсіраванне голасу, напал страсцей, крык. Па форме яна можа выглядаць і спакойнай, але ўнутрана засяроджанай, узбагачанай значным сацыяльна-псіхалагічным зместам.

Звярніце ўвагу, скажам, на верш А. Лойкі «Перапіска». Грамадска-актуальнае значэнне яго — выразнае : гэта верш пра моладзь, яе працу, рамантыку. Паэт сцвярджае героя, адданага сваёй справе, чалавека-працаўніка, які ўмее адкрываць паэзію ў сваёй нялёгкай рабоце, у жыццёвых цяжкасцях. Гераізм хлопцаў-меліяратараў, пра якіх гаворыць паэт, не паказны, а глыбінны, так сказаць, спакойны, натуральны. Верш напісаны ў спакойнай манеры, з раскаванай інтанацыяй, празаізаваным радком.

Можна спаслацца ў сувязі з гэтым на многія вершы М. Танка апошняга часу. У вершы «Бухенвальд» лава перажыванняў клакоча ўнутры, знешне ўсё быццам бы спакойнае. Але толькі знешне: «Б'е Бухенвальда звон — мільёнаў стогн у сэрцы адклікаецца трывожна. Не знаю: ці, пачуўшы гэты звон, хто зноў да мірных сноў вярнуцца зможа».

Публіцыстычная паэзія ўвесь час узбагачаецца дасягненнямі іншых жанраў, пашырае свае выяўленчыя магчымасці.

Неправамерна было б, аднак, з гэтага рабіць вывад, што канчаткова зжыў сябе так званы газетны верш. Добрыя вершы, прысвечаныя значнай падзеі, даце, гадавіне, вельмі патрэбны зараз. А калі яны па-сапраўднаму сагрэты душэўным цяплом паэта, яго непадробным сардэчным хваляваннем, якое выклікала гэтая падзея, іх можна разглядаць як паэзію высокага мастацкага гатунку.

У сувязі з залатым юбілеем Саюза ССР хораша прагучаў верш А. Русецкага «Аб вялікай Радзіме», моцны сваім інтэрнацыянальным пафасам» Публіцыстычная інтанацыя аказалася тут вельмі прыдатнай:

Каласуе, жыве
люднай сілы Саюз!
Гэта з ім, Беларусь,
ты ў час лютай навалы
адстаяла імя сваё,
славу сваю,
жытам, вокнамі зноў
з папялішчаў паўстала.

Па-ранейшаму актуальным застаецца партрэтны верш як адзін з відаў публіцыстычнай лірыкі. Яго лепшыя ўзоры — паэзія высокай духоўнасці, нястомнага служэння народу. Такі, скажам, верш М. Танка «Памяці Івана Сікоры» — пра шырока вядомага беларускага садоўніка. Паэт малюе свайго героя не дэкларацыйна, а па ўсіх правілах мастацтва.

Развіццё публіцыстычнай паэзіі пайшло, такім чынам, па шляху далейшага ўзаемадзеяння, уплыву і ўзаемаўзбагачэння публіцыстычнага і мастацкага пачаткаў. Публіцыстычная лірыка робіцца больш філасафічнай, разважлівай. Прынамсі, у лепшай сваёй частцы.

Сапраўдная публіцыстычная паэзія жывіцца, паўтараем, значнай думкай, вялікімі пытаннямі, якія яна імкнецца ставіць. Апісанні, якімі б «прыгожымі», метафарычнымі яны ні былі, паслабляюць інтэнсіўнасць паэтычнага мыслення, зніжаюць яго публіцыстычныя вартасці. Пра гэта думалася пры чытанні аднаго з нядаўніх вершаў У. Ляпёшкіна, верша пра мову. Па форме — гэта публіцыстычны верш.

Мова матчына! Родная, звонкая,
Ты ўвайшла ў маё сэрца даўно,
То шапочаш бярозкаю тонкаю,
То шуміш залатой збажынай.
То трымціш жаўруковаю песняю
Над абсягам прыціхлых палёў,
Ручаінкамі звоніш прадвеснімі,
То курлычаш жальбой жураўлёў...

І далей у такім жа плане. Набор розных пахвал і кампліментаў у адрас роднай мовы. А ці трэба яны самой мове, якая вышэй за ўсе пахвалы і кампліменты. Памятаеце, як сказаў пра яе Расул Гамзатаў у вядомым сваім вершы «Родная мова»?

Кого-то исцеляет от болезней
Другой язык, но мне на нем не петь,
И если завтра мой язык исчезнет,
То я готов сегодня умереть.

Публіцыстычны верш тады добры, калі ён вынашаны і перажыты, калі ён — вынік глыбокага пазнання жыцця, правільнага разумення яго руху і перспектыў.

Перажытае... Яно па-рознаму, у рознай форме можа адбіцца ў вершы. У вершы П. Прыходзькі «Салдацкая дарога» пазнаецца яго аўтар-салдат, франтавік, што скончыў вайну ў Берліне:

Пераправы, плацдармы,
Балотная стынь да знямогі,
Акружэнні і маршы,
І песні, што ў бітвы вялі,—
Гэта ўсё ты спазнала,
Салдацкая наша дарога...
Бінтавала ты грудзі,
Збалелыя грудзі зямлі.

Салдацкая дарога, якая бінтавала збалелыя грудзі зямлі — на мой погляд, гэта вельмі значны, ёмісты асацыятыўны вобраз, якім паэт сказаў многае...

Не трэба даваць палёгку публіцыстычнай паэзіі. Патрабаванні да яе павінны быць такія ж высокія і строгія, як і да іншых жанраў.

Паэзія лічыцца адным з найбольш аператыўных жанраў літаратуры. Публіцыстычная лірыка — асаблівa. Ёй не патрэбна перадышка, яна ўся ў хадзе, «за валом огня, и плотней к нему,— як завяшчаў А. Твардоўскі,— сробел и отстал — крышка!». Гэта і ёсць, мне здаецца, крэда публіцыстычнай паэзіі, паэзіі высокага грамадзянскага абавязку.

## КАБ ПЕРАМАГЛА ГАРМОНІЯ

### *(Паэзія і некаторыя аспекты НТР)*

Прыгадваецца такі выпадак. Адзін мой даўні знаёмы-мінчанін, чалавек сталага веку, пенсіянер, неяк пры сустрэчы нечакана прызнаўся, што летам яму больш за ўсё хацелася б пакінуць межы горада і басанож прайсціся палявымі сцежкамі, дарагімі партызанскімі мясцінамі, начуючы пад адкрытым небам і перабіваючыся няхітрым дарожным харчам. З не ўласцівай яму сентыментальнасцю ён згадаў пры гэтым куванне зязюлі, водар палявых прастораў і золкасць рос...

Гэтую размову я ўспомніў, гартаючы паэтычныя старонкі беларускай перыёдыкі і кнігі, сустрэўшы вось гэтыя радкі Максіма Танка:

Трэба,<br>
Хоць раз у год,<br>
Прайсці басанож баразною за плугам,<br>
Каб аднавіць<br>
Сваю даўнюю сувязь з раднёй —<br>
Зямлёй, камянямі, травой.

Для М. Танка, з яго пастаянным напружаным імкненнем зразумець свой век, асэнсаваць яго праблемы і падзеі з вышыні накопленага вопыту, такая думка пра неабходнасць абнаўлення сувязей з «зямлёй, камянямі, травой» быццам бы і не новая, як няма нічога новага і ў сціплым жаданні майго знаёмага. Але сённяшні вопыт і перш за ўсё тое, што звязана са шматгранным паняццем навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, прымушае неяк па-іншаму ўспрымаць падобныя душэўныя рухі і ставіцца да іх.

У апошні час назіраецца ўсё ўзрастаючая цікавасць паэзіі (хоць і не толькі яе) да разнастайных працэсаў, якія выкліканы навукова-тэхнічнай рэвалюцыяй. НТР стала сапраўды альфай і амегай нашага часу, спарадзіўшы мноства праблем, якія маюць адносіны да ўсіх без выключэння сфер чалавечага жыцця. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя — гэтае змяненне характару працы, імклівае развіццё аўтаматыкі і электронікі, сродкаў масавай камунікацыі, інфармацыйны выбух, новыя крокі ў вывучэнні космасу, пераход да інтэнсіўных метадаў вядзення гаспадаркі — шмат у чым вызначае самаадчуванне і ўяўленні, перажыванні і густы сучаснага чалавека.

Цікава прасачыць, як адбіваецца навукова-тэхнічная рэвалюцыя на чалавечых характарах, у прыватнасці — калі гаварыць пра паэзію — на характары лірычнага героя, які нешта набываў і нешта,

відаць, страчваў па меры таго, як перад ім паўставалі ўсё новыя і новыя пытанні, праблемы, задачы.

Галоўны клопат паэзіі і яе трывога — і гэта асабліва заўважаецца сёння,— каб чалавек эпохі НТР не збядняўся духоўна, а каб пастаянна ўзбагачаўся. Якраз аб гэтым, мне здаецца, хацеў сказаць у вершы. «НТР» («Нёман», 1973, № II) А. Вазнясенскі, хоць яго думкі, здалося мне, не заўсёды дакладна «сфармуляваны»: «Да здравствует Научно-техническая, переходящая в Духовную!». Пра гэта ж, думаецца, разважае, «быццам вершы», лістота ў А. Куляшова («***Глыбокі лістапад у Белавежы...»): «Няўжо навек нас замяце няўвага сляпых завей, бесчалавечных душ?.. Хіба памром, гвалтоўнай смерці трапіўшы пад кола?». Сучасная паэзія, закліканая актыўна фарміраваць светапогляд, маральнае аблічча чалавека, па-свойму красамоўна сведчыць аб тым, што ўяўленне чалавека аб прыродзе мяняецца. Тут велізарную ролю адыгрывае навукова-тэхнічны прагрэс. «Те же нас радуют звезды небесные...» — сказаў некалі А. К. Талстой. Аднак сучасны паэт бачыць у зорным небе нешта істотна іншае, чым А. К. Талстой або, скажам, Ламаносаў («открылась бездна, звезд полна, звездам числа нет, бездне — дна»). Нават чалавек 30-40-х гадоў нашага стагоддзя не мог уявіць таго, што ўбачыў цяперашні паэт вачыма свайго героя — не толькі чорную бездань касмічнай прасторы, але і блакітнае ззянне планеты Зямля, адваротны бок Месяца і шмат іншага. Пашырыліся яго ўяўленні пра час і прастору.

Само паглыбленне нашых ведаў аб прыродзе становіцца прадметам паэзіі. У А. Русецкага ёсць верш «Адкрыццё» — пра паэтычна зразуметую роднасць чалавека і прыроды: «Нядаўна, з майго пальца ўзяўшы кроў і сок з далоні клёна, біяхімік адзнаку нашай крэўнасці знайшоў: здаўна з зялёным другам сваякі мы». Шукаючы роднасць дрэва і чалавека на, так сказаць, біяхімічным узроўні, паэт выходзіць на шырокія сацыяльна-гуманістычныя абагульненні. Яго цікавіць перш за ўсё філасофія самога факта:

Нібы сцягі, мне дрэвы агнявыя
шумяць аб нашай крэўнасці
лісцём...
Мы ўсе чырвоныя
і, як стыхія,
мы неадольныя,
бо мы — жыццё!

А. Русецкі настолькі ўражаны сваім адкрыццём, што не адчуў патрэбы ні ў дакладнай рыфме, ні ў строга класічнай арганізацыі рытмікі.

Час, што імчыцца наперад, уладна кліча за сабой, але нярэдка здараецца так, што паэт — часам таленавіты,— імкнучыся занатаваць у сваіх перажываннях яго бег, абмяжоўваецца фіксацыяй толькі знешніх прыкмет. Скажам, герой С. Гаўрусёва, звяртаючыся да сцюардэсы, раптам выяўляе нейкае вельмі дзіўнае жаданне: «Гатоў зрабіцца робатам, сланом з даўжэзным хобатам», толькі б яна звярнула на яго ўвагу, не глядзела «лакава, г. зн. прыязна-абыякава», як тлумачыць паэт гэта вынайдзенае ім самім слова. Зразумела, такія радкі выпадковыя ў змястоўнай і ўвогуле вельмі мэтанакіраванай паэзіі С. Гаўрусёва, але яны сведчаць пра часам несур'ёзныя яго адносіны да рэальных пытанняў, звязаных з навукова-тэхнічным прагрэсам.

Сёння пра навукова-тэхнічную рэвалюцыю, яе разнастайныя пазітыўныя вынікі гавораць, пішуць, спрачаюцца вельмі шмат. Актуальнай тэме ўзаемаадносін чалавека і прыроды ў эпоху НТР прысвяцілі свой вельмі змястоўны дыялог пісьменнікі Ч. Айтматаў і Л. Навічэнка («Литературная газета», 1 студзеня 1973 г.).

Рэдка які артыкул аб паэзіі абыходзіцца без таго, каб не адзначыць своеасаблівасць нашай эпохі, магутны ўплыў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі на светаўспрыманне і мастацкае мысленне паэта, на яго ідэйна-маральныя, грамадзянскія пазіцыі. Тое, пра што пісаў у адным з артыкулаў крытык Ал. Міхайлаў,— «Цяпер мяняецца і ўскладняецца характар лірычнай паэзіі, для яе мала аднаго толькі багацця адчуванняў і абаяння непасрэднасці. Мудры вопыт і аналітычнае мысленне становяцца адной з важнейшых умоў паэтычнага засваення хуткаплыннага жыцця»,— у значнай ступені звязана з разнастайнымі працэсамі развіцця навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Сёння ад паэта патрабуецца вострае адчуванне рэальнай праблематыкі сучаснага жыцця ў багацці яго новых асаблівасцей і прыкмет, уменне адлюстраваць іх глыбока, непаўторна, у сваім ракурсе бачання,— словам, быць на ўзроўні з векам, яго патрабаваннямі.

Добра вядома, што ва ўмовах сучаснай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі пытанні ўзаемадзеяння чалавека і прыроды набываюць асаблівую вастрыню не толькі ў сацыяльна-эканамічных альбо тэхнічных адносінах, але і ў маральных. Сёння стала звычайным, што не толькі ў спецыяльным, але амаль у кожным часопісе і газеце мы знаходзім матэрыялы пра стаўленне чалавека да прыроды, яе ўзаемаадносіны з навукова-тэхнічным прагрэсам. Узмацніўся, як мне здаецца, «прышвінскі» напрамак у нашай літаратуры. Але гэта толькі адзін з вынікаў уплыву сучаснага стану навукі і тэхнікі на развіццё мастацкай літаратуры. Праз чалавека — героя жыцця і героя літаратуры, які з'яўляецца суб'ектам і аб'ектам навукова-тэхнічнай рэвалюцыі,—

магутныя вытворчыя сілы грамадства аказваюць моцнае ўздзеянне на фарміраванне ўсяго комплексу эстэтычных ідэй і маральных прынцыпаў мастацтва і літаратуры. Ідэйна-маральны патэнцыял мастацтва, у сваю чаргу, валодае вялікай сілай уздзеяння на чалавека, на яго адносіны да навакольнага свету.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя, якая закранула ўсе галіны нашага быцця і ўсе бакі свядомасці кожнага з нас, шмат чаму навучыла. Немалая яе роля і ў тым, што менавіта яна, думаецца, падказала глыбей і пяшчотней любіць прыроду. Гэта яна, відаць, заразіла своеасаблівым жаданнем майго знаёмага; яго ж — былога партызана — як я разумею, у свет прыроды клікалі не толькі партызанскія ўспаміны.

Як жа адлюстроўваюцца «прыродныя адчуванні» чалавека ў сучаснай паэзіі, больш за ўсё беларускай, як яны фарміруюцца пад уздзеяннем навукова-тэхнічнага прагрэсу?

Умельства тонка адчуваць прыроду здаўна цанілася і лічылася за талент. Такім талентам валодалі многія беларускія паэты-класікі і іх маладыя паплечнікі. Вазьміце пачытайце кнігу нашых пісьменнікаў «Слова аб роднай прыродзе» (выд. «Народная асвета», 1968) і вы пераканаецеся ў гэтым. Пейзажная лірыка Купалы, Коласа, Багдановіча, Труса, Хадыкі і многіх іншых паэтаў тонка перадае настрой прыроды і душэўныя адчуванні саміх паэтаў.

Сёння мастацкае асэнсаванне тэмы прыроды мае свае адценні і ракурсы. Успрыняцце прыроднага — living рознае па ступені эстэтычнай актыўнасці — у сучаснай паэзіі ўсё часцей і глыбей пранізваецца выразнымі маральнымі адчуваннямі. У нядаўняй кнізе М. Танка «Хай будзе святло» чытаем такое прызнанне-здагадку:

Уся зямля гарыць у майскай квецені:
Колькі год я па ёй вандраваў!
А сёння спыніўся:
　　　　　　　　як жа ісці
Па вуснах пявучых траў,
Па жывых, раскрытых вачах лотаці?
Дык вось чаму птушкі лётаюць!

Такую здагадку мог нарадзіць толькі вялікі і шчыры эмацыянальны імпульс, цэлы ўсплёск у душы паэта, арганічна ўласцівы яму талент любіць прыроду, берагчы і шанаваць яе, як вялікае народнае багацце.

Справа, здавалася б, ясная, аднак і тут з'яўляюцца (і не малыя!) пытанні. Як гаворыць паэт: «Все мы любим зеленого друга, а зеленому другу туго...». Гэта з верша І. Шклярэўскага, дзе ёсць і такая думка:

Эта тема, до боли избитая,
Перепиленная на дрова,
Перепаханная, изрытая,
Слава богу, еще жива!

І далей, з вялікім публіцыстычным запалам:

Надо срочно спасать природу!
Охранять ее,
как свободу.
В чистоте,
как родную речь
И как душу свою, беречь.

Навукова-тэхнічны прагрэс, аказваецца, звязаў паэзію і ўсю літаратуру з новымі складанымі жыццёвымі праблемамі і псіхалагічнымі канфліктамі, многія з якіх знаходзяць сваё выражэнне ў паэзіі.

Уважліва ўслухоўваецца ў шум жыццёвага мора, углядаецца ў тое, што нясе яно чалавеку, П. Панчанка. Свае назіранні ён умее асэнсаваць у святле камуністычнага светапогляду, які дазваляе востра адчуваць асабістую адказнасць за жыццё, у тым ліку і за зялёны свет прыроды.

Прырода на дзіва праўдзіва —
Ці вые, ці хмельна пяе.
На свет яна нас нарадзіла,
А мы забіваем яе.

То шротам, то вострай пілою,
То труцім, то палім жыўцом…
Планету мы так прапалолі:
Патомкі заплацяць жыццём.

Альбо выпрамляем машынай
Рачулкі, што любяць пятляць.
І сохне цяністы ляшчыннік,
І мяккія сцежкі пыляць.

Так, чалавек дзейнічае як магутная сіла, ствараючы новыя вадасховішчы, мяняючы плыні рэк, выкарыстоўваючы нетры, асушваючы балоты, будуючы плаціны, ствараючы гіганцкія прамысловыя комплексы і г. д. Яго навукова-тэхнічная дзейнасць сягнула далёка за межы планеты, набыўшы глабальны характар. Але — трэба не забываць — прырода не пасіўны аб'ект панавання чалавека, і гэтае яго «панаванне» зусім не бязмежнае. На ўсякае ўмяшанне ў натуральны ход сваіх працэсаў прырода пэўным чынам рэагуе. Адказнасць за зялёны свет прыроды, за флору і фауну, за ваду, зямлю і паветра, за ўсё жывое на зямлі павінна стаць арганічнай часткай чалавечай

свядомасці. Сённяшняя паэзія бачыць у гэтым вялікую выхаваўчую праблему і імкнецца дапамагчы — сваімі мастацкімі сродкамі — яе вырашэнню. У другім месцы Панчанка скажа: «Не люблю я слова «пакарыцель», не люблю я слова «уладар», вось зямля зялёная — бярыце для жыцця, і працы, і для мар».

Крытык Яўгені Сідараў у дыялогу з паэтам Леанідам Мартынавым («Литературная газета», 1974, № 1) сказаў, што «даволі распаўсюджаныя ў нашай паэзіі і прозе элегічныя настроі... можна разглядаць як «пабочны прадукт» навукова-тэхнічнай рэвалюцыі...». Але гэта правільна толькі часткова. Сочачы за ходам НТР, паэзія знаходзіць шмат «матэрыялу для роздуму», не звязанага з беззваротным адыходам патрыярхальнага сельскага ўкладу.

Не буду спрачацца: магчыма, праблема ўздзеяння чалавека на прыроду падаецца ў Панчанкі і занадта абвострана, але пазітыўная праграма, якую прапаноўвае паэт, здаецца мне дастаткова прадуманай:

Прырода на дзіва праўдзіва...
І толькі скрані валуны —
Калоссе зашэпча пра дзіва,
Пачнуць хвалявацца ільны.

І толькі збяры ўсё каменне
З тваёй неўрадлівай зямлі —
І сам ты замрэш у здзіўленні:
Як дзякуюць шчодра палі.

Думаю, што гэтым і наступным радкам, адзначаным доўгім і ўпартым роздумам над жыццём, у нейкай меры памог паявіцца на свет выязны семінар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, што адбыўся ў Докшыцкім раёне пазалетась. Гэты раён дабіўся значных поспехаў ва ўздыме ўраджайнасці, у ачышчэнні палёў ад камення, якога там асабліва шмат. Наваленыя паабапал дарог крушні сведчаць аб праробленай працы і аб любові чалавека да зямлі. За яе палі шчодра дзякуюць.

Накормяць цябе і напояць,
Бо ты нарабіўся за трох...
Пяшчанае роднае поле
І крушні ля белых дарог.

І цікавае заканчэнне верша, якое паказвае глыбіню хвалявання і трывогі паэта, яго высокую грамадзянскасць :

Цяжкое ліпнёвае голле
Пад пылам схілілася ніц.
З трывогай сачу за Бягомлем:

Ідуць табуны навальніц.

Успамінаецца даўняя мара Паўлюка Труса, выказаная ім у далёкія 20-я гады. Звяртаючыся да роднай Беларусі, паэт пытаўся:

Край палёў...
О край,—
Калі ж ты станеш
Краем фабрык дымных
І машын?..

З таго часу непазнавальна змянілася індустрыяльнае аблічча рэспублікі. Змянілася і працягвае змяняцца — мы ўжываем усе захады, каб нашы фабрыкі і заводы, становячыся ўсё больш і больш магутнымі, былі менш «дымнымі»...

Калі мы гаворым пра традыцыі Маякоўскага ў беларускай паэзіі, перш за ўсё называем П. Панчанку. Пры ўсёй лірычнай «мяккасці» ў яго паэзіі вельмі баявы, наступальны характар. Адсюль яе публіцыстычнасць, сатырычная завостранасць. Але сёння ў Панчанкі, як і ў іншых паэтаў, пабольшала філасофскіх матываў і абагульненняў, якія вызначаюцца сацыяльнай значнасцю паэтычнай думкі.

Сучасная лірыка патрабуе высокай адухоўленасці, інтэлектуальнага напружання, эмацыянальнай паўнаты. Менавіта такімі якасцямі вызначаецца шырока вядомы верш П. Панчанкі «Белыя яблыні». Поспехі ў асваенні касмічнай прасторы будуць залежаць яшчэ і ад таго, гаворыць паэт, наколькі чалавек зберажэ і памнолсыць такія каштоўнасці, як каханне, чалавечнасць, дабрата, пяшчота, ласка, жаноцкасць... «І недзе ў космасе будуць прывабліва цвісці, як і ў нас, іх дзявочыя яблыні».

Праблемна-аналітычны падыход да супярэчлівых з'яў жыцця абумоўлены ў паэта ўзмацненнем асабіста грамадзянскага пачатку, які дазваляе глыбокі, па-партыйнаму страсны аналіз спалучаць з плённым, ідэйна багатым сінтэзам. П. Панчанка адносіны да прыроды асэнсоўвае ў цеснай сувязі з гістарычным вопытам народа: «Пакарэнне — гэта не карэнне будучых прасветленых эпох. Для стварэння лепшых пакаленняў трэба помніць гора ўсіх дарог». І тое, што раіць паэт, аб чым просіць, звяртаючыся да сучаснікаў і будучых пакаленняў, гучыць па-сапраўднаму гуманістычна:

Акіян і космас вывучайце
З добрым сэрцам,
А яшчэ прашу:
Пакідайце і буслу і чайцы
Больш вады і неба на душу.

Мне здаецца, што асноўны пафас паэта па сваёй накіраванасці супадае са зместам вядомых пастаноў ЦК КПСС, Вярхоўнага Савета і

Савета Міністраў СССР аб ахове прыроды, скіраваных на разумнае, ашчаднае выкарыстанне яе багаццяў.

Такая ж думка гучыць у кнізе Л. Дайнекі «Начныя тэлеграмы» (1974): «Давайце ж мірна ўсё ўладзім — за круглы стол з Прыродай сядзем». «Прырода», заўважце, ён піша з вялікай літары.

Вельмі многае з праблем сучаснага бурнага навукова-тэхнічнага развіцця знаходзіць адбітак у нашай паэзіі. Зразумела, гэты адбітак у кожнага паэта свой, ён адпавядае творчай індывідуальнасці, жыццёваму і грамадзянскаму вопыту. Цікава адлюстроўваецца гэтая праблематыка ў яе чалавечым, «светапоглядным» вырашэнні ў паэтычных вобразах А. Куляшова.

Гаворачы пра вершы, якія склалі «Новую кнігу» А. Куляшова (1964 год), А. Твардоўскі пісаў: «Якім, напрыклад, натуральным, нязмушаным чынам уваходзіць у кола яго лірычнага роздуму, становіцца прадметам паэзіі такая навізна, як сучасныя ўяўленні аб сусвеце, што сталі значнай часткай нашага светаадчування ў гады вялікіх поспехаў у вывучэнні космасу». Куляшоў мысліць катэгорыямі шырокімі, вечнымі, дасягаючы ў сваіх вобразах высокай абагульненасці з'яў рэчаіснасці. У гэтым сэнсе ён плённа працягвае лепшыя традыцыі «касмічнай» лірыкі 20-х гадоў, даючы ім новае жыццё. Асноўны змест яго нядаўніх твораў — паэм «Цунамі», «Далёка да акіяна», «Варшаўскі шлях», зборнікаў вершаў «Новая кніга», «Сасна і бяроза» — складае своеасаблівы глыбока філасофскі роздум сталага і мужнага чалавека над карэннымі праблемамі сучаснага быцця, над праблемамі ўзаемаадносін чалавека, прыроды, часу. Тут атрымалі далейшае развіццё характэрныя для ўсёй нашай паэзіі яе сённяшнія асаблівасці — пашырэнне ўяўленняў аб свеце, навізна адчування прасторы і часу, павелічэнне ўдзельнай вагі лірычнага пачатку, узбуйненне асобы лірычнага героя, узбагачэнне яго духоўнай змястоўнасці. Таму так канкрэтна і хвалююча гучыць размова паэта з акіянам, Зямлёй, часам, вечнасцю: «Адвечны час з нябачных нам дарог глядзіць на нас, нібы на муравейнік: вось-вось, здаецца, возьме ў рукі венік і вымеце, як смецце, за парог». Паэт увесь час схіляецца да канфліктных сітуацый, каб ярчэй «высветліць» гуманістычныя каштоўнасці эпохі.

Скажы мне, час, а чый дасціпны розум
Тады сякерай грымне ў цішыні
Тваіх лясоў і, па кругах на пні,
Гады палічыць соснам і бярозам?..

Не ўладаром сваёй бязлюднай эры
Хадзіць ты будзеш, а сляпым старцом,

Пакуль для пушчаў, песень і сякеры
Мы новым не адродзімся жыццём.

Паэтычнай сістэме А. Куляшова ўласціва маштабнасць мыслення. Герой Куляшова вялікі як асоба, гэта — магутны чалавек, але ён вельмі пяшчотны да роднай зямлі, клапоціцца пра яе фауну і флору.

Аб гэтым жа клопат Максіма Танка, які паэт выказаў уласцівымі яму сродкамі непаспешлівага верлібру, напоўненага журботным роздумам:

Распалілі касцёр.
І не бачым, як дарогай дыму,
Што цягнецца ў неба,
Назаўсёды ад нас адыходзяць сябры —
Хвоі, бярозы, асіны...

Некалі пад сінтэтычнаю елкай
Дзед-Мароз ці мы самі
Будзем расказваць дзецям
Пра нашых сяброў
І са слязамі ў вачах
(Бо мы — вельмі чуллівыя людзі)

Слухаць, як шуміць галасамі
Загубленых дрэў
Магнітафонная плёнка.

*(«Дарогай дыму»)*

Савецкая паэзія за сваю гісторыю зведала шмат захапленняў. Так, адзін час яна захаплялася «жалезнымі кветкамі» і «сталёвым салаўём».

У 20-я і на пачатку 30-х гадоў у крытыцы існавала думка, што для савецкай паэзіі не ўласціва цікавасць да «ціхага краю» маленства, прыроды, да традыцыйнага пейзажу, што ёй не патрэбна пачуццёвасць, бо сфера яе дзеяння — тэмы велічныя, індустрыяльныя, высокія. Аказваецца, і тое і другое можна спалучыць, як спалучыў яго наш (хоць пакуль што не заўсёды натуральна) час — сярэдзіна XX стагоддзя. Зразумець «галактык мову» і тое, «думае аб чым сцяжына ў полі, спелы бор сасновы, рачулка, што прыцмоквае ўначы...» (Г. Бураўкін) — неабходнасць, якая ўдзельнічае ў фарміраванні свядомасці і светапогляду сучаснага чалавека, яго асобы, пачуццяў патрыятызму.

Шчаслівы той, хто ўмее размаўляць з прыродай, слухаць яе рух, дыханне, галасы, як гэта ўмее, скажам, Кастусь Кірэенка. Прыгадаем яго цудоўны верш «Слухайце ластавак» (1971):

Адкіньце ўсё —
І смутак і жальбу.

Забудзьце крыўду
Позіркаў няласкавых.
Станьце каля хаты
                    пад вярбу,
Слухайце ластавак.

«Размова» з ластаўкамі ачышчае і ўзнімае чалавека маральна, узбагачае яго ўспрыняцце свету. Але трэба ўмець іх слухаць...

Слухайце,
Як скрутка шалясцяць
Крылцы іх,—
На льдзінкі голас колецца.
Ластаўкі заўтра адляцяць,
Сёння на радзіму яны моляцца.
Моляцца на ціхую павець,
На страху,
замшэлую і цёплую.
Ой, далёка ластаўкам ляцець!
Ці абзвоняць свет
жывымі кроплямі?
Ці прысудзіць лёс ім
Дасягнуць выраю,
Спаткаўшыся з наваламі?
Слухайце! —
Вось яны пяюць...
Слухайце! —
А вось ужо й не стала іх...

У гэтым малюнку замілаванасці няма непатрэбнай сентыментальнасці, а сузіральнасць паэта пранікнута вялікім эстэтычным зместам. Асабліва кранае шчырасцю апошні радок паэта, які — у адказ на запытанне «Можа, ты хоць ведаеш, скажы, чалавек, дзе ластаўкі падзеліся?» — прызнаецца: «Я і сам іх добра не наслухаўся...».

У так званай пейзажнай паэзіі заўсёды была небяспека залішняй апісальнасці, халодна-спакойнага сузірання, ружовага спакою. Сёняшняя паэзія, як і ўся літаратура, патрабуе праблемнага падыходу да жыццёвых з'яў. Мы шмат спрачаемся аб грамадзянскай паэзіі, справядліва звязваючы яе з сучаснасцю. Што ж такое грамадзянскасць у паэзіі? Які верш можна лічыць грамадзянскім? Ці можа быць (даўняе пытанне) грамадзянскім верш прыродаапісальны, пейзажны? Справа тут, відаць, у дзейснасці пазіцыі паэта, у яго філасофскім і мастацкім светапоглядзе, у яго падыходзе да «пейзажу».

Не ведаю, як на каго, а на мяне асабіста ў новай кнізе В. Віткі «Праводзіны лета» найбольшае ўражанне зрабіў па-сапраўднаму паэтычны верш «Спяшайцеся» з яго надзённым клопатам пра абарону

і захаванне прыроды і ўсяго жывога на зямлі. Паэт раіць і заклікае спяшацца «ў поле, у луг, у лясы — запісваць птушыныя галасы». Сам па сабе такі заклік нікога не можа здзівіць, ды паэт на гэта і не разлічвае. Ці мала іх было і ёсць, тонкіх знаўцаў і аматараў паслухаць салаўя, зязюлю, перапёлку, крыжадзюба ці нават канарэйку, якую цяпер ужо амаль ніхто, здаецца, не лічыць «мяшчанскаю птушкай». А са з'яўленнем магнітафона кожны можа запісаць песню любімай птушкі. Сам паэт тонка ведае гэтую справу:

Яшчэ на дасвецці, на самым золку,
Зловім на плёнку
Мы перапёлку.
Няхай астанецца на стужачцы хоць
Заклік на памяць:
«Ідзі палоць!»

І паглядзіце, як хораша расказваецца ў вершы пра гэту маленечкую прыгажуню — гераіню многіх і многіх фальклорных песень:

Нямала за век яна перапалола,
Нямала ножачак перакалола
Горкім асотам, рыжаю піжмаю,
Родная, любая, ты ж мая, ты ж мая...
Колькі нам дзетак пакалыхала,
Колькі ў дарогу нараткала...

Не менш яркімі фарбамі малюецца «самы народны паміж птушак» — салавей. Нават калі б у вершы былі толькі гэтыя цудоўныя, сагрэтыя народнай паэзіяй радкі, то і тады яго можна было б, на маю думку, смела залічыць да ліку творчых удач В. Віткі. Верш уражвае сваёй грамадзянскай далучанасцю да сённяшніх нашых спраў і клопатаў.

Зрэшты, Вітка даўно вядомы як гарачы прыхільнік і абаронца прыроды. Яшчэ ў кнізе «Ружа і штык» (1958) быў змешчаны, помніцца, цікавы верш «Пра некаторых аматараў прыроды», так званых турыстаў «з свінячай натурай», для якіх «уся цана прыродзе — свая града ў агародзе», астатняе — «без права і без закона».

Знаўца яркай палітры,
Ён не міне палянкі,
Каб не раструшчыць паўлітры,
Не кінуць на памяць бляшанкі!

Прырода ў паэта быццам адухоўлена сівою памяццю народа, любоў да яе павялічвае гуманістычнае гучанне верша:

Сюды, калі ласка, кінаапарат.
Бачыце, выстраіліся на пожні

Сосны на свой урачысты парад,
Баюся, што на апошні.

Даўно пералічаныя камлі
Прагны сухмень аблізвае.
Якія бары былі на зямлі —
Пабачыце ў тэлевізары.

Прырода — наша агульнае грамадскае багацце, крыніца прыгажосці і эстэтычнай асалоды,— яшчэ і яшчэ раз даводзіць паэт. Разам з тым ён разумее, што справа не ў тым, каб пакінуць «усё як ёсць», ён не падзяляе і не апраўдвае падобнага пункта погляду, абараняючы — і гэта добра адчуваецца ў яго кнізе «Провады лета» — разумныя, беражлівыя адносіны да свету прыроды,

Тэма прыроды... Не раз і не два менавіта з ёю крытыка звязвала паняцце дробнатэм'я і беззмястоўнасці. І дарэмна. Справа — у самім паэце, ва ўнутранай, душэўнай значнасці і велічыні яго асобы, у арганічнай зрошчанасці яе са сваім часам, з яго вядучымі сацыяльнымі сіламі і тэндэнцыямі. Якраз тут праходзіць мяжа паміж паэзіяй вялікай грамадскай актыўнасці і паэзіяй малазмястоўнай, нягледзячы на знешнюю «прывязанасць» да сучасных праблем.

Прагрэс ва ўсіх галінах даецца нялёгка, мае свае выдаткі. І яны таксама прыцягваюць увагу паэтаў. Арыгінальнае, я сказаў бы, іранічна-парадаксальнае асвятленне крайнасцей праблемы мы знаходзім у нядаўнім цыкле вершаў М. Танка (1971):

У кнізе наведвальнікаў музея
Нейкі песіміст пакінуў запіс:
«Пакуль не ўсю атруцілі
планету
Рознымі хімікаліямі,
Добра было б, каб ужо сёння
Экспанавалася хоць адна
жменька
Натуральнай зямлі».

Пра вельмі сур'ёзнае гаворыць у гэтых, з добраю доляю гумару, радках паэт. Верш прымушае задумацца, але не сее безнадзейнасць. Апошні момант, на маю думку, мае прынцыпова важнае значэнне ў мастацкім асэнсаванні праблем навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Тут патрэбна цвярозасць розуму, рэальны погляд на рэчы. Бо сум, элегічнасць мала што ў дадзеным выпадку могуць праясніць. Менавіта элегічнасць, як я думаю, паслабляе творчыя пазіцыі М. Арочкі — аўтара вельмі цікавай кнігі «Кветкі бяссмертніка» — у адным з яго вершаў:

Відавочцы,
пішыце пра сум жураvoў
(Яны ўсё радзей плывуць
караванамі
Паўскрай гарадоў,
Над імшарамі заараньымі),
Пра досвіткі
яшчэ не дымныя,
Пра лясы парадзелыя,
ды яшчэ неабдымныя,
Пра капэлы птушыныя,
васількі ў жыце —
Пішыце,
пішыце...
Проста —
На ўспамін нашчадкам.

Не трэба, як кажуць, панікаваць. Трэба верыць, як П. Панчанка, што белыя яблыні будуць цвісці некалі і ў космасе. Ды і сам Арочка ў другім вершы той жа нізкі збіраецца садзіць яблыньку:

На машыне прывезлі
саджанцы,
Накалелыя ў першы мароз.
Выбіраю яблыньку-ўдаліцу,
Як нявесту дзе-хто —
навырост!

Праўда, гэтае «нявесту — навырост» не зусім да месца. Можна кашулю ці што іншае выбіраць навырост, толькі не нявесту. Аднак паэтычнае прыпадабненне яблынькі да нявесты не выпадковае: яблынька нечым вельмі дарагая паэту, дарагая, як нявеста. Нездарма ж далей у вершы і яблынька і нявеста нібыта зліваюцца ва ўспрыняцці паэта, хоць зразумела, што гаворка ідзе пра яблыньку...

У сувязі з крытыкай некаторых выдаткаў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі хочацца ўспомніць і пра нядаўнюю паэму А. Вярцінскага «Начны бераг».

Твор гэты прэтэндуе на праблемнасць гучання. Аўтар на прыкладзе ракі Сож хоча паказаць, да чаго прыводзяць занадта «валявыя» адносіны да прыроды, да эксплуатацыі яе багаццяў.

Для нас прырода — маці, хоць
і маці строгая, суровая.
Якія ж мы, калі з мячом
ідзём, накшталт варожай раці,
скараць і рабаваць багацці
(чые багацці? — роднай маці!).

Сук, на якім сядзім, сячом!

Гэта правільна, але выхад паэта на праблему, як вынікае з паэмы, з'яўляецца чыста выпадковым. На самай справе, а калі б не адбылося так, што герою паэмы не хапіла месца ў гасцініцы і каб ён не вымушаны быў правесці ноч на беразе Сожа, дык і не заўважыў бы, што «плёнка брудна-тлустая пагойдваецца на вадзе». Не ўпрыгожваюць паэму і такія радкі: «прыйшоў на пушкінскі я круг», следам за якімі цытуюцца словы Пушкіна «Восстань, пророк, и виждь, и внемли». І ёсць усё-такі ў паэме — пры паўторным чытанні ў гэтым пераконваешся — значная доза экалагічнага песімізму, заснаванага на нейкай асабістай крыўдзе:

Адплата йдзе...
Чытаю ў прэсе
(ты не чытаеш, Сож, газет?):
«На самай воднейшай з планет
вады хапаць не будзе прэснай...»

Была, плыла, цякла вякамі,
і больш не будзе тых крыніц,
і будзе ўся зямля, як каня,
прасіць адчайна: «Піць-піць-піць!»

Думаецца, не варта кідацца ў падобныя прароцтвы, яны — не плённыя... Гаворачы пра тое, як — часам даволі складана — адлюстроўваецца ў паэзіі ўзаемадзеянне сённяшняга чалавека і прыроды, нельга абмінуць паэму В. Зуёнка «Сяліба», прынамсі адзін з яе матываў, таму што ўся «Сяліба» — паэма «пра лёс і славу роднага краю» — заслугоўвае асобнай гаворкі. Маецца на ўвазе правільнае і глыбокае разуменне паэтам адносін сучаснага чалавека да прыроды. «Саперніцтва з прыродай — непазбежнасць, як непазбежнасць — розум у прыродзе»,— гаворыць паэт. Аднак, пры ўсім пры тым, «саперніцтва» — яно не бой крывавы... Хто, як не мы, ёй у бядзе паможа, калі парушаецца гармонія ў прыродзе? Можа дапамагчы толькі чалавек і перш за ўсё камуніст:

Мы, камуністы,
з бою —
як салдата —
Выносім на руках сваіх
планету.
Мы раны забінтуем ёй, загоім,
Перададзім — блакітную —
нашчадкам...

У гэтых радках адкрыта публіцыстычна выказаны актыўна-ваяўнічая грамадзянскасць паэта, вера ў будучыню нашай цудоўнай блакітнай планеты, вядучыя сацыяльныя сілы эпохі.

Праблемы навукова-тэхнічнага прагрэсу і яго вынікаў у такім, у прыватнасці, пытанні, як узаемаадносіны чалавека і прыроды, ажыўлена абмяркоўваюцца ў паэзіі. Гэтае абмеркаванне мае часам, як мы пераканаліся, занадта гарачы характар. Важна аднак, каб пры гэтым не гублялася глыбіня, сур'ёзнасць разумення праблемы, удумлівыя да яе адносіны.

## «ЯНЫ ПРЫХОДЗЯЦЬ САМІ...»

### *(Нататкі аб маладой паэзіі)*

Их не ждут. Они приходят сами.
И рассаживаются без спроса.
И ломающимися голосами
Задают неловкие вопросы.

1

Гэтыя радкі рускага савецкага паэта Д. Самойлава ўспамінаюцца мне кожны раз, калі я думаю пра маладую паэзію. Праблема паэтычнага маладняка, яго выхавання і творчага росту — вечная праблема літаратуры. Праўда, кожная эпоха ставіць яе па-свойму, у залежнасці ад умоў і патрабаванняў часу. Наш час вымагае ад кожнага пісьменніка шырокага, па-сапраўднаму грамадзянскага погляду на сваю справу, актыўнага ўдзелу ў выкананні задач камуністычнага будаўніцтва, якія намеціў XXIV з'езд партыі. Сёння, як указвалася ў Справаздачным дакладзе ЦК XXIV з'езду КПСС, роля літаратуры ў фарміраванні светапогляду савецкага чалавека, яго маральных перакананняў асабліва ўзрастае. Літаратура заклікана дзейна ўмешвацца ў жыццё, дапамагаць сцвярджэнню новага, прагрэсіўнага, быць чуйнай да чалавека, да яго штодзённых турбот. Сённяшні пісьменнік не толькі літаратар, ён разам з тым актыўны грамадскі дзеяч, грамадзянін у самым высокім сэнсе, слова якога — мастацкае слова — з'яўляецца грамадзянскім учынкам.

Наша жыццё — багатае і разнастайнае, як ніколі. І вельмі складанае. Раскрыць усю складанасць працэсаў, якія ў ім адбываюцца, улавіць галоўныя тэндэнцыі яго развіцця літаратура зможа толькі тады, калі будзе мысліць на сучасным узроўні. Галоўная прыкмета сучаснага мастацкага мыслення — пры ўсёй шырыні індывідуальных стыляў і форм — гэта глыбіня аналізу, імкненне дайсці да самых каранёў з'явы, ускрыць яе найглыбейшыя прычыны. Калі ў мастака развіты слых і чуйнасць на грамадскія праблемы, калі ён здольны іх усведамляць і глыбока асэнсоўваць, калі ў ім жыве чалавек-грамадзянін,— значыць, у нашым разуменні, гэта мастак сучасны. Як, скажам, Пімен Панчанка, які яшчэ раз паказаў вышыню сваіх мастацкіх крытэрыяў у двух падборках вершаў апошніх гадоў. Засяроджанасць на вострых праблемах дня, шырыня абагульненняў і бязмежная шчырасць — вось што заўсёды кранала нас і кранае ў паэзіі Пімена Панчанкі.

Вечная незадаволенасць —
У сэрцы балючым рэхам.
А можа, гэта няздольнасць
Угнацца за ярасным векам?
А можа, лепей, чым гнацца
За простай і яснай ісцінай,
Цішком над гатовым згінацца
Ці слацца апалым лісцем?
Толькі не гэта, не гэта,
Не здолею — кропка. Труна.
Іншыя будуць паэты
Сэрцы людскія кранаць...
Я ганаруся партыяй,
Ды мала цяпер прысяг.
Чаго — пытаюся — варты я?
На якой вышыні мой сцяг?

Вершы Панчанкі грунтуюцца і на асабістым вопыце паэта, і на гістарычным вопыце народа, які асэнсоўваецца паэтам вельмі асабіста. Вершы «пра сябе», такія, як, скажам, «...І мяне хвароба тузанула», мяжуюць з глыбокім роздумам пра лёс Айчыны, яе культуры, яе прыродных багаццяў («Крышталічны хрыбет», «Наша энцыклапедыя», «Грыфельныя дошкі»). І ўсё гэта прасякнута глыбокім пачуццём чалавечнасці, клопатам аб чалавечым шчасці, маральнай чысціні, сумленнасці. Чытаеш, і аж сэрца шчыміць.

Па вершах П. Панчанкі, як і іншых паэтаў старэйшых пакаленняў — П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова, М. Лужаніна, К. Кірэенка А. Пысіна, М. Аўрамчыка,— мы можам меркаваць, як расце і духоўна ўзбагачаецца свет сучаснай паэзіі, як адлюстроўваецца ў ім грамадзянская самасвядомасць народа, навізна нашай сацыялістычнай рэчаіснасці. Аднак наша сённяшняя гаворка — не пра паэтаў старэйшага і сярэдняга пакаленняў, а пра тых, хто пакуль што выдаў усяго адну-дзве кнігі, а то і не выдаў ніводнай, абмяжоўваючыся часопіснымі альбо газетнымі публікацыямі.

У 1972 годзе з другой кніжкай выступілі: Уладзімір Скарынкін — «Гукавы бар'ер», Уладзімір Карызна — «Святло ліўня», Віктар Ракаў — «Акно ў зялёны сад», Казімір Камейша — «Мембрана», Леанід Дайнека — «Бераг чакання», Яўген Крупенька — «Нядзеля»; з першай Уладзімір Фамін — «Падслухаў сэрца», Уладзімір Дзюба — «Вуліцы без назваў», Мікола Мінчанка — «Зялёны звон», Марыя Шаўчонак — «Белая ластаўка». Першую кнігу паэзіі «для дарослых», назваўшы яе вельмі адказна — «Жыццё», даў Міхась Парахневіч, які раней пісаў пераважна вершы для дзяцей і апавяданні. Упершыню заявілі аб сабе

ў рэспубліканскім друку В. Мамойка, Л. Аноп, У. Някляеў, В. Мурашкін, Б. Беліжэнка, В. Пілецкая, Л. Русілка, Н. Загорская, І. Лашутка, В. Шыханцоў, У. Кунцэвіч...

Як бачым, прыток свежых сіл у літаратуру не спыняецца. Гэта, вядома, добра, хоць сам па сабе такі шырокі паток вершаў тоіць у сабе і пэўную небяспеку. Не так даўно ў часопісе «Вопросы литературы» быў змешчаны артыкул М. Ісакоўскага пад назвай «Доколе?..».

«Я з усёй сур'ёзнасцю думаю,— пісаў Міхаіл Васільевіч,— што калі ў нас у краіне з такой жа інтэнсіўнасцю і ў такой жа колькасці, як і цяпер, будуць выходзіць зборнікі вершаў, калі ў часопісах, альманахах, газетах, радыё- і тэлеперадачах будзе з'яўляцца такая ж незлічоная колькасць вершаў... калі падобныя з'явы, паўтараю, будуць працягвацца і нават узрастаць у сваёй колькасці, то ўсё гэта непазбежна ператворыцца ў вельмі вялікае бедства, калі яно ўжо не ператварылася ў яго».

Хоць паважаны паэт выказаў у сваім артыкуле шмат трывожнага і набалелага, аднак поўнасцю пагадзіцца з ім нельга. Пры ўсіх сваіх недахопах паэзія маладых дае нам уяўленне аб сучаснай моладзі, яе сацыяльнай актыўнасці, інтарэсах і мэтах, якога мы не пачэрпнем з іншых крыніц. А ў тым, што вельмі многія пішуць вершы, што многа вершаў друкуецца, ёсць і бясспрэчныя дадатныя бакі. Людзі хочуць жыць прыгожа і думаць прыгожа. А графаманаў заўсёды было шмат. Нам трэба ўзнімаць ідэйна-мастацкія крытэрыі літаратурнай прадукцыі. Менавіта на гэта звяртае ўвагу пісьменніцкай грамадскасці нядаўні партыйны дакумент — пастанова ЦК КПСС «Аб літаратурна-мастацкай крытыцы», дзе гаворыцца аб стварэнні такой абстаноўкі, якая выключала б праяўленне ў крытыцы кампрамісных адносін да ідэйных і мастацкіх недахопаў, суб'ектывізму, прыяцельскіх і групавых схільнасцей, прадузятых ацэнак асобных мастакоў і твораў.

2

У паэзіі (пры наяўнасці, вядома, таленту) вядучую ролю іграе асоба самога паэта. «Каб стварыць паэму, ты павінен стварыць сябе, удасканальвай сваю духоўную асобу...»,— вучыў братоў-паэтаў Уолт Уітмен. Кожны паэт паказвае ў творы самога сябе, нават калі ён гэтага не хоча. Асоба паэта — гэта і свой ракурс бачання, і тэмперамент, і глыбіня асэнсавання, і многае іншае. Талент — рэдкасць, нездарма яго завуць «божай іскрай», ён першая, неабходная, але не адзіная ўмова для творчасці: у літаратуры велізарнае значэнне мае грама-

дзянская асоба пісьменніка. Таму, гаворачы пра асобу пісьменніка, мы будзем мець на ўвазе перш за ўсё яе грамадзянскі змест.

Гётэ ў пралогу да «Фауста» гаварыў пра «імкненне да ісціны» як пра асноўнае ў творчасці паэта. Каб сцвердзіць сваю ісцінную сутнасць, паэт павінен адмовіцца ад дробязей, пераадолець асабістую абмежаванасць — дзеля адлюстравання ісціны, праўды. Сапраўдная сутнасць паэта не столькі ў тым, чым ён розніцца ад астатніх, колькі ў тым, чым ён родны астатнім. Ён — не проста індывід, ён — магутная, вялікая асоба. Ёсць гэтая асоба — ёсць паэзія, адсутнасць асобы — заўсёды адсутнасць значнага паэтычнага зместу.

Вось перада мною зборнік вершаў У. Карызны «Святло ліўня». У анатацыі да яго сказана: «...прыгажосць роднага краю, шчырасць пачуццяў і чысціня чалавечых адносін — вось галоўнае, што хвалюе маладога паэта». Звернемся да саміх вершаў:

> О край працавіты мой,
> Край вясельны,
> Мне сыграць бы табе
> На клавішах зор вясенніх!

Жэст паэта — яўна ненатуральны, вобраз надуманы, выпадковы. Верш расквечаны так званымі паэтызмамі і даволі сцёртымі штампамі: край працавіты, вясельны, зоры вясеннія, гаі салаўіныя, хвалі сінія і г. д.

> Мне сыграць бы табе
> На арфах гаёў салаўіных
> Пад апладысменты
> Хваль азёрных, успененых, сініх!
>
> Нават, каб памагалі
> Усе пеўчыя птушкі аднойчы,

(чаму толькі аднойчы? — У. Г.)

> Ручаі і крыніцы
> З аркестрам вясновае ночы,—
> І тады б я не выказаў
> Сотай долі любові сыноўняй,
> Ад якой маё сэрца
> Свеціцца поўняй!

Паэт хацеў выказаць сваю любоў да радзімы, але збіўся на агульшчыну, на штамп. Чаму так атрымалася? Думаецца, правільна гаварылася, маючы на ўвазе падобныя выпадкі, у дыялогу В. Бечыка і А. Вярцінскага («Літаратура і мастацтва», 9 чэрвеня 1972 г.): «Відаць, гэта той выпадак, калі мы маем справу з тымі самымі «птушынымі

песнямі», пра якія здзекліва гаварыў В. Бялінскі, сцвярджаючы грамадскае прызначэнне паэта».

На жаль, падобныя ў эстэтычным плане да толькі што прыведзенага і многія іншыя вершы Карызны — «Зялёная мошачка слабай іскрой...», «Паклаўшы руку на сэрца...», «З усіх шляхоў...», «Ліпень гарачынёю ліпне...», «У бары» і г. д. З іх мы даведваемся, што аўтар любіць луг, лес, поле, сваю вёску, але ўсе гэтыя рэаліі быцця падаюцца безадносна да сучаснасці, да светаадчування сучаснага чалавека.

Хай даруе нам Карызна, але ў яго вершах шмат банальнага, неабавязковага і наіўнага. Паэт неяк нават ваяўніча абараняе апісальнасць і драбнатэм'е:

Мы часта вершы пішам
Надта модныя,
Чытаючы іх,
зломіш галаву, (? — У. Г.)
Яны ж пра мілыя
І гэтакія родныя —
Нябёсы і крыніцы срэбраводныя,
Бацькоўскай сцежкі мяккую жарству.

Усе вершы — пра крыніцы? Што хоча сказаць Карызна — каб сябры-таварышы пісалі прасцей?

І вось з гадамі —
мы ўжо расфасоўшчыкі
Паэзіі (? — У. Г.) —
тут дабрата,
тут зло,
З гадамі мы,
глядзіш,—
рэгуліроўшчыкі:
Даём чырвонае,
зялёнае святло.

Нашто гэты перанос з радка ў радок? Какецтва?

А што б сказалі нам,
каб гаварылі,
Героі вершаў — неба, сасnякі?
(Сасnякі — героі вершаў? Нешта зусім новае...— У. Г.)
А кім бы нас,
урэшце,
палічылі,
Каб пачыталі вершы,
землякі?
Яны ж для нас садоўнікі (? — У. Г.)

Навечна,
І верыць ім патрэбна, далібог...
Паэзіі патрэбна чалавечнасць,
А чалавеку —
цеплыня дарог.

Садоўнікі, дарогі — пры чым тут яны? І наогул — што тут да чаго?.. Краявіды, пейзажы, агульныя разважанні — гэтага мала: патрэбны сур'ёзныя грамадзянскія адносіны да рэчаіснасці.

Верым, упэўнены: Карызна здольны на большае. Змог жа ён вельмі цікава расказаць пра звычайнае ў вершы «Зялёнае шкельца». Заслугоўвае ўвагі і яго паэма «Гром над дарогай»...

Патрыятычная тэма, як і тэма кахання, дружбы, прыроды, заўсёды была вельмі прывабнай для маладых паэтаў. І не дзіўна: яны хочуць сарыентавацца перш за ўсё ў гэтых вялікіх чалавечых каштоўнасцях, зразумець іх месца ў самім жыцці. Але ўспамінаюцца правільныя, на наш погляд, словы аднаго нашага паэта пра Радзіму: «Усю яе, ад ніў і да палацаў, апелі мы, ды мала песень тых». Справа не толькі ў тым, каб прызнавацца і клясціся Радзіме ў любові і славіць яе песняй. Поспех спадарожнічаў тым паэтам, хто асэнсоўваў тэму Радзімы як вечную катэгорыю, у цеснай сувязі з задачамі дня. Блок называў пісьменнікаў «самымі дакладнымі і самымі галоўнымі органамі пачуццяў Радзімы». «Мы — не сляпыя яе інстынкты, а яе сардэчны боль, яе думы, яе валявыя імпульсы»,— гаварыў ён.

Лепшы сродак даказаць Радзіме, народу, партыі сваю любоў — па-мастацку паўнакроўна паказаць наш сённяшні дзень ва ўсёй яго разнастайнасці і складанасці, ва ўсім багацці фарбаў і адценняў. Паэзія сённяшніх маладых у значнай сваёй частцы дэкларатыўная і .абстрактная. Пачуцці слаба асэнсаваны, іх яшчэ трэба, як кажуць, даказаць. Недахопы, характэрныя для вершаў Карызны, тыповыя для многіх.

Надта кволыя пакуль што многія вершы Міколы Мінчанкі, які шмат піша пра Радзіму і каханне (зборнік «Зялёны звон»). Па сваім тоне і стылі яны падобны да вершаў Карызны. Тая ж апісальнасць, легкадумнасць. У выніку — мастацкая бездапаможнасць: замест яркіх пачуццяў — чуллівасць, млявая задушэўнасць, кволая настраёвасць. А часам — і зусім бяздумнасць, як, скажам, у вершы «Атака»:

Над полем грознае «ура!» —
Ідуць у бой сыны Айчыны.
Ужо атакі не стрымаць:
Мацней металу нашы грудзі...
Не разбярэш: на снезе мак
Ці кроў?

Навошта гэта, людзі?!

У такой сітуацыі, калі ў бой пайшлі сыны Айчыны, апошняе пытанне — увогуле недарэчна.

Непараўнальна лепш выглядаюць тыя радкі М. Мінчанкі, дзе ён думае пра тое, што «не на трох кітах зямля трымаецца — на далонях мацеры маёй».

Гэта праўда, што паэзію жывіць непасрэдны вопыт, пачуццё, перажыванне. Аднак, калі эстэтычнае пазнанне гэтым і абмяжоўваецца, не ідзе далей, ад адчуванняў да абагульненняў, тыпізацыі, твор застаецца чымсьці недаспелым, нявырашаным, грамадзянская індывідуальнасць аўтара ў ім не адбіваецца.

Статычнай апісальнасцю грэшаць вершы Э. Зубрынага. Ёсць у іх любаванне прыродай, восенню, барвяны клён і жураўліны сум, скалелыя аблокі, апошнія гронкі далёкага лета... Уся гэтая «рамансавасць» можа каго-небудзь і расчуліць, але не ўзбагаціць. Далей нейтральных замалёвак аўтар не ідзе. І справа, вядома, не ў тым, што ён піша аб прыродзе. Піша — значыць адчувае яе. Гісторыя паэзіі ведае паэтаў — такіх, як, напрыклад, смалянін Мікалай Рыленкаў,— які ўсю сваю творчасць прысвяціў тэме прыроды. Але ў аснове яго паэтычнай канцэпцыі ляжыць арыгінальная філасофія асобы, вельмі змястоўнай у ідэйным і маральным плане. Пейзажная лірыка Зубрыцкага мае патрэбу ў значнай актывізацыі душэўнага перажывання. Сёння, у век навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, тэма прыроды ў паэзіі непазбежна ўзбагачаецца новымі нюансамі і адценнямі.

У Юркі Голуба высокаразвітая — гэта адразу кідаецца ў вочы — тэхніка верша, якая нечым нагадвае мне Р. Барадуліна. Гнуткасць інтанацый, лёгкасць, натуральнасць размовы — гэта добра, але сэнсавая нагрузка пакуль што слабаватая. Вось яго верш «У глушы» :

Шчаслівы, як цыган,
Што краў у Зэльве коней.
Ці, як заезны комік
(На іх расце цана),
Брыдзеш сабе далёка
Ад тлуму, мітусні.
Захочаш — загалёкай,
Захочаш — дык засні.
І так прыдатна ў ботах,
І не чутно зязюль.
За блізкі свет адсюль
Дом,
Дарогі,
Работа.

Прырода ў жалуды
Заклала час і кроны,
І лесу усё роўна,
Адкуль ты,
Чый,
Куды.

От які «раскаваны» малады чалавек — «адкуль ты, чый, куды»? Лепш было б, каб паэт шукаў асабістую раскаванасць і волю ў сваім дачыненні да агульных турбот і клопатаў, да спраў свайго героя.

Карызна, Мінчанка, Зубрыцкі, Баторын, Голуб — людзі рознага творчага «стажу» і вопыту, і недахопы, слабыя месцы ў кожнага свае. Аднак ёсць, безумоўна, у іх недахопах шмат агульнага — яно перш за ўсё ў няспеласці паэтаў як асоб у высокім, грамадзянскім разуменні гэтага слова.

Паэзія — бязлітасная: яна ўскрывае, выстаўляе напаказ чалавечае нутро. Ніякая тэхніка, ніякія мастацкія прыёмы тут не дапамогуць. Наадварот, яны толькі падкрэсляць недахопы. Галоўны рахунак, які ў сувязі з гэтым хочацца прад'явіць сёння маладой паэзіі,— гэта заніжанасць грамадзянскіх маральных патрабаванняў паэтаў да сваёй творчасці, нявыхаванасць густу.

3

Добра помніцца, як бурна і ўпэўнена ўвайшоў у нашу паэзію, «нікога не спытаўшы», Рыгор Барадулін, як яскрава адлюстравалася ў яго «Вечары над Таболам» працоўная героіка цалінных будняў. Поспех Барадуліна і большасці паэтаў, яго равеснікаў, быў абумоўлены тым, што яны звярнуліся да таго новага, што несла ў сабе жыццё, што з'явілася здабыткам стваральнай дзейнасці савецкага чалавека.

Сёння ёсць шмат думак, перажыванняў і эмоцый у нашых сучаснікаў, якія ў творах маладых паэтаў знаходзяць прыблізны і кволы водгук, а то і ўвогуле не знаходзяць яго. Адбываецца навукова-тэхнічная рэвалюцыя, вырашаюцца звязаныя з ёю складанейшыя пытанні сацыяльнага, ідэалагічнага і псіхалагічнага быцця сучаснага чалавека, а маладая паэзія нібыта не заўважае іх, не ўлічвае аграмадных зрухаў у сённяшнім свеце, які змяняецца літаральна на нашых вачах.

Маладым нестае адкрыццяў у галіне новай тэматыкі. Тое, пра што яны ў пераважнай большасці сваёй пішуць, выглядае вельмі прыватным, неістотным. Залішне часта аддаюцца яны сентыментальным успамінам аб дзяцінстве.

Ад дажджу хаваліся пад стрэхамі,
А ўшчукаў,—

як сонца вестуны,
На кійках па лужынах мы ехалі,
Закасаўшы да кален штаны...

*(В. Ракаў)*

Ну, добра «ехалі», але чаму пра гэта абавязкова трэба паведаміць нам, чытачам?

Нешта ж ёсць у той пары, што
клікае,
Чым заўжды і ў старасць даражыш,
З сэрца неспакойнага не выкінеш,
Хоць па ручайках не пабяжыш...—

адкуль узялося гэтае «клікае», «ушчуваў» і іншыя моўныя неахайнасці?

Колькі тут банальнага, агульнага! І гэта ў паэта «са стажам»!

У 1958 годзе Р. Барадулін напісаў свой лепшы верш тых часоў — «Бацьку».

Не выйшаў ты і ў гэты раз
Мяне спаткаць, паднесці рэчы...

З тых пор гэты матыў вандруе з кнігі ў кнігу, з верша ў верш. Так, многіх сыноў і дачок вайна пакінула бязбацькавічамі, і калі, скажам, М. Мінчанка піша ў вершы «Брату» пра тое, што бацька не вярнуўся з вайны («загінуў бацька, але ён жывы ўсім нам сніцца»), то аўтару, вядома, спачуваеш, але бачыш, што жыццёвы факт не знайшоў у яго свежага эстэтычнага выяўлення. Гэтага ж не хапае вершу М. Шаўчонак «...Знаёмых і незнаёмых...»

Усіх вас прашу я, людзі:
Знайдзіце мне бацькаў здымак!

Сама па сабе такая рэч, вядома, кранае, але расказана пра ўсё вельмі прыблізна.

На гэтую ж тэму ёсць вершы ў М. Парахневіча («Бацьку»), У. Дзюбы («Хлапчукі») і ў іншых паэтаў, але ў іх мала навізны.

«Даўно вядома,— піша Ф. Яфімаў у рэцэнзіі на кнігу вершаў Н. Тулупавай,— што вершы павінны гаварыць або пра зусім новае, або па-новаму аб старым. Але што можа быць у паэзіі новым? Сапраўды, у паэзіі ўжо было ўсё. Усё, апрача самога паэта, усё, апрача яго асобы, адзінай і непаўторнай... Тыя вершы ўдаюцца, чытаюцца і ўспрымаюцца, у якіх адлюстравалася нешта ад асобы паэта». Гэта правільна, аднак нельга недаацэньваць аб'ектыўнай навізны самога жыцця і ўмення паэта глыбока спасцігнуць яго сэнс.

Магчыма, у адчуванні жыццёвай дыялектыкі, у выбары тэмы якраз і знаходзіць сваё першапачатковае выяўленне асоба паэта, яго грамадскае і творчае аблічча. Іншая справа, наколькі глыбока ўдалося

паэту ўвасобіць новую тэму ці праблему ў жывую тканіну мастацкіх вобразаў, надаць ім сапраўднае паэтычнае гучанне.

Цікавая з'ява ў сучаснай нашай маладой паэзіі — вянок санетаў У. Дзюбы пад назвай «Выток», змешчаны ў яго першай кнізе «Вуліцы без назваў». Сімпатычна ўжо тое, што аўтар шукае паэзію ў справах і думках сваіх сучаснікаў, у працоўных буднях рэспублікі. У старажытнай форме санета ён расказвае пра такую сучасную падзею, якой з'яўляецца адкрыццё нафты на Беларусі. Спроба У. Дзюбы — не столькі пошук «сваёй» традыцыі, колькі эксперымент. Паэт хоча ў «вянок» уплесці ўсё — удзячнасць роднай зямельцы за яе скарбы, разняволены чалавечы геній, карціны партызанскага блакаднага ваеннага мінулага, пасляваенныя цяжкасці і іншае — і... недзе вянок «разрываецца», не ў сілах падпарадкаваць усё гэта адзінству сваёй структуры. Парушаецца факусіроўка аўтарскага бачання, яно здрабняецца на мноства слаба звязаных паміж сабой малюнкаў. Не будзем катэгарычна сцвярджаць, што «вянок санетаў» — цалкам непрыдатная для вырашэння дадзенага зместу форма. Справа ў тым, наколькі гэты жанр з яго цвёрдымі эстэтычнымі патрабаваннямі арганічны для паэтычнай свядомасці Дзюбы. Твор прайграе ад таго, што ў ім часта за агульнарытарычнымі фразамі не бачна канкрэтная асоба — чалавек, які разгадвае таямніцы зямлі. Большасць сіл паэт патраціў на «пляценне» самога «вянка».

І ўсё ж «Вянок» цікавы сваім зваротам да сучаснасці. Ён сведчыць яшчэ і аб тым, як напружана ўліваецца паэзія ў новыя тэмы і як нялёгка яны ёй даюцца. «Вянкі санетаў» напісалі А. Сербантовіч, Н. Гілевіч, Х. Жычка. Крытыка, помніцца, станоўча ацаніла іх вопыт. Там форма ўспрымалася як натуральнае і заканамернае ўвасабленне зместу, звязанага з тэмай вайны, з вялікімі ахвярамі, якіх яна патрабавала ад народа. Дзюба такога зліцця зместу і формы не дасягнуў, але задаткі паэтычнай асобы ў яго творы праявіліся.

Неблагое ўражанне пакідаюць вершы У. Дзюбы «Ваенная двухпутка», «Першы дзень вайны», «Ты помніш, маці...». Удаўся паэту верш, што даў назву ўсяму зборніку — «Вуліцы без назваў»: дзеці малююць на асфальце дамы, вуліцы, гарады — дзіўны свет, які вабіць сваёй невядомасцю і рамантычнасцю. Чалавеку радасна яго адкрываць. Добра, што малады паэт шукае свой ракурс бачання, свой падыход да матэрыялу, сваю тэму.

Шырэйшы тэматычны гарызонт у Я. Крупенькі. Піша ён пра Радзіму, пра вёску, маці, каханне і г. д. Вылучаецца сваёй сур'ёзнасцю верш «Курганы»: «Прайдзі мой край — усюды курганы, нямыя сведкі вечнасці яны. Адным — стагоддзі, а другім — гады.

Схавалі чалавечыя сляды...» Можна было б працытаваць і яшчэ многія добрыя радкі з кнігі «Нядзеля», а некаторыя вершы прывесці поўнасцю — яны вартыя таго. Але хочацца сказаць пра недахопы, якія перашкаджаюць творчаму росту паэта.

Як ні дзіўна, Крупеньку ў нечым перашкаджае ўласны паэтычны вопыт, правільней — уменне складаць вершы.

Адзнакі гэтага ўмення, інакш кажучы, рамясла, відаць у наступным вершы, які нагадвае сентыментальную, чуллівую, а значыць, дрэнную прозу:

Ты — мая весняя раніца —
Ласкава ў акно зазірнула
Першым праменем сонечным —
І працягнула рукі
Цёплыя-цёплыя.
Такія рукі
Могуць быць толькі
У аднаго чалавека —
Маці.
Ты — мая весняя раніца —
Засмяялася звонка-звонка,
Так можа смяяцца
Толькі адзін чалавек на зямлі —
Маці.

Паэту на гэты раз здрадзіў эстэтычны густ: пра маці так пісаць нельга. Яшчэ пра сваю каханую дзяўчыну юнаку — можна зразумець, а пра маці — «ласкава ў акно зазірнула», «працягнула рукі цёплыя-цёплыя», «весняя раніца» і г. д.— не, паэт жа не дзіця па ўзросце...

Крытыка, ацэньваючы новую кнігу, рэдка ўспамінае імя рэдактара. І дарэмна. У поспеху аўтара, як і ў недахопах кнігі, ёсць заслуга і яе рэдактара. Скажам. «Нядзелю» Я. Крупенькі рэдагаваў У. Машкоў, і ён мог бы з большай патрабавальнасцю паставіцца да кнігі, такія вершы, як «Мінская вуліца ў Маскве», «Расціць жыткі...», «Сонечны зайчык...», «Іду...», наогул не ўключаць. У кнізе ёсць радкі проста банальныя, невыразныя, якія нагадваюць хутчэй за ўсё чарнавыя накіды.

Я сустрэчы з табою рад
Любою парою,
Легендарны Ленінград —
Радзіма герояў,—

сказаць так пра Ленінград — значыць нічога не сказаць. Альбо пра што напісана наступнае чатырохрадкоўе:

Цеплынёю дыхае ралля.
Прарастаюць ў цішыні зярняты,
І, як доктар,

слухае зямля —
Моцна сэрца б'ецца
у салдата.

Пра якога салдата ідзе гаворка? Чаму яго сэрца раптам стала біцца моцна? І чаму сэрца слухае зямля? Чым верш карацейшы, тым ён павінен быць змястоўнейшы, з багатым падтэкстам — кожнае слова на вагу золата. У прыведзеным чатырохрадкоўі такога не атрымалася, а гэта сведчыць пра нізкую патрабавальнасць аўтара да сябе.

Ёсць вартыя ўвагі вершы ва Уладзіміра Фаміна ў зборніку «Падслухаў сэрца»... Гэта — «Характар», «Рукі маці», «Бэз», «Нам у трыццаць...». У Фаміна багаты жыццёвы вопыт, але ў вершах ён адлюстраваўся вельмі вузка. Не адчуваецца ў паэта сваёй галоўнай тэмы. Ён нярэдка абмяжоўваецца даўно вядомымі, прапіснымі ісцінамі: «Быць спакойным яно (мора.— У. Г.) не можа — значыць, мору патрэбна воля». У такой сітуацыі якраз і адбываецца «ўцечка» грамадзянскага запалу і тэмпераменту. Некаторыя вершы маюць уяўна грамадзянскі характар, нават нясуць адзнакі безгустоўнасці:

Аб'едкаў мне ў жыцці Не трэба,
Я палавініць не люблю...
Хачу трымаць рукамі неба,
Хачу абняць усю зямлю.

Як сказаў Казьма Прутко ў, нельга абняць неабдымнае. І трэба пазбягаць рыторыкі.

Сацыяльна-грамадскія матывы гучаць у Фаміна, як і ў большасці іншых маладзейшых паэтаў, у асноўным у вершах на антываенную тэму. Аднак і гэтым вершам нестае новага жыццёвага напаўнення, хоць і адчуваецца, што многае з таго, пра што ў іх гаворыцца, аўтар сам перажыў.

У жыцці ж нам хапіла спаўна.
На бацькоў сваіх
Доляй падобны.
Нас не мёдам паіла вайна
І карміла
не булкаю здобнай.
Па шляхах басаногімі нас
Гналі слоты,
вятры
і завеі.
У блакадных балотах
не раз
Мы, бязвусыя,
Рана сівелі...

Не магу адмовіцца ад уражання, што падобнае недзе (у паэтаў папярэдняга пакалення) я ўжо чытаў.

Амаль кожны з паэтаў імкнецца расказаць пра сваё вясковае дзяцінства, пра бацьку, маці, роднае поле, лес, хату, раку... Нічога благога ў гэтым няма, але нельга не адзначыць наіўнасць і павярхоўнасць многіх радкоў, непрыхаваную іх інфармацыйнасць:

Дзе б я ні быў, бацькоўскі дом
Мне служыць маяком.
Стаіць калодзеж пад акном
З пявучым жураўлём.

*(Я. Крупенька)*

Ахвотна верыцца, што ўсё гэта так, аднак радкі начыста пазбаўлены навізны, яркасці фарбаў, непаўторнасці дэталей, усяго таго, што сведчыла б пра наяўнасць цікавай і арыгінальнай асобы паэта.

З цікавай першай кнігай «Бацькоўскі парог» выступіў паэт І. Скурко. Найбольш прывабная ў яго — патрыятычная лірыка, звязаная з апісаннем родных краявідаў, сустрэч з землякамі. Спыняе ўвагу маральна завостраны верш «Развага», у якім паэт славіць «мудрую развагу быцця», але рашуча адхіляе яе, калі «пазавуць на дапамогу», калі трэба будзе некаму дапамагчы. Тады развага непатрэбна...

Надта марудна пашыраюць свае грамадскія далягляды і ўяўленні многія з тых, у каго першая кніга засталася даўно ззаду, а на парозе — другая. Шлях да другой кнігі часцей бывае больш цяжкі, чым да першай. Здараецца, і нярэдка, што чалавек вычарпаў сябе ў першай кніжцы і на другую яго нестае.

Цікава заявіла пра сябе Вольга Іпатава першым зборнікам, які выйшаў некалькі гадоў назад. Было відаць, што ад паэтэсы можна чакаць многае. Аднак яна пакуль што спраўдзіла далёка не ўсе нашы спадзяванні. Прынамсі, тое, што друкавалася ў перыёдыцы, задавальняе не зусім.

Задоўга не раблюся я
дарослай.
Ва ўсіх учынках холадна-
цвярозай,—

гэта радкі з верша В. Іпатавай «Задоўга не раблюся я дарослай...», надрукаванага ў «Літаратуры і мастацтве». Не пра такую «халоднацвярозую» дарослсць у дачыненні да самой Іпатавай ідзе гаворка, а пра дарослсць асобы, яе грамадзянскасць, сталасць мыслення.

Пэўнае развіццё ў творчасці маладых атрымалі інтымныя тэмы і матывы. Каханне, адносіны ў маладой сям'і, дружба — пра ўсё гэта, як і трэба было чакаць, маладыя пішуць ахвотна і шмат. І гэта

натуральна. «Паэзія сэрца мае такія ж правы, як паэзія думкі»,— лічыў М. Г. Чарнышэўскі.

Нельга пэўна сказаць, за што ты любіш таго ці іншага чалавека, аднак паэзія заўсёды высока цаніла чалавечую здольнасць любіць глыбока, да самазабыцця. Нядаўна выдадзеная анталогія беларускай любоўнай лірыкі «Зорка Венера» яшчэ раз засведчыла гэта.

«Вечнае каханне» загаварыла са старонак кнігі Віктара Ракава «Акно ў зялёны сад». У паэта строгія маральныя патрабаванні да свайго кахання, але часам настолькі звужаныя, што мала верыш у сапраўднасць пачуцця.

Я думаў, што бясконца буду жыць
Тым пачуццём, якім цябе авеяў.
Ды памыліўся — твой пагляд савее,
Калі удача ад мяне бяжыць.
Ну як, скажы, з табой мне, гэткай,
жыць?
Ты мне ніякіх пісьмаў не пішы.
Пайшоў я ў свет, назад каб не
вярнуцца.
Гукай таго, хто ўмее нізка гнуцца,
Хто табе сёння па тваёй душы.
Чытаць не буду... Пісьмаў не
пішы...

Па кантрасце ўспамінаецца славутае пушкінскае «Я вас кахаў...» з яго сапраўдным гуманізмам і чалавечнасцю. І ўсё ж такі ў кнізе Ракава асоба паэта больш поўна — у параўнанні з іншымі яго вершамі — раскрылася менавіта ў інтымнай лірыцы. Хоць, вядома, ёсць вартыя ўвагі і вершы «іншага складу». Значна ярчэй і свяжэй у параўнанні з іншым яму ўдалося сказаць пра родны кут. Прыцягвае ўвагу і прымушае ўспомніць і падумаць пра сваё, роднае верш В. Ракава «Дворышчаў прывычныя прыкметы...». Тут ёсць свае разважанні пра той куток зямлі, які ёсць у кожнага, якому кожны абавязаны сваім нараджэннем.

Ракаў — здольны паэт, пра што сведчыць добры, вельмі душэўны, на мой погляд, верш «Неданошаныя сарочкі» — пра тых, хто не вярнуўся з вайны, каго да гэтага часу чакаюць маці, дастаючы час ад часу са старых сундукоў ільняныя вышытыя сарочкі, неданошаныя сынамі... Але разам з тым у вершах Ракава шмат адчуванняў банальных, да таго ж вельмі не ясных, цьмяна выяўленых.

Складанае ўражанне пакідае зборнік вершаў Мар'яна Дуксы «Крокі» (1972). Яму, напрыклад, удалося намаляваць постаць салдата з бронзы, які стаіць ка п'едэстале, але гатовы ізноў засланіць варожую

амбразуру, каб абараніць мір; «Ў нас кволай бронзы не бывае, няма ў нас бронзы нежывой!». Спадабаўся верш «Чаканне гасцей» — падрабязны, вельмі жывапісны паказ абедзеннага стала, усёй падрыхтоўкі да сустрэчы гасцей — «Каб тыя, з горада, адчулі, што значыць добрая радня».

Але, як і ў выпадку з Ракавым, адчуванні М. Дуксы не заўсёды перарастаюць у асэнсаваныя пачуцці, не заўсёды звязаны са значнымі чалавечымі перажываннямі. Адсюль з'яўленне вершаў, у якіх, апрача няяснага, прыблізнага настрою, па сутнасці нічога няма. Паэту шкодзіць неахайнасць у рабоце са словам. А. Лойка справядліва папракаў яго за тое, што, скажам, у вершы, прысвечаным памяці Ф. Багушэвіча, ёсць дзіўнае сцверджанне, што, маўляў, трэба мець «падзорную трубу, каб аднаму рашыцца сярод ночы распачынаць вялікую сяўбу». Нашто тут падзорная труба? У другім месцы паэт піша: «Бывае, што жыццё — кавалак прозы, для выгляду памочанай у мёд». Ці такія «прыгажосці»: «паваю сонца ў зеніце ірдзее», «печка — царыца вёскі і зімы», «каровы важна, быццам шляхта, нагамі б'юць у тратуар».

Бачны рост у такога паэта, як К. Камейша. Хіліць на роздум ягоны верш «Лілі», прысвечаны блізкаму чалавеку — жонцы. Верш напісаны ў характэрнай для маладога паэта сцішанай, разважлівай манеры. Але голас яго на гэты раз гучыць занадта камерна — маленькая сям'я, маленькая кватэра, свой сямейны мікрасвет... І хоць «шчасця непрыкметная падкова пад нагою рысака звініць» (пры чым тут конь?), аднак гэтаму мікрасвету яўна бракуе сувязі з тым вялікім светам штодзённай працы, барацьбы, жыцця, у якім усе мы жывём. Казіміру Камейшу — аднаму з самых цікавых нашых маладых паэтаў — трэба шырэй мысліць, каб голас яго гучаў на болей высокіх грамадзянскіх нотах, каб у ім адчувалася большая маральная адказнасць за тое, што адбываецца ў жыцці.

Верш М. Парахневіча «Дачка» таксама мае інтымны, «сямейны» характар. У ім шмат бацькоўскай пяшчоты, і каб яна не была выказана ў лоб, задужа прамалінейна, гэта быў бы, можа, адзін з лепшых вершаў паэта.

Радок у Парахневіча асабліва пераканаўча і паэтычна гучыць там, дзе гаворыцца пра асабіста зведанае, што стала часткай ягонага вопыту. Такія вершы «*** А быць магло б: адно імгненне...», «*** Красунь нямала ёсць на свеце...», «Адзінства» і інш., у тым ліку цудоўны па свежасці фарбаў верш «Усе — у Крым...». Вонкава — гэта паэтычная спрэчка з тымі, хто кожнае лета шукае экзотыку ў «паўднёвых мясцінах».

Не трэба мне паўднёвых тых

экзотык.
Навошта мне той набярэжны гам!
Я за адно — за клёў хітрухаў —
плотак
Пуцёўку прафсаюзную аддам.
Бяры і едзь. Да пляжу.
Да прыбою.
Ляжы на сонцы. Ці драмі ў цяньку,
Бо ты не знаеш, што гэта такое —
Наварыстая юшка ў кацялку.
У ёй усё: сівы туман затокаў,
І тміну смак, што выспеў на лугах,
І мяккі водар ёдзістых асокаў,
І свежасць ранку, і вуголля пах.

Шкада, што верш замыкаецца паэтызацыяй рыбалкі і агітацыяй за адпачынак у межах Беларусі — тэма дае надзвычай шырокі інтэлектуальны прастор. Тым не менш хочацца сказаць паэту дзякуй за тое, што ён так свежа і непасрэдна нагадаў нам тую наймілейшую часіну, калі «на зоры займае».

Інтымная, прыродаапісальная лірыка, як любая іншая галіна паэзіі, дае паэту магчымасць на ўвесь голас выказаць сваё грамадзянскае крэда. Але такіх вершаў, па праўдзе кажучы, не знойдзеш у нашых маладзейшых паэтаў. А, скажам, у таго ж Барадуліна нярэдка можна натрапіць на такі менавіта верш:

Дзень добры,
родны бор!
Даўно цябе не бачыў.
Ну, як твой смалазбор,
Падсочаны бядача?

Паэт развіў у сабе здольнасць звязваць «прыроднае», «лясное» з трывогай чалавека другой палавіны дваццатага стагоддзя. І як здорава, дзякуючы гэтай сувязі, гучыць верш! Як цікава «іграе» тут сваімі адценнямі слова «падсочаны»!

Часам інтымныя вершы некаторых паэтаў будуюцца па схеме: я цябе чакаў, а ты пайшла з другім. Дзяўчаты часта пішуць пра тое, як любы здрадзіў ім, і просяць лівень, каб «змыў чалавека таго сляды, ...якому я, як сабе, давярала» (М. Шаўчонак). Што ж, чалавечы лёс неаднолькавы, у адным выпадку ён складваецца шчасліва, у другім — не.

За паваротам зніклі рэйкі.
І колькі ўдалеч не глядзець —
Ужо ніколі, нават зрэдку,
Цябе не ўбачыць, не сустрэць.

Стаю адна. Туман бялёсы
Ахутаў з галавы да ног.
...І разыходзяцца два лёсы
Па тонкіх лініях дарог.

Такія вершы кранаюць аматараў прыгожых паэтызмаў, але вялікага душэўнага перажывання не выклікаюць...

4

Для паэта няма больш высакароднай мэты, чым стварэнне вобраза героя нашых дзён, раскрыццё духоўнага багацця і паэзіі працы тых звычайных людзей, хто будуе трактары і здабывае нафту, узводзіць гарады і вырошчвае хлеб, працуе на атамных рэактарах і разгадвае тайну жывой клеткі! Няпроста зразумець яго псіхалогію, складаную дыялектыку душы, маральныя ідэалы, але лірык на тое і лірык, што, гаворачы ад сваёй асобы і пра сябе, расказвае ў той жа час і пра іншых. Вобраз сучасніка ў паэзіі выступае найбольш ярка ў форме лірычнага героя — «я» паэта.

Трэба сказаць, што паэтычная аднастайнасць і маральна-грамадзянская нясмеласць прыкметна збяднілі не толькі характар героя і яго ўяўленні пра жыццё, але і самую мастацка-вобразную фактуру твораў. Міжволі ўспамінаецца першая, юнацкая, кніжка Г. Бураўкіна «Майская просінь» — які цікавы характар быў заяўлены ў ёй! Цяпер такіх герояў нестае маладой паэзіі. А калі ў паэта няма канкрэтнага героя — роднага, любімага, з выразным сацыяльным, маральным, псіхалагічным аблiччам,— значыць няма каму думаць, трывожыцца, радавацца, няма каму задаваць пытанні жыццю.

Зрэшты, не скажу — знешняе аблічча гэтага чалавека праступае ў вершах У. Скарынкіна:

Цяжкі дастаўся крыж
Табе, што ні кажы...
Ізноўку ты ляціш
На Ніжнія Крыжы.

Дыхнуў мароз на шкло —
Намаляваў панты.
Не грэюць, як назло,
Настылыя унты.

Кіруюцца сябры —
Хто ў Адлер,
Хто ў Парыж.

Над трэцім угары
Гарыць
Паўднёвы Крыж.

Табе ж з маленства,
Друг,
Па сэрцы неспакой.
І стаў Палярны круг
Арбітаю тваёй.

Толькі адкуль гэтае амаль някрасаўскае «цяжкі дастаўся крыж» у дачыненні да сучаснага лётчыка, які, я ўпэўнены, любіць сваю прафесію, як гэта ўвогуле ўласціва лётчыкам. Яны не могуць не лятаць, іх проста цягне ў неба. Далей, адкуль аўтар узяў «панты» (з націскам на апошнім складзе), бо калі ён меў на ўвазе аленевыя рогі, то гэта панты. Цікавая дэталь: авіятар, інжынер, Скарынкін рэдка звяртаецца да матэрыялу, які дае яму яго справа, яго работа.

Пачаць гатовы
кожную гадзіну
Ў душы маёй
паэт і інжынер
Паміж сабой
смяротны паядынак,—

прызнаецца У. Скарынкін, але большасць яго вершаў— пра дарагую сэрцу вёску, мясціны дзяцінства. Вершам, у якіх паэт спрабуе асэнсаваць сваю работу, нестае выразнасці і смеласці думкі. Як гэтаму, напрыклад, васьмірадкоўю:

Святлом сіняватым поўня
Апырскала самалёты.
І сталі нагадваць
раптоўна
Яны незямныя істоты.
Паблісквають росы на «ІЛах».
Маўчаць да пары матory.
Гатовыя ў неба
на крылах
Узняць каляровыя зоры.

Такі шматабяцаючы зачын і такое ардынарнае заканчэнне! Цяжка даецца паэту гэтая тэма, але якраз яна і з'яўляецца яго тэмай, і яму над ёй працаваць...

Тыя, хто любіць паэзію, з цікавасцю сочаць за выступленнямі ў друку Святланы Басуматравай. Што вабіць перш за ўсё ў яе вершах — дык гэта шчырасць, часам нават здзіўляючая. У асобе Басуматравай беларуская літаратура мае, відаць, вельмі здольную і перспектыўную

маладую паэтэсу. Яе вершы нясуць на сабе адзнаку свежасці, непаўторнасці і праўдзівасці лірычнага перажывання. Гэтыя якасці прысутнічаюць і ў вершах, надрукаваных у трэцім нумары «Маладосці» за мінулы год.

Якая восень — сум і прыгажосць,
Спакой і смутак, золата і чырвань.
Вось-вось гатова адляцець у вырай
За жураўліным клінам маладосць.
Хай лістапад. Я веру, што мяне
І заўтра будзе радаваць світанне.
Што светлае і вечнае каханне
Мой неспакойны лёс не абміне,
Не вабіць ні вядомасць, ні рублі,
Аддам усё адзіным двум
патрэбам —
Сумленна жыць пад родным
мірным небам,
Любіць усё жывое на зямлі.

Паэтэсе адно трэба выходзіць на шырэйшы «аператыўны прастор», уключыць у арбіту сваёй творчай думкі больш шырокія тэматычныя і ідэйныя пласты рэчаіснасці, узнімаць свае «патрэбы» да ўзроўню патрэб грамадзянскіх, інакш кажучы, выхоўваць у сабе пачуццё асобы. Таму што элементарныя паняцці, першыя каштоўнасці: вернасць, дабрата, асабістая сумленнасць — абавязковыя ўмовы, каб быць чалавекам. І ўсё ж такі гэтага мала герою нашага складанага часу. Яму неабходны яшчэ грамадскі інтэлект, грамадзянскі тэмперамент, паслядоўныя перакананні, мужнасць і ўменне за іх змагацца.

Сярод сённяшніх маладых не проста знайсці паэта, які б, хай сабе і ломкім голасам, задаваў пытанні — сабе і чытачам. Нельга ж усур'ёз успрымаць такое, скажам, «пытанне»:

Чаму, сябры, скажыце, сам
не ведаю,
Я, нібы птушка, песню заспяваў?
*(Я. Крупенька)*

Тым больш узрадуешся, калі раптам натрапіш на сапраўды ўдумлівую лірыку, якая патэнцыяльна змяшчае ў сабе і запытанне, і роздум, і імкненне даследаваць з'яву.

Вось гэтым — пытаннямі, апалітычнасцю думкі, імкненнем паэта ў што б гэта ні стала дайсці да ісціны,— хвалююць вершы Уладзіміра Верамейчыка.

Людзі! Чаго леціце вы ў космас?
Што вы шукаеце там?
Кладі б ля рэчак зямныя пракосы,

К спелым хадзілі жытам.

Людзі! Навошта яна вам — Венера?
Блудзіць няхай між нябёс!
Можа, ўзламаўшы касмічныя
дзверы,
Зойдуцца сэрцы ад слёз?

Людзі! Чаму ў адказ анямелі,
Ладзячы струны ракет?
Ладзілі б лепей дзецям вяселлі,
Песні пускалі ў сусвет!

І далей, з касмічнага плана гаворка пераходзіць у зямны, бытавы, чалавечы:

Людзі! А можа, з планеты далёкай
Госці збіраюцца к вам,
І мудрацы паміж зорных аблокаў
Шлях паказалі сынам?..

Людзі! Я поўнасцю вас разумею:
Госця за вёскай заўжды
Бацька страчаў ліхтаром у завею,
У спёку — з біклагай вады.

Змерзне — падасць ён кажух
абагрэты,
Спёка — з біклагі глынуць...
Людзі!
Да зорак вас не ракеты —
Шчодрыя сэрцы нясуць!

Прынцыпова важна, што ў сваіх публіцыстычных вершах У. Верамейчык застаецца мастаком: праўда перажыванняў спалучаецца ў яго з хараством адчування жыцця, грамадзянскі пафас — з асобаю паэта.

Значнасць асобы паэта і героя, моцная зрошчанасць з жыццём, з яго штодзённай прозай павялічваюць духоўны патэнцыял паэзіі. Праблема духоўнасці, павагі да духоўных працэсаў жыцця сведчыць пра актыўнасць паэтычнага мыслення.

Добра запомніліся дзве падборкі вершаў Р. Семашкевіча ў студзеньскіх нумарах часопісаў «Полымя» і «Маладосць» за 1972 год. Семашкевіч імкнецца паказаць жыццё чалавечага духу, народнай свядомасці, неадрыўнай ад побыту, але здольнай часамі ўзносіцца над ім высока, туды, «дзе другі абсяг відзён». Пра гэта — верш «Полька ў

вёсцы Пяціхатка», успаміны паэта пра канкрэтную з'яву — звычайныя вясковыя танцы. Але як пададзена гэта самая полька — праз звычайны бытавы план відаць абрысы іншага, больш шырокага, я б сказаў, нават філасофскага плана — «шлях сюды, як Млечны Шлях». А ў тым жа нумары «Маладосці» змешчаны такія проста выдатныя вершы, як «Развітанне з садам», «Летнія малюнкі»; у «Полымі» — «Вяртанне кніг», «Паляванне».

Адны паэты — ясныя, простыя, яны адразу раскрываюць свае каштоўнасці, другія патрабуюць больш засяроджанага стаўлення да сябе. З ліку апошніх — Рыгор Семашкевіч. Многія вершы яго шматпланавыя, як, напрыклад, тое ж «Развітанне з садам». З кім размаўляе паэт? З садам, з сябрам ці з самім сабою? Аб чым ідзе гаворка? Аб жыцці, аб пасталенні чалавека, аб тым, што застаецца з ім з дзіцячых год назаўсёды. Творы Семашкевіча патрабуюць значнага інтэлектуальнага напружання, але гэтая спелая паэзія шчодра ўзнагародзіць вас за ўвагу. Паэт добра адчувае момант эстэтычнай узаемасувязі формы і зместу: думка свеціцца ў радку ўсімі сваімі фарбамі і адценнямі.

Не вельмі многа друкаваўся апошнім часам А. Разанаў, каб скласці пэўную думку пра ягоны творчы рост. У «Літаратуры і мастацтве» (14 студзеня 1972) змешчаны верш «Першапраходцы», у якім паэт вельмі ўжо, мне здаецца, сумна ўяўляе сабе лёс тых, каго называе «першапраходцамі»:

Адпрацаваўшы, на спачын,
ледзь цені чуйныя пабеглі,
не засмучоныя нічым,
нічым не ўцешаныя леглі.

І хоць верш заканчваецца на больш упэўненай ноце, мяне, чытача, не пакідае адчуванне нейкай маркоты:

Але праз веянне начэй
у нейкі момант недзялімы —
любоў... смуга... —
да іх вачэй
цішком схілялася Радзіма.

Крыўдна, што гэты вельмі здольны паэт пайшоў у вершах, здаецца, больш ад кнігі, чымся ад жыцця. Адсюль — некаторая абстрактнасць у яго апошніх публікацыях.

60-я гады былі цікавыя з'яўленнем у паэзіі некаторых новых, невядомых да гэтага жанраў. Адышлі ў нябыт панегірыкі, на іх месца з'явіліся свежыя «чорнарабочыя» жанры, такія, як, напрыклад, «лірычны рэпартаж» — з калгаса, з завода, новабудоўлі. «Полымя», і

«Маладосць», і «Беларусь», і «ЛІМ» даволі часта друкавалі на сваіх старонках лірычныя рэпартажы Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна, Н. Гілевіча, В. Макарэвіча і іншых. Аднак гэты жанр, нягледзячы на сваю аператыўнасць, аказаўся недаўгавечным (паэмы, скажам, ён не мог замяніць), і сёння яго ўжо амаль не сустрэнеш, бо паэзія стала больш глыбокай і ўдумлівай, і «рэпартажнасці» яе не можа задаволіць. Аднак і зараз мы маем права патрабаваць, асабліва ад маладой паэзіі, большай разнастайнасці і свежасці. Дарэмна мы будзем шукаць у ёй сёння, напрыклад, сатырычных твораў ці хоць бы гумарыстычных — і гэта лішні раз паказвае на слабую сувязь з жыццём.

5

Расказваюць, што ў старажытных японскіх мастакоў быў такі звычай: майстар, які дасягнуў зеніту славы і вядомасці, раптам ад усяго гэтага адмаўляўся, мяняў прозвішча і зноў пачынаў усё спачатку... Такі ўчынак сведчыць, па-першае, аб вялікай патрабавальнасці, з якой ставіліся мастакі да сваёй творчасці, па-другое, аб іх вялікай мужнасці.

Падобныя прыклады можна адшукаць у гісторыі літаратуры і мастацтва многіх народаў.

Іншая справа сёння: асабовы пачатак у літаратуры ўзрос настолькі, што ахапіў сабою ўсе бакі творчага акта, пачынаючы выбарам праблемы і канчаючы індывідуальным стылем мастака, стаў абавязковай і неад'емнай якасцю самога твора. Каб я не ведаў, скажам, што вось гэты верш —

Ёсць у нас гаспадары,
Што топчуцца па дабры,
А дабра не бачаць.
Можа, я стары бурчун,
У шчарбаты б'ю чыгун,
Дык няхай прабачаць,—

напісаў Якуб Колас, твор страціў бы для мяне ці не палавіну сваёй прывабнасці.

Леў Талстой прызнаваўся, што, чытаючы твор, незалежна ад таго, пра каго там напісана, ён перш за ўсё шукаў душу самога мастака, яго асобу.

Яе, асобу, я напаткаў у кнізе Л. Дайнекі «Бераг чакання». Помню яго першую кнігу «Галасы», якая выйшла некалькі гадоў назад. «Бераг чакання» — значны крок наперад у творчым і грамадскім развіцці паэта.

Вуголле спаленых хацін.

I чорны дым. I чорны вецер.
У кожнага свая Хатынь.
I ўсё ж Хатынь адна на свеце.
У кожнага свая Хатынь —
Хатынь ці ў Віцебску, ці ў Мінску.
Ды ў посвіст куль, у грукат мін
Пайшоў бы я, каб мёртвы сын
Падняўся з Вашых рук, Камінскі.

Сказана так шчыра і рашуча, што паэту верыш адразу, без ваганняў. Што паэт імкнецца ісці ўпоравень са сваім часам, гаворыць верш «Буслы дваццаць першага веку», з яго трывогай пра тое, каб пер'е буслам не абскуб «цывілізацыі вецер». У вершах Дайнекі адчувальны грамадзянскі напал, мужнасць і маральная бескампраміснасць. Перад намі паэт без ілюзій, гэтым і цікавыя яго лепшыя вершы, Дайнека імкнецца ісці ад жыццёвага факта, вобразна яго асэнсоўваючы. Сярод такіх вершаў — «Самалёт», З часоў вайны ляжаў у дрыгве, «як выкапнёвы мамант», збіты варожай куляй ваенны самалёт. Паэт ажыўляе гэту рэліквію сваёй фантазіяй: самалёту сняцца сны пра неба, крылы просяць празрыстай вышыні. I прыйшло нарэшце збаўленне, яго паднялі наверх, і калі ён паказаўся з зямлі, усе навокал знялі перад ім шапкі. Мне здаецца, ёсць у гэтым вершы паэтычная свежасць, павага да подзвігу, намечаны цікавы мастацкі вобраз. У Дайнекі свядомая ўстаноўка на паказ значны і вельмі канкрэтны.

Адзін з лепшых вершаў — «Партызанская каша». Асабліва тыя радкі, дзе партызаны, якія сядзяць за кашай, уяўляюцца паэту касцамі, што паселі на лузе ў час абеду.

Аднак, хвалячы Дайнеку, яго за многае трэба і крытыкаваць. Творы, якія складаюць яго новую кнігу, якасна нераўнацэнныя. Побач з добрымі ёсць вершы «прахадныя», якія выглядаюць самі па сабе даволі прыстойна, а ў суседстве з тымі ж «Бусламі...», «Самалётам», «Партызанскай кашай», «Сузор'ем Арла» пакідаюць не самае лепшае ўражанне.

Паводле лепшых традыцый беларускай літаратуры ў асобе пісьменніка прызванне мастака заўсёды спалучалася з абавязкам грамадзяніна. Разам з тым нельга трактаваць грамадзянскасць і ідэйнасць у вузкім плане. Сёння нам да густу тая паэзія, якая ўся пранізана прагай пазнання і страснага сцвярджэння пазнаных ісцін. Нам не вельмі імпануюць паэты, якім усё ясна ад нараджэння, у якіх няма ніякіх турбот, пытанняў, а ёсць толькі адна (гэта ў 20 год!) сталасць, адукаванасць і падкаванасць. Не надта цікавыя яны як людзі, а значыць, і як паэты. У гэтым сэнсе павучальны вопыт і лёс тых, хто

прыйшоў у паэзію ў другой палавіне 50-х гадоў і ў пачатку 60-х. Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі, Сцяпан Гаўрусёў, Ніл Гілевіч, Васіль Зуёнак, Уладзімір Караткевіч, Еўдакія Лось, Юрась Свірка і іншыя — усе яны ішлі ў літаратуру настойліва, падчас фарсіравана, імкнучыся абавязкова сказаць сваё слова.

У іх паэзіі надзвычай дакладна і праўдзіва адбіліся жыццёвыя дарогі цэлага пакалення: украдзенае вайной дзяцінства, цяжкасці, нястачы пасляваеннай пары. Нас да гэтага часу вабіць у паэзіі Ю. Свіркі тое, што яна не баіцца жыццёвых, быццам бы зусім не «паэтычных» праблем. Паэт гаворыць пра іх публіцыстычна, аднак яго вершы ў той жа час не пазбаўлены і спакойнага засяроджанага роздуму. Асоба паэта праяўляе і сцвярджае сябе ў разнастайнасці актыўных адносін да жыцця, у пошуках, часам нялёгкіх і пакутлівых.

З цікавай паэмай «Вянок» у дзесятай кніжцы часопіса «Маладосць» за мінулы год выступіў Р. Тармола. Ствараецца ўражанне, што паэт доўга шукаў сваю тэму, новы падыход да яе. Тое, што ён знайшоў, цікава і па задуме, і па выкананні. «Піянеру Колю Гойшыку, камсамольцу Міколу Кедышку, камуністу Мікалаю Гастэлу» прысвечаны яго «Вянок».

У восьмым нумары «Маладосці» за 1973 год Анатоль Грачанікаў надрукаваў свой верш «Школа танцаў», У якім ёсць усё — і жарт, і гумар, і іронія, і разам з тым вельмі шмат сур'ёзнага. Ёсць падставы гаварыць аб тым, што ў творы ў своеасаблівым успрыняцці адбіліся некаторыя вельмі істотныя, у тым ліку супярэчлівыя бакі сучаснасці. Цікава выступіў паэт у свой час і на «Паэтычнай паверцы» ў «ЛіМе» (31 сакавіка 1972 года). Наяўнасць асобы паэта азначае павелічэнне «працэнта» жыцця ў яго творах, узмацненне грамадзянскага пачатку паэзіі.

Вядома, нельга чакаць, каб у маладых асоба выяўляла сябе так стала і выразна, як у П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова, П. Панчанкі, А. Пысіна, М. Лужаніна і многіх, многіх іншых, чыя паэзія раскрыла працэс духоўнага развіцця чалавечай асобы ў барацьбе за сацыялізм і камунізм. Засмучае другое: маладыя менш, чым трэба б было, вучацца ў старэйшых. Таму, калі сустрэнеш у іх уплывы Танка, Куляшова, Панчанкі, то гэта толькі радуе. Больш трэба чытаць сваіх добрых настаўнікаў, вучыцца ў іх! І набываць свой уласны жыццёвы вопыт. Нешта не чуваць апошнім часам, каб хто з маладых паехаў некуды на новабудоўлю, пажыў яе клопатамі. Па-ранейшаму перад паэзіяй востра стаіць праблема прафесійнага вывучэння жыцця, творчай актыўнасці, праблема самастойнасці і ініцыятывы ў падыходзе да

рэчаіснасці, якое сёння больш чым калі вымагае ад паэта праўды аб сучасніку.

У «Дні паэзіі», які выйшаў у мінулым годзе ў Маскве, змешчаны ліст Аляксандра Твардоўскага паэту Канстанціну Ваншэнкіну ў адказ на дасланую ім кнігу вершаў. У кнізе, пісаў Аляксандр Трыфанавіч, «проста няма дрэнных вершаў (падкрэслена А. Твардоўскім.— У. Г.), — у самым прахадным вершы — то зоркасць вока, то думка, то выраз,— што-небудзь — ды ёсць». І кніжка ў цэлым добрая, гаворыць Твардоўскі, «хваліць яе будуць з поўнай падставай», адзначаючы творчую прадуктыўнасць Ваншэнкіна, але,— працягвае ён далей,— «я не знайшоў, каб гэта прадуктыўнасць была ў плане і духу якойсьці генеральнай думы, захаплення якім-небудзь пачуццём, задачай, пошукам,— не, усяго патроху, але ў асноўным тая ж вельмі прыемная (пакуль што!) любоў да ўсіх жыцейскіх колераў і адценняў, гатоўнасць адклікнуцца на ўсё, што ідзе ў душу: на снег, на дождж, на прачытаную кнігу, праслуханую песеньку, заўважаную падрабязнасць той ці іншай карціны,— і адклікнуцца хораша, выразна, аднак ужо, даруйце мне, з некаторай набітасцю рукі ў малых сакрэтах творчасці».

Заўвага Твардоўскага актуальная, як ніколі.

Сёння сілы савецкіх людзей скіраваны на ўзрастанне эканамічнай магутнасці краіны, умацаванне міру паміж народамі, на далейшы ўздым сацыялістычнай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, навукі і культуры.

«На якой вышыні мой сцяг?» — вось тое галоўнае, сфармуляванае Піменам Панчанкам пытанне, над якім абавязаны задумацца кожны сучасны паэт, калі ён усур'ёз ставіцца да сябе як да літаратара-грамадзяніна, закліканага спецыфічным сродкам — мастацкім словам — удзельнічаць у сучасным жыцці, рухаць яго да вяршынь прагрэсу.

# БУДНІ І СВЯТЫ ПАЭЗІІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

На маім пісьмовым стале — цэлая бібліятэка паэзіі: каля трох дзесяткаў кніг, якія былі выдадзены за некалькі апошніх год для дзяцей дашкольнага ўзросту і вучняў пачатковых класаў. Гэта вершы, песні, паэмы, казкі, байкі, загадкі, лічылкі, розныя дзіцячыя карацелькі, скорагаворкі, пацешкі.

У дзіцячай паэзіі — ні для кога ні сакрэт — свае вялікія і вельмі адказныя задачы. Ідэйна-маральныя ўстоі і ўяўленні складваюцца непасрэдна пад яе ўплывам, яна дае веды, фарміруе погляд на навакольны свет, вучыць любіць Радзіму, родную прыроду, выхоўвае любоў да працы, культурных каштоўнасцей. Кніга, калі чалавек падружыцца з ёй з дзяцінства, робіцца яго добрым спадарожнікам на ўсё жыццё. Яна пашырае кругагляд, уводзіць дзіця ў новы, невядомы свет. Ян Бжэхва, выдатны польскі дзіцячы пісьменнік, сцвярджаў, што «для дзіцяці кніга — галоўная духоўная патрэба, такая ж важная для развіцця, як вітаміны...».

Свае задачы, эстэтычныя асаблівасці і адценні, свой выключна эмацыянальны, прадметны лад мыслення, яркая мастацкая форма — тут усё ўзаемазвязана адно з другім, усё падпарадкавана неабходнасці выхавання развітай, паўнацэннай асобы дзіцяці.

Вядома, што дашкольнікі і школьнікі малодшых класаў асабліва любяць вершы, ахвотна іх чытаюць і слухаюць, завучваюць на памяць і дэкламуюць. Менавіта верш у гэтым узросце становіцца адной з галоўных асноў для выхавання і развіцця мастацкага густу. Я ведаю, як не лёгка бывае часам у «дарослай» паэзіі адрозніць сапраўдную мастацкую каштоўнасць ад падробкі, сурагату. Тут патрэбен часам надзвычай глыбокі, кваліфікаваны падыход і нават своеасаблівы талент ацэнкі. А ў дзіцячай паэзіі мяжа, што аддзяляе мастацкі твор ад падробкі пад яго, эрзаца, яшчэ больш тонкая і рухомая. Тым большая адказнасць друку, выдавецтваў, крытыкі перад маленькім чытачом.

У нас, здаецца, няма амаль ніводнага паэта, у якога б не было кніг ці твораў для дзяцей. Пра гэта сведчыць і анталогія беларускай дзіцячай літаратуры, выдадзеная некалькі год назад у двух тамах. Для дзяцей пішуць літаральна ўсе, хто піша і для дарослых. Пішуць і тыя, што яшчэ не сталі прафесійнымі пісьменнікамі, але актыўна выступаюць як аўтары дзіцячых кніг: В. Лукша, М. Бабарыка, К. Баразна, А. Ільюшэнка, Н. Галіноўская, Н. Корзун, Я. Крупенька, Э. Перагуд, В. Місун, Я. Калашнікаў, Н. Шклярава і многія іншыя.

Адразу хацелася б адзначыць адну прыемную і шматабяцаючую тэндэнцыю: апошнім часам кніга для дзяцей у заўважнай сваёй

частцы робіцца сапраўды кнігай у самым дакладным і адказным значэнні гэтага слова — творам цэласным і закончаным, выкананым на добрым паліграфічным узроўні, у якім арганічна паядналіся эстэтычныя намаганні і пісьменніка і мастака-афарміцеля. І ў лепшых з іх аўтары — пісьменнік і мастак — выступаюць як своеасаблівыя сапернікі, што спаборнічаюць у выразнасці і дасканаласці свайго мастацтва, у перадачы яго адрасату. Такую кнігу — прыгожа, з добрым густам аформленую — прыемна, як кажуць, узяць у рукі, пагартаць. А маленькага чытача да яе проста цягне: добрая кніга ў яго ўяўленні — гэта абавязкова і прыгожая кніга!

З мастакоў, якія асабліва старанна і плённа, з вялікай любоўю да справы ўдзельнічаюць у стварэнні кнігі, я назваў бы А. Лось, Н. Паплаўскую, В. Шаранговіча, П. Драчова, В. Бароўку, Я. Куліка, Ю. Зайцава, А. Грубіну, А. Луцэвіча, С. Кавалёва, У. Рудакова, Б. Забо-рава, В. Тарасава і некаторых іншых.

Помніцца, на VI з'ездзе пісьменнікаў агульны стан паэзіі для дзяцей быў намаляваны даволі крытычнымі фарбамі. «Трэба пры-знаць, аднак,— гаварыў М. Танк у справаздачным дакладзе з'езду,— што шмат яшчэ друкуецца і шэрых, пасрэдных зборнікаў такой паэзіі, якая нават і вопытнымі, здольнымі паэтамі робіцца часам як бы з адходаў іх асноўнай «дарослай» паэтычнай вытворчасці. А што ўжо гаварыць пра паэтаў слабых ці проста пра графаманаў? Поле дзейнасці для апошніх якраз найбольш прасторнае ў нашай дзіцячай літаратуры — там яны браканьерствуюць няўлоўна і беспакарана».

Ацэнка суровая і ў многім справядлівая! Яна павінна дапамагчы нам узмацніць патрабаванні і выправіць многія недахопы.

І ўсё ж такі за апошні час, асабліва пасля пастановы аб далей-шым развіцці дзіцячай літаратуры (1969) у актыве дзіцячай паэзіі з'явіўся шэраг твораў, якія здольны на сённяшні дзень у многім паслабіць такую суровую ацэнку. А некаторыя з іх смела можна залі-чыць да безумоўных мастацкіх удач нашай літаратуры.

Узяць, напрыклад, шырокавядомую «Чытанку-маляванку» Васіля Віткі (1971), разлічаную ў асноўным на самых маленькіх — дашкалят. Асабіста мяне яна вабіць перш за ўсё тым, што ў ёй мудры дзядулін вопыт трывала і шчыра спалучыўся з незамглёнасцю першаснага адкрыцця свету, радаснага знаёмства дзіцяці з жыццём.

Правільна і быццам бы прачытаўшы «Чытанку-маляванку» гава-рыла крытык А. Марчанка ў артыкуле «Ключы ад «краіны дзяцін-ства...» («Детская литература», 1973, № 2): «Той, хто піша для дзяцей, абавязаны улічваць асаблівасці дзіцячага ўспрыняцця і перш за ўсё тое, што дзіця бачыць свет... у «першародным бляску» : фарбы без

адценняў, гукі — мацней, пахі — выразней. А галоўнае тое, што свет прадстае перад маленькім «першапраходцам» не фрагментарным, а цэласным».

Пісьменніцкая праца В. Віткі living разнагаліновая. Выдадзены нядаўна яго двухтомнік сведчыць, як плённа аўтар працуе ў розных відах і жанрах літаратуры. Аднак я, прызнацца, як і многія іншыя літаратары, схільны найперш бачыць у яго асобе выдатнага дзіцячага пісьменніка.

Што характэрна для Віткі — дзіцячага пісьменніка? Яго самабытнае мастацтва грунтуецца на глыбокім разуменні псіхалогіі ўражлівага дзіцячага характару, павазе і адказнасці за яго выхаванне.

«Чытанка-маляванка» пісалася, відаць, не адзін год, не адзін год шліфаваліся, удасканальваліся ў гучанні яе «ладачкі-ладкі», «пацешкі», «скорагаворкі», «лічылкі», «гульні», «задачкі» і іншыя творы для дзяцей. Свет гэтай кнігі вельмі яркі, бясхмарны і бяскрыўдны. Ідучы яго дарогамі, маленькі чытач адкрывае для сябе шмат новага, нязнанага. І, можа, перш за ўсё — непаўторную музыку роднага слова. Яна мне чуецца ў віткаўскай «Калыханцы» :

Люлі, люлі, люлі,
Дзеткі ўсе паснулі.
Не спіць толькі коця,
Ходзіць па балоце.
Застудзіў ён лапку,
Прыйшоў грэцца ў хатку…

Напачатку, перш чым усвядоміць сэнс слова, дзіця якраз засвойвае яго музыку, «гармонію», прывыкае да гучання. «Бабіны госці», «Дарожка», «Коця і Каця», «Млын» вабяць якраз гэтай вось нязмушанасцю паэтычнай мовы: «Чыкі, чыкі, чыканачкі, едзе зайчык на саначках…». Малыш зачараваны самой музыкай слова.

Для пазнання свету вялікае значэнне мае, зразумела, не толькі музыка мовы. Вітка цудоўна можа жывапісаць словам, усё больш і больш пашыраючы свет уяўленняў свайго чытача, узбагачаючы яго слоўны запас, лексіку.

«Чытанка-маляванка» па-свойму універсальная. Кожны чалавек «ад двух да пяці» знойдзе ў ёй шмат цікавага для сябе, для кожнага ў ёй ёсць нечаканасць, нейкае адкрыццё. Пазнанне свету грунтуецца на трывалай і шматслойнай народнай аснове. Між іншым, ёсць, на маю думку, у гэтым чалавеку — лірычным, так сказаць, героі «Чытанкі-маляванкі» — нешта ад старажытнага скамароха, традыцыйнага веселуна-жартаўніка, і ад мудрага дзядулі-выхавацеля, якога так моцна і аддана любяць унукі, і за ўсімі гэтымі постацямі (што асабліва

важна) стаіць наш сучаснік, чалавек дваццатага стагоддзя з яго сённяшнімі ведамі, уяўленнямі, побытам...

Прыйшоў ён, дзед Васіль, да ўнукаў з незвычайным карабцом, адчыніў яго, і адкрылася багацце незвычайнае:

Ёсць тут маляванні,
Складачкі-чытанкі,

Байкі-самаграйкі,
Песні-калыханкі,

Жарты-перакруткі,
Гулі-самагудкі,

Лічылкі, загадкі,
Ладачкі-ладкі...

Вось яно, цудоўнае, накопленае вякамі жанравае — калі гаварыць «літаратуразнаўчаю» моваю — багацце дзіцячай паэзіі. Пра яго нельга забываць, зводзячы мастацкую разнастайнасць паэзіі для маленькіх да адных, часта малавыразных, вершаў.

Народна-фальклорныя элементы ў паэзіі В. Віткі для дзяцей бачны ва ўсім. У тым, скажам, якое значнае месца ён адводзіць казкам, калыханкам, загадкам і іншым жанрам, чые вытокі караняцца ў сівой мінуўшчыне народа. Вітка і другія паэты правільна робяць, літаратурна асвойваючы і ўзнаўляючы іх, быццам бы даючы ім другое, доўгае жыццё.

Праблемы даступнасці, якая часта і не без падстаў непакоіць некаторых дзіцячых паэтаў, для Віткі амаль не існуе. Часцей за ўсё ён расказвае пра навакольны свет, знаёмячы дзяцей з невядомым, адкрываючы яго паэтычны сэнс. З гэтай мэтай паэт нярэдка піша ва ўмоўнай манеры, якая, як вядома, вельмі характэрна для дзіцячага фальклору. Фальклорныя сюжэты чаргуюцца з арыгінальнымі, такімі, як «Праводзіны снежнай бабы» — «Чаму ля дзетсада маршы і песні? Снежная баба едзе на пенсію...», дзе столькі дзіцячай весялосці, смеху, элементаў гульні...

І, можа, адзіны (прынамсі, мне так здалося) спрэчны выпадак, калі цудоўнае майстэрства паэта часткова ператвараецца некаторымі сваімі гранямі ў самамэтаю фабульную гульню,— верш «Валакуча», «Кузьма падкузьміў Ягора, Ягор аб'ягорыў Рыгора, Дзямід паддзямідзіў Мікіту» і г. д., усе збегліся ў адно месца, «от была буча, кучавалакуча!». Так — крыху легкавата, больш нагадваючы свет дарослых — заканчваецца верш. Зрэшты, гэта — на маю думку, якую можна і

аспрэчыць, маючы на ўвазе вялікую ролю славеснай гульні ў паэзіі для маленькіх.

«Да пяці год дзіця нічому не вучаць, але яно пазнае больш, чым потым за ўсё жыццё»,— тонка, ва ўласцівай для яго парадаксальнай манеры заўважыў В. Шклоўскі. В. Вітка, відаць, добра пра гэта ведае і імкнецца шырэй пазнаёміць свайго маленькага чытача з навакольным светам. Прадметы хатняга ўжытку, рэчы, побыт, звяры, птушкі, праца, чалавечыя ўзаемаадносіны — паэт расказвае пра ўсё ў вясёлай дасціпнай форме, выкарыстоўваючы багаты арсенал самых разнастайных выяўленчых сродкаў.

«Чытанка-маляванка» належыць, бясспрэчна, да лепшых узораў беларускай дзіцячай паэзіі. Колькасць такіх кніг увесь час павялічваецца. У іх знаходзіць сапраўды высокамастацкае адлюстраванне цудоўная пара дзяцінства.

Дзяцінства... Першапачатковы перыяд чалавечага жыцця. Непаўторны, незабыўны, бясконца дарагі для нас час, калі закладваюцца найбольш глыбокія эмацыянальныя асновы светапогляду чалавека.

Свет простых рэчаў, што абступае чалавека з усіх бакоў, з якой прагай і цікавасцю мы знаёміліся з табой у маленстве! Любоў і цікавасць да «тых часоў» застаецца ў чалавеку на ўсё жыццё, і нярэдка ў сваю «дарослую» пару ён заглядае ў дзіцячую кнігу, у тую, на якой выхоўваўся некалі сам, і ў новую, свежую, якую купіў і прынёс сыну. Нездарма некалі В. Бялінскі настойліва раіў пісьменнікам: «Пішыце, пішыце для дзяцей, але толькі так, каб вашу кнігу з насалодай прачытаў і дарослы, і, прачытаўшы, перанёсся б лёгкаю мараю ў светлыя гады свайго маленства».

У сэрцы кожнага дзіцяці жыве казка. Некаторыя таварышы, здараецца, залішне, часцей за ўсё несправядліва, папракаюць дзіцячую паэзію драбнатэм'ем. Маўляў, занадта шмат там розных малаістотных «дробязей» — зайчыкі, чарапашкі і г. д.

Акрамя «Чытанкі-маляванкі», перада мной кнігі для дзяцей «Лясная зарадка» Н. Галіноўскай (1965), «Пралеска» В. Вярбы (1968), «Ластаўка» А. Дзеружынскага (1970), «Зайчык-выхваляйчык» Е. Лось (1970), «Мы таксама падрасцём» І. Муравейкі (1971), «Каля млына» А. Лойкі (1972), «Сонца ў хованкі гуляе» М. Чарняўскага (1970), «Колеры» Я. Крупенькі (1973), «Каго баяцца ў лесе» Р, Тармолы (1973), «Дванаццаць пасланцоў» С. Шушкевіча (1973), «Дагані на kані» Д. Бічэль-Загнетавай (1973), «Тры казкі пра зая» Г. Бураўкіна (1974) і інш.

На якім, так сказаць, матэрыяле яны напісаны?

«Кот-чэмпіён», «Для чаго снягір каляровы», «Птушкі вярнуліся з выраю», «Першы дожджык», «Бусел», «Пеўнік», «Сонечны зайчык» —

назвы вершаў (яны ўзяты намі са зборніка І. Муравейкі, але характэрны і для інш.) гавораць самі за сябе: рэчы і з'явы, пра якія напісаны вершы,— традыцыйныя прадметы дзіцячай паэзіі, элементы таго свету, які звычайна акружае чалавека з самага дзяцінства. Падобныя тэмы і матывы можна сустрэць у многіх паэтаў, і такая акалічнасць нікога не павінна здзіўляць. Справа, відаць, найбольш у стаўленні паэтаў да гэтых традыцыйных, «вечных» тэм, у неабходнасці новых вобразных рашэнняў. Скажам, каго не цікавіла ў свой час, «для чаго снягір каляровы». У вершы І. Муравейкі з такім запытаннем да снегіра звярнууся Петрусёк. І птушка адказала:

— Адкажу табе, сябрук,—
Каб хутчэй мяне ты ўбачыў
І хоць жменьку даў мне круп.

Аўтар здолеў знайсці новы, нечаканы паварот, верш набыў чалавечую цеплыню, не страціўшы прастаты, яснасці паэтычнага перажывання.

«Установка» на новы падыход да традыцыйных вобразаў, свежае вырашэнне тэмы, безумоўна, правільная, бо, прызнацца, набілі аскоміну стэрэатыпныя кошкі, пеўнікі, вавёркі, стракозы і г. д., што вандруюць без усякіх змен па многіх кнігах.

Гартаю кніжкі, што сабраліся ў мяне на стале...

Свет дзіцячай паэзіі выглядае па-святочнаму стракатым, шматфарбным, непадробны вясёлым. Відаць, інакшым ён і не можа быць сёння. Вось як успрымае навакольную рэчаіснасць маленькі герой з верша П. Пранузы:

Я — вясну малюю,
Фарбаў не шкадую.
Колерам зялёным —
Дрэвы і палеткі,
Колерам чырвоным —
Сонейка і кветкі.
Колерам блакітным —
Неба, ручаіну.
А якую фарбу
Воблачку пакіну?
Я вясну малюю...

Ёсць, з аднаго боку, у ім, гэтым чароўным свеце, свая цэласнасць і завершанасць. Гэта — ясны, недвухсэнсоўны свет, дзе ва ўяўленні малыша ўсё закончана, усё на сваім месцы. З другога боку, чалавечы свет, які ў дзіцячым узросце асабліва актыўна пашыраецца і абнаўляецца.

Плывуць караблі, пушчаныя хлапчукамі, у даўнім (1947 г.) вершы К. Кірэенкі — «і ў думках іх ззяюць марскія прасторы, і свецяць партоў маякі». Гэта — метафарычнае ўвасабленне дзіцячай мары пазнаць свет — той, што далёка за гарызонтам: «Мы чуем, што мы не адной Беларусі, а ўсёй Радзімы сыны».

Калі гартаеш некаторыя сённяшнія дзіцячыя кнігі, то, паўтараю, часта ловіш сябе на думцы аб некаторай тэматычнай звужанасці, здрабненні многіх традыцыйных вобразаў. П. М. Машэраў у дакладзе на XIII пленуме ЦК Кампартыі Беларусі звярнуў увагу на сур'ёзныя заганы, якія ўласцівы дзіцячай літаратуры, асабліва для малодшага ўзросту. «У эпоху небывалага ўзлёту навукі, тэхнікі, тэхналогіі, асваення космасу,— сказаў ён,— дзіцячая літаратура ўсё яшчэ топчацца вакол лясных гномаў, казачных прынцаў і Іванкаў-дурачкоў». Заўвага наколькі сур'ёзная, настолькі ж і справядлівая. Над ёю павінны задумацца нашы дзіцячыя пісьменнікі, бо задача пашырэння тэматычных, пазнавальных абсягаў — адна з першачарговых у дзіцячай літаратуры. Некаторыя гэта адчуваюць. Правільна робіць, скажам, М. Чарняўскі — аўтар кніжкі «Сонца ў хованкі гуляе»,— імкнучыся да ўвасаблення сучаснай тэмы. Яго верш «Сустрэча з зубрамі», дзе зубрамі аказаліся магутныя МАЗы, прасякнуты гонарам за нашы вялікія дасягненні ў машынабудаванні.

Добрага слова заслугоўвае, на маю думку, вершаванае апавяданне Е. Лось «Здарэнне ў пушчы» (з кніжкі «Зайчык-выхваляйчык»), з якога маленькі чытач даведаецца аб пагранічніках, іх сённяшнім жыцці, трывожнай службе. Пра яе аўтар імкнецца расказаць праўдзіва, няспрошчана.

Паэзія павінна пашыраць сферу ўяўленняў дзіцяці, актыўна фарміраваць яго ўнутраны, душэўны свет, задавальняць у дзіцяці прагу ведаў, даваць адказы на яго пытанні, гаварыць пра самае важнае. А ў такім узросце важным можа быць рознае.

Наш сучаснік інтэнсіўна вывучае космас. Тэма актыўна просіцца ў дзіцячую паэзію. Яе распрацоўваюць такія паэты, як П. Макаль, А. Вольскі, М. Калачынскі, І. Муравейка, часткова А. Бялевіч і многія іншыя, у тым ліку Н. Галіноўская, якая адрасуе свае творы для самых маленькіх. Яна — аўтар цэлага шэрагу кніжак для дзяцей менавіта гэтага ўзросту. Яе героі таксама хочуць стаць касманаўтамі:

Я насунуў шлем на бровы,
Плашч надзеў я васільковы.
Ранак добры, сонца свеціць,
Карта, компас у ракеце,
Агуркі, гарбуз вялікі,

Можна ў космас адлятаць,
Ды бяда вось: чаравікі
Не магу зашнураваць.

*("Касманаўт")*

Тэмы велічныя суседнічаюць у яе вершах з бытавымі, Маленькія героі прагнуць пра ўсё ведаць, пра тое, што далёка і што блізка. Паэтэса імкнецца ўлічваць дзіцячую псіхалогію. Скажам, схільнасць дзяцей задаваць размаітыя, часам вельмі нечаканыя пытанні:

Вельмі любіць наша Таня
Задаваць усім пытанні.
— А чаму,— пытае ў маці,—
Не расце маліна ў хаце?
— А чаму,— пытае ў таты,—
Наш гарох такі вусаты? і г. д.,

але чамусьці дае на ўсе пытанні вельмі незразумелы адказ — праўда, з прэтэнзіяй на гумар:

— А таму, унучка,
Што ты — чамучка.

Свядомасць, унутраны свет чытача гэтага ўзросту развіваецца асабліва інтэнсіўна. Пісьменніку абавязкова трэба ўлічваць заканамернасці развіцця інтарэсаў дзіцяці.

Ідэйная накіраванасць, сэнсавая напружанасць у дзіцячай паэзіі павінны быць такія ж, як і ў «дарослай». А ў Галіноўскай не-не ды і сустрэнеш вершы легкаважкія, драбнаватыя па думцы. Ёсць яны і ў яе кнізе: «Лясная зарадка», «Папугай», «Кошка-памочніца», «Клубок», «Чырвоны шар» і інш.

Нешта падобнае можна сказаць і аб кніжцы В. Вярбы «Пралеска». А між тым тут ёсць вершы неблагія, прысвечаныя роднай прыродзе, яе прыгажосці. Толькі хацелася б, каб на прыроду паэтэса глядзела сучаснымі вачыма, бачыла і новае ў ёй, змены, што прынесла ў яе дзейнасць чалавека. Не будзем забываць: паэзія для дзяцей — адзін з самых плённых спосабаў пазнання свету.

Мы ўжо на прыкладзе В. Віткі гаварылі аб жанравай разнастайнасці нашай дзіцячай паэзіі. Багацце жанравай палітры азначае багацце эстэтычна-пазнавальных магчымасцей паэзіі, значнасць выхаваўчага ўплыву на чытача.

Асабліва спрыяюць дзіцячаму пазнанню свету загадкі, вельмі дасціпныя мастацкія творы. Прызнаны майстар гэтага жанру — Н. Гілевіч. Яго кніга, што так і называецца — «Загадкі» (1971), цудоўна аформлена Аленай Лось.

Народная аснова многіх з загадак Н. Гілевіча — несумненная.

Бычок крутарогі

Ідзе без дарогі,
У лесе не трэсне,
На плёсе не ўсплёсне,
Праз возера скочыць —
Капыткоў не памочыць.

У гэтай загадцы зашыфраваны не проста месяц, а месяц-маладзік («крутарогі»).

Вельмі каштоўная якасць загадак Гілевіча — талент гумару, заўсёдная настроенасць на жарт, весялосць. Яны разлічаны на розны ўзрост, з цікавасцю над імі «паламае галаву» дашкольнік і школьнік, і не толькі малодшых класаў.

Загадкі Гілевіча патрабуюць разумовага напружання, будзяць фантазію, выхоўваюць уменне думаць, аналізаваць:

Па зямлі я не хаджу
І на неба не гляджу,
Вочы маю — не міргаю,
Маю рот — не гавару,
Ёсць і хвост, але не звер я
І не птах, хоць ёсць і пер'е,
Хаты зроду не будую,
Ды ні трохі не бядую.

Не адразу адгадаеце, што гэта — рыба.

Цікавую, дасціпную кнігу своеасаблівых загадак «Сонечны клубочак» прыдумаў В. Зуёнак. У адрозненне ад Н. Гілевіча ён не акцэнтуе ўвагі на дакладным апісанні прыкмет схаванай у загадцы разгадкі. Ён рыфмуе слова — адгадку з адпаведным папярэднім радком, выхоўваючы такім чынам слых і ўважлівасць чытача да слова.

Песні ўсе пяюць наўкола,
А ў яго — слабенькі голас...
— Пых! Пых! — дайце ножык:
Зробіць дудку сабе...

— Вожык! — усклікае малыш. Тут жа, побач,— малюнак: вожык з дудкай.

Вельмі добра, калі паэт шукае сябе ў распрацоўцы розных тэм, кола якіх увогуле неабмежаванае.

Арыгінальная задума вадзіла пяром В. Лукшы, калі ён пісаў сваю кнігу вершаў «Аркестр», у якой паставіў мэту ў дасціпнай форме расказаць аб розных музычных інструментах — кларнеце, дудзе, фагоце, гітары і г. д. Пра многія інструменты яму ўдалося сказаць «галоўнае», што іх вылучае, раскрыць іх своеасаблівасць у агульным «аркестры»:

— Хоць вы чуеце

Не часта
Гуслі струнныя,
Званчастыя —
Не раскажаце
Без нас
Ні быліну,
Ні сказ.

Ёсць у яго, праўда, і менш удалыя, «прахадныя» вершы: «Трохвугольнік», «Чалеста», «Домра» і некаторыя іншыя, якім нестае арыгінальнай думкі.

Пазнанне свету і выхаванне ў дзіцячай паэзіі неад'емныя ад усведамлення прыгожага і добрага. Калі ўлічыць сучасныя патрабаванні, трэба сказаць, што даўно пара нашым дзіцячым паэтам стварыць маштабны чалавечы вобраз накшталт дзядзі Сцёпы ці, напрыклад, доктара Айбаліта, каб яго шчыра палюбіла, каб ім захаплялася наша дзетвара.

Верш павінен гаварыць пра самае важнае для чалавека. Задача дзіцячай паэзіі — давесці сваімі, уласцівымі ёй сродкамі да свядомасці маленькага чытача, што такое добра і што — дрэнна.

У сучаснай літаратуры вельмі ўзрасла цікавасць да маральных, выхаваўчых праблем. У дзіцячай жа паэзіі гэты паварот пакуль што адчуваецца слаба. Многія паэты абмяжоўваюцца знешняй фіксацыяй розных, часта малазначных дэталей рэчаіснасці ў іх дзіцячым успрыманні:

Мне купілі
Новы мячык.
І ён скача,
Нібы зайчык.
Я кажу яму:
— Чакай!
Ад мяне ты
Не ўцякай!
Усміхнуўся мячык,
Потым
Ён спыніўся
Каля плота,
Мне гаворыць:
— Каб не плот,
Паскакаў бы
Ў агарод!

Чым і каго зацікавіць такім вершам Я. Крупенька?

А між тым ён не навічок у дзіцячай паэзіі, у яго ёсць і добрыя вершы — хоць бы пра таго ж «тэлеграфіста-дзятла», які падказвае блізкі прыход вясны.

Крытыка павінна змагацца з паэзіяй сузіральна-нежывой, пасіўна-апісальнай, пазбаўленай душэўных намаганняў раскрыць і паказаць хараство і веліч нашай рэчаіснасці. «Дзіцячы пісьменнік,— справядліва гаворыць вядомы рускі дзіцячы паэт Ю. Карынец,— гэта Настаўнік з вялікай літары».

Але выхаванне гэта асобае. Трэба пазбягаць залішняй дыдактычнасць памятаць адзін з няпісаных законаў педагогікі: дзіця не павінна заўважаць, што яго вучаць. Неабходна выхаваўчую ідэю даносіць да малога чытача ў дасканалай, лёгкай, вясёлай форме.

Умее жывы дыялог з захаваннем размоўных інтанацый пабудаваць Н. Галіноўская:

— Міша, вымый свае ногі.
— Бабка, я не чую.
— Падымі свой шарф з падлогі.
— Бабка, я не чую.
— Міша, на табе цукерку.
— Бабка, дзве хачу я.

*(«Міша»)*

Дакладны разлік, для каго ты пішаш, мае ў паэзіі для дзяцей, паўтараю, вялікае значэнне.

Сучасная дзіцячая паэзія значна ўзмацніла свой гуманістычны пафас. Гэта адчуваецца ў многіх кнігах. Вельмі харошая, чалавечая думка — «як бы цяжка ні было, ведай, шчасце прыйдзе. Не рабі ніколі зло і слабых не крыўдзі»,— вынікае з казкі Г. Бураўкіна «Зай і яблынька», адной, думаецца, з самых удалых у сучаснай беларускай дзіцячай паэзіі.

Кніга М. Чарняўская «Сонца ў хованкі гуляе» разлічана, галоўным чынам, на школьнікаў малодшых класаў. З першых старонак яе герой развітваецца з цацкамі, збіраецца ў школу. Многія вершы прысвечаны школьнай вучобе, побыту. Спадабаўся мне верш «Ручай»:

Бяжыць ручай, спяшаецца,
Бо ведае, што часта
Адтуль,
Дзе ён канчаецца,
Рака бярэ пачатак.

Кніга населена ў асноўным школьнікамі, яны паказаны ў вучобе, працы, гульнях. Аднак, часам М. Чарняўскі паказвае сваіх герояў залішне наіўнымі (верш «Чыстапісанне») і, здараецца, вельмі паблажліва ставіцца да такіх іх учынкаў, за якія трэба строга ўшчуваць

(«Прапажа»). А выхаванне чэснасці, смеласці, самаадданасці было і застаецца першачарговым клопатам паэзіі для дзяцей.

Дзіцячыя творы М. Хведаровіча таксама адрасаваны ў асноўным школьнікам малодшых класаў. Даўно помніцца яго мілы верш «Чачотачка». Чым вабіць ён — музычнасцю ці нейкай дзіўнай замілаванасцю да гэтага маленькага стварэння?

Скача ў полі чачотачка,
Жвава так шчабеча —
Жоўценькая вяхотачка,
Чорненькія плечы...

Вельмі ўдалы верш «Паслухмяны сынок» — пра Уладзіка, у яго хварэе маці, а ён «і посуд памые, і збегае ў краму, бо вельмі шануе любімую маму».

Праўда, і ў Хведаровіча не ў кожным вершы знаходзім свежую думку. Часам ён абмяжоўваецца даволі банальным паўтарэннем даўно вядомага (вершы «Балельшчык», «Сонечны зайчык»), накшталт таго, што Ігнасік замест вучобы дзень цэлы «з ранку да вечара мячык шпурляе». Не новая думка — і просталінейны вывад:

Настаўніца ўчора
Сказала Ігнасю:
— Яшчэ год пакінем
Цябе ў гэтым класе.

Апошнім часам часцей сталі выходзіць кнігі выбранага беларускіх дзіцячых паэтаў. З такой кнігай пад назвай «Рагатка» выступіў А. Вольскі, які вельмі ахвотна піша пра лес, птушак, прыроду, пра тое, як трэба любіць іх і берагчы.

Актыўным зарадам выхаваўчага ўздзеяння на чытача школьнага ўзросту валодае публіцыстычна напорыстая паэзія К. Кірэенкі, адрасаваная дзецям.

Хлопчыкі,
Не крыўдзіце дзяўчынак,
Хлопчыкі,
Вы ж будучыя воіны.
Помніце:
Без дружбы немагчыма
Перайсці
Праз ростані і войны...

Або ў другім вершы:

Былінныя штурмы, паходы,-
Як полымя ў ззянні вякоў.
Запомнім, сябры, назаўсёды
Вялікія справы бацькоў.

Падобныя матывы гучаць у вершы С. Пашкевіча «Дзедаў партрэт», герой якога ганарыцца сваім дзедам-будзёнаўцам: «Не ў адным паходзедзед мой быў.

Белых генералаў моцна біў". Такія радкі выхоўваюць любоў да Радзімы, да гераічных старонак яе гісторыі. Тэму дружбы народаў вельмі плённа распрацоўвае Э. Агняцвет. Чакаем яе новых кніг для дзяцей. І ад усей паэзіі - распрацоўкі тэм, якія б выхоўвалі савецкі патрыятызм, адданасць камуністычным ідэалам вернасць народу, партыі, Радзіме.

Кола выхаваўчых абавязкаў паэзіі для маленькіх як бачым, шырокае. Яна сваімі сродкамі вырашае адказныя задачы выхавання пачуцця патрыятызму Вярнуліся з выраю птушкі:

На дрэве на кожным
Птушыны гоман:
— Як добра дома!
— Як добра дома!

*(І. Муравейка)*

Усведамленне радзімы, любоў да яе пачынаецца з такіх во немудрагелістых ісцін.

Адна важных задач дзіцячай літаратуры — актыўны удзел у працоўным выхаванні падрастаючага пакалення. Як паэзія заахвочвае дзяцей да працы?

Тэма працы займае значнае месца ў творах М Ка лачынскага для дзяцей. Ён малюе сваіх герояў на птушкаферме і на пасецы, у кузні, і ўсюды - у абставінах працы. У вершы «Лясное наваселле» (кніга «Мая мазаіка») школьнікі садзяць маладыя дрэўцы, каб зрабіць людзям дабро, пакінуць добрую памяць аб сваіх справах.

У І. Муравейкі ёсць даволі ўдалы, на мой погляд, верш «Як сеялі абаранкі», дзе вядзецца свабодная, нязмушаная гаворка пра тое, колькі трэба чалавеку затраціць працы, каб абаранкі трапілі на стол. Паэт імкнецца эстэтызаваць працэс працы, паказаць яго ва ўсёй прывабнасці. У адным з вершаў І. Муравейкі хлопчык Андрэйка прымярае бацькаву шапку і не якую-небудзь, а шахцёрскую: «Цяпер засталося зусім небагата: хуценька вырасці гэткім, як тата».

Маленькі хлопчык у кнізе С. Шушкевіча «Дванаццаць месяцаў» таксама марыць стаць шахцёрам: «Каб быў добры ўраджай, соль здабуду, кожны знай».

Выхоўваючы любоў і павагу да працы, паэзія павінна высмейваць ленасць, нежаданне працаваць, марнатраўства. Паглядзіце, як без непатрэбнага нуднага маралізатарства Н. Галіноўская перадае размову дзвюх рыдлёвак:

Размаўлялі дзве сяброўкі,
Дзве жалезныя рыдлёўкі:
— Я ўскапала пляц пад боб,
Пад радыску і пад кроп,
Пад фасолю і часнок,
Гаспадар мой — Васілёк.
А сяброўка у адказ:
— Ты працуеш увесь час.
Добра жыць табе, цікава.
Я я« стаю ў кутку без справы,
Есць іржа мяне ўвесь час.
Гаспадар мой — Апанас.

*(«Два гаспадары»)*

Займальна крытыкуе ленасць С. Шушкевіч у «Казцы-былі пра рэпку».

Часта выходзяць у нас зборнікі вершаў для дзяцей А. Дзеружынскага. Не ўтоім: за колькасцю паэт часам забываецца пра якасць. Творчая ўдача звычайна чакае яго там, дзе ён актыўна ставіцца да таго, пра што піша. Вось верш «Агародніцы» — пра дзяўчынак Тадору і Алёну. Працавітая Тадора вырасціла цэлую градку памідораў, а градка Алёнкі — яна «ленаватая была» — зарасла пустазеллем. Аўтар імкнецца правільна накіраваць інтарэсы дзіцяці, выхаваць любоў да працы.

Арганічнай далучанасцю да свету сялянскай працы і побыту радуе вершаванае апавяданне Д. Бічэль-Загнетавай «Рыжая Палянка», якое склала асобную кніжку паэтэсы для малышоў. Такія ж — станоўчыя якасці можна знайсці ў нядаўна выдадзеным, хораша аформленым зборніку для дзяцей А, Лойкі «Каля млына».

Агульнавядомая, можна сказаць, думка: для дзяцей трэба пісаць таксама, як і для дарослых, толькі трохі лепш. Сказана гэта не без гумару, але вельмі правільна. Адказнасць пісьменніка вялікая: ён фактычна закладвае асновы мастацкага густу, усяго светапогляду чалавека. Пры дзіцячай даверлівасці густ, эстэтычныя ўяўленні Можна папсаваць у самым пачатку іх фарміравання. Пісьменнік павінен глыбока ведаць псіхалогію, своеасаблівы склад дзіцячага мыслення.

«...Дзіця,— казаў А. М. Горкі,— да дзесяцігадовага ўзросту патрабуе забавы, і патрабаванне яго біялагічна законнае. Яно хоча гуляць, яно гуляе ўсім і пазнае навакольны свет перш за ўсё і лягчэй за ўсё ў гульні, гульнёй. Яно гуляе і словам, і ў слове. Менавіта на гульні словам дзіця вучыцца тонка сцям роднай мовы, засвойвае музыку яго і тое, што філолагі называюць «духам мовы». Эстэтычная паўнацэннасць — вось найпершае патрабаванне да дзіцячай паэзіі,

тут патрабаванні да слова, гуку, рытму і г. д. павінны быць вельмі высокія. Тут патрэбна вялікае майстэрства.

Паглядзіце, як хораша ўмее пісаць гукам, рыфмай В. Вітка, эстэтызуючы такі, здавалася б, малапаэтычны працэс, як пілаванне дроў:

Наша вострая піла —
Не піла,
А пчала,
Не піла,
Не ела,
Ні разу не прысела.
А ўсё пела
І гула —
Вясёлая піла.
Папілавала дровы —
Будзьце здаровы!

Пра пілаванне дроў напісаў і П. Прануза:

Я паклікаў брата Вову:
— Пойдзем папілуем дровы.

Пілавалі, успацелі,
Адпачыць мы захацелі.

А піла не спачывае
І звініць, нібы жывая:

— Стомы я не ведаю,
Пілаваць гатова я
Бёрны і смалістыя,
Бёрны і дубовыя.

Брата і мяне здзівіла:
У пілы якая сіла!

Ёй нялёгка, а спявае
І сумотнай не бывае.

Неблагі верш, на маю думку,— але, у адрозненне ад віткаўскага, апісальны. У Віткі — канцэнтрацыя сэнсу, які падаецца весела, гулліва, без усякага прымусу. Змястоўнасць праяўляецца ва ўсіх кампанентах верша — у кожным слове, складзе, гуку, і ўсё гэта вабіць чытача, заахвочвае да працы, вучыць яе любіць. Трэба памятаць наказ В. Бялінскага дзіцячым пісьменнікам: «Дзеці... хочуць бачыць у вас сябра... патрабуюць ад вас насалоды, а не суму, расказаў, а не павучанняў».

Няма ніякіх падстаў дзяліць дзіцячую літаратуру на выхаваўчую і дзеля забавы. Зрэшты, апошняе, здаецца, ёй пакуль што не пагражае. Хутчэй наадварот, здараецца, што ёй нестае майстэрства, гульні словам.

«Недагледжана», мне здаецца, рытміка ў некаторых творах для дзяцей у Д. Бічэль-Загнетавай. У тым ліку ў вершы «Дзівак» (зборнік «Дагані на кані», 1973), сэнс якога цьмяны для дзяцей. Не ўпэўнены, што тут прыдатна такая вось рытмічная будова:

Нагавіцы выкруціў старанна
І пакрочыў шчаслівы хадок
З прахалодай прыемнай на целе.
А куды?
Куды вочы глядзелі!

Між іншым, і рэчы, і дрэвы, і кветкі на малюнках Ю. Зайцава, змешчаных у кнізе «Дагані на кані», выглядаюць залішне ўмоўнымі, дэфармаванымі, хоць адчуваецца, што мастак намагаўся ісці якраз ад дзіцячага ўспрыняцця.

Асабліва вялікую ролю ў дзіцячай паэзіі адыгрывае рыфма — багатая, свежая, нечаканая, К. Чукоўскі лічыў яе носьбітам сэнсу ў дзіцячай паэзіі. Тут — у галіне рытмікі, рыфмы — каралём выглядае Р. Барадулін, якому рыфма часам падказвае ўвесь верш.

У суботу
Сем янотаў
З раніцы вучылі ноты.
Ледзь адзін адолеў
                    ДО,
Уздыхнуў:
— На гэтым до!
А другі дайшоў да
                    РЭ:
— Нешта ў горле мне
дзярэ...

Ноты натуральна ўпісваюцца ў вершавую тканіну і вельмі дасціпна рыфмуюцца:

Сёмы ўзненавідзеў
                    СІ:
— Хоць мяне ты укусі,
Хоць прасі, хоць не прасі,
Мне цягнуць абрыдла сі.

Неахайна зарыфмаваныя, манатонныя, поўныя абстракцый і рыторыкі павярхоўна апісальныя вершы, у якіх нічога не адбываецца,— для дзяцей зусім не падыходзяць. Яны могуць выклікаць у іх толькі сум.

Праўда, часам, пагнаўшыся за дасціпнай рыфмай, аўтары ахвяруюць сэнсам. Напрыклад, вельмі банальнай выглядае гэтая гульня «ў рыфму» ў вершы М. Чарняўскага пра ластаўку:

А сама ды гнёзды
Лепіць.
Пэўна, лічыць —
Гэтак лепей.

Нельга пераацаніць ролі мастацкай фантазіі ў дзіцячай паэзіі. Аднак фантазія патрабуе ад паэта тонкага густу, пачуцця меры. Гэтае пачуццё, мне здаецца, здрадзіла Д. Бічэль-Загнетавай у некаторых яе дзіцячых вершах, напісаных у апошні час. Напрыклад, у вершы «Кіт у Нёмане», чытаем: «баба цэдзіць сырадой і, забраўшы ўвесь надой, да ракі прастуе, там кіта (? — У. Г.) частуе». Нейкая беспрадметная размова і ў такіх яе радках:

Маладзік мяне люляў.
Скінуў воблачка пад ногі.
Цэлы свет — мае дарогі.
Родны дом — уся зямля.

Юны чытач, гаварыў А. Твардоўскі, «непараўнальна больш пільны і непадкупны ў адносінах малейшага фальшу, нацягнутасці і спрошчанасці, што падладжваецца да яго ўзроўню вершаванай і празаічнай мовы».

Хочацца адзначыць яшчэ адзін вельмі істотны момант у паэзіі для дзяцей.

Дзіцячая паэзія немагчыма без гумару, усмешкі-пацешкі, якімі напоўнены казкі, скорагаворкі, загадкі, што спрадвеку бытуюць у народзе.

Весела і неяк вельмі арганічна піша для дзяцей Р. Барадулін. Шэраг яго вершаў змешчаны ў дзіцячай анталогіі «Арлянятам» (выд. «Беларусь», 1967): «Як яноты вучылі ноты», «Козытна», «Добрыя суседзі», «Едзе вожык» і інш. Яны пазбаўлены сентэнцый, маралізатарства, рэзанёрства, пра якія саркастычна адгукаўся некалі В. Бялінскі.

Дзіцячая паэзія, дарэчы, бярэ ад фальклору не толькі аптымізм і наіўна-мудры погляд на свет. На прыкладзе кніг В. Віткі і іншых паэтаў мы бачылі, колькі розных жанраў перайшло з фальклору ў дзіцячую паэзію, сувязь якой з фальклорам уяўляецца нам больш плённай, чым у «дарослай» і ў ідэйным, маральна-выхаваўчым сэнсе і ў выкарыстанні эстэтычных сродкаў.

Дзіцячая паэзія ўсё яшчэ, падобна фальклору, не забывае каляндар. «Дванаццаць месяцаў» назваў сваю кнігу для дзяцей С. Шушкевіч.

Вялікае месца ў сучаснай паэзіі для дзяцей, як і раней, займае традыцыйная казка ў вершах.

Шырока вядомы казкі Ул. Дубоўкі. Кранаюць чалавечай цеплынёй казкі Г. Бураўкіна. Яны абапіраюцца на ўласцівасці і схільнасці дзіцячай свядомасці і псіхалогіі.

Добрага «казачніка» мае наша паэзія для дзяцей у асобе М. Чарняўскага. Яго «Сварку на градзе» з карысцю для сябе прачытаюць юныя чытачы. «Падзеі», што адбываюцца ў агародзе, пададзены ў казцы вельмі жыва, дынамічна: «На градзе ўсё гудзе. Сварка цэлы дзень ідзе. Навакол — мітусня. Навакол — валтузня». Ярка, цікава намаляваны расліны і іх «узаемаадносіны».

Таўстаногі ўпарты боб
Агурка пад паху згроб.
Агурку дыхнуць няма чым —
Сонца цэлы дзень не бачыць.

Драматычна напружанае гучанне ўмее надаць казцы А. Вольскі («Рагатка»). Своеасаблiва, даволі ўдала выступіў у гэтым жанры Р. Тармола (зборнік казак «Каго баяцца ў лесе»).

Казку «Дабрадзей-асілак» напісаў А. Бялевіч. У ёй паэтызуецца чалавечы розум, дабрата, сіла. У казцы, як вядома, добры пачатак змагаецца са злым і перамагае, казка ўзнаўляе пэўныя жыццёвыя калізіі. Аўтар «Дабрадзея-асілка» таксама імкнецца наблізіць сваю казку да сучаснасці. Яго герой хлопчык Міхась, зрабіўшыся асілкам, перажывае розныя прыгоды, трапляе нават на Месяц. Праўда, такое набліжэнне да сучаснасці ў казцы А. Бялевіча не ідзе далей чыста знешніх рыс.

Зусім неабавязкова насяляць казкі рознымі «драконамі», як гэта часам здараецца, тым больш рабіць акцэнт на гэтых жахах. Самае галоўнае — высакародная думка, багатая, значная, якая павінна вынікаць з казкі.

Аб чым сведчаць кнігі дзіцячай паэзіі, пра якія ішла гаворка?

Аб тым, што наша дзіцячая паэзія расце і развіваецца. Гаманлівым раўчуком уліваецца яна ў шырокую плынь усёй сучаснай беларускай паэзіі. Пашыраюцца яе пазнавальныя далягляды, узмацняецца гуманістычны пафас, узбагачаецца сфера мастацкага адлюстравання — вельмі спецыфічная ў дзіцячай паэзіі.

І яшчэ аб тым, што паэзія для дзяцей мае патрэбу ў пастаяннай увазе і клопаце з боку крытыкі. Не так часта, як хацелася б, можна натрапіць у нашым друку на глыбокі, змястоўны артыкул ці рэцэнзію пра дзіцячую кнігу. Справа ў сучасных высокіх крытэрыях і патрабаваннях, якім павінна адпавядаць паэзія: усё лепшае — дзецям.

# 2

# ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТАЎ

## ПРАЗ УСЁ ЖЫЦЦЁ

### *(Пятрусь Броўка)*

Нямала — цэлых паўвека! — самааддана і нястомна служыць роднай літаратуры, роднаму народу, партыі, краіне народны паэт Беларусі Пятрусь Броўка. Сабраны ім за гэты час ураджай — каля сотні кніг (на беларускай, у перакладзе на рускую і іншыя мовы) вершаў, паэм, прозы, публіцыстыкі і інш. Але наўрад ці можна дакладна змераць тую найтанчэйшую работу ў сэрцах і душах людзей, якую здзейснілі і здзяйсняюць яго партыйныя па сваёй сутнасці творы! Прыкметнай і Магутнай плынню ўліваюцца яны ў агульнае рэчышча ўсёй шматнацыянальнай савецкай літаратуры. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што сучасны пісьменнік не толькі майстар літаратуры, мастак, ён і незаменны грамадскі дзеяч! Аўтарытэт Пятра Усцінавіча Броўкі як актыўнага грамадскага дзеяча вялікі і бясспрэчны.

Не перастаеш здзіўляцца душэўнаму здароўю, энтузіязму, няўрымслівасці гэтага неспакойнага чалавека. Народны паэт Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, член ЦК Кампартыі Беларусі, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР, галоўны рэдактар БелСЭ Пятро Усцінавіч Броўка працуе вельмі шмат. У вялікім і малым ён застаецца чалавекам чулым і клапатлівым.

Мінаюць гады, дзесяцігоддзі, а ў слове паэта, у яго душы не меншае пачуцця, сардэчнасці, страснасці, бо пры ўсёй шырыні і шматграннасці партыйных, дзяржаўных і звычайных чалавечых клопатаў Пятрусь Броўка перш за ўсё паэт, паэт надзвычай працавіты і плённы.

Прысутнасць у любой нацыянальнай культуры такога выдатнага майстра, як Пятрусь Броўка, вельмі адчувальная і вельмі дабратворна ўплывае на яе развіццё. Бясспрэчныя тая вядучая роля і месца, якія па праву належаць яму ў сучаснай беларускай літаратуры, той каласальны, неацэнны ўклад, які ён унёс у беларускую савецкую культуру ў цэлым.

Хочацца яшчэ і яшчэ раз пагартаць яго кнігі, удумацца ў створаныя ім паэтычныя вобразы, азірнуцца на пройдзеныя дарогі, пачатак якіх губляецца недзе там — за даляглядам нашай сацыялістычнай гісторыі, бо нарадзіўся паэт у 1905 годзе. Але пачаць хочацца не з самых першых, а з сённяшніх, самых новых, адштурхоўваючыся ад цудоўнай, поўнай эмацыянальнага азарэння думкі, выказанай у гэтых вось нядаўніх радках:

Не трэба спачування, жалю,
Я не стаміўся, ты павер,—
Я, можа быць, на перавале —
Ой, што мне бачыцца цяпер!..

Сёння, калі мінула паўстагоддзя літаратурнай дзейнасці, Броўка вылучаецца сярод многіх паэтаў, і не толькі сваіх равеснікаў, асаблівай творчай актыўнасцю. Толькі за апошнія гады ён выдаў некалькі кніг: «Між чырвоных рабін», «Калі ласка», «І ўдзень і ўночы...» — зборнікі паэзіі; «Разам з камісарам» — кніга прозы; «Пішу пра сэрца чалавечае...» («Пишу о сердце человечьем...») — публіцыстыка. Правільная, вельмі дакладная вось такая яго паэтычная самахарактарыстыка:

Люблю я дум палёт узнёслы,
Імклівы рух, пакуль жыву —
Рака я,
Не ставок зарослы,
І кожнай хваляю плыву.

Цяпер асабліва выразна і яскрава бачна, што творчасць Броўкі праз усё жыццё паэта была арганічна знітавана з жыццём народа, якому аддана служыла і служыць яго муза. «У творах Петруся Броўкі,— пісаў Кандрат Крапіва,— паэт і грамадзянін выступаюць у злітым адзінстве. Грамадзянскі пафас з'яўляецца характэрнай рысай усяе яго творчасці. Прачытайце яго паэмы адну за другой, прачытайце лірычныя вершы, напісаныя ў розныя часы, і вы пераканаецеся, што паэт жыве тым, чым жыве народ. Яго глыбока хвалюе і гістарычны лёс беларускага народа, і лёс яго сыноў і дачок, якія памнажаюць здабыткі і славу нашай краіны».

Як шырокая рака люструе неба, так і ў творчасці паэта знаходзіць выразны адбітак наша сучаснасць, руплівае, стваральнае жыццё савецкага чалавека. Яго цікаўнасць да народнага жыцця не ведае межаў.

«Я прыйшоў да вываду,— прызнаваўся некалі С. Маршак,— што паэт павінен быць акном, насцеж расчыненым на вуліцу».

Такі і Пётр Усцінавіч Броўка. Я, прызнацца, ніводнага разу не бачыў, каб ён, скажам, спакойна сядзеў дзе на лаўцы, адпачываў. Не, ён заўсёды ў няспыннай хадзе, у вечнай заклапочанасці, у пастаяннай рабоце думкі. Неспакой — мабыць, асноўная яго чалавечая рыса. Не дзіўна таму, што тэматычны, жыццёвы абсяг грамадскіх і творчых інтарэсаў паэта надзвычай шырокі. Чым толькі ён не цікавіцца, пра што толькі не піша! Сучаснае, цяперашняе і мінулае, блізкае і далёкае, Радзіма, маладосць, сябры, каханне,

унутраны свет чалавека ў самых розных яго адценнях і г. д., і г. д. — немагчыма пералічыць усё, што «яму блізка да душы».

Усё знаходзіць у ёй адбітак, бо паэт добра адчувае сваю роднасць з жыццём, з Радзімай, з усім светам. Вельмі разнастайная праблематыка яго вершаў — Броўку хвалююць жыццёвая пазіцыя сучасніка, яго ідзйна-маральныя перакананні, ён бічуе праявы мяшчанства ў сучасным нашым грамадстве, цікавіцца праблемай часовага і вечнага, зменай пакаленняў, услаўляе герояў, што аддалі жыццё за Радзіму, складае гімн хлебу, роднай зямлі, працавітым продкам.

Важнае месца ў творчасці Броўкі займала і займае ленінская тэма і тэма партыі.

Не абыходзіць паэт і вострыя міжнародныя праблемы, інтэрнацыянальныя матывы ў яго вершах гучаць вельмі моцна.

Мне бачна —
джунглямі густымі
Ідуць змаганнікаў страі —
Хацеў бы побач стаць я з тымі,
Хто сёння ў найцяжкім баі.

Гэта шчырыя і вельмі арганічныя для Броўкі радкі. Паэт там, дзе ідзе змаганне за чалавечнасць, за сацыялізм.

Ёсць у Броўкі ў кнізе «А дні ідуць...», за якую яму была прысуджана Ленінская прэмія 1962 года, незабыўны, знамянальны ў многіх адносінах верш «Сцяжынка пад Нью-Йоркам». Паэту давялося пабываць у Нью-Йорку, знаходзячыся ў складзе дэлегацыі БССР на сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Ідучы па той — нью-йоркскай — сцяжынцы, паэт успомніў другую, што на Ушаччыне,— родную сцяжынку мілага, далёкага дзяцінства, «па ёй матуля ў першы раз у свет вяла а хаціны».

Гудзіць над ёй дрымотны бор,
Гамоняць сосны з дубам,
Бяжыць яна паміж азёр
На бацькаўшчыне любай.

Душэўна прачулыя патрыятычныя радкі, паэтычная моц якіх нашмат павялічваецца нечаканым ракурсам у поглядзе на даўно знаёмую сцяжынку дзяцінства :

Хто мог бы думаць, што яна
Вакол зямлі абкружыць?
Што пройдзе сёлы, гарады
(А з ёй гады прамчалі),
Што прывядзе мяне сюды,
За акіяна хвалі.

«Да рэвалюцыі,— успамінаў неяк П. У. Броўка,— забіты горам селянін калі і думаў, то толькі пра свой двор, ну, аб бліжэйшых родзічах, пра суседзяў, а. самае большае — аб сваёй воласці. Яго мала хвалявала, што адбывалася за межамі воласці, ды ён і не ведаў пра гэта. А цяпер наш калгаснік зусім іншы. Пасеяўшы жыта ў беларускай вёсцы і клапоцячыся аб яго ўраджаі, ён думае і пра тое, а як там, на Украіне, з пшаніцай, ва Узбекістане — з бавоўнай, а ў Грузіі — з вінаградам?..»

Вось у гэтай «сцяжынцы вакол зямлі» адлюстраваўся маштаб і веліч жыццёвых шляхоў сучаснай Беларусі, якая за гады савецкай улады ў дружнай сям'і брацкіх народаў выйшла на сусветную арбіту. Гэтай жа дарогай разам са сваім народам ідзе Пятрусь Броўка. Сацыяльна-гістарычныя далягляды паэта надзвычай шырокія. Але бяруць яны пачатак свой у далёкай краіне дзяцінства...

Біяграфія паэта — гэта біяграфія таго пакалення савецкіх людзей, якое ў дзяцінстве зведала беспрасветную гаркоту старога жыцця пад уціскам паноў і царскіх чыноўнікаў.

«Дзяцінства маё,— піша П. Броўка ў аўтабіяграфіі,— было такім самым, як ва ўсіх дзяцей сялянскай бедноты. З малых год кавалак хлеба не даваўся дарма, Праца пачыналася з невялікага і павялічвалася з гадамі. Спачатку пасвіў гусей, пасля авечак, а пазней — кароў. Вадзілі коней на начлег. Нялёгка было, часам хацелася пагуляць з аднагодкамі, а даводзілася ад цёмнага да цёмнага сачыць за статкам. Але колькі было ў гэтым прыгажосці! Да гэтага часу памятаюцца бясконцыя сцежачкі і дарожкі на лугах і палях вакол роднай вёскі, задумлівы гоман сасновага лесу, баравыя астравы сярод бяздоння адвечных балотаў. Безліч птушыных галасоў, напевы ветру, шум калматых ялін, нават шэпт лугавых траў навечна напоўнілі сэрца».

Так расказвае Броўка аб «родавых», душэўных вытоках сваёй паэзіі, якая эстэтычна караніцца ў песнях жней і расказах начлежнікаў, у мастацтве вандроўных дудароў, ва ўсім вясковым фальклоры.

Уражанні дзяцінства і юнацтва, жыццё самых першых паслякастрычніцкіх год, перабудова вёскі і ўсяго грамадства, актыўны ўдзел ва ўсіх пачынаннях камсамола і вясковай моладзі — усё гэта дало штуршок і вылілася ў вершах. Помніце гэтыя вось цудоўныя яго радкі з кнігі «А дні ідуць...»:

Не пытайся пра гэта,
Бо адказу не дам.
Як зрабіўся паэтам,
Я не ведаю сам.

Свой радок на паперы
Не чакаў я спаткаць,
Проста сэрца без меры
Захацела спяваць.

Што зажыў без клапотаў
Я, вясковы юнак,
Што, прыбраўшыся ў боты,
Хлеба зведаў усмак...

Так, менавіта гэтаму пакаленню пашчасціла адчуць і перажыць незвычайны душэўны ўздым, сапраўдную вясну чалавецтва пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Жыццёвая вясна паэта супала з вясной краіны, рэспублікі. Перад юнаком адкрыліся неаглядныя далі і магчымасці творчага росту.

«Мы зарунелі на беларускіх загонах, узораных плугам Кастрычніцкай рэвалюцыі» — гэтыя словы, запісаныя ў праграме «Маладняка», добра характарызуюць і самаадчуванне маладога Петруся Броўкі. У 1927-1928 гадах ён кіраваў полацкай філіяй «Маладняка». Пачатак яго творчасці, як і яе вытокі, сам прыход Броўкі ў літаратуру быў вельмі тыповы для таго часу і шмат чым падобны на літаратурныя дэбюты многіх яго равеснікаў.

16 жніўня 1926 года ў газеце «Чырвоная Полаччына» малады Пятрусь Броўка друкуе першы свой верш «Ой, не шапчы, мая бярозка...». Алесь Звонак, які тады працаваў у газеце, успамінае: «Я добра памятаю першы прыход Петруся Броўкі ў рэдакцыю. Быў ён вышэй сярэдняга росту, блакітнавокі, з нейкай падкупаючай шчырасю ўсмешкаю на твары, у доўгім, прабітым кулямі, падпаленым салдацкім шынялі з чужога пляча...». Такім ён запомніўся сучасніку.

За плячыма маладога паэта ўясо быў даволі значны жыццёвы вопыт. У гэты час ён працаваў у Полацкім акруговым камітэце ЛКСМБ, а затым адказным сакра таром «Чырвонай Полаччыны», вакол якой групіраваліся маладыя літаратурныя сілы акругі, у якой адбыўся яго літаратурны дэбют. Працуючы ў «Чырвонай Полаччыне», яму даводзілася пісаць усё: публіцыстычныя артыкулы, вершы, фельетоны, нарысы, справаздачы з пасяджэнняў, перадавыя. Усё гэта прымушала шырэй знаёміцца з жыццём і ўзбагачала вопытам для далейшай літаратурнай дзейнасці. Работа ў газеце навучыла яго паўсядзённа адчуваць дыханне жыцця краіны і шчыра адгукацца на яго праявы.

Першыя вершы (некаторыя з іх Броўка падпісваў псеўданімам Юрка Баравы) паэтызавалі пачуцці закаханага юнака, але не толькі

каханне жывіла іх. У перажываннях паэта ўсё большае месца займалі матывы новага, што ўсталёўвалася ў жыцці. Вяртаючыся дадому, юнак просіць маці:

Белаю сарочкаю
Надары ты сына,
Бо пайшла ўпрочкі
Мачыха-мякіна.

І каўнер узорамі
Расфарбуй жа наскімі.
Ды не так, як учора мне,—
Васількамі-краскамі.

Ты яе, кужэльную,
Вышпігуй калоссямі,
Што бадзянне беднае
Выжыць давялося нам.

Гэтыя радкі былі напісаны Броўкам — студэнтам літаратурна-лінгвістычнага аддзялення Беларускага дзяржаўнага універсітэта, куды ён паступіў у 1928 годзе. Вучобу ва ўніверсітэце з яго, як пазней скажа паэт, «творчым таварыскім асяроддзем», якое садзейнічала мастацкаму станаўленню маладога паэта, шчасліва дапаўняла шчырая, няўрымслівая цікаўнасць да ўсяго, што адбывалася навокал. Па характару таленту П. Броўка ад самага пачатку быў вельмі ўражлівы, здольны захапляцца і адгукацца на ўсе праявы жыцця, асабліва адчувальны да новага, таго, што нараджалася і ўсталёўвалася ў маладой савецкай краіне.

Паэта хвалявалі праблемы сацыялістычнага будаўніцтва, тэма індустрыяльнага горада («рубільнік індустрыі ўключаны ў сёння»). Ранняя паэзія Броўкі — гэта ранак нашага сацыялістычнага жыцця, якое спорна пайшло ў рост.

Чытаючы ранняга Броўку, нават сёння, калі мінула каля пяці дзесяткаў год, увачавідкі бачыш, колькі гарачага творчага імпэту было ў яго паэзіі. Імпэту часам магчыма нават занадта прыкладнога, падпарадкаванага прамым задачам дня, мэце (як нам сёння здаецца) найбольш блізкай.

Справа ў тым, што літаратура — у разуменні Броўкі — была заўсёды важнейшым сродкам перапробкі жыцця, актыўным удзельнікам будаўніцтва сацыялізме. Такое разуменне складала сутнасць яго ідэйна-палітычнай пазіцыі і тады, але эстэтычна яна выяўлялася часам вельмі фарсіравана:

Мне трэба, каб слова

падносіла цэглу,
А вершы ў альбом
і другія напішуць.

У вершы «Памяці Паўлюка Труса» Броўка называе Труса майстрам, песня якога «буйнымі ветрамі... насіла з мулярам цэглу на ўсходніх крутых».

З цягам часу ён і другія пісьменнікі ўсё паўней разумелі новыя адносіны чалавека і свету, выхаваўчыя задачы мастацтва, імкнуліся да глыбейшага сацыяльна-псіхалагічнага ўзнаўлення жыцця, разумення яго складанасці. Літаратура ўзнімалася на новы ўзровень.

Паэтычная актыўнасць Броўкі была палемічны завострана супраць мінорных настрояў «ясеніншчыны», што мелі месца сярод некаторых маладых паэтаў. Ён сцвярджаў адданасць паэта справе будаўніцтва, радасна вітаў кожны поспех у выкананні планаў пяцігодкі.

Першыя кнігі Петруся Броўкі — дзве адразу: «Прамова фактамі» і «Гады, як шторм» — з'явіліся ў 1930 годзе. Пісаліся яны на працягу другой палавіны 20-х гадоў. Энергічнасць, тэмпераментнасць, лозунгавасць — адчуваюцца ўжо ў саміх назвах. У гучанні радкоў можна пачуць інтанацыі Маякоўскага. Ідэйныя і творчыя пазіцыі маладога паэта акрэслены ў першых кнігах вельмі ярка, з юнацкай рашучасцю і катэгарычнасцю. Як мастацкі дакумент эпохі, яны поўнасцю захавалі сваё значэнне да нашых дзён, даносячы сам стыль і дыханне часу.

Я знаю — скора праімчыць
паводкаю рака.
Прымай, савецкая вясна,
загады ад ЦК.
Устань,
ды золакам касі,
Ды высушы аблонь!
Я знаю — красак нам дасі,
Дай хлеба,
дай святло!

Зразумела, як сталы паэт Пятрусь Броўка склаўся не адразу. Фарміраванне яго творчай індывідуальнасці адбывалася на розных мастацкіх перакрыжаваннях, у актыўных ідэалагічных спрэчках.

Пэўны час малады неўтаймоўны Броўка з яго пастаянным імкненнем да пошукаў, да мастацкага наватарства знаходзіўся пад уплывам паэта Паўлюка Шукаючы, які лічыў сябе беларускім футурыстам і кіраваў «Літаратурна-мастацкай камунай». Але гэтая літаратурная

групоўка праіснавала нядоўга. Броўка пакінуў яе і перайшоў у БелАПП — самую ўплывовую літаратурную арганізацыю таго часу.

Дваццатыя гады — складаны перыяд развіцця нашай літаратуры, якая тады была зусім маладой. Праз многа год паэт, успамінаючы сваю маладосць, 20-я гады, назаве іх «часам буйнага кіпення літаратурных сіл, якія тады нараджаліся, часам вялікай мастацкай разнастайнасці». Але тут жа дадасць: «Праўда, разнастайнасць гэту не трэба перабольшваць. Яна непараўнальна з сягонняшнім; у 20-я гады моцна давала сябе адчуваць нівеліроўка пад агульны стыль, «паэтычны універсалізм» (па ўдаламу выразу аднаго нашага беларускага крытыка). Ды гэта і зразумела: дзеці больш падобны адзін на другога, чым дарослыя, што многа паспыталі...».

Гэтая ж думка-ўспамін прагучала і ў нядаўнім вершы:

А быў ён, слоў гусіны статак,
Крыклівы, ды без ладу ў ім —
Паэзіі маёй пачатак
Быў і складаным і цяжкім.

І я, як тая рыба, біўся,
Як свой кірунак выбіраў,
І ў недавучаных вучыўся,
Недапаэтаў прызнаваў...

Так ён напіша пазней, праз многа год, і гэтае самапрызнанне дапаможа нам многае на яго творчым шляху зразумець глыбей...

У даследаваннях творчасці П. Броўкі ўсталявалася традыцыя лічыць перыяд 20-х гадоў у значнай ступені вучнёўскім, але не трэба забываць, што, менавіта, у гэты час адбылося мастацка-палітычнае, сацыяльна-грамадзянскае самавызначэнне яго паэзіі, што ён адкрыта і чэсна паставіў яе на службу народу і партыі, на службу будаўніцтва камунізме.

«У гады першай пяцігодкі,— успамінае П. Броўка,— мы пісалі пра ўсё. Хадзілі на заводы, бічавалі прагульшчыкаў, гультаёў, рвачоў. Часта выходзіла рытарычна... але я ніколі не шкадаваў працы, аддадзенай лозунгам і агіткам. Працуючы над імі, даводзілася быць у віры жыцця і многае пазнаваць». Гэта была тая адзіна правільная школа жыцця, у якой складваўся светапогляд мастака, мацнела яго эстэтычнае крэда.

Перад беларускай паэзіяй, лірыкай стаяла наватарская задача — па-мастацку асэнсаваць сацыялістычную рэвалюцыю, эстэтычна сцвердзіць яву новага жыцця, даць вобраз новага чалавека, адлюстраваўшы свет яго думак і эмоцый. Паказальны ў гэтых

адносінах верш Броўкі «Зямля», напісаны ў 1931 годзе. Хай яго духоўныя, інтэлектуальныя далягляды не такія ўжо і шырокія, уражвае новая пазіцыя лірычнага героя, які стаў руплівым гаспадаром і знаўцам зямлі, даглядае яе на новы, калектыўны лад, клапоціцца пра агульнае шчасце.

Верш гэты даўно стаў хрэстаматыйным, адным з лепшых твораў беларускай паэзіі трыццатых гадоў. Ён сведчыў пра пасталенне светапогляду паэта. Зямля, што вякамі належала панам, пачала служыць народу, вярнулася да свайго сапраўднага гаспадара.

Мы ж цябе зразумелі, зямля!
Кормім гноем цябе, кормім каліем,
Каб ты кожнае лета
Цяжарнай была
Не адным,
А трыма ураджаямі.

Калгасны лад як адзіна магчымая дарога да сацыялізме, сіла і розум, складзеныя «да купы», пуцілаўскі трактар, сучасная агратэхніка сталі ўвасабленнем новай, сацыялістычнай явы на вёсцы. Новае хвалявала і прыцягвала паэта. Яго творчасць 30-х гадоў — гэта няспыннае пашырэнне тэматыкі, узбагачэнне творчага дыяпазону і мастацкіх фарбаў.

У 1931 годзе Броўка напісаў аповесць «Каландры». Яна шмат у чым сугучна па сваіх настроях, думках зборніку вершаў «Цэхавыя будні» (1931), які рыхтаваўся ў гэты ж час і таксама быў прысвечаны рабочай тэме. Праца над дзвюма кнігамі вялася паралельна. Трэба сказаць, што на той час у беларускай літаратуры ўвогуле няшмат было твораў з жыцця рабочага класа.

Да рэвалюцыі прамысловасць Беларусі была пераважна саматужніцкай, Ды і ў першыя гады Савецкай улады таксама не паспела развіцца. Вопыт пісьменнікаў у распрацоўцы рабочай тэмы, паказу жыцця заводскага калектыву быў не надта вялікі.

«Каландры» — не першы празаічны твор П. Броўкі. Яшчэ ў 1927-1928 гадах ён друкаваў свае апавяданні ў газеце «Чырвоная Полаччына» і часопісе «Працаўнік асветы». Аўтар імкнуўся ў іх паказаць эпізоды класавай барацьбы ў беларускай вёсцы сярэдзіны 20-х гадоў, напярэдадні калектывізацыі. У «Каландрах» жыццё вёскі таксама закранута, але асноўнае месца адведзена паказу працэсаў індустрыялізацыі і звязанага з ёю сацыяльна-псіхалагічнага, духоўнага абнаўлення рабочага чалавека, умацавання сувязей паміж горадам і вёскай, дружбы працоўных розных нацыянальнасцей. Пісьменнік ускрывае класавую сутнасць канфлікту ў заводскім

асяроддзі, уважліва імкнецца прасачыць, як новае, перадавое, чэснае перамагае ў чалавечых адносінах, у адносінах да працы. Значная ўдача пісьменніка — вобраз рабочага Муляўкі, прызнанага настаўніка моладзі, у якім увасобіліся рэвалюцыйныя традыцыі пралетарыяту і лепшыя рысы рабочага чалавека з яго сумленнасцю, прынцыповасцю, непрымірымасцю да раўнадушных.

Такім чынам, ужо на самым пачатку творчага шляху Пятрусь Броўка звяртаецца да розных жанраў і мастацкіх сродкаў, шмат эксперыментуе, шукае сваёй унутранай тэмы, сваё адметнае творчае аблічча. І ўсё гэта дзеля таго, каб па-мастацку раскрыць, асэнсаваць велічныя гістарычныя далягляды, якія расчыніліся перад разняволеным народам. Сіла мастацтва паэта каранілася ў тым, што яно заўсёды ішло ў нагу з народам, са сваім часам. Паэт славіў новую яву, змагаўся з яе ворагамі, агітаваў, гаварыў пра самае галоўнае. Ён звяртаўся да мільёнаў, і голас яго быў добра чуцён. Ён хацеў, каб чытачы яго зразумелі, і ўсё глыбей пераконваўся, што для гэтага найбольш патрэбны гранічная прастата і даступнасць.

Не так даўно П. У. Броўка пісаў («Правда», 8 чэрвеня 1968 года):

«Я хачу сказаць пра сучаснасць і своечасовасць такой якасці нашай паэзіі, якую не назавеш лепш, чым старым, добрым, выпрабаваным словам — прастата». Паэт спасылаецца на вопыт пражытых год: «Я ўспамінаю,— гаворыць ён,— тыя далёкія гады, першыя свае вершы, якія так хацелася зрабіць «пад Маякоўскага» ; я ўспамінаю і сваіх крытыкаў — суровых, стрыманых на пахвалу сельскіх актывістаў, што казалі мне: «А ў Купалы куды лепш», яршыстых хлопцаў і строгіх дзяўчат у чырвоных касынках, камсамолію, якая толькі пачынала свой шлях да адукацыі і з маладым пафасам патрабавала: «Давай, як у Маякоўскага, Купала ж устарэў». Я ўспамінаю гэты час, сябе, сваіх сяброў, якія ўсё больш і сур'ёзней разумелі, што... у кожнага з нашых вялікіх настаўнікаў свая прастата і свая складанасць, свая нечаканасць мастацкіх адкрыццяў».

Пятрусь Броўка — за прастату ў яе горкаўскім разуменні:

«Паміж спрошчанасцю і прастатой ёсць істотная розніца, яе можна выразіць так: спрошчанасць — гэта штучнасць і, значыць, фальш, а прастата — сапраўднае мастацтва. Праўда будучыні — простая і ясная».

«Добра і, як звычайна ў Горкага, ёмiста сказана»,— так выказаўся пра гэтую горкаўскую думку П. Броўка.

Прастата яго сучаснай паэзіі, усёй творчасці арганічна звязана, на маю думку, з такой яе ўласцівасцю, як глыбокая народнасць. Сёння гэта асабліва выразна відаць, хоць трэба сказаць, што

творчасць паэта заўсёды жывілі крыніцы народнай мудрасці. «Усякая паэзія толькі тады сапраўдная,— пісаў Б. Р. Бялінскі,— калі яна народная, гэта значыць, калі яна адлюстроўвае ў сабе асобу свайго народу». Броўка не падрабляецца пад «народнае», а мысліць народнымі катэгорыямі і ўяўленнямі. Пра адну з сваіх кніг ён кажа: «Кросны яе заснаваў, уток я цяпер выбіраю». У вершах паэта рассыпана шмат лаканічных, але ёмістых, блізкіх да фальклорных выразаў. Ён і не тоіць, што вельмі любіць народную паэзію («Цаню адзінку — мастака: ў сяброўстве розум і рука, але схіляюся чалом перад народам-мастаком») і вельмі шырока карыстаецца ёю ў сваёй творчасці, пазбягаючы стылізацыі пад фальклор. Творча засвойваючы і развіваючы тыя народна-паэтычныя традыцыі, якія яму бліжэй, ён тым самым садзейнічае ўздыму на новую ступень ідэйна-мастацкіх, маральна-этычных уяўленняў народа.

Так, Броўку ў значнай ступені ўласцівы народныя ўяўленні і крытэрыі жыццёвых каштоўнасцей. Вось што, напрыклад, гаворыць ён каханай:

З адным не параўнаю —
З хлебам!
А так за ўсё,
За ўсё ты больш:
Ты для мяне —
Зямля і неба.
Цяплынь і спёка,
Золь і дождж.

*(«Ты для мяне»)*

Хлеб — паводле народнай традыцыі — вышэйшая каштоўнасць жыцця, і Броўка падкрэслівае гэта ў сваім вершы. Гэтаксама чалавеку неабходна праца — крыніца здароўя і дабрабыту («Пчаліны дом»).

Думаецца, не будзе перабольшаннем сказаць, што паэзія П. Броўкі ўвабрала ў сябе шмат якія істотныя рысы, грані народнага характару.

У творчасці Броўкі, як у тым народным «калі ласка», адлюстроўваецца шырокая душа народа, яго высакародства, шчырасць і гасціннасць, ветлівасць і дабрыня.

Народнае, фальклорнае адбілася і на мастацкай форме яго паэзіі. Хіба не нагадвае народную песню такі вось, скажам, яго верш:

Ах, як добра мне сягоння
І пад грабам, і пад клёнам.

Ах, як хараша і люба
Мне пад дубам, дубам, дубам...

Як прыемна і гасцінна
Пад ялінаю-ялінай.

А як песні льюцца звонка
Пад сасёнкаю-сасёнкай.

Тут, дзе кожны куст знаёмы,—
Я як дома, я як дома.

Проста? Так, проста, але як насычана думкай, эмоцыяй, як выразна адбіўся тут душэўны вопыт паэта, яго асоба! Менавіта, такім вось чынам паэзія П. Броўкі раскрывае перад чытачом душу народа, лад яго мыслення, густы і схільнасці, эстэтычныя сімпатыі, яго высокую маральнасць. На прыкладзе паэзіі Броўкі мы пераконваемся, што фальклор, калі сувязь з ім глыбокая, арганічная, эмацыянальна ўзбагачае творчасць, актывізуе пачуцці, насычае іх думкай, простай і ў той жа час вельмі глыбокай, якая арыентуе паэта ў складанасцях праблематыкі сучаснага жыцця.

Але перад тым, як падняцца на такі ўзровень ідэйнасці, мастацкасці, такой змястоўнай прастаты, трэба было прайсці не малы жыццёвы, творчы шлях.

Этапнымі кнігамі П. Броўкі 30-х гадоў з'явіліся зборнікі «Прыход героя» — 1935 год і «Вясна Радзімы» — 1937. Галоўнымі героямі яго паэзіі сталі ўдзельнік грамадзянскай вайны Янка-коннік і руплівы калгасны садоўнік, «шчаслівы за працу», брыгадзіры і трактарысты, дзяржынцы — вартаўнікі савецкіх граніц, «бабылёвая дачка» Кацярына — гераіня аднайменнай паэмы канца 30-х гадоў. Усе гэтыя вобразы яскрава перадаюць аблічча і каларыт часу з яго працоўным энтузіязмам, сведчаць, як непазнавальна мяняўся чалавек духоўна, як узбагачаўся яго ўнутраны свет. Паэзія Броўкі 30-х гадоў — гэта па-маладому страснае, бадзёрае, радаснае сцвярджэнне сацыялістычнай явы. Паэт не перастае захапляцца прыгажосцю жыцця, багатым калгасным працаднём, героікай будаўніцтва новага свету, усеагульным народным энтузіязмам. Ён паэтызуе разняволеную актыўнасць чалавека, перад якім адкрыліся ўсе шляхі.

Вельмі характэрны для творчай індывідуальнасці Броўкі верш 30-х гадоў «Радзіме» з яго эмацыянальнай раскаванасцю і шчырасцю думкі, сыноўняй гордасцю за шчаслівы дзень Радзімы.

Мы прасторы твае
Сваім сэрцам абдымем,
За граніцы наўсцяж
Мы адкажам сваёй галавой.

Гэта наша зямля,
Гэта наша радзіма,—
Дзень высокі, як сонца,
Шугае над ёй.

Расло адчуванне адказнасці — сваёй і свайго пакалення: «Многа дадзена нам, многа спросіцца з нас». Прыходзіла сапраўдная сталасць...

Пачынаў Броўка як лірык з паэзіі вельмі інтэнсіўных асабістых перажыванняў, у якіх дакладна быў акрэслены грамадскі партрэт лірычнага героя. Аднак бліжэй да сярэдзіны 30-х гадоў у яго творчасці ўзмацняюцца эпічныя матывы. Праўда, першая паэма — «Прамова фактамі» — была напісана на самым пачатку творчага шляху, яшчэ ў 1930 годзе. Яна распрацоўвала заходнебеларускую тэму. Але цалкам залічыць яе да эпасу можна толькі ўмоўна, настолькі яна публіцыстычная і лаканічная па форме. Гэты эпас асаблівы: ён лірычны, моцна сагрэты суб'ектыўным пачуццём, усхвалявана страсны. Зрэшты, іншым паэт ніколі не быў. Ён заўсёды страсна абараняў адкрытыя ім ісціны.

Нароўні з сучаснасцю яго ўладарна вабіла да сябе героіка грамадзянскай вайны. Ёй ён прысвяціў адну з лепшых сваіх паэм 30-х гадоў «Праз горы і стэп», напісаную «паводле гістарычных матэрыялаў Самарскай кавдывізіі». Здарылася так, што яму разам з П. Глебкам давялося ў 1932 годзе пабываць на зборах 7-й Самарскай кавалерыйскай дывізіі, якая стаяла тады непадалёк ад Мінска — у Ждановічах. Там ён і натрапіў на матэрыял, з якога потым вырас магутны эпічны твор, які сродкамі высокага мастацтва ўвасобіў гераічнае аблічча Самарскай дывізіі і яе байцоў — удзельнікаў барацьбы за савецкую ўладу ў грамадзянскую вайну.

Праз праўдзівы паказ гераічнага паходу Самарскай кавалерыйскай дывізіі, не цураючыся рамантычных барваў, аўтар малюе вобраз народа, узнятага рэвалюцыяй на свядомую барацьбу, непрымірымага да ворага, здольнага на самаахвярнасць, на подзвіг. Штрыхамі, экспрэсіўна намечаны аб'ектывізаваныя партрэты герояў-чырвонаармейцаў Бандарэнкі, Сізова, Вайнова.

Помніш ты, Як Вайноў
У трызненні глыбокім
З ложка кінуўся вобзем
і, расплюшчаны ніц,
Плакаў дзіцем,
Што недзе далёка
Сямірэчча
Канае ў агні?

Не менш цікавая старонка Броўкавай паэзіі 30-х гадоў — паэма «1914», напісаная ў 1933 годзе. Гэта — страсна антымілітарысцкі твор. У цэнтры яго — лёс селяніна Сымона Перагула, яго сацыяльная трагедыя. Імперыялістычная вайна, з якой Перагуд вярнуўся калекам, уся буржуазная сістэма царскай Расіі ўяўляюць сабой суцэльны здзек над чалавекам. Яны варожыя яму па самой сваёй сутнасці.

Паэма «1914» моцная сваім сацыялістычным гуманізмам, бачаннем тых гістарычных шляхоў, на якіх можна дабіцца вызвалення чалавека працы ад капіталістычнага ўціску.

«1914», таксама як і «Праз горы і стэп», сведчыць аб плённасці творчай вучобы паэта ў Маякоўскага, Броўка сам не адмаўляў, што Маякоўскі «з'явіўся для нас рэвалюцыянерам-вестуном, ён пашыраў і рассоўваў магчымасці паэзіі, указваў шляхі да шырэйшага ахопу сучаснасці». Але, каб сучаснасць бачылася ярчэй і праўдзівей, паэту даводзілася раз-пораз кранаць (і, як мы бачылі, вельмі глыбока) гістарычныя пласты народга жыцця. Гістарызм яго мыслення яшчэ больш паглыбіцца і ўзмоцніцца ў гады вайны, калі вынікне неабходнасць асэнсаваць гістарычныя вытокі і карэнні магутнага ўсплёску народнага гераізму.

Абедзве паэмы даўно расцэньваюцца, як класіка беларускай савецкай паэзіі, як лепшае, што створана Броўкам у сярэдзіне 30-х гадоў. Яго дасягненні ў галіне лірыка-эпічнага жанру значна пасунулі наперад развіццё паэмы ў беларускай літаратуры, узбагацілі яе істотнымі мастацка-тэматычнымі адкрыццямі.

У 1934 годзе з'явілася новая паэма Броўкі «Так пачыналася маладосць», пра мінскіх камсамольцаў-падпольшчыкаў, што актыўна змагаліся з белапалякамі. І ў гэтай паэме гістарычная тэма гучала вельмі надзейна: побач пад панскім ботам стагнала і не пераставала змагацца Заходняя Беларусь, чыё ўз'яднанне ў адзінай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы паэт горача вітаў у 1939 годзе.

Эпічныя творы першай палавіны 30-х гадоў сведчылі пра далейшае пашырэнне мастацкай палітры паэта. Узрасла — на трывалай рэалістычнай аснове — экспрэсіўнасць малюнкаў і вобразаў, абвастрылася сатырычная накіраванасць асобных матываў і вобразаў, раскаваней, вальней стала рытміка.

30-я гады — перыяд інтэнсіўнай творчай вучобы Броўкі. Ён вучыцца ў Маякоўскага, Пушкіна, Шаўчэнкі, Купалы і Коласа. Паэта вабіць грамадзянскасць гэтых мастакоў, іх высокае майстэрства. Яго верш к канцу 30-х гадоў робіцца больш строгім, засяроджаным. Ранейшае буянне і стракатасць фарбаў усё часцей саступаюць месца прасветленасці, празрыстасці паэтычных малюнкаў.

Год ад году загартоўваецца палітычная свядомасць паэта і яго лірычнага героя. Броўка ўжо на самых першых этапах сваёй творчасці горача ўславіў маральна-палітычнае адзінства новага сацыялістычнага грамадства, калектывізм, інтэрнацыяналізм, братнюю дружбу народаў Краіны Саветаў. Такія вершы, як «На Краснай плошчы», «Браты», «З армянскіх матываў», «У Каніве» і інш., кожны па-свойму праслаўлялі дружбу савецкіх народаў як вялікую заваёву Кастрычніка, рэалізацыю мудрай ленінскай нацыянальнай палітыкі. Плён гэтай дружбы прыкметны быў ва ўсіх сферах жыцця, у тым ліку ў развіцці нацыянальных літаратур. Узаемапераклады, пастаянныя творчыя кантакты, знаёмствы, сяброўскія сустрэчы садзейнічалі ідэйна-мастацкаму выспяванню літаратур, росту майстэрства і творчай культуры пісьменнікаў.

Тэма дружбы савецкіх народаў праходзіць праз усю творчасць П. Броўкі. Значнае месца яна заняла ў яго паэзіі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, што паказала, на які высокі, бессмяротны подзвіг быў здольны вялікі савецкі народ, людзі розных нацыянальнасцей, згуртаваныя адной мэтай, у адным душэўным парыве пад кіраўніцтвам партыі.

З цягам часу гэтай выключна важнай тэме, якая заўсёды глыбока хвалявала Броўку, ён прысвеціць вялікае празаічнае палатно — раман «Калі зліваюцца рэкі» (1957), населены шматлікімі героямі, людзьмі цікавымі і значнымі, што сумеснымі намаганнямі будуюць сабе шчаслівае жыццё. Тут зноў праявілася жывая сувязь пісьменніка з сучаснасцю і яе праблемамі.

Пра будаўніцтва міжкалгаснай гідраэлектрастанцыі на беразе возера Дрысвяты (аб гэтым і напісаны раман) паэт, па асабістаму прызнанню, даведаўся з «Праўды», і такая падзея яго глыбока кранула. Адразу пацягнула на будаўніцтва, дзе калгаснікі трох рэспублік: Беларускай, Літоўскай і Латвійскай узводзілі карпусы будынка электрастанцыі.

У выніку некалькіх год напружанай працы з'явіўся цікавы твор, у якім аўтар пераканаўча даводзіць, як у барацьбе з агульным ворагам, з рознымі перашкодамі і цяжкасцямі, а таксама ў мірнай стваральнай працы развівалася і мацнела дружба народаў-братоў: беларусаў, літоўцаў, латышоў, як нараджаюцца паміж імі новыя, сацыялістычныя адносіны, мацнее грамадзянская актыўнасць і ініцыятыва...

Вернемся, аднак, яшчэ раз у далёкія 30-я гады, у перадваенны час, калі з'явілася кніга паэзіі Петруся Броўкі «Шляхамі баравымі» (1940), якая яшчэ раз засведчыла творчую сталасць аўтара, яго

велізарныя магчымасці як выдатнага майстра савецкай паэзіі. П. Глебка пасля выхаду зборніка пісаў, што «яго вызначаюць вершы, у якіх цэнтральнае месца займае чалавек, яго пачуцці і думы, дармо што гэтыя вершы напісаны часамі аб дажджы ці аб крыніцы. У гэтых вершах Пятрусь Броўка зрабіў надзвычай удалую спробу перадаць жывыя пульсы чалавечага пачуцця так, што пад ім адчуваецца магутнае сэрца людзей нашага часу. А праўдзівасць і непасрэднасць пачуцця вызначылі ў сваю чаргу разнастайны характар рытмічнага малюнка і страфікі. Гэта кніга ў гэтым сэнсе самая багатая не толькі ў творчасці самога Броўкі, а і ўсіх нашых маладых паэтаў».

Возьмем адзін з вершаў, якія меў на ўвазе П. Глебка,— «Дождж». Вось яго пачатак:

Ані расы каторы дзень.
Пад сонечны касцёр
Сады, спавітыя ў сухмень,
Ранялі свой убор.
Ні месца засені.
Прынад
Не захаваў і лес.
Тарфянішчаў багністы чад
Змяёй у грудзі лез.
З балотаў высыпала тля
І мірыяды мух...
На часткі трэскала зямля,
Абходзячы свой круг.

У гэтых яркіх метафарах, славеснай пластыцы ўгадваецца мастацкі вопыт аўтара паэмы «Праз горы і стэп» з яе напружаным, ярасна-валявым стылем і разнастайнасцю рытмікі і страфікі. Аднак верш бліжэй да класічных традыцый, ён больш скромны, эканомны. Лірычны характар праяўляецца ў гэтым вершы ва ўсёй яго мастацкай тканіне вельмі праўдзіва, натуральна, молада, шчыра. У яго паставе, душэўным жэсце няма аніякай позы. Майстэрства паэта вельмі тонка перадае стан душы героя. Вось яшчэ адзін фрагмент з гэтага цудоўнага верша:

Маланкі стрэламі ўстаюць,
У бубен сыпле гром...
І я, захоплены, стаю
Абдожджаны кругом.
Часамі рукі працягну,
Нібы хачу ў палёт.
Набраклі мускулы.
Спіну
Пасек крамністы шрот.

Да хмар імкнуся, крычучы
Ад свежых, поўных сіл:
— Сячы смялей,
У твар сячы,
Змяці дашчэнту пыл!..

Талент паэта дасягнуў высокай паэтычнай вяршыні. І, трэба сказаць, своечасова, бо наперадзе «маячылі» такія грозныя выпрабаванні, якія запатрабавалі ад яго слова выключнай моцы і мужнасці.

На зыходзе 30-х гадоў усё мацней і мацней адчувалася набліжэнне ваеннай навальніцы, яе суровы подых. Адчувала яго і паэзія Броўкі, для якога тэма абароны Радзімы, заваёў сацыялізма была заўсёды блізкай, крэўнай. У вядомым вершы 1938 года ён пісаў:

Як толькі гэты гул пачую,
Паходны ранец развяжу
І моўчкі кніжку запісную
Паміж патронаў палажу.

У 1940 годзе паэт уступае ў КПСС.

Калі пачалася вайна, камуніст П. У. Броўка быў сярод тых, хто першым з'явіўся на прызыўныя пункты, у ваенкаматы, каб выканаць свой свяшчэнны абавязак перад Радзімай. Вялікая Айчынная вайна стала суровай праверкай грамадзянскіх якасцей паэта. Родная Беларусь, родная зямля, родная маці аказаліся ў палоне.

Паэзія П. Броўкі перыяду вайны адухоўлена глыбокім пачуццём патрыятызму. Каму не запаў у душу напісаны ў 1943 годзе верш «Рана», прасякнуты нейкім шчымлівым адчуваннем радзінных мясцін:

Знаю, сціхнуў бы боль,
Каб напіўся жывіцы
З той крыніцы,
Што смагу таліла не раз,
Каб чабору таго,
Каб тае медуніцы,
Каб паветра з бароў,
Што пад Мінскам у нас.

У час вайны паэт супрацоўнічаў у рэдакцыі франтавой газеты «За Савецкую Беларусь» на Бранскім і Заходнім франтах, затым рашэннем ЦК КПБ быў адкліканы з фронту .і працаваў у партызанскім друку.

Палымянае слова паэта гартавала мужнасць, выхоўвала непахіснасць, вучыла ідэйнай стойкасці. Глыбокая вера ў перамогу ні на хвіліну не пакідала паэта нават у самыя цяжкія часы 1941 года: «Не раз мы зносілі насланую бяду, не раз знішчалі мы драпежнікаў шалё-

ных змяце зямля і гэтую брыду,— і выйдзе Беларусь з палону!» Яго творы клікалі ў бой, набліжалі дзень Перамогі.

Сяргей Грахоўскі вельмі трапна сказаў пра вершы Броўкі ваеннай пары: «Яны — гарачыя абоймы, закладзеныя ў снайперскую вінтоўку».

Цяжка нам у бядзе,
Але мы не заплачам;
Мы за праўду
Насмерць і бязлітасна б'ём.

Гэта была паэзія любові і нянавісці. Любові да роднай зямлі, яе народа, яго гісторыі і культуры і страснай нянавісці да фашызму. Хто не памятае такіх цудоўных вершаў Броўкі перыяду ваеннага ліхалецця, як «Маці», «Рана», «Байцам-беларусам», «Надзя-Надзейка», «Кастусь Каліноўскі», «Магіла байца», «Вам скажуць сосны» і інш., якія сведчылі пра ўзмацненне народнага духу яго паэзіі. Паэт быў разам са сваім народам, дыхаў з ім адным дыханнем, пранікаўся яго светаўспрыняццем.

Паэт ні на хвіліну не траціў веры ў мірную, шчаслівую будучыню. «Будзем сеяць, беларусы!..», заглядваючы ў заўтрашні дзень, упэўнена прадказваў ён у 1942 годзе, калі да вызвалення было яшчэ далёка.

Зацвітуць ля новай хаты
Зноўку яблыні і грушы.
Будзем сеяць, беларусы!
Закуваюць нам зязюлі,
Пахаваюць катаў кулі.

Такія радкі сагравалі сэрцы байцоў, партызан, радавалі і натхнялі. Яны былі патрэбны, як хлеб.

У гады вайны П. Броўка на грунце раней назапашанага вопыту звяртаецца да буйных лірыка-эпічных форм: узнікаюць «Паэма пра Смалячкова» (1942), «Беларусь» (1943), «Ясны кут» (1944). Яны з вялікім эмацыянальным напалам малююць вобраз народа ў вайне. Малююць па-рознаму: «Паэма пра Смалячкова» — з перавагай героіка-рамантычных фарбаў; «Беларусь» — узнёсла-прачулая ода роднай зямлі, яе гераічнай гісторыі, дружбе братніх народаў; «Ясны кут»т — лірыка-драматычны твор, які расказвае пра вяртанне чалавека на родную, вызваленую зямлю, знявечаную чужынцам, пра нечуваныя народныя ахвяры і нябачаныя руіны, якія пакінула пасля сябе вайна...

Ад гэтых часоў памяць аб вайне, самаахвярным гераізме і мужнасці тых, хто паў, «прыкрыўшы свабоду грудзямі», балючы роздум аб лёсе чалавека ў перыяд ваеннага ліхалецця застануцца ў паэзіі Броўкі,

а значыць, і ў яго душы назаўсёды. З'яўляюцца новыя выдатныя творы, як, скажам, паэма «Голас сэрца», напісаная ў 1960 годзе — праз пятнаццаць гадоў пасля сканчэння вайны — і прысвечаная памяці роднай маці паэта, што загінула ў Асвенціме. У паэме арганічна сплавіліся боль і пяшчота, споведзь і пропаведзь, лірыка і публіцыстыка, нянавісць да вайны і магутны голас у абарону міру. Гэта — адзін з самых пранікнёных твораў паэта.

У першыя дні ліпеня 1944 года, пасля вызвалення, П. Броўка разам з іншымі пісьменнікамі вяртаецца ў родны Мінск. І зноў патрэбна была паэтава песня, каб узняць рэспубліку з руін, аднавіць, адбудаваць жыццё.

І мы, што змагаліся мужна,
Руплівa засеем загоны,
Таксама з'яднана і дружна,
Па тым жа адвечным закону.

Паэт не таіў, не закрываў вочы на тыя страты, якія панесла рэспубліка і ўся краіна, на разбурэнні і папялішчы, на тое, што загінуў кожны чацвёрты.

Пра чалавека, што вярнуўся з вайны дамоў, у родны кут, вярнуўся пераможцам, пра тое, што ён убачыў дома, П. Броўка вельмі шчыра расказаў у лірычнай паэме «Ясны кут». І ці не была навеяна гэтая паэма першым пасля вызвалення наведаннем роднай вёскі? Яна ж пакутавала пад час акупацыі не менш за іншыя. Не выйшла на гэты раз на парог родная матуля...

Пра змрок акупацыі, загубленую маладосць — паэма «Паланянка» (1945)...

Жыццё працягвалася, паўставала нанова, адраджалася, і яго рух выразна адлюстроўваўся ў тагачаснай літаратуры. П. Броўка даволі хутка і натуральна ўваходзіў у атмасферу новага часу, пачынаў пісаць аб ім. У першыя пасляваенныя гады ён выступае з паэмай «Хлеб» (1946), вершамі «Думы пра Маскву», «Брат і сястра», «Каваль», «Апошняя зямлянка», «Парк перамогі», «Народнае дзякуй», «Каб мне стаць...», за якія яму ў 1947 годзе прысуджана Дзяржаўная прэмія другой ступені. У тым жа 1947 годзе ён абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

Героем паэзіі П. Броўкі становіцца чалавек, які вярнуўся з вайны і прыступіў да мірнай працы, па якой ссумаваліся яго рукі. Шырока і вольна дыхае ён, ідучы за плугам, засяваючы поле, кладучы вянцы зруба. Радзіма бачыцца паэту ўся ў рыштаваннях, занятая аднаўленчай, стваральнай працай. Вобраз працавітага сейбіта, што ходзіць палямі, сыпле жыта «залатымі дажджамі» — можа, самы

дарагі для паэта вобраз. Споўнілася яго празарлівая ўпэўненасць, прадвяшчанне часоў вайны — «Будзем сеяць, беларусы!».

Дынаміка аднаўленчай працы добра перададзена ў вершы «На Палессі гоман, гоман...» (1949), у якім паэт з уласцівым яму гумарам апеў радасныя змены, што так інтэнсіўна адбываліся ў гэтым кутку Беларусі. Услаўляецца радасць працы, аптымізм будаўнікоў новага жыцця, іх мастакоўская душа.

У другой палавіне 40-х, пачатку 50-х гадоў адна за другой выходзяць паэмы П. Броўкі: «Хлеб» (1946), «Бацькаў дом» (1947), «Родныя берагі» (1948), «Добры друг» (1949), «Чырвон-гарадок» (1950), «Лясы Наддзвіння» (1953). Гэта творы розныя, не аднолькавыя па ступені мастацкай удачы. Мяне хвалявала і будзе хваляваць адлюстраванай у ёй праўдай жыцця паэма «Хлеб» і некаторыя другія. А такой рэчы, як, скажам, «Чырвон-гарадок», часамі, мне здаецца, бракуе заглыбленасці ў жыццё, у яго праблемы і канфлікты, якая ўласціва лепшым творам паэта.

У паэзіі Броўкі 50-х гадоў чалавек найчасцей паказаны ў радасным парыве будаўніцтва жыцця. Ён умее марыць. Мары пра будучыню, якая заўсёды стымулявала і натхняла яго мастацкую думку, заўсёды жывілі паэзію Броўкі. Страснае жаданне, каб былі забыты словы «прысуд і турма», каб «не чутна было аб кары ні разу», напаўняе верш 1954 года «Хацеў бы...». Гэтым жа годам пазначаны цудоўны верш «Такая і мне ўжо часіна прыпала», дзе таксама востра выявілася прага зазірнуць у рэальныя абрысы заўтрашняга дня.

Унутраны настрой, асноўны ідэйны стрыжань Броўкавай паэзіі 50-х гадоў — рупнасць, клапатлівасць, засяроджанасць на маральных пытаннях, патрабавальнасць да сябе і да іншых. «А ты хоць дрэва пасадзіў?..— няхай сябе спытае кожны» — такая думка не пакідае яго ў многіх творах.

Лёс беларускай паэзіі, у тым ліку паслякастрычніцкай, склаўся так, што ёй давялося, люструючы асабістыя, часам псіхалагічна вельмі тонкія перажыванні паэта, быць адначасна летапісам жыцця, увасабленнем яго гістарычнай плыні. Такім летапісам, на маю думку, і з'яўляецца багатая і разнастайная паэзія Петруся Броўкі.

У 50-я гады яна шырэй і шырэй рассоўвае свае геаграфічныя межы і ўяўленні. «Такі ўжо ў мяне характар — усюды хачу пабыць»,— прызнаецца паэт у адным з вершаў. Ён многа ездзіць за мяжу. У яго паэзіі ўзнікае і магутна гучыць тэма абароны міру. «Мы хочам, мы хочам, паэты, пра сіняе неба спяваць. А неба цікуюць ракеты, гатовы яго расстраляць». Сцвярджаючы ідэю міру паміж народамі, паэзія Броўкі выкрывала імперыялістычную палітыку заходніх дзяржаў,

выхоўвала ў савецкіх людзей гатоўнасць абараняць Радзіму і сацыялістычныя заваёвы, мабілізоўвала іх на працоўныя здзяйсненні.

Асабліва інтэнсіўна і плённа паэт працуе ў другой палавіне 50-х гадоў, пасля заканчэння работы над раманам «Калі зліваюцца рэкі». Адна за другой выходзяць кнігі яго паэзіі «Пахне чабор» (1959), «Далёка ад дому» (1960), «Высокія хвалі» (1962). Гэта быў перыяд асаблівага росквіту лірыкі П. Броўкі, станаўлення яе новай ідэйна-эстэтычнай якасці, абумоўленай зменамі ў клімаце духоўнага жыцця савецкага грамадства, актывізацыі працэсу яго маральнага развіцця.

Адна з паэтычных вяршынь П. Броўкі гэтага перыяду, у якую трапіла лепшае з трох папярэдніх зборнікаў — кніга вершаў і паэм «А дні ідуць...», выдадзеная ў 1962 годзе. Паэт нібыта занава падсумоўвае ў ёй свой жыццёвы вопыт, вяртаецца да вытокаў, карэнняў, да першародных чалавечых каштоўнасцей, сцвярджае ўзрослую самасвядомасць народа і свайго героя, яго грамадзянскасць і адказнасць за сённяшні дзень і будучыню. І ў гэтым не было адмаўлення ад традыцый, а наадварот: паэт развіваў іх — на новай еацыяльна-маральнай аснове — далей.

Не цяжка заўважыць, што ў паэзіі Броўкі, пачынаючы з кнігі «А дні ідуць...», адбываюцца вельмі плённыя працэсы збліжэння з жыццём, яго штодзённай канкрэтыкай. Побач з назіральнасцю, асабістасцю бачання ўзрастае філасофскі пачатак, імкненне да шырокіх мастацкіх абагульненняў на грунце вялікага асабістага і грамадскага вопыту. Шмат якія творы пазначаны роздумам аб мінулым і цяперашнім, аб дружбе, сяброўстве, месцы чалавека ў жыцці, яго грамадскім абліччы. Часам у некалькіх радках, вельмі сцісла і эканомна паэту ўдаецца выказаць надзвычай глыбокія, падказаныя жыццём думкі.

Лірыка Броўкі 50-60-х гадоў развіваецца ў бок аналітычнага паказу дыялектыкі чалавечай душы з усімі адценнямі яе складанага эмацыянальна напоўненага жыцця.

Лірычны герой П. Броўкі — камуніст, чалавек шырокага эмацыянальнага дыяпазону, пры гэтым немалы палітычны кругагляд і ідэйны пафас арганічна спалучаюцца ў Броўкі з пранікнёнай, асабіста зацікаўленай думкай аб чалавеку, які бачыцца паэту ў святле гуманістычных перспектыў развіцця ўсяго чалавецтва.

Паэт час ад часу звяртаецца да вобраза У. І. Леніна, у духоўным кантакце з якім ён шукае ідэйную, маральную апору і падтрымку сабе, сваім творчым парываннем. Напісаная ім у 1956 годзе паэма «Заўсёды з Леніным» з'явілася значным укладам у беларускую паэтычную Лeнініяну. «Мне хацелася,— пісаў паэт,— перадаць у гэтай паэме па-

чуцці сыноўняй адданасці і любові да вялікай партыі, створанай Ільічом, да партыі, якая па яго запаветах росціць і ўмацоўвае нашу сацыялістычную Радзіму. А поспехі Радзімы Ільіча радуюць і натхняюць савецкіх людзей».

Творчасць паэта — гэта шматгранная, задуіпэўная, вельмі зацікаўленая размова з сучаснікам. Паэт любіць з ім раіцца, пытаць пра галоўнае, хваляваўца яго хваляваннямі і непакоем. На гэтай аснове ўзбагачаецца і паглыбляецца яго гуманізм, разуменне чалавечай дабраты:

Дабро рабі заўжды аддана,
Ды не крычы аб тым знарок,
Дабро даюць, а так звычайна,
Як грудзі матчыны сасок.

Этычнае ў творчасці Броўкі моцна знітавана з эстэтычным. Дабрата паэта і яго героя неадлучная ад цудоўнага таленту, умення цешыцца красой жыцця, глыбока і па-свойму адчуваць яго прыгажосць у бясконца розных яе праяўленых. Адсюль, відаць, на дзіва маладое, вострае ўспрыняцце свету:

А вішні ўсё штогод цвітуць.
Цвітуць, ажно чуваць на слых...

Жыць на зямлі — вялікая, на думку паэта, «нагарода», што даецца чалавеку толькі раз... У адным з вершаў паэт шчыра прызнаецца: «Але красу я адчуваю, як быццам у семнаццаць год». Так мог сказаць толькі чалавек багатага і тонкага душэўнага, эмацыянальнага жыцця, якое з незвычайнай паўнатой выявілася ў інтымнай лірыцы паэта, у лірыцы кахання. Гэта цікавая, вельмі прывабная старонка паэзіі П. Броўкі. У ёй адлюстраваліся шмат якія душэўныя якасці паэта: прыроджаная тактоўнасць, мяккасць характару, маральная чысціня.

Іх двое, зліўшыся, стаяла.
Не разлічыць ніяк галоў,
Як быццам хмара прыкрывала
Касцёр ільняных валасоў.

Было ім цяжка раз'яднацца.
Адно, што бачылася мне:
Пяшчотныя дзяўчыны пальцы
На закаханага спіне.

Я поблізу ішоў дарогай.
Хацеў мінуць. Не змог, аднак.
Яны не бачылі нічога.
І я не бачыў. Лепей так!

Пэўны час некаторыя нашы крытыкі ды і паэты таксама знаходзіліся ва ўладзе ілюзіі, быццам інтымная лірыка — не што іншае, як імкненне паэта схавацца ад працоўных будняў грамадства ў сваім унутраным «я». Цяпер нам зразумела, што яны не мелі аніякай рацыі. Наадварот, каханне хоць і не адзіны, аднак важны паказчык духоўнага жыцця асобы, а чалавечае каханне — адна з рыс камуністычнага гуманізму ўвогуле.

Відаць, не памылюся, калі скажу, што каханне заўсёды было адной з самых сардэчных, інтымных тэм паэзіі Броўкі. Помніцца даўні — з 30-х гадоў — яго верш «Здрада», дзе расказваецца пра закаханага гарманіста, які, каб звярнуць увагу каханай дзяўчыны, вырашае працаваць па-ўдарнаму («і на полі дзён на сотню я наперадзе пайду»). Што ж, у асабістых адносінах людзей адлюстроўваюцца сацыяльныя сувязі, і ці можна аддзяліць каханне чалавека ад усяго таго, чым ён жыве. Каханне раскрывае істотныя бакі творчай індывідуальнасці паэта, паказвае на ўзровень яго душэўнай гарманічнасці. 1947 годам пазначаны верш «Маладзіком», напоўнены нейкім на дзіва сардэчным замілаваннем да жыцця, да закаханай пары, якая бачыцца паэту ў месяцавым ззянні, у рамантычна прыўзнятым свеце. І гэта важная і адметная рыса яго светаўспрымання:

Прыселі каханкі
У згодзе, у ласцы,
Аблітыя срэбрам,
Як быццам у казцы.

Словам, каханне — традыцыйны матыў лірыкі, інтымна звязаны з самай глыбіннай душэўнасцю паэта, асаблівасцямі яго погляду на рэчаіснасць.

Інтымная лірыка Броўкі развівалася ў рамках агульнай творчай эвалюцыі паэта ў цесных кантактах з ідэйна-маральным развіццём грамадства, адносін паміж людзьмі. Асаблівы ўсплёск яе прыпадае, як мне думаецца, на другую палавіну 50-х гадоў. Менавіта тады быў створаны шэдэўр Броўкавай лірыкі — верш «Пахне чабор», які затым увайшоў у кнігу «А дні ідуць...». У ім паэт успамінае сваё юнацтва, дні маладосці, «лёгкія крокі на вузкай сцяжынцы», светлы вобраз дзяўчыны ў белай іскрыстай хусцінцы, пах чабору...

Час той схаваўся за дальняй гарою,
Здасца хвілінай — яна прада мною...
Выйду. Гукаю. Маўклівы прастор.
Пахне чабор,
Пахне чабор...

У гэтым вершы, як і ў многіх іншых, П. Броўка паказаў сябе надзвычай тонкім лірыкам, глыбокім знаўцам чалавечай душы, дасканалым псіхолагам. А як дакладна перададзены каларыт часу, туга па юнацтву, светлы смутак, пяшчота...

Пра юнацкае каханне і вядомы верш «Александрына» (1961), які стаў песняй, народнай, можна сказаць, песняй (музыка кампазітара У. Мулявіна), яе з нязменным поспехам вось ужо колькі год выконваюць праслаўленыя «Песняры».

Цуд Броўкавай лірыкі — «Ты мая пчолка», поўны незвычайнай пяшчоты да любімай жанчыны, замілавання яе жаноцкасцю, працавітасцю, харавством, гатоўнасцю абараніць яе ў жыццёвых нягодах.

Сваёй інтымнай лірыкай П. Броўка яшчэ і яшчэ раз даводзіць, што камунізм, які будуе наш народ,— гэта не толькі багацце матэрыяльнага дабрабыту, але разам з тым і багацце чалавечых пачуццяў, багацце душы, без якога нельга ўявіць сабе сучаснага чалавека. Чэрпаць з гэтых багаццяў, паўней адлюстроўваць іх — задача нашай паэзіі.

Недзе на зыходзе 50-х гадоў у творчасці П. Броўкі часцей стала заўважацца адна вельмі цікавая адметнасць: вяртанне назад, дэ. сваіх радзінных вытокаў, у 20-я, 30-я гады. І нават у ранейшыя — гады маленства.

Камсамольская ячэйка 20-х гадоў на вёсцы, дзейнасць «Сіняй блузы», першы трактар на полі — «конь сталёвы», як тады казалі ў вёсцы, першае каханне — вось вытокі і штрыхі біяграфіі лірычнага героя П. Броўкі, якія асэнсоўваюцца паэтам на новай аснове, у цеснай і свабоднай сувязі інтымнага, маральнага з грамадскім, сацыяльным.

«Гадоў дваццатых зімы, леты, вы прада мною зноў і зноў»,— гэта быў час незвычайнай усеагульнай актыўнасці, кардынальных рэвалюцыйных зрухаў у беларускай вёсцы. І запомніўся ён паэту навечна таму, што ён сам быў актыўным удзельнікам працэсу абуджэння і пераробкі жыцця на вёсцы і агеньчык кімаўскага юнацтва пранёс праз усе гады.

Нядаўна ў Маскве, на рускай мове, выйшла вельмі цікавая кніга Петруся Броўкі «Пишу о сердце человечьем...», у якой змешчаны артыкулы і ўспаміны паэта аб пражытым. Ёсць там шмат новага, свежага, асабістага. Паэт успамінае:

«Помню, што ў 1923 годзе мы, моладзь саўгаса «Малыя Дольцы», адчулі, што нам неабходна ўступіць у камсамол. Мы даведаліся аб ім з паступаўшых да нас юнацкіх газет. На жаль, валком КСМБ да нас яшчэ не дайшоў, і мы вырашылі накіраваць хадака прама ў Барысаўскі уком камсамола. Я быў тады лёгкі на пад'ём і, не марудзячы,

пусціўся ў шлях, прыхапіўшы з сабою торбачку з хлебам і куском сала. Увесь паход (а трэба было прайсці 120 кіламетраў) заняў у мяне чатыры дні: два дні туды і назад два. Ва ўкоме мяне ветліва сустрэлі, надзялілі інструкцыямі, бланкамі і прапанавалі паскорыць арганізацыю ячэйкі. Так я і стаў сакратаром камсамольскай ячэйкі, надоўга звязаўшы свой лёс з камсамолам, Я на ўсё жыццё застаўся ўдзячны яму за сапраўдную школу жыцця, за выхаванне ва мне лепшых камуністычных пачуццяў, якія прывялі мяне ў ленінскую партыю камуністаў».

Пасля гэтага глыбей разумееш лірызм і непрыдуманасць сённяшніх радкоў, што выключна праўдзіва, эмацыянальна ярка расказваюць пра тыя дні.

Гады адышлі, як часовыя госці.
Моўкне ля бору пустая хаціна...
Дзе вы, сябры маёй маладосці,
Дайце збяромся, ну хоць на гадзіну!

Дайце ўдыхнём, як на раніцы весняй,
З першае, волкае роснае кветкі,
Дайце ж успомнім жарты і песні,
Можа, й слязу змахнём неўпрыкметку.

Думаецца, што якраз адтуль ідуць аптымізм і душэўная бадзёрасць, якімі прасякнута сучасная творчасць П. Броўкі. І, можа, якраз гэтым і вабяць яго тыя даўнія часы.

Асабліва рэльефна, на наш погляд, паўстаюць характар і асоба паэта, час яго маладосці ў вершах-успамінах, такіх, як «Жорны», «Валрэўкомаўскі кур'ер», «Першы камісар», «Ячэйка», «З юначых дзён», «Гады адышлі...», «Быў юнаком...», «Першыя спектаклі» і іншых. У Броўкі добра адчуваецца жывая, ідэйна і мастацкі вельмі плённая сувязь часу — дваццатых, трыццатых гадоў з сучаснасцю. Гэты сінтэз надае паэтычнаму свету Броўкі аб'ёмнасць, выразнасць грамадскіх даляглядаў, шырыню перспектыў.

Рэдка хто сёння ў савецкай паэзіі так шчыра, так усхвалявана апеў і ўславіў гераіку і рамантыку камсамольскага юнацтва, маладосць тых, каго сёння мы завём ветэранамі.

З плакатаў, з лозунгаў газетных
Ляцелі словы, што агні,—
Да рэвалюцыі сусветнай
Мы ўсе лічылі толькі дні.

Вяртаючыся да вытокаў свае творчасці, да дзён юнацтва і маладосці, глыбей і глыбей пазнаючы гуманістычныя асновы нашага грамадства, паэт вельмі арганічна звязвае сваё, асабістае, прыватнае,

з вялікімі гістарычнымі ідэаламі, народжанымі сацыялістычным ладам.

У той разнастайнасці тэм, матываў, праблем, якія паўстаюць перад намі ў апошніх кнігах Броўкі і якія складаюць важны элемент іх паэтычнага свету, зусім не адчуваецца эклектычнасці. Не адчуваецца таму, што ўсё гэта трывала змацавана адзіным, цэласным лірычным характарам. Непаўторны характар паэта складае ідэйна-эстэтычны цэнтр яго паэтычнага свету і выяўляе сябе з зайздроснай паўнатой як у змесце, так і ў форме яго паэзіі.

З поўнай падставай можна сцвярджаць, што лірычны характар Броўкі — характар савецкі і ў той жа час надзвычай нацыянальны, беларускі. У ім адбілася духоўнае багацце паэта, узнёслы лад яго мыслення і настрою.

Лірычны герой паэта — эстэтычнае выяўленне духоўнасці, уласцівай асобе самога паэта. «Чым асоба паэта глыбей і мацней, тым ён большы паэт»,— гаварыў Бялінскі. Грамадзянскі рост, узмужненне асобы паэта абавязкова адбіваецца па фарміраванні і развіцці характару яго лірычнага героя.

Літаратуразнаўцы сцвярджаюць, што характар у лірыцы паэта сумарны, гэта значыць, асобны верш раскрывае нейкі адзін ягоны бок, дае ўяўленне аб некаторых яго гранях і рысах. А ўсе гэтыя грані і рысы аб'ядноўваюцца ў пэўнае адзінства, высвятляюць характар.

Падобную карціну, на мой погляд, можна назіраць у Броўкі. Ад верша да верша, расказваючы пра жыццё і пра сябе, так ці інакш ставячы свае адносіны да навакольнага свету, шукаючы ў ім паэзію, ён малюе цікавы, вельмі прывабны, аб'ёмны, яркі па мастацкіх фарбах, чалавечы характар.

Пра Броўку і яго лірычнага героя можна сказаць словамі старажытнага пісьменніка — нішто чалавечае ім яе чужое. Рознабаковасць гэтага характару, яго жыццялюбства добра выявіліся ў многіх творах. Ён вельмі таварыскі, гаваркі.

А я любіў за ўсё найболей
Пагутарыць ва ўсе гады.

Сказана, паверце, вельмі шчыра. Таксама, як і ў другім вершы, дзе паэт прызнаецца, як карціць яму заўсёды

Сустрэцца з полем, борам, гаем,
З крыніцай, возерам, ракой,
Наведаць тых, каго жадаю,
Хто хоча бачыцца са мной.

Чаго ж мне хочацца найболей:

Я не схіляю галаву,—
Каб паспяваць яшчэ ў застоллі...
Я ж, можа, песні не сарву.

А якую прыхільную, цёплую ўсмешку выклікаюць вось гэтыя радкі з верша Броўкі «Калі прыеду»:

Калі прыеду ў вёску нашу
І папрашу цябе паесці —
Стаўчы мне бульбяную кашу,
Засквар, чым маеш ты, нарэшце.

А ёсць кілбаска — пахваліся,
Грыбкоў падкінь ты усялякіх,
Пастаў вялізную мне місу
Капусты кіслае для смаку.

Падай, як некалі бывала,
(Бо змалку не змяніў я густу)
Скрылёў з пяток сырога сала
І хлеба ўкрой, як трэба, лусту.

Было б недапушчальнай памылкай бачыць тут адну толькі «этнаграфію». Не, у радках паэта ёсць большае, што ярка адцяняе пэўную грань паэтычнага характару чалавека, які не забыў свой радзінны куток, адкуль пайшлі яго жыццёвыя дарогі, І хіба гэта не сведчыць пра душэўны вопыт паэта, не раскрывае яго характар, густы, схільнасці?!.

У паэтычных зборніках Броўкі «Калі ласка» (1972), «І ўдзень, і ўночы...» (1974), у кнізе прозы «Разам з камісарам» (1974) пабольшала, на маю думку, матываў апавядальных. Паэт шчыра гаворыць пра сябе, пра свае адчуванні, сімпатыі, антыпатыі, ваганні, у нечым прызнаецца, дзеліцца вопытам, думае, іранізуе, нават — вельмі тактоўна — павучае. Што ж, кожны паэт, асабліва такі, як Броўка, у якога вялікі жыццёвы і духоўны вопыт, мае поўнае права на споведзь. І яна выходзіць у яго вельмі цікавая, змястоўная.

Шмат можа сказаць пра Броўку вось гэты верш, які мне асабліва падабаецца:

Калі надыдзе час спачыну,
Адна ёсць просьба да зямлі:
Накрый мяне крылом арліным,
Крыло галубкі пасцялі.

Абодвум з дзён маленства босых
Зайздросціў я, як ні кажы,—
Глядзеў услед арлу ў нябёсах,

Ды галубінай быў душы.

А ўсё ж калісьці, у нейкім ранні,
З праменнем першым па расе
Не клёкат грозны — вуркаванне
Няхай мне вецер прынясе.

Крыло арла і крыло галубкі — гэтыя, запазычаныя з фальклору, але асэнсаваныя па-свойму, па-сучаснаму вобразы набываюць у Броўкі сімвалічны сэнс. Яны ўвасабляюць, на мой погляд, два пачаткі ў чалавечай душы — смеласць і пяшчоту, дзёрзкасць і дабрату, яснасць бачання і чалавечнасць. Адзін з гэтых пачаткаў і адцяняецца, і ўзбагачаецца другім, абодва яны плённыя і неабходныя на жыццёвых шляхах.

Нярэдка мы спрачаемся аб тым, што такое майстэрства, што з ім рабіць і г. д., разумеючы пад майстэрствам найперш тэхніку вершаскладання, г. зн. па сутнасці атаясамліваючы яго з уменнем будаваць кампазіцыю, дасканала рыфмаваць радкі, інструментаваць іх. Усё гэта, безумоўна, мае адносіны да паняцця майстэрства, але толькі пры ўмове, калі служыць сродкам для выяўлення глыбокай, грамадскі значнай думкі. Калі ж такое думкі няма, траціць свой сэнс нават самая дасканалая тэхніка.

У Броўкавым вершы майстэрства проста непрыкметнае, яно — арганічная ўласцівасць яго паэтычнай думкі. Мастацкая форма паэзіі Броўкі заўсёды хвалявала мяне сваім дэмакратызмам. Уражанне такое, што для паэта праблемы формы проста не існуе. Яна такая ж неад'емная частка яго свядомасці, як і сам змест, можна сказаць, адзіны спосаб існавання гэтага зместу. Таму, відаць, і ствараецца ўражанне, што паэта мала цікавяць выяўленчыя сродкі. Усё ясна, лагічна, проста, аднак разумееш, што гэта тая прастата, якая прыходзіць да мастака пасля доўгіх-доўгіх пошукаў.

Адна з найважнейшых рыс паэзіі Броўкі — яе народнасць. Паэту ўласцівы народны погляд на рэчы, на жыццё. Паэзія Броўкі карэннем сваім урасла ў народную глебу. Яна — у блізкасці паэта да народных інтарэсаў, якія знаходзяць выяўленне ў яго творчасці, у той грамадзянскасці і адказнасці, якую паэт адчувае на кожным кроку.

Хачу не многа я.
Даволі —
Хоць рушыць конна, не ляцець,
Але быць вобадам у коле,
Не дробнай спіцай мільгацець.

Яму да ўсяго ёсць справа. Ён пра ўсё павінен ведаць. Клапатлівыя адносіны да навакольнага дакладна адлюстроўваюць пазіцыю

паэта, яго прыналежнасць да таго вялікага і малога, што адбываецца навакол. І што Броўку было характэрна заўсёды — дык гэта прага новага, вострая назіральнасць, уменне ўбачыць у, 'здавалася б, дробязі істотныя прыкметы часу.

Я ўзрос на роднай Беларусі
Пры берасцянцы і дудзе,
Гляджу сягоння і дзіўлюся —
Пастух з транзістарам ідзе...

Хацелася б звярнуць увагу на адну своеасаблівасць паэтычнага мыслення Петруся Броўкі: тыпізацыя, як сродак лірычнага абагульнення, дапаўняецца ў яго другой, уласцівай, дарэчы, фальклору, формай эстэтычных адносін да свету — ідэалізацыяй. Нярэдка здараецца і так, што ідэалізацыя, як тып мастацкага мыслення, выходзіць у яго на першы план. І тады верш нагадвае маляўнічую вышыўку, алеаграфію ў найлепшым сэнсе гэтага слова:

Ноч і прытуліць і прыкрые
Надзейным покрывам сваім,
Калі гуляюць маладыя...
Здаецца, ўсё спрыяе ім —

І луг сустрэне дыванамі,
І гай пяшчотаю спаўе,
І цёмна-шумнымі лістамі
Ім дрэва кожнае спяе,

І неба гляне зор гарошкам...
А хцівы месяц да відна
Як быццам высцеле дарожку
З бялюткай трубкі палатна.

Зрэшты, ідэалізацыя ў пэўнай ступені заўсёды была ўласціва асобным творам Броўкі — як адзнака паэтавага светаўспрымання. Як тып паэтычнага абагульнення, яна дазваляла і памагала Броўку пасвойму, праўдзіва адлюстроўваць паэзію жыцця.

Зварот да фальклору з яго «калектывізмам» ва ўспрыманні свету, вельмі характэрным для вуснай народнай паэзіі, ніколькі не прыніжае асабовы пачатак паэзіі Броўкі. Наадварот, дазваляе яму выявіцца як след. Сувязь з вуснай народнай творчасцю не скоўвае П. Броўку, а адчыняе перад ім шлях да паэтычнага адлюстравання сучаснасці. Так было пад канец 30-х гадоў, у суровыя дні вайны, так ёсць і сёння. Сённяшняя паэзія П. Броўкі не толькі не страціла сваёй празрыстасці і ідэальнасці ў добрым сэнсе гэтага слова, а набыла новую якасць:

вершы паэта неяк памякчэлі, зрабіліся больш разважлівыя, захаваўшы ў той жа час дух баявітасці, высокі грамадзянскі пафас.

«Уменне зрабіць вялікае і малое прадметам мастацтва,— тонка заўважыў пра свайго сябра П. Ф. Глебка,— надае паэтычнаму голасу Петруся Броўкі надзвычайна шырокі дыяпазон. Ён і тонкі лірык, які ў такіх выпадках карыстаецца бадай толькі акварэльнымі фарбамі. Ён і трыбун, які можа прымусіць словы гучаць узнёсла і ўрачыста».

Не пра стомленасць душы, а пра няўтольную прагу пазнання свету, жыцця, людзей, пра радасць служэння роднаму народу сведчаць новыя кнігі паэта.

Я ж на галоўную дарогу,
Здаецца, толькі і ўзышоў.

Паэзія Броўкі моцная сваёй высокай грамадзянскасцю і адначасова адухоўлена тонкім лірызмам. Яна ўвабрала ў сябе і непаўторныя краскі палёў і лясоў, і звон беларускіх рэк, і скарбы вуснай народнай творчасці.

Вядомы крытык У. Агіевіч некалі трапна сказаў пра П. У. Броўку: «Яго ўласная біяграфія з'яўляецца як бы. жывой ілюстрацыяй да жыцця ўсяго беларускага народа». Гэтак жа можна сказаць пра разнастайную творчасць паэта, у якой знайшло адбітак духоўнае жыццё роднага народа.

Пройдуць гады, і новыя пакаленні будуць звяртацца да твораў Петруся Броўкі і меркаваць па іх пра нашу эпоху. Можна не сумнявацца, што яны знойдуць там вялікую і хвалюючую праўду пра наш бурлівы і складаны век, пра чалавека — барацьбіта і стваральніка. Няма сумнення і ў тым, што з цягам часу ўсё глыбей і шырэй будзе раскрывацца народная мудрасць, ідэйнае багацце і мастацкае хараство гэтых цудоўных твораў.

Ідзе час,.. Паэзія Петруся Броўкі і сам паэт — у дарозе. За плячыма — вялікі вопыт і той узрост, ад якога можна шмат чакаць.

Ах, як хутка час праходзіць, ах, як хутка час бяжыць!..
Я б хацеў, пяро, з табою доўга-доўга гаварыць,
Я ж яшчэ не ўсё агледзеў і не ўсё адчуў душой,
Працаваць нам, працаваць нам, ранавата на спакой...

## ДЗЕНЬ СЁННЯШНІ

### *(Максім Танк)*

Даўняя звычка Максіма Танка — пад кожным творам ставіць дату яго напісання ці, дакладней, заканчэння работы над ім. Першы верш яго новай кнігі «Хай будзе святло», якая падсумоўвае работу паэта за апошнія амаль што пяць з паловай год, памечаны 1.1.67, апошні — 21.IV.72. Перыяд немалы, а як для сённяшняга хуткаплыннага часу — то асабліва значны і змястоўны.

Як адбіўся ён у рабоце паэта?

Кампазіцыя кнігі склалася проста і натуральна, прынамсі на наш погляд: верш за вершам, паслядоўна, як дзень за днём (ні дня без радка!), і ў кожным вершы — адбітак душы паэта, яго ідэйнае і маральнае самаадчуванне ў разнастайнасці ўласцівых кожнаму дню падзей, здарэнняў, успамінаў, перажыванняў. Розныя падзеі пакідаюць след у свядомасці паэта: скажам, праблемы навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і тое, «што ўчора на калгаснай нашай ніве зазелянела маладая рунь», а таксама многае іншае... Танк глыбока перакананы, «што ў жыцці няма падобных ні месяцаў, ні дзён, ні хвілін».

У гэтым выявілася танкаўскае разуменне багацця штодзённага, «звычайнага» жыцця. Яго вершам (а іх больш за дзве з паловай сотні) зусім не ўласціва аднастайнасць — ні ў змесце, ні ў форме. Яны не стамляюць, бо ў іх пераліваюцца разнастайнымі адценнямі яркія і эмацыянальныя фарбы. Прастата кампазіцыйнай будовы кнігі падкрэслівае інтэнсіўнасць унутранага інтэлектуальнага жыцця паэта і духоўную змястоўнасць яго паэзіі.

З чаго і калі пачынаецца паэт? Як нараджаўся і сталеў той арыгінальны і самабытны мастацкі свет, які мы завём паэзія Максіма Танка?

На гэтае пытанне не лёгка адказаць, нягледзячы на тое, што добра ведаеш час і абставіны, калі паявіліся першыя творы паэта. Першыя вершы Танка датаваны самым пачаткам 30-х гадоў, а зборнік «На этапах» выйшаў у Вільні ў 1936 годзе. Р. Р. Шырма — дзядзька Рыгор, як пяшчотна заве яго Яўген Іванавіч па сённяшні дзень, усхвалявана і вельмі дакладна пісаў у прадмове да яе, што муза Танка «нарадзілася ў звонкім шуме медна-сасновага наднарачанскага бору. Чорныя барозны палёў, пеністыя хвалі Нарачы і Мястра, а пазней шырокія этапныя дарогі былі яе калыскай».

Аўтар прадмовы акцэнтаваў увагу на біяграфічных і сацыяльных вытоках і матывах творчасці Танка. Максім Танк — паэт,

народжаны барацьбой. Яго ўзняла з жыццёвых глыбінь хваля нацыянальна-вызваленчага руху заходнебеларускага народа. У гэтай барацьбе ён, рэвалюцыянер-падпольшчык, камуніст, прыняў самы дзейсны ўдзел. Свой выдатны талент паэта і арганізацыйныя здольнасці ён з юнацкіх год аддаў справе партыі, справе народа, знаходзячыся ў самай гушчыні бурлівага жыцця. Працаваў у падполлі інструктарам ЦК камсамола Заходняй Беларусі, вёў рэвалюцыйна-прапагандысцкую работу, выконваў разнастайныя даручэнні партыі. Не адзін раз яго судзілі пілсудчыкі, канфіскоўваліся яго кнігі, зведаў ён роспач этапных дарог і турэмную няволю.

Жыццё паэта-рэвалюцыянера, канспіратара выразна і яскрава паказана ў вершах «Кожны дзень шукаюць маю песню...», «Як мы пішам?..», «Не забывай», «Калі прачынаецца вецер...», «Нарач, як мора, шуміць...», « Ізноў я тут», «Сцены і неба кавалак між кратаў...», «Да дня»...

— Ці чуеце?
Пусціце ў хату!
— У нас няма пагрэцца дзе.
— Я збіўся ў замеці праклятай,
Блукаю ўжо каторы дзень.
Хто я?
Свой!
Можа, нават чулі.
За мной шлюць гончыя лісты,
Мяне шукаюць катаў кулі...
— Што ж не сказаў адразу ты!
Заходзь!
Для гэткіх ёсць прытулак.

У маладой заходнебеларускай літаратуры М. Танк быў не адзінокі. Побач з ім працавала цэлая плеяда маладых таленавітых паэтаў: М. Васілёк, М. Машара, П. Пестрак, В. Таўлай, Н. Тарас, М. Засім, А. Іверс і іншыя. Аднак творчая індывідуальнасць М. Танка была адметная сярод іх, нават напачатку вельмі самастойная. Ён быў прызнаным лідэрам заходнебеларускай паэзіі. Творчасць яго вылучалася шырынёй сацыяльнага і чалавечага зместу і незвычайнай яркасцю вобразнага мыслення. Вобраз у Танка па-сапраўднаму невычарпальны:

На захад ідуць цягнікі —
Лён,
Жыта,
Сасна і бяроза...
Гляджу і гляджу з-пад рукі,
Як наша юнацтва вывозяць.

У гэтай паэтычнай асацыяцыі — злучэнні вельмі далёкіх паняццяў — бездань сэнсу. Вобраз выключна шматмерны, аднак усе яго сэнсавыя адценні сыходзяцца на адным: капіталізм абкрадвае народ, краіну не толькі матэрыяльна, але і духоўна.

Са старонак першых кніг паэта («На этапах» — 1936, «Нарач» — 1937, «Журавінавы цвет» — 1937, «Пад мачтай» — 1938) паўстаюць карціны народнага жыцця, цяжкага, сатканага з мноства супярэчнасцей. Паэт бачыў іх і паказваў у сваіх творах. Не адзін раз даводзілася яму, падпольшчыку, начаваць пад саламянымі стрэхамі сялянскіх хат у незнаёмых людзей. І ўсюды чулася адно і тое ж:

Бачыш: у нас голад, жыць нялёгка, браце,
Хлеб на стол кладзецца толькі для гасцей.
Добра, калі хопіць бульбы ў нашай хаце
Да вясны, да першых з выраю гусей...
Час такі нядобры. З першых дзён марозу
Маладых нямала ў турмы павялі...

*(«Песня кулікоў»)*

Гэта — расказ старога. Прыслухайцеся да яго непаспешлівай, даверлівай гаворкі, удумайцеся ў словы. Як шмат можа сказаць пра чалавека нават адна інтанацыя, рытміка. Колькі ў ёй смутку і гора, дабраты і надзеі...

У новай кнізе «Хай будзе святло» шмат вершаў-успамінаў: «Ля старой хаціны», «Бяседа», «Пейзаж — 1939», «Пагасла электрычная лямпачка...». Малюнкі мінуўшчыны ярка кантрастуюць з пашай сённяшняй явою — нават у самым звычайным, будзённым. Паэт гаворыць пра соль: «Бацькі калісьці яе ў тры пальцы бралі, як малітву, куплялі ў крамнікаў расол з-пад селядцоў, у сцэджанай вадзе варылі бульбу двойчы, драбкі яе смакталі ад цынгі...» («Шахцёр»).

Як бы сумна не выглядалі карціны заходнебеларускага жыцця ў творчасці М. Танка гэтага перыяду, яго творы гучалі аптымістычна, у іх адчуваўся вялікі рэвалюцыйны зарад. Зразумела, паэтычнае аблічча Танка сфарміравалася не адразу, але яго «вучнёўскі» перыяд у літаратуры праходзіў фарсіравана, творчая сталасць настала вельмі хутка — адначасова з грамадзянскай, рэвалюцыйнай, партыйнай, неаддзельная ад іх. Жыццёвыя карэнні паэта глыбей і глыбей уваходзілі ў народную глебу, ад кнігі да кнігі паўней і шырэй раскрываўся яго духоўны свет.

Неяк капаючыся ў архіве, я натрапіў на пажоўклую паштоўку прыкладна 1935 года — з выцвілымі літарамі, на якой рукой Танка было напісана: «Ніхто не можа быць добрым мастаком, пакуль бачыць жыццё іншым, чым яно ёсць». Гэта, безумоўна, так. Аднак сіла і

вабнасць паэзіі Танка заключаецца не толькі ў гэтым, а і ў глыбокім эстэтычным сінтэзе рэальнасці з ідэалам, праўды з прыгажосцю. Жыццё выступае ў вершах Танка ў сваім рэвалюцыйным развіцці.

Паэт і яго герой вельмі тонка адчуваюць хараство і здольны адкрываць яго, нават знаходзячыся за турэмнымі кратамі. Востра ўспрымаюць яны прыгажосць рэвалюцыйнага парывання да свабоды і шчасця. У вершах паэта заўсёды прысутнічае надзея, вера ў народ, у яго талент і творчыя сілы.

Паўната жыццёвых перажыванняў — неад'емная рыса героя вершаў Максіма Танка. Яго гераізм і рэвалюцыйнасць робяцца ад гэтага яшчэ больш праўдзівымі, пераканаўчымі і маральна прывабнымі. Гэта — звычайны, жывы, рэальны чалавек, без якога б там ні было налёту аскетызму. І ў гэтым яго прыгажосць.

У лепшых вершах сярэдзіны 30-х гадоў, такіх, як «Да дня», «Спатканне», «Песня кулікоў», «Паслухайце, вясна ідзе», «Павязлі цягнікі», «Раманс» і іншых, чалавек паказаны ў вельмі разнастайных жыццёвых сітуацыях. Гэта натура жывая, цэласная, якой невядома мяжа, што раздзяляе «сваё» і «чужое», асабістае і грамадскае. У вершы «Спатканне» малюецца сустрэча палітвязня са сваім бацькам, які прыходзіць яго адведаць. З багатай на падтэкст размовы мы пра многае даведваемся, глыбей пазнаём іх чалавечы свет. Колькі ў іх пяшчоты, зацікаўленасці жыццём, веры ў яго перспектывы, у будучыню:

Вясною светлаю з-за крат
З сяўнёю, поўнаю зярнят,
Нас выйдзе шмат, як цёмны бор,
На скібы чорныя разор...

Паэт глыбей і глыбей асвойвае пласты народнай свядомасці, яго паэзія робіцца народнай па праблематыцы і па духу яе выяўлення. Думаецца, у гэтым ключ той папулярнасці, якой карысталася паэма «Нарач» (1936), што расказвае аб вядомым паўстанні нарачанскіх рыбакоў.

Асабліва мужнее талент паэта, расце яго майстэрства ў перыяд уздыму народнага фронту ў Заходняй Беларусі (другая палавіна 30-х гадоў). Паэт паўней авалодвае метадам сацыялістычнага рэалізму, паглыбляецца класавы змест яго творчасці, акрэсліваецца лірычнае «я». Гэта час усебаковага палітычнага грамадзянскага і чалавечага сталення паэта, час цяжкіх выпрабаванняў, пра якія, як і пра многае іншае, можна меркаваць па цудоўных кнігах — «Журавінавы цвет» (1937), «Пад мачтай» (1939).

Ішла вайна з фашызмам у Іспаніі. Там, у радах інтэрнацыянальных брыгад, знаходзіліся і некаторыя з яго таварышаў: «Не стала

шмат маіх сяброў. Адных сляды пясок завеяў ці недзе спяць на Пірэнеях пад белым саванам снягоў». Але паэта не пакідае мужнасць, вера ў народ, партыю, у перамогу рэвалюцыйна-вызваленчай справы, у сілу песні.

З вялікай радасцю, як і ўвесь наш народ, сустрэў Танк 17 верасня 1939 года. Гэтага дня чакалі даўно, але прыйшоў ён неяк адразу: «Незабыўныя дні ўз'яднання,— успамінаў ён потым,— засталі мяне дома, у Пількаўшчыне. Помню, вераснёўскім ранкам прыбеглі хлопцы з суседняй вёскі Слабада з радаснай весткай, якую яны пачулі па радыё: Чырвоная Армія перайшла граніцу. Усе мы кінуліся на Мядзельскі тракт, які ўжо грымеў ад танкаў з чырвонымі зоркамі, гармат, машын...».

Здарова, таварышы! Доўга чакалі
Мы вас і чакала ўся наша зямля,—

гэта радкі з шырокавядомага верша, які быў напісаны на вялікім душэўным уздыме. Паэт уключаецца ў актыўнае грамадскае жыццё, а яго творчасць уліваецца ў агульную плынь беларускай савецкай паэзіі. Але голас яго, непаўторны танкаўскі голас, і тут гучаў вельмі свежа і моцна.

Паэзія Танка, заўсёды шчыльна звязаная з народам, партыяй, роднай зямлёй, прайшла суровую праверку ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Магутна гучаў яго голас: «Мы вернемся», «Не шкадуйце, хлопцы, пораху», «Падымайся, Беларусь», «Вастрыце зброю», «Ты будзеш жыць, Радзіма!». Танк працуе ў франтавым і партызанскім друку. Аб гэтых днях успамінае Якаў Хелемскі — адзін з лепшых перакладчыкаў Танка на рускую мову:

«Танк сярод нас быў ужо абсалютна сваім, родным. Худзенькі, светлавалосы, у салдацкай гімнасцёрцы, наплечных рамянях, са шпалай у пятліцах, ён выглядаў зусім юным. Цяжка было, гледзячы на яго, паверыць, што перад табой чалавек нялёгкага лёсу, які прайшоў падполле і турмы».

Паэт пісаў вершы, нарысы, лістоўкі... З гэтага часу тэма вайны ва ўсёй яе трагічнай рэальнасці стане адной з пастаянных у паэзіі Танка. Але ён нястомна будзе супрацьстаўляць ёй прагу жыцця, перамогу дабра і чалавечнасці.

У час вайны, у 1943 годзе, Максім Танк піша паэму «Янук Сяліба», прысвечаную беларускім партызанам, якую ён сам лічыць адной з найбольш удалых. Паэма ўключае вельмі характэрную для светаўспрымання паэта прытчу пра музыканта Куліка. Калі бог паставіў яго на раздарожжы, перад выбарам, куды пайсці — у пекла ці ў рай, музыка раптам успомніў родны край,

I што не ў кожнай хаце адгасціў,
I не на ўсіх хрысцінах пабываў,
I не на ўсіх вяселлях адыграў,
I не з усіх яшчэ ён чарак піў...
Зноў захацелася яму дамоў.
Паправіў лапці, струны патужыў
I на Палессе,
граючы,
пайшоў.

Паэта ні на хвіліну не пакідае глыбокая вера ў народ, у яго творчыя сілы і талент. У гэтым фрагменце з паэмы «Янук Сяліба» добра бачна адна з істотных рыс паэтыкі М. Танка: асобныя, здавалася б, мала звязаныя паміж сабой матывы складаюцца ў важную абагульненую думку аб прызначэнні мастака і яго мастацтва, думку, якая вызначаецца вялікай філасофскай глыбінёй.

Плённа — хоць і не заўсёды з аднолькавай мастацкай сілай — працаваў Танк у пасляваенныя гады. Адна за другой выходзяць яго кнігі: «Праз вогненны небасхіл» (1946), «Каб ведалі» (1948), «На камені, жалезе і золаце» (1951), «У дарозе» (1954). У гэтых кнігах паэт успамінаў вайну, трывожную маладосць і нястомна шукаў новых кантактаў з пасляваеннай рэчаіснасцю.

Мужна, пранікнёна гучыць тэма партыі:

Партыя —
Выпрабаваны ў баях карабель.
Я — адна толькі нітка
У тых ветразях пурпуровых,
Што гісторыі подых
Нясуць на сабе...

У сярэдзіне 50-х гадоў паэту давялося шмат ездзіць па краіне і за яе межамі. Прага свежых уражанняў, адкрыццяў, жыццёвай навізны, уменне яе адчуваць, уславіць перадавое, чалавечнае — без гэтага нельга ўявіць Танка ні як чалавека, ні як паэта. У адным з вершаў ён прызнаецца, што «не лічыў бы паэтам сябе, каб кожны мой дзень не быў днём нараджэння». Прага вандровак, падарожжаў, пошукаў вельмі характэрна для яго паэтычнага настрою.

Паэтычныя небасхілы сённяшняга Танка надзвычай шырокія. Тэматычныя і ідэйна-эмацыянальня абсягі яго паэзіі адпавядаюць маштабам сучаснага жыцця. Апошнім часам значна пашырылася геаграфія паэзіі Танка, узбагацілася яе грамадзянская лінія, яшчэ танчэй стала майстэрства.

Свежа, з новай сілай раскрыўся паэт у кнізе «След бліскавіцы» (1957). Мне асабіста яна нагадала яго лепшыя кнігі, вабячы высокім

напалам страсцей, грамадзянскім пафасам, тонкім лірызмам, а галоўнае — цеплынёй сваёй чалавечнасці. Так, яна наскрозь прасякнута ідэямі актыўнай сцвярджальнай чалавечнасці. Гэта было ўласціва — не трэба забываць — і папярэднім яго кнігам, аднак не ў такой ступені. Ідэі высокага, наступальнага, сапраўды сацыялістычнага па свайму зместу гуманізму сталі ў ёй усёпранікальнымі, вядучымі. Як не ўспомніць у гэтай сувязі шырокавядомы верш з гэтай кнігі «Ave Maria», які крытыка параўноўвала з такімі шэдэўрамі М. Танка, як «Спатканне», «Песня кулікоў», і які ўспрымаецца як гімн жыццю, жаночай прыгажосці.

У Луўры, стоячы перад скульптурай Венеры Мілоскай, паэт пасвойму зразумеў, чаму ў багіні «рук няма» : «Пэўна, маланка скрышыла, каб перад небам і перад зямлёю грудзі свае імі не засланіла». Маленькі штрышок, але гэта сапраўдная паэзія з цудоўнай думкай пра бяссмерце прыгажосці.

Глеба, на якой вырастаў і дужэў талент Танка, мела ў сваёй структуры пласт сусветнай і перш за ўсё еўрапейскай культуры.

Даўно вядома, што для паэтыкі Танка характэрны актыўны зварот да вобразаў старажытнай культуры, антычнасці і адраджэння. Паэт умее зблізіць мінулае з сучаснасцю. У новай кнізе гэта рыса паэтычнага мыслення Танка атрымала далейшы працяг і развіццё. Падзённа гучыць спрэчка Мікеланджэла з богам у вершы «Перад «Рабамі». Бог просіць скульптара спыніць работу над вядомымі «Рабамі».

Да раніцы яны спрачаліся, чуваць,
і бог, разгневаны, пакінуў гэту
стрэчу,
Не змогшы запалохаць і пераканаць,
Да Мікеланджэла
паслаў
анёла смерці.

Не менш сучасна гучыць вядомае пытанне Гамлета «быць ці не быць» для пасажыраў карабля, які плыве міма замка Эльсінор, а ўнізе, у сініх тонях, яшчэ з часоў вайны прытаіліся міны. Літаратурныя рэмінісцэнцыі характэрны многім творам паэта. З легенды, падання, старажытнага выказвання ён умее здабыць максімум важнага сёння, актуальнага сэнсу. Адштурхоўваючыся ад вядомага радка з геніяльнага «Слова аб палку Ігаравым»: «На Нямізе снапы сцелюць галовамі...», паэт, звяртаючыся да невядомага аўтара «Слова», намаляваў прывабную карціну сённяшняга дня.

Сёння,— аб чым сведчыць кніга «Хай будзе святло»,— паэт перш за ўсё імкнецца больш поўна і дакладна перадаць у сваёй творчасці

несупыннае ўзбагачэнне і ўзбуйненне асобы савецкага чалавека. Пашырэнне сферы чалавеказнаўчых і грамадзянскіх інтарэсаў усёй савецкай паэзіі ў творчасці Танка адчуваецца надзвычай выразна. «Ці будзе дождж, ці пройдзе стараной?» — гэты даўні сялянскі клопат хвалюе і паэта, які ганарыцца сваім сялянскім паходжаннем. Свет паэта прывязаны да зямлі, да рэальнага жыцця, але гэта свет мастака з уласцівай яму смелай фантазіяй, рамантычнымі ўзлётамі, нечаканымі сацыяльна-псіхалагічнымі адкрыццямі.

У паэзіі Танка жыве чалавек дзейсны і мужны, дасціпны і іранічны, мудры і па-дзіцячы непасрэдны адначасова. У ім спалучыліся талент і вопыт, думка набыла выразнасць, філасафічнасць і пераканаўчасць афарызма. У яго песні мазолістыя рукі і вернае сэрца. Паэт не баіцца «празаізацыі» радка, бо тое, пра што ён расказвае, надзвычай важнае і значнае па думцы. Паэтычны эфект уласцівы самой прыродзе яго мыслення.

Герой паэта з тых, хто імкнуўся сказаць Радзіме, народу аб сваёй любові, перш за ўсё «плугам пракладваючы барозны без агрэхаў, касой на нарачанскіх сенажацях, сякерай узводзячы з бярвення зрубы хат, вінтоўкай, што ўручылі ў час суровы...».

Паэзія Танка — уся! — грунтуецца на бязмежнай любові да жыцця.

Адсюль, з любові да жыцця ўзмацняецца разуменне неабходнасці бараніць яго. Творчасць Танка сведчыць, што мастацтва, паэзія і цяпер, у век грозных супярэчнасцей застаецца драмай жыцця.

Паэт строга, з пазіцый высокай маралі, судзіць жыццё. Гэтае права даў яму яго вялікі і багаты жыццёвы вопыт, вострае пачуццё асобы, якая ясна праступае ў яго паэзіі. Адсюль узрастанне праблемнасці ў падыходзе да рэчаіснасці, узмацненне філасофскага роздуму. Сённяшняя паэзія Танка — гэта паэзія неспакою. Ён ведае, што ў свеце ідзе вострая барацьба, што ніколі не сціхала яна і ў мастацтве: «Прайшоў я праз усе залы. Бачыў карціны, намаляваныя тлустымі пальцамі, скруткамі долараў, страхам, разгубленасцю, абыякавасцю. Калі ж у экскурсавода запытаўся: а дзе карціны, намаляваныя сціснутымі кулакамі, вачамі беспрацоўных, каменнямі барыкад, крывёю расстраляных,— у мяне праверылі дакументы і вельмі шкадавалі, што я — не іх падданы» («На выстаўцы»).

Лірыка ў паэзіі М. Танка значна пашырыла свой мастацкі дыяпазон. Сэрца паэта ўмяшчае боль планеты.

«Спецыяльнасць мая — спецыяльнасць сапёра, які ўсё жыццё размініраве шляхі да любові, дружбы, міру» — У гэтым паэт бачыць сваю задачу. Яго паэзія сагрэта клопатам аб чалавеку:

Ты, homo kosmikos, мой брат,
Глядзі, каб не забыў
Знаёмых сцежак і прысад,
Сваіх жытнёвых ніў.

Гаючых рос, духмяных траў,
Палін, вятроў, азёр
І рук, з якіх ты стартаваў
Да невядомых зор.

І песень матчыных святых,
І смаку праснакоў,—
Чаго нідзе не знойдзеш ты,
Пайсці ў заклад гатоў.

А каб заўжды мог адшукаць
У космасе край свой,
Цвяток радзімы васілька
Вазьмі ў палёт з сабой.

Гуманізм паэта і ў высакароднасці яго чалавечай натуры, у яго душэўнай далікатнасці («Як жа ісці па вуснах пявучых траў, па жывых, раскрытых вачах лотаці? Дык вось чаму птушкі лётаюць!»), у той трывозе за лёс жывой прыроды, што бачна ў многіх вершах. З захапленнем назірае ён за цецеруковым такавішчам, аднак чуецца і трывога:

Пяюць, заплюшчыўшы свае вочы,
Пяюць, забыўшы пра журавіны.
Хаця б вяселля іх не сурочыць,
Хаця б на песню іх гром не рынуў?

Танк — як паэт, як чалавек, як асоба — вельмі абаяльны. Аб складаным ён імкнецца гаварыць проста, але не спрошчана, разлічваючы, у сваю чаргу, на поўнае разуменне чытачоў. У сённяшняга Танка — у каго заўсёды хораша ўжываліся гумар і жарт, сатыра і проста гарэзлівасць, а часам нават сарказм — значна пабольшала гэтых якасцей. Часта ў жартаўлівай форме паэт гаворыць аб вельмі і вельмі сур'ёзным і важным, як, напрыклад, у вершы «Памяці Івана Сікоры» — вядомага беларускага садавода:

Вы яшчэ не прышчэплівалі свае
яблыні?
Як шкада, што Сікора — стары
садавод,
Аб якім у нас казкі, легенды
складалі,
На змярканні аднойчы згубіў

акуляры
І забрыў не дамоў, але ў рай
Або мо на другую планету,
І цяпер нельга з ім нам параіцца.
...Можа, пры дапамозе касмічных
ракет
Нам яшчэ з ім удасца звязацца.
Таму абы-якімі гатункамі чаранкоў
Вы не спяшайцеся прышчэпліваць
яблыні.

Вершы Танка філасафічныя па мастацкай своеасаблівасці падыходу да рэчаіснасці, па спосабу тыпізацыі жыццёвых з'яў. Тое, што для каго іншага можа здацца не вартым увагі, у мастацкай сістэме Танка, будучы падключаным да агульнай лініі паэтычнага напружання, набывае значны сэнс:

Вы не маглі б,
Таварыш ювелір,
Гэты камень
З бруку нашага горада
Аправіць у золата?

Камень гэты не проста камень, з ім у паэта звязана шмат дарагіх успамінаў.

Не, вы не махайце рукамі!
Я — не вар'ят.
Гэты камень —
Зразумейце толькі —
Даражэй за брыльянт,
Што ззяе ў вітрыне вясёлкай.
Ён у семнаццатым годзе
На барыкадзе быў,
У сорак першым
Мяне ад асколкаў фашысцкіх
прыкрыў.
А покуль мы зноў
Адбудоўвалі кожную фабрыку, дом —
Доўга мне ён падушкай служыў
І сталом.
Ён не такі просты камень,
паверце,—
Камень з бруку
Нашага горада,
Дзе сёння смяюцца шчаслівыя дзеці
І чуецца грому вясновага
грукат.

Танк умее разгледзець вялікае ў малым, у асобнай дэталі — веліч усёй рэчаіснасці. Тое, што для ўсіх прывычнае — у яго можа раптам выклікаць незвычайную душэўную рэакцыю, і ён здзівіць нечаканасцю адкрыцця.

Людзі пераступаюць пусты карабок ад запалак, а між тым ён расказаў бы «не менш за якую-небудзь энцыклапедыю», таму што «кожная ўспышка запалкі кусок жыцця азарала».

Калі Танка спыталі: «Што для вас галоўнае ў паэзіі?» —ён адказаў: «Праўда. І пошукі новых мастацкіх сродкаў, якія гэту праўду маглі б данесці да чытача, вывесці на трасу да чалавечага сэрца».

Крытэрый майстэрства для М. Танка — арыгінальнасць, багацце, цэласнасць мастакоўскага свету, а галоўнае — яго эстэтычная адпаведнасць жыццёвай праўдзе. «Галоўная задача мастацтва,— як пранікнёна сказаў К. Лібкнехт,— стварэнне не дасканалых твораў, а дасканалага свету».

Майстэрства — рэч індывідуальная, яно ў кожнага паэта — сваё, адметнае!

Прапушчана праз душу мастака... С. Маршак аўтарытэтна сведчыў, што «гэта прыходзіць само сабою, калі слых паэта так абвостраны, што слова для яго не толькі нешта азначае, але і гучыць усімі сваімі галоснымі і зычнымі», бо ў паэзіі ідэя можа быць выяўлена толькі мовою паэзіі.

Майстэрства — гэта калі адчуваеш, што інакш сказаць было нельга, а менавіта толькі так, у такой форме, такім чынам. Гэтая думка часта прыгадваецца пры чытанні М. Танка. У адной з нядаўніх яго кніг змешчаны верш «На біблейскую тэму».

Абрадваўся вярблюд,
Прачытаўшы ў «Бібліі»,
Што, быццам, яму
Лягчэй прайсці праз іголькае вушка,
Чым багатаму ў рай.
Але, убачыўшы за агароджай эдэму
Свайго гаспадара,
Зразумеў,
Што зноў яго ашукалі.

Паспрабуйце скажыце іншым спосабам! Гэта — немагчыма, бо тут усё непаўторна, як непаўторна — фенаменальная сама мастацкая думка.

Або другі верш, прысвечаны С. Ясеніну:

Асуджаюць, што ты выбраў смерць —
Апошні схоў ад жыццёвых нягод,
Быццам іх нельга было пераждыць,

Схаваўшыся
За дымам белых яблынь,
За кастрамі начлежнай зары,
За пераборамі і ўсхліпамі гармоніка,
За сасновым зрубам сваіх вершаў,
За плячамі шматлікіх сяброў...
Колькі было магчымасцяў,
З якіх скарысталіся б іншыя,
Акрамя цябе!

Паэтыка танкаўскага верлібру пакуль што слаба вывучана, а перад намі вельмі цікавы ўзор мастацкага мыслення. Адзін вобразны сілагізм, другі, трэці і ў канцы яны, як сноп перавяслам, моцна звязваюцца шырокай думкай — абагульненнем.

Прыведзеныя вышэй вершы, на мой погляд, узор філасофска-медытатыўнай лірыкі, да якой Максім Танк звяртаецца вельмі часта.

Светаўспрыманне Танка, якое грунтуецца на цесных сувязях з жыццём, абумоўлівае і эстэтыку паэта — эстэтыку здаровага і, я б сказаў, менавіта танкаўскага рэалізму. Танк — рэаліст па складу свайго характару і таленту. Ён глыбока закаханы ў матэрыяльнае, жывое жыццё. Для яго прыгожае самае простае: плуг, хлеб, песня, дружба — рэчы першай неабходнасці.

Моцная знітаванасць з народным укладам жыцця ўласціва Танку і яго паэзіі, бо паэт, яго творчасць выраслі на народнай глебе. Маральныя і эстэтычныя карэнні Танкавай паэзіі — народныя ў самым дакладным сэнсе слова. «Як аб перажытым народа майго расказаць?» — адна з галоўных турбот паэта, жыццё і лёс якога неаддзельныя ад жыцця і лёсу народа. Адно адлюстравалася ў другім, як перажытае старой маці ў наступным дыялогу:

— Нешта вы, маці, сыноўскі
Шынель гэты доўга хавалі.
Зараз прыкіну,
Што можна пашыць з яго
Вашаму ўнуку.
Вось толькі шкада,
Мо недзе ля печы
Рукаў асмаліла...
— Не, у той дзень наша вёска
гарэла...
— Ну, я памяркую, прыкіну.
Ды тут і крысо, зачапіўшыся,
Нехта падзёр на цвіку.
— Не, гэта — на дроце калючым...
— Тут можна было б падтачыць.

Вось толькі на самых грудзях
Невялічкая дзірка ад молі...
— Не, гэта ад кулі...
*("Перакройванне шыняля")*

Паэзія Танка і фальклор — пытанне асобнае.

Беларуская паэзія больш, чым якая іншая, мае патрэбу ў «выроўніванні» інтэлектуальнага і эмацыянальнага вопыту. Апошні, нам здаецца, маючы пад сабой даўнія (перш за ўсё фальклорныя) традыцыі, часта бярэ верх над інтэлектуальнасцю ў яе сучасным разуменні — асабліва ў творчасці паэтаў, якія празмерна захапляюцца «ружовымі золкамі», «яснавокімі мальвамі», «сінявокімі зорамі» і г. д., стылізуючы свае вершы пад фальклор. У такіх паэтаў верш трымаецца пераважна на рыфме, як правіла, вельмі беднай і спрошчанай, на элементарных паўторах рытму — без спробы павялічыць унутраную, ідэйна-інтэлектуальную ёмістасць верша. Верш не мае адзнакі аўтарскай асобы, бачання свету, індывідуальнасці; ён блізкі да фальклорнай песні як яе знешні пераймальнік.

Між тым сапраўдная народнасць паэзіі — не ў механічнай блізкасці да фальклору з яго «ідэальнай» паэтыкай. Галоўнае заключаецца ў тым, каб, не адмяжоўваючыся ад фальклору, ісці ў напрамку творчага наватарства, якое выкарыстоўвае найбольш канструктыўныя фальклорныя традыцыі. Гэтым шляхам ідзе Максім Танк. Сучасная паэзія часта будуецца на асацыяцыі пачуццяў, якія здольны зблізіць разнародныя з'явы і рэчы. «Шыбы старой камяніцы» нагадалі М. Танку пра вочы людзей, «якія заўжды пасля стрэлаў згасалі».

Асцярожна
Выцірайце шыбы,
Каб з ценямі дыму
Пажараў вайны
Не сцерці і ценяў
Вам блізкіх людзей,
Якія апошні раз
Некалі ў гэтыя шыбы глядзелі.

На гуманістычны роздум мастака паклала адбітак трагедыя суровага веку. Перажыванне паэта — пры ўсёй сваёй усёабдымнасці і маштабнасці — становіцца канкрэтна-адчувальным, пластычным, балючым на дотык. Паэтычнасць, як бачым, дасягаецца ў паэзіі М. Танка не рыфмай, нават не простай паўтараемасцю рытму, а найперш самой унутранай змястоўнасцю, ідэйнай і эмацыянальнай насычанасцю верша і яго выразнаю сінтаксічнаю пабудоваю. М. Танк — паэт з ярка выяўленымі інтэлектуальнымі эмоцыямі. Гэта відаць у

тым, як ён асэнсоўвае новы матэрыял, як апошні спалучаецца з паэтычным і біяграфічным яго вопытам.

Айсбергі — гэта алмазы
Палярнага ззяння,
Сны, што пад сіверам
Сняцца грэнландскім кітам.
Айсбергі — гэта застылыя
Горы маўчання,
Помнікі шхунам разбітым
І іх маракам.

Другі паэт у велічнай карціне плывучых айсбергаў убачыў бы нешта іншае, а М. Танку — песняру і ўдзельніку нацыянальна-вызваленчай барацьбы заходнебеларускага народа Ў перыяд белапольскай акупацыі, а потым барацьбы ўсяго савецкага народа з нямецкім фашызмам у гады Вялікай Айчыннай вайны, якая патрабавала столькі ахвяр,— айсбергі здаліся «помнікамі шхунам разбітым і іх маракам». Думка паэта шчодра насычаецца пачуццямі, а пачуццё ўбірае ў сябе думку.

Як мастак М. Танк ніколі не парываў з фальклорам, падтрымліваючы з ім сувязь на высокім узроўні эстэтычнай культуры. Традыцыі фальклорнай паэтыкі сустракаюцца і ў сённяшняй творчасці паэта:

У кожнага — свой век.
Мой век складаецца:
З дзён нараджэння сонца,
З пярсцёнкаў сосен, вырашчаных мною,
З раздадзеных сябрам акрайцаў хлеба,
З напоўненых вадой, віном збаноў,
З дарог, пракладзеных за небасхілы,
З зацепленых начной парою вогнішч,
З сустрэчных і растайных пацалункаў,
З камення, што ў падмуркі паўрастала,
З нялёгкай вернасці сваёй зямлі і песні...

Эмацыянальны і інтэлектуальны пачаткі, неад'емныя ад фальклорнай традыцыі, адлюстроўваюць у паэзіі М. Танка сучасны ўзровень грамадскай свядомасці, выяўленай у душэўным вопыце паэта. Мы не раз бачылі, як хораша ажывалі пад яго пяром даўнія легенды. У новай кнізе таксама ёсць вершы, пабудаваныя на выкарыстанні легендарна-казачных матываў. Памятаеце легенду, у якой расказваецца пра скамароха, што, заснуўшы, адпусціў з ланцуга Мядзведзіцу, і тая пайшла Млечным Шляхам «праз нашу краіну азёрную», сцішыўшыся недзе ў паўночным логавішчы:

Адно, звон пачуўшы смыка,

Пачынае скакаць, і да раніцы
На сіні рачны перакат
Густы зарапад асыпаецца.
*(«Зарапад»)*

Пераказаная паэтам легенда ўвабрала ў сябе ўласцівыя яму гумар, жартоўнасць. І цяпер, убачыўшы зарапад, мы, напэўна, успомнім яго верш, які ў нечым паэтычна ўзбагаціў наша ўспрыняцце свету.

Яркае, шматфарбнае апісанне народных звычаяў і традыцый, нанава пераасэнсаваныя прымаўкі і прыказкі, цэлыя пласты народнай свядомасці — усё гэта шырокім струменем уліваецца ў паэзію Танка, падпарадкоўваючыся ўладзе яго таленту. Праўда, сярод вершаў, якія блізка стаяць да фальклору, пракідваюцца, на мой погляд, і некаторыя слабейшыя,— напрыклад, «Туман туманіць асенні, слотны...» з яго чыста ўмоўна фальклорнымі вобразамі жалейкі, дзяўчыны. У радзе такіх вершаў — «Святочнае», «Як была я мала, мала...» — асоба паэта выяўлена недастаткова.

У новай кнізе «Хай будзе святло» шырока прадстаўлена любоўная лірыка. Яна па-танкаўску вельмі адметная, тут шмат гумару і жартоўнасці.

Любоўная лірыка Танка ўслаўляе жыццё, жаночую прыгажосць, яе вялікую ўладарную сілу. Аўтамат з газіраванай вадой не даў паэту асвяжальнай шклянкі, хоць той і кінуў яму некалькі манет:

А прыйшла Афрадыта,
якая толькі што
Выплыла з хваляў,— ён наліў
ёй шклянку
Асвяжальнай, газіраванай
з сіропам.
Відаць, і мае медзякі ён аддаў бы,
Калі б не паклікаў яе Акіян —
Раззлаваны, зайздросны.

Чытаць Танка, перажываць разам з ім, поўнасцю аддацца ва ўладу яго паэзіі — сапраўдная эстэтычная асалода. Яго паэзія, як усякая сапраўдная паэзія, узбагачае нас эстэтычна, паглыбляе наш погляд на свет, жыццё.

## «ШТО Я ЛЮБЛЮ...»

## *(Кастусь Кірэенка)*

Калі трэба было б, скажам, знайсці эпіграф да творчасці Кастуся Кірэенкі з ягоных твораў, то, на мой погляд, такім эпіграфам маглі б стаць радкі з верша «Труба»:

Мне ўручыла Радзіма
У вялікім паходзе
Трубу.
Не маўчаць,
Не чакаць,
Не глядзець, пакуль скончыцца бой,
А на славу гукаць
І на подзвіг
Пявучай трубой...

У вялікім паліфанічным аркестры, якім уяўляецца мне сучасная беларуская паэзія, голас Кірэенкі чуецца вельмі выразна, чымсьці нагадваючы — ці то сілай, ці тонам або тэмбрам сваім — пявучую трубу, якая кліча наперад. Не хачу тым самым сказаць, што яму не ўласцівы інтымныя інтанацыі, якія чуюцца ў такіх цудоўных вершах, як «Усмешка», «Калі я дамоў прыеду», «Пах чабаровы», «Слухайце ластавак» і многіх-многіх іншых, альбо матывы засяроджанага роздуму. Творчы дыяпазон яго паэзіі даволі шырокі, але напорысты, валявы, грамадзянска-публіцыстычны стыль складае, мне здаецца, яе галоўную своеасаблівасць.

«Я — паэт. Гэтым і цікавы. Аб гэтым і пішу»,— казаў пра сябе Ул. Маякоўскі. «Не паэт, а біяграфія паэта піша вершы»,— таксама, грунтуючыся, відаць, галоўным чынам на ўласным вопыце, заўважыў Э. Межэлайціс. «Мая біяграфія — у вершах»,— прызнаваўся С. Ясенін. Гэта было і сціпла, і вельмі справядліва. Але думаецца, далёка не кожны з паэтаў мае права так сказаць пра сябе. Чытаючы новы выпуск аўтабіяграфій беларускіх пісьменнікаў («Вытокі песні», Мінск, 1973 год), я міжволі звярнуў увагу на падобнае прызнанне аднаго даволі маладога паэта: маўляў, шукайце маю біяграфію ў вершах, адсылаю вас да сваіх кніг. І падумалася: а ты, дарагі таварыш, упэўнены, што яе можна там знайсці? Што ў мастацкай тканіне паэтычнага радка адчуваецца біццё твайго пульсу і ўгадваецца ўсё перажытае табой і не толькі табой?

Часам чытаеш вершы, зборнікі вершаў маладых і сталых (і ў гэтым — чалавечым — сэнсе па-сапраўднаму цікавых) паэтаў і не без

шкадавання пераконваешся : яркі, арыгінальны ў жыцці чалавек — а якім часта банальным і плоскім паўстае ён у сваіх творах.

Мера аўтабіяграфічнасці ў літаратуры, а ў лірыцы асабліва,— пытанне надзвычай важнае. Калі гаворка ідзе пра паэта-лірыка, то вось гэтая ступень узаемасувязі, тоеснасці, адэкватнасці перажытага і паказанага, адчутага і выяўленага ў вершах можа быць, на мой погляд, крытэрыем іх мастацкай паўнацэннасці і эстэтычнай значнасці. Аўтабіяграфічнасць, зразуметая дастаткова шырока, з'яўляецца адной з умоў ідэйна-мастацкай пераканаўчасці твора.

Такі крытэрый асабліва да месца і, больш таго, неабходны пры характарыстыцы і ацэнцы тых паэтаў, чый творчы шлях, ужо дастаткова працяглы, налічвае некалькі дзесяцігоддзяў, адкрытых усім вятрам нашай эпохі.

Да ліку такіх паэтаў адносіцца Кастусь Кірэенка.

Сваю аўтабіяграфію ён апублікаваў у кнізе «54 дарогі», але, магчыма, з-за сціпласці не сказаў пра тое, наколькі аўтабіяграфічныя яго вершы. Аднак перачытваючы яго кнігі, думаеш перш за ўсё пра гэта, пра тыя відавочныя сувязі, што здзяйсняюцца праз асобу паэта паміж яго творчасцю і часам, у якім ён жыве...

Асоба паэта ў розных яго вершах адлюстроўваецца не ў аднолькавай меры. Таму ў пошуках штрыхоў і фарбаў да творчага партрэта К. Кірэенкі будзем звяртацца ў першую чаргу да тых яго твораў, тэм і вобразаў, якія з'яўляюцца найбольш характэрнымі для яго індывідуальнасці.

Біяграфія Кірэенкі, калі гаварыць у цэлым, склалася вельмі шчаслівa. Равеснік рэспублікі, ён аказаўся ўдзельнікам многіх гістарычных падзей у жыцці краіны, многае, прайшоўшы праз яго сэрца, праз паэтычную свядомасць, адгукнулася ў вершах. У прадмове да зборніка Леаніда Гаўрылава — сябра свайго юнацтва, які загінуў на вайне,— Кірэенка ўспамінае, як той «вельмі настойліва рыхтаваў сябе да ўступлення ў жыццё. Яго адзінай марай было як можна паўней і карысней аддаць свае сілы і здольнасці служэнню савецкаму народу». Можна з упэўненасцю сказаць гэта аб усім пакаленні «равеснікаў Кастрычніка» ў цэлым, іх грамадскае і грамадзянскае аблічча фарміравалася ўжо пры савецкім ладзе, у 30-я гады.

Паэты гэтага пакалення вылучаліся нейкай асаблівай мэтаімкнёнасцю і шчырасцю, фанатычнай адданасцю літаратуры, з якой звязваліся думкі на будучыню. «Бяссонныя інстытуцкія ночы за кнігамі,— успамінае Кірэенка гэтыя гады,— сяброўскія сустрэчы, гутаркі, спрэчкі і расчараванні... Мы станавіліся дарослымі, а на жыццё насоўвалася хмара ваеннай трывогі...» Набліжалася вайна...

Сёння шмат гавораць і спрачаюцца пра першую кнігу паэта — якой яна павінна быць, нярэдка скардзяцца на тое, што вось, маўляў, цяперашнія маладыя дэбютуюць не з той сілай, як іхнія папярэднікі. Не бяруся катэгарычна сцвярджаць, што гэта сапраўды так, але першыя кнігі Я. Купалы, М. Багдановіча, М. Танка, А. Куляшова, П. Панчанкі і многіх іншых паэтаў з'явіліся выдатнымі з'явамі свайго часу. Вельмі яркай і важнай аказалася першая выйшаўшая з некаторым спазненнем (перашкодзіла вайна) кніга К. Кірэенкі «Ранак ідзе». Паявілася яна ў 1945 годзе, аднак і сягоння адзін мой добры знаёмы, вядомы паэт, гаворачы аб ёй, сказаў: «У гэтай кнізе не было ніводнага слабога радка!». Відаць, ён быў не зусім дакладны, мой знаёмы, даўно не перачытваў кнігу і мяркуе па таму даўняму ўражанню, але кніга на самай справе з'явілася значнай грамадскай падзеяй у многіх адносінах. У ёй былі сабраны некаторыя раннія вершы — 1939, 1940, 1941 гадоў, па-юнацку шчырыя і ў нечым яшчэ кволыя, няспелыя. Тым не менш, ужо тады бачны былі парасткі незвычайнага лірычнага тэмпераменту, які абяцаў раскрыцца ў будучым.

Пачынаў паэт у стрымана-лірычным ключы, у падтэксце яго песні адчувалася глыбокае эмацыянальнае хваляванне. Гэтая схаваная эмацыянальнасць добра адчувалася, скажам, у вершы 1941 года, прысвечаным Л. Гаўрылаву:

На курганні крычыць пугач,
Быццам хоча прастор застрашыць.
Ты ж будзь мужным, як слова наша,
Смутак мой, ціхі мой, не плач.

Скора дзень. Бачыш, як дрыжыць
Над Сажом цёплы свет барвовы?
Прывітальныя сонцу словы,
Смутак мой, добры мой, кажы.

І суціхні. Няхай наш век
Будзе песняй бадзёрай самай!
Зразумей жа, што я чалавек,
Я заплакаць магу таксама.

Першыя вершы Кірэенкі і другіх паэтаў яго пакалення — гэта ў многім вершы-прадчуванні. У іх адчуваецца тая інтэнсіўная ідэйна-маральная падрыхтоўка, якая аказалася вельмі і вельмі неабходнай напярэдадні выпрабаванняў, што выпалі на долю гэтага пакалення.

Ужо ў самым пачатку творчага шляху Кірэенка паказаў сябе рамантыкам, бязмежна закаханым у жыццё, родную, блізкую сэрцу прыроду, у сяброў, якія разам з ім сустракаюць ранак жыцця. Яго —

нават самыя першыя вершы — вылучала нейкая асаблівая закаханасць, бязмежная пяшчота, эмацыянальнасць, якая спалучала ў адзін, часам магчыма недастаткова канкрэтны вобраз асобныя дэталі, штрыхі, перажыванні. Гэта вершы «Чэрвень» (1940), пранізаны па-юнацку захапляючым успрыняццем жыцця, «Ты па шчавель ішла на луг...» (1929), дзе тонка, з незвычайнай пяшчотай паказана зараджэнне пачуцця ў юначым сэрцы.

Галоўны ж змест зборніка «Ранак ідзе» складаюць творы, напісаныя ў грозныя ваенныя гады, калі родная зямля была ахоплена агнём. Вайна застала Кірэенку ў арміі, дзе ён праходзіў службу. «Калі б пачаў успамінаць усё, што ўбачыў і што перажыў за чатыры гады вайны,— патрэбна было б пісаць тоўстую кнігу мемуараў»,— гаворыць паэт аб сабе. Кнігу мемуараў...— з гэтым можна пагадзіцца, толькі сапраўдныя вершы могуць больш расказаць, чым мемуары. У вершах К. Кірэенкі адбілася перажытае...

Галасілі салдаткі не дзень і не два,
Жабравалі па свеце малыя сіроткі.
А на лузе шумела, як мора, трава,
І жыты наліваліся сокам салодкім.

Даспявалі суніцы ў зялёных барах,
На шыпшыне звінелі пчаліныя гуслі.
А дзяўчыну з бацькоўскага бралі двара
І ў Нямеччыну гналі — па ўсёй Беларусі.

Так, праз рэальнасць гэтага кантраснага супастаўлення трагічнасці вайны і прыгажосці прыроды, перадаецца вобраз часу.

Вайна ў Кірэенкі мае вельмі будзённы выгляд. Вершы пісаліся ў палявых умовах, літаральна на хаду.

Каля пажараў прыкурвалі,
У касках варылі гарбату,
Спявалі з вачмі пахмурнымі
Аб нівах сваіх і хатах.

Над брацкай магілай шчырую
Слязіну зганялі без слова.
І цяжка — як птушкі к выраю —
Спяшаліся ў шлях суровы.

Вершы Кірэенкі, напісаныя ў тыя дні і, відаць, перш за ўсё для тых дзён, даносяць у наша «сягоння» перажыванні савецкіх людзей, што ўзняліся супраць фашысцкай навалы, атмасферу напружанага змагання і ўсю абстаноўку той цяжкай пары. Зрэшты, што датычыцца абстаноўкі, то паэт не ставіць мэту адлюстраваць яе ва ўсіх

дакладнасцях і падрабязнасцях. Галоўны яго клопат — шырока і нязмушана выявіць сваё душэўнае жыццё, расказаць пра сваю любоў і нянавісць, данесці да чытача свае перажыванні.

Імкнучыся не адстаць ад падзей, паэт расказваў пра будні вайны, ратную працу салдата, пра дваццаць восем герояў-панфілаўцаў, пра тое, як «жывыя ідуць наперад», пра смерць салдата-пехацінца на полі бою, пра тое, як рана ў гэты час прыходзіла да людзей сталасць і пакрывала скроні сівізна.

«Жывыя ідуць наперад — свяшчэнны закон вайны» — гэта ідэя, гэты радок складае, магчыма, самую істоту паэзіі Кірэенкі ваеннага перыяду.

Адлегласць у часе нярэдка ўзмацняе гучанне верша. Сёння асабліва хвалююча гучаць, даносячы пах пораху і ўсёй атмасферы таго часу, вершы беларускіх паэтаў, напісаныя ў перыяд вайны. У гэтым пераконваешся на прыкладзе такіх вершаў Кірэенкі, як «Цішыня», «Дваццаць восем», «Поле», «Калі пярун вайны», «Гарманіст іграў», «На полі бяссмерця», «Восень», «Мы хутка прыйдзем...».

У час вайны Кірэенка-паэт, відаць, паўней і арганічней, чым калі б там ні было да гэтага (а часам, магчыма, і пазней), праявіўся як асоба. Паказчык прысутнасці асобы — шчырасць яго слова, праўдзівасць, высокі ідэйны пафас і мастацкі ўзровень.

Усё ўбачанае, перажытае паэтам па гарачых слядах падзей адбівалася ў вершах. Праўда, ізноў-такі па-асабліваму: часта абыходзячы дэталі, падрабязнасці, але адчуўшы сам дух і пафас падзей, іх эмацыянальную афарбоўку. У імя гэтага паэт нярэдка ахвяраваў жыццёвым праўдападабенствам у яго вузкім разуменні, ідучы быццам бы нават у процівагу яму. Падобнага ў яго можна знайсці не мала.

Тут варта памятаць, што Кірэенка — паэт-рамантык, яркі прадстаўнік, менавіта, рамантычнага напрамку ў савецкай паэзіі, рамантычнага тыпу творчасці, прынцыпу адлюстравання рэчаіснасці. Такую акалічнасць неабходна ўлічваць у падыходзе да яго твораў. Скажам, у 1944 годзе быў напісаны верш «Песня» — пра песняра-музыку, што іграў на ліры аб чалавечым горы, якога тады хапала ўсюды. Салдаты, хто слухаў музыку, папрасілі іншую песню. Лірнік заспяваў пра дні юнацтва, але і гэта не задаволіла слухачоў, якія цяпер папрасілі расказаць пра будучае — «куды вядзе нас цяжкая дарога, што ўбачым мы, як вернемся дамоў». І пясняр расказаў. Гэта была радасная песня:

> Прад імі сонца промні рассыпала,
> З развалін уставалі гарады,
> Зязюлі сотні летаў ім лічылі,

Зямля паўнела кветкамі і збожжам
І кліч кідала: — Вось, усё для вас!

Вершы Кірэенкі ваеннага перыяду — гэта, як вобразна гаворыць сам паэт, своеасаблівыя «лісты ў вечнасць». І ў гэтым мне таксама бачыцца прыкмета рамантычнай прыроды яго паэзіі.

Надзвычай моцна, шматгалоса гучала ў творах Кірэенкі ваеннага перыяду тэма Радзімы, што стала з таго часу адной з галоўных у яго творчасці. Слова Радзіма Кірэенка піша з вялікай літары. Радзіма — гэта родная зямля і глыбіні народнай гісторыі, дарагія імёны і подзвігі вялікіх продкаў. Пра іх паэт расказаў у вершах «Сталасць», «Беларусь», «Курганы», «Продкам», «Слаўгарадам»... Не перастае хваляваць верш «Продкам» (1945) — глыбокі роздум аб гістарычным лёсе роднага народа.

Вы трызнілі ў лятунках
Пра светлую долю
І не раз за яе
Грозна біліся ў полі:
Свае сны вы нашчадкам
Перадаць прысягнулі.
Над калыскай Пра іх
Мы ад матак пачулі...

Патрыятычныя пачуцці паэта ўзбуйняюцца гістарычнай перспектывай. З'яўленне гістарычных матываў у лірыцы Кірэенкі ваеннага часу ўспрымаецца як узмацненне сувязей з гераічным мінулым свайго народа, з «продкамі-салдатамі», што аддана баранілі сваю радзіму ад чужынцаў. Яго лірычны герой — прадаўжальнік іх справы, пераемнік іх вялікіх гераічных традыцый.

Нарадзіўся К. Кірэенка 12 снежня 1918 года ў сялянскай сям'і на Слаўгарадчыне Магілёўскай вобласці.

«Мая родная вёска Гайшын,— гаворыць ён у сваёй аўтабіяграфіі,— даволі ладная і шматлюдная, раскінулася на высокім правым беразе Сожа. Нічым асаблівым яна, безумоўна, не славілася, акрамя як тымі палямі і пералескамі, крыніцамі і сцяжынкамі, дарогамі і рачулкамі, якія ёсць усюды і якія з маленства застаюцца дарагімі для кожнага па-свойму».

Тэма Радзімы — вялікай і малой — атрымае далейшае развіццё ў яго лірыцы. «Лепей за ўсё мне на свеце мясціна тая, дзе я нарадзіўся і ўзрос. Бэз пад акном і на полі каліна... Ціхае сонца, блакіты нябёс...» І ў другім месцы: «Мы чуем, што мы не адной Беларусі, а ўсёй Радзімы сыны». Адно адлюстроўваецца ў другім, спалучаючыся ў дарагім душэўным вобразе.

Да першай кнігі тэматычна і па стылі прымыкае другая — «Пасля навальніцы» (1947). Яна працягвае далейшае развіццё лірычнага характару, які намеціўся ў зборніку «Ранак ідзе»: салдат-пераможца вярнуўся з палёў вайны дадому. У лірыцы Кірэенка як і ва ўсёй савецкай паэзіі гэтага часу, гучыць матыў мірнай стваральнай працы, па якой за гады вайны знудзіліся рукі салдата.

Так, баі сціхлі, але ўспаміны аб вайне засталіся жывыя. Слядамі трасіруючых куль прашываюць яны свядомасць былога воіна. Тады, адразу пасля вайны, і сягоння.

Сябры, з якімі ў бітвах крочыў,
З якімі курчыўся ў агні,—
Я з вамі ўсюды, і не збочу
З дарогі слаўнае радні.

Гэтыя радкі напісаны зусім нядаўна...

Горкія, трагічныя, сумныя ўспаміны аб вайне застануцца назаўсёды. Яшчэ доўга вясенні гром будзе нагадваць паэту ваенную кананаду («Гром»), Нават з марознай зімой у яго асацыіруюцца жорсткія ваенныя ўспаміны («Мая зіма»).

У вершы «Пасля навальніцы» (1946) ёсць вобраз арліцы, якая лётае над разбураным гняздом у пошуках арлянят. Гэты вобраз успрымаецца як паэтычная метафара зруйнаванай вайной Беларусі. Імкнучыся ўзбагаціць арсенал эстэтычных сродкаў, паэт усё часцей звяртаецца да алегарычных паэтычных абагульненняў («Бор», «Маці шукае сына», «Аб чым лес шуміць» і інш.).

Расце цікавасць да фальклору: «Ліст», «Ясакар», «Як пайшло маё сэрца», «Кліч» і многія іншыя творы пабудаваны на выкарыстанні фальклорных сюжэтаў. Маці шукае сына, пытаючыся пра яго ў ракіты, у ветру, у жыта... Сэрца паэта пайшло па беламу свету — «пакланіцца палям, і лугам, і барам, і ўсім людзям...». Фальклорны вобраз развіваецца далей:

Як там сталі даваць майму сэрцу дарункі:
Дзень — праменні аддаў; ночка — з зораў карункі,
Бор сасновы — свой звон, поле — ясную даль,
Луг — свой водар, а людзі — і радасць, і жаль.

Пра што гэты верш? Думаецца, усё пра тое ж — пра ўзаемасувязі з жыццём, пра вечны сыноўскі абавязак перад народам, якому трэба вярнуць «скарбы песень».

Перачытваючы сёння першыя кнігі паэта, бачыш, як шмат добрых вершаў было ў іх. Незвычайным, я б сказаў — паліфанічным гучаннем уражвае «Асенняе рэха» (1945), пранізанае свежасцю і празрыстасцю восеньскага паветра.

Што яшчэ хочацца адзначыць як характэрнае для паэтыкі першых яго кніг — густ і ўменне жывапісаць словам. Гэты жывапіс заўважны ў вершы «Адлёт жураўлёў» (1946), у той выключна яркай карціне ранняй восені, якая тут намалявана.

Паэтыцы Кірэенкі амаль не ўласцівы паўтоны, адценні. Калі звон — то аглушальны, раса — цяжкая, навальніца — бязлітасная, удар — люты, хмара — чорная і г. д. І ў гэтым мне таксама бачыцца своеасаблівасць яго характару, у якім арганічна спалучыліся маральна-валявы і песенны пачаткі.

Другая кніга пацвердзіла, што той напорысты паэтычны тэмперамент, які так моцна заявіў аб сабе ў першым зборніку, не выпадковы, што ён — арганічная ўласцівасць лірычнага характару паэта.

Кірэенка — надзвычай эмацыянальны. Узяць яго верш «Як я люблю твой пах!..», напісаны не так даўно — у 1966 годзе. Тут усё трымаецца на эмоцыі. Размова ў ім ідзе пра свежы жнівеньскі хлеб — «самы чысты і самы салодкі», і думка будуецца на развіцці эмацыянальна-асацыятыўных сувязей паміж адчуваннямі і перажываннямі лірычнага героя.

Але не заўсёды гэта проста — замацаваць эмоцыі ў слове, асабліва пры такім паэтычным тэмпераменце, як у Кірэенкі, пры яго здольнасці да самаўзбуджэння. Здараецца часам, што эмоцыі ў вершы не вельмі суадносяцца з логікай. Скажам, у вершы «Вуды бяру» паэт, расказваючы пра асалоды рыбалкі, у заключэнне робіць завышана сур'ёзны вывад: «Не, нездарма рэкі цякуць, нездарма...». Занадта, думаецца, шматзначны для дадзенага выпадку вывад.

Чарговая кніга паэта «Мая рэспубліка», што пэўным чынам падрахоўвала пройдзены шлях, выйшла ў 1949 годзе. Яна пачыналася цудоўным, этапным, можна сказаць, вершам «Мая рэспубліка», што стаў потым шырокавядомым творам, які сведчыў, што працэс пераходу на мірныя рэйкі, «ужывання» ў пасляваенную рэчаіснасць праходзіць паспяхова. Людзі ўзнімаюць з руін гарады і сёлы, будуюць заводы, засяваюць палі, запальваюцца вокны вітрын, чуюцца радасныя песні. Сэрца паэта напаўняецца гордасцю за жыццё, што адраджаецца навокал... Але жыве ў ім глыбокае пачуццё адказнасці за тых, што загінулі (гінуць самыя лепшыя), за працяг іх справы. Яго герой востра адчувае пераемнасць...

«Любімы прыём паэта,— гаворыць пра творчасць К. Кірэенкі гэтага перыяду П. Панчанка,— ажыўляць нежывыя рэчы: і цэгла і сосны самі просяцца на будоўлю; гармата сама выказвае жаданне стаць трактарам; расліны просяць хмару, каб паліла іх дажджом і г. д.».

Адчуваецца, што лірычны герой і гэтай кнігі таксама працягвае жыць радасцю перамогі, якая расквечвае святочнымі колерамі ўспрыняцце жыцця, свету. Рэальны, звычайны свет пераўтвараецца ў вершах К. Кірэенкі паводле законаў абагульнена-рамантычнага ўспрымання — у свет паэтычны. Паглядзіце, з якім нецярпеннем, з якой прагай жыцця чакае яго лірычны герой прыходу вясны — «Гаспадыняй заходзь у хату маю ды сядай частавацца за стол за дубовы» («Грукні ў акно, вясна»).

Кірэенка-рамантык хораша адчуваецца ў вершах «Караблі», «Конь Даватара», «Перад вясной», «Ля агню», якія даўно і па справядлівасці лічацца лепшымі рэчамі паэта. Няма нічога дзіўнага ў тым, што, відаць, не кожнаму можа прыйсціся да густу рамантычны стыль паэзіі Кірэенкі. Асабліва аматарам паглыбленага псіхалагізму, філасафічнасці. Але ж і паэт мае права разлічваць на чытача, надзеленага талентам «нелагічнага» ўспрыняцця свету, здольнага на рамантычнае здзіўленне, павышаную эмацыянальнасць.

Такі чытач зразумее, думаю, верш «Раніца на Свіцязі», дзе паэт сілай шматколернага слова стварае светлую сімфонію абуджэння прыроды, світання на Свіцязі. Разам з прыродай прачынаюцца людзі. Іх ёй якраз неставала.

З'явіліся людзі.
І поле,
Што марыла вырасціць хлеб ім,
Ажно прыўзнялося
Прад гэтаю арміяй дужай.

Рамантызм, апрача ўсяго іншага, азначае, што паэт не баіцца стыхійнай магутнасці жыцця, смела выходзіць яму насустрач, імкнучыся авалодаць ім, замацаваць у творы.

Але ўсё ж такі іншы раз рамантычная ўзнёсласць ператвараецца ў хадулі, як, напрыклад, у вершы «След чалавека» (1948), у якім герой збіраецца падарожнічаць па зямлі «з кіркой цяжкой, з картай стэпаў і гор», каб пакінуць пасля сябе след. Намер цудоўны, але вялікаватая ў ім доза рамантычнай наіўнасці.

У лірычным творы — кароткім па форме і ёмістым па душэўнаму зместу — на кожны радок, на асобнае слова прыпадае каласальная доля агульнай сэнсавай нагрузкі. Таму вельмі важна, каб слова было ўжыта з вялікай дакладнасцю, каб яно было адзіным і незамянімым. Недзе ў пачатку 50-х гадоў у некаторыя творы паэта пранікае расцягнутасць, апісальнасць, рыторыка: «Перад вясной», «Цягнік», «Мінскія плошчы», «Малады лес», «Мара» — гэтым і некаторым іншым вершам, як нам сёння (праз чвэрць стагоддзя!) здаецца, не хапае

«чалавечага элемента», цеплыні, эмацыянальнай свежасці, незададзенасці. Многія з іх здаюцца сёння залішне афіцыйнымі.

У паэтыцы К. Кірэенкі часта сустракаецца такі прыём, як рэфрэн. Ён любіць паўтараць які-небудзь радок. Але, відаць, не заўсёды паўторы апраўданы, як, да прыкладу, у вершы «Грукні ў акно, вясна» (1948). Радок — «грукні ў акно, вясна» — паўтараецца некалькі разоў, але ён не вельмі багаты на новыя эстэтычныя адценні. Тое ж самае ў вершы «Другу», дзе «Ах, Заір!» паўтараецца без асаблівай патрэбы сем разоў. Шкодзіць і агульшчына — агульныя месцы, бедныя на канкрэтнае, непаўторнае.

«Маякі» (1952), «Родны свет» (1952), «Любоў і дружба» (1955) — гэтыя кнігі былі напісаны ў першай палавіне 50-х гадоў. Аўтар імкнецца да паэтызацыі працоўнага ўздыму савецкіх людзей: сінія камбінезоны трактарыстаў напомнілі яму сінія васількі. Творы паэта напоўнены адчуваннем вялікай краіны, працоўнымі рытмамі. Яны — пра людзей, што заўсёды на сваім пасту, заўсёды гатовы спраўдзіць свой будзённы подзвіг.

Іменна пра гэта — верш «Жураўлі» (1953), у якім расказваецца, як медыкі ратуюць чалавечае жыццё. Ёсць у асобных радках верша налёт сентыментальнасці, але ўвесь твор прасякнуты трывогай за чалавека, яго здароўе і самаадчуванне: «Тэлефоны, не спіце, званіце няспынна, тэлеграмы-маланкі, ляціце з сяла!».

А колькі сонца і святла ў вершах «У дзень суніц», «Сонца ўсходзіць над ракой», «Пах чабаровы»! Яны чымсьці блізкія да цудоўнага купалаўскага «Ільну», створаны ў рэчышчы той жа традыцыі. Незвычайна сімпатычны вобраз дзяўчыны-калгасніцы намаляваны ў іх.

Не прыдумаю сама,
Што са мной здарылася:
З працы сёння йшла дамоў
І з дарогі збілася.

Мне б ісці каля ракі,
Я ж пайшла дубровай,
Галаву маю кружыў
Пах чабаровы.

Чым вабяць гэтыя радкі, як не сваёй выразна народнай асновай, свежасцю погляду на свет, напеўнасцю.

У лірыцы гэтага перыяду можна наглядаць узмацненне сатырычных матываў, увогуле мала ўласцівых музе паэта. «Памагаты», «Літаратурны дзеяч», «Выхавацель» — у гэтых творах едка высмейваюцца некаторыя недахопы і заганы пэўнай часткі людзей.

Кірэенка заўсёды імкнуўся сваёй паэзіяй удзельнічаць у літаратурна-эстэтычных спрэчках, якія асабліва вострымі былі на мяжы 50-60-х гадоў. Адно з сведчанняў гэтага ўдзелу — верш «Другу-літаратару», дзе аўтар горка наракае на тое, што «парой мы пустазеллю гімн пяём, забыўшы, што мы — племя хлебаробаў». І ў гэтых радках — эстэтычная платформа паэта.

Публіцыстычны дар Кірэенкі знайшоў яркае ўвасабленне ў такіх вершах, як «Сіла праўды маёй», «Партыі», «Любоў і нянавісць мая», «Камуніст». Нягледзячы на тое, што крытыка 40-х, ды і 50-х гадоў не заўсёды садзейнічала росквіту інтымнай лірыкі, у творчасці Кірэенкі ў гэты час атрымалі распаўсюджанне лірыка-пейзажныя замалёўкі — «Летняя ноч», «Ты ўспомніш той напеў», «Расінка», «Лес і поле», «Аб чым лес шуміць»...

У вершах Кірэенкі чутны трывожны пошум лесу і зімовыя завеі, паэт прагна ўслухоўваецца і ўглядаецца ў жыццё прыроды, звяроў, птушак. Унутраная патрэба «пакланіцца прыродзе» заўсёды жыла ў яго душы. Тэма прыроды, успрыняцце якой у яго пранікнута своеасаблівым, па-свойму глыбокім пантэізмам, скразной лініяй праходзіць праз творчасць паэта. Ён умее тонка і разам з тым вельмі моцна адчуваць шматколерны і шматгалосы свет прыроды. Паважаць і шкадаваць яе. Адносіны да прыроды неад'емныя ў паэта ад пэўнага маральнага пачатку: «Баюся словам лішнім, неўпапад, парушыць дарагое сугалоссе крынічных звонаў і лясных рулад, дыханне зор і шэпату калосся». У вершах Кірэенкі прырода поўная таямнічасці. Яна можа ўзбуджаць у чалавеку нейкія нават першабытныя адчуванні, элементы «пралагічнага» мыслення:

Ізноў адчуваеш ты,
Што ў цемры сядзіш не адзін:
Там цягнуцца ў рост кусты
Алешніку і крутыя,

Там ціха трызніць рака;
Ільсняцца зоры ў высі,
А збоку, у лазняках,
Пасуцца ў статку ласі.

*(«Ля агню»)*

Скрозь прызму часу выразна бачны вартасці і недахопы твораў гэтага перыяду. Часам, паўтараю, ім шкодзіць шматслоўнасць, залішняя апісальнасць, расцягнутасць. Нярэдка ў гэты перыяд сваёй творчасці — канец 40 — пачатак 50-х гадоў — паэтаў погляд заўбольш паверхню з'яў, не ідзе ў глыбіню.

Прыкметнае паслабленне праблемнасці, звязанае з ім драбнатэм'е — падобныя недахопы пагражалі многім. Кірэенка браў вялікія, значныя тэмы. Як, напрыклад, у вершы «Дружба», але тэма, заяўленая ў загалоўку, вырашаецца надта ж агульна.

Новыя інтанацыйныя адценні пачынаюцца ў кнізе «Светлая хваля», якая выйшла ў 1959 годзе і, мне здаецца, па свайму лірычнаму тэмбру, па вынашанасці і багаццю пачуццяў бліжэй да першага зборніка «Ранак ідзе». Паэт сапраўды загаварыў нейкім незвычайна маладым голасам, свежа, без напружання.

Адзін з традыцыйных матываў лірыкі Кірэенкі — тэма маці. Ёй, маці, паэт прысвяціў лепшыя парыванні душы і самыя пяшчотныя пачуцці. Іменна маці адрасаваны гэтыя цудоўныя радкі «Светлай хвалі»:

Калі я дамоў прыеду,
Усіх трывог зазнаўшы меру,
Пасцялі ты мне, матуля,
Пасцялі пасцель з аеру.

Ён расце ў нас недалёка —
Каля Сожа, ля прычала.
Ты ж заўжды — з маленства помню —
Мне пасцель з аеру слала.

Магчыма, і няма патрэбы напамінаць маці, дзе расце аер. Аўтару, як ужо гаварылася, пры яго рамантычных схільнасцях, канкрэтна-рэалістычныя дэталі ўдаюцца не заўсёды, таму што яны канкрэтызуюць, удакладняюць, прызямляюць, прывязваюць да «матэрыі» вольны палёт натхнення.

На прыкладзе Кірэенкі і іншых паэтаў мы наглядалі ў гэты перыяд станоўчы працэс вяртання паэзіі — на новым «вітку» грамадскага і літаратурнага развіцця — да сваіх жыватворчых вытокаў — багацця і разнастайнасці народнага жыцця.

Мяняецца, узбагачаецца маральна-этычны воблік героя. Сутнасць яго — высокая ідэйнасць, партыйная прынцыповасць і перакананасць — застаецца ранейшымі, але пашыраецца тэматыка, узбагачаецца гуманізм, з новай сілай вядуцца эстэтычныя пошукі.

Новы маральны падыход да з'яў жыцця відаць, напрыклад, у вершы «Граб» (1957) — ва ўменні адчуваць чужыя раны, боль, мужна супрацьстаяць ударам лёсу.

Творчыя тэндэнцыі, што наметіліся ў «Светлай хвалі», узмацніліся ў наступных кнігах: «Смага» (1962), за якую аўтару прысуджана літаратурная прэмія імя Я. Купалы, «Цёплая радуга» (1966). Кнігі гэтыя

сведчаць, што паэзія К. Кірэенкі, не страціўшы мужнасці, набытай на цяжкіх дарогах вайны, цвёрдасці ідэйных перакананняў, у нечым пацяплела і ад гэтага стала яшчэ больш цікавай і прывабнай. З даверам звяртаецца паэт да свайго чытача, упэўнены ў тым, што той абавязкова яго зразумее. І гэта — адна з граняў яго эстэтычнай пазіцыі.

Менавіта ў кнігах «Смага», «Цёплая радуга» паявіліся элементы аналітычнага падыходу да рэчаіснасці, якія ўзбагацілі светаўспрыняцце паэта. Непаспешлівыя інтанацыі роздуму пранікаюць у самую тканіну верша. Паэт стаў больш засяроджаны, удумлівы, разважлівы, паглыбіў маральны крытэрый у асэнсаванні жыцця. Словам, пашырылася і ўзбагацілася чалавечая аснова паэзіі Кірэенкі. Пазбаўляючыся ад душэўнай мітуслівасці, яна засяроджваецца на галоўных духоўных каштоўнасцях.

Вынікі ўнутранай перабудовы лірычнага героя засведчаны ў многіх творах. «Чым ты пахнеш, зямля» — верш аб пакінутай, патоптанай і спаленай вайной зямлі, якая, аднак, пахне хлебным духам і дзявочымі косаму смехам і плачам... Верш «Стол мой верны» — маўклівая размова з рабочым сталом. Паэт часцей і больш уважліва стаў углядацца ў чалавечыя вочы і многае там заўважаць. У яго вершах, якія нічога не страцілі ў сваім баявым, наступальным характары, глыбей і глыбей сцвярджаецца пяшчота, спачуванне, сардэчнасць, задушэўнасць. Інакш бы ён не напісаў, скажам, цудоўны верш «Ах, залатыя, залатыя», «Застанецца толькі гэта», «Цалуйцеся, людзі, часцей» і іншыя, якія сведчаць пра ўзбагачэнне яго эмацыянальнай асновы.

Паэт прыходзіць да вельмі значнага разумення тых простых маральных каштоўнасцей, з якіх складаецца чалавечы побыт, жыццё, настрой:

Цалуйцеся, людзі, часцей,
Не адкладвайце галубіцца.
Будзьце прасцей, будзьце прасцей,
Пакуль любіцца.

Нельга не бачыць, што побач з працэсам «пацяплення» лірычнага характару працягваюць спець і паглыбляцца грамадзянскія матывы. Сведчанне ўзмацнення актыўнасці аўтарскай пазіцыі — лірычная паэма «Іспанка», пабудаваная на страсных маналогах-успамінах лірычнага героя, у якіх ён звяртаецца да іспанскай дзяўчыны Марселіны. Яшчэ дзіцём пасля грамадзянскай вайны ў Іспаніі трапіла яна ў невялікую вёску на Магілёўшчыне. Трагічны лёс выпаў на долю герояў паэмы. Ваеннае ліхалецце разлучыла іх, раскідала па свеце, але пачуццё інтэрнацыянальнага яднання засталося.

Гуманістычна наступальныя вершы «Песня», «Тры залпы», «Наказ невядомых салдат», «Рахунак» і іншыя гавораць пра тое, што паэт ідзе па правільным шляху — па шляху жыццёвай праўды, якая дае развіццё паэтычнаму таленту. Гэту паўнату жыццёвае праўды ён імкнецца сцвердзіць усімі сіламі думкі і пачуцця.

Што я люблю, не аддам што на здзекі —
Ведаюць родныя нівы і рэкі.
Ясныя зоры, бароў дзераза
І смутку сляза.

Як я люблю — тое ведаюць рукі,
Што цалаваў я шмат год без прынукі,
Бровы, і лоб, і маршчынак прамень,
І кожны наш дзень.

Аднак у некаторых месцах усё яшчэ шкодзіць рытарычнасць, ці, дакладней сказаць, неасэнсаваная эмацыянальнасць, якая часам як бы штучна ўзбуджае пачуцці лірычнага героя, не матэрыялізуючы іх у мастацкім вобразе, закліканым быць вынікам сапраўды перажытага. «Перавяжыце мне рану — я сам не магу, перацісніце сэрца, бо, гляньце, як сачыцца, па крывінках сачыцца страшны гул! А жыць хочацца, жыць хочацца!»

Я ўпэўнены, што гэтую просьбу (верш так і называецца «Просьба»), якая б нецярпліва страсная яна ні была, можна было выказаць інакш — не ў лоб, а праз душэўны, псіхалагічны рух, праз учынак.

У апошні час паэт усё часцей звяртаецца да ленінскай тэмы: «У вянок Леніну», «Ленін радзіўся для ўсіх». Паэт асэнсоўвае спадчыну вялікага правадыра, які з'яўляецца для яго і для ўсіх нас «жывей за ўсіх жывых».

На высокім лірычным напале напісаны паэмы К. Кірэенкі «Уступ», «Агонь», «Слёзы Раданы» і інш. Ім, відаць, у пэўнай ступені нестае эпічнага элемента. Паэмы сведчаць, што аўтар — лірык, што яго мысленне надзвычай эмацыянальнае.

Шырока вядомы творы Кірэенкі для дзяцей. Сярод іх ёсць проста цудоўныя вершы, што западаюць глыбока ў душу. Работа над творамі для дзяцей — добрая школа эмацыянальнага ўзбагачэння паэта.

«Сутнасць справы заключаецца ў тым,— слушна адзначаў крытык Б. Рунін,— што ў лірыцы ўсе асаблівасці верша, літаральна ўсё, пачынаючы з тэмы і адбору ўражанняў і канчаючы так званай тэхналогіяй,— робяцца непасрэдным праяўленнем характару лірычнага героя». Кірэенка першых сваіх кніг — гэта напор страсцей, выбух

эмоцый, напружанне псіхалагічных сітуацый. Не зменшылася гэтых якасцей у яго і зараз, але яны сталі, мне здаецца, больш асэнсаваныя.

«Кніга ста песень» К. Кірэенкі адзначана Дзяржаўнай прэміяй БССР. У ёй, можна сказаць, скандэнсаваўся жыццёвы, духоўны вопыт паэта ва ўсім багацці перажытага. Гэтая цудоўная кніга з пераканаўчай паэтычнай выразнасцю расказвае пра любоў паэта да жыцця і паказвае рэчаіснасць ярка, шматфарбна. Паэт разважае, думае, аналізуе, у кнізе шмат матываў апавядальных, шмат прызнанняў вельмі інтымных.

Пагасла зорка дзесь над полем.
Пасля яшчэ вунь і яшчэ...
Што мне да іх?.. А нейкім болем
Раптоўна сэрца апячэ.
Як быццам зараз нешта страціў,
Кагосьці болей не вярнуць.
І ўспомніш фронт, балоты, гаці,
І згадкі памяць разануць.
І нешта стане ў горле комам,
І здасца раптам: сам гарыш...
А зоркі падаюць са звонам.
І звон такі — што не сасніш...

Можна сцвярджаць, што гэтая кніга падводзіць вынікі — у сэнсе глыбіні пранікнення ў жыццё, мастацкага майстэрства, крышталізацыі стылю — зробленаму за папярэднія гады. Яна — прыклад таго, як паэт умее па-філасофску ўзнімацца над канкрэтнасцю жыццёвай сітуацыі, імкнуцца і дасягаць значных філасофскіх абагульненняў. «Кніга ста песень» малюе духоўны свет сучасніка, не абмінаючы яго складанасці, шматмернасці маральных праблем, якія стаяць перад чалавекам. Гэта — лірыка роздуму, якая вабіць сваёй шчырасцю.

Лірыка Кірэенкі была і засталася лірыкай жыццесцвярджэння, прагі жыцця. Мне заўсёды падабаўся верш «Жыву», напісаны ў пачатку 60-х гадоў — нават пры некаторай яго дэкларацыйнасці — перш за ўсё тым, што ў ім адлюстраваўся з усёй шчырасцю лірычны характар паэта — сваім грамадзянскім і проста непаўторным чалавечым зместам.

Што ты здзіўляешся,
Што я часам хмурны стаю,
Што я часам іду,
Павесіўшы галаву?
Што ты здзіўляешся,
Што я часам сумна пяю,—
Я ж жывы, братка,
Я жыву.

## СУЧАСНАЕ І ВЕЧНАЕ

***(Аляксей Пысін)***

Знешне — гэта спакойны, негаваркі, ашчадны ў рухах чалавек, але па вачах, па ягоным упартым паглядзе, скіраваным ва ўнутр, на сябе самога, можна здагадвацца пра напружанасць інтэлекту, пра інтэнсіўную работу духу, якая, здаецца, ніколі не прыпыняецца ў ім.

Яна адлюстроўваецца ў вершах...

Відаць, не трэба даказваць, наколькі неабходны паэту цэласны, арганічны характар. Без яго немагчыма паўнацэнная лірыка, бо інакш яна будзе пазбаўлена драматызму і канфліктнасці, тэндэнцыйнасці і праблемнасці. Наяўнасць такога характару сведчыць аб выразным светапоглядзе паэта, сталасці яго маральна-філасофскай канцэпцыі.

Такі характар мне бачыцца ў паэзіі Аляксея Пышна.

Яго вытокі, матэрыял, на якім ён склаўся,— перажытае...

Свет Пысіна — гэта рэальны свет, прапушчаны праз уражлівую душу паэта, перажыты ім, тое, што зрабілася яго чалавечым вопытам, ідэйным і мастацкім набыткам. Таму яго паэтычныя вобразы часцей за ўсё ярка індывідуальныя і арыгінальныя, разгорнутыя ў мінулае і ў будучыню,— пачынаючы ад простай метафары і канчаючы разуменнем цэлага, канцэпцыяй жыцця. Адно дапамагае глыбей усвядоміць другое. У вершы «***З поля — агні паяздоў...» (адна з самых апошніх кніг — «Да людзей ідучы») паэт гаворыць аб неадольнай празе пазнання, якая ніколі яго не пакідала — «можа, вясны было мала ў межах спадчыны сціплай маёй?».

Сёння ў прыціхлым узросце
Бачу на самым пачатку хады
Белыя дрэвы ў бяросце
З поўнымі вёдрамі светлай вады.

Ярка метафарычнае заканчэнне верша не здаецца нечаканым, калі мець на ўвазе, што вяртанне «на самы пачатак хады», у дзяцінства,— адно з любімых паэтычных падарожжаў Пысіна. «Да сябе пачатак далучаю з першаю смяшынкай і слязой» — такі матыў характэрны для Пысіна. Першае, даўняе, што запомніў ён з дзяцінства, раптам успыхвае — пад промнем бачанага за ўсё жыццё — незвычайна яркай, поўнай святла, паветра і прасторы карцінай. Другі раз ён пойдзе ў гэтае падарожжа разам з дачкою, і тая нічога асаблівага ў лесе не заўважыць —

Ён не здзівіў цябе бярозкай,

Стажкамі ціхіх Мураўёў?
Ну што ж, ты хочаш быць дарослай.
А я ў сваё маленства вёў.

Далучэнне «да першай смяшынкі і слязы» дазваляе глыбей і танчэй разумець сучасніка і самога сябе.

Пра свой жыццёвы «пачатак» паэт сцісла, але гаворыць у аўтабіяграфіі, успамінаючы песні, якія хораша спявалі хлопцы і дзяўчаты, і — гэтая дэталь здалася мне вельмі цікавай у дачыненні да паэзіі Пысіна — мноства крынічак у ваколіцах роднай вёскі Высокі Барок : «Ці ты ў лузе, ці на папасе — усюды знойдзеш паблізу крынічку. То яна трапеча ў замшэлым пазелянелым зрубе, то струменіць адкуль-небудзь з-пад горкі ці проста ўзнікае там, дзе конь капытом ступіў».

З адной з іх пачаўся ручаёк паэзіі Аляксея Пысіна, плынь яго з цягам часу ўсё больш мацнела.

У лірыцы Лысіна — аднаго з самых таленавітых і сур'ёзных беларускіх паэтаў — вельмі выразна праглядваюцца два перыяды. Першыя тры зборнікі («Наш дзень», «Сіні ранак», «Сонечная паводка»), напісаныя ў 50-х і пачатку 60-х гадоў можна аднесці да першага этапа творчага шляху паэта. Другі пачаўся кнігай «Мае мерыдыяны» (1965), працягнуты зборнікамі «Твае далоні» (1967), «Да людзей ідучы» (1973) і самымі новымі вершамі.

Чытаючы ў «Полымі» (1974, №1) рэцэнзію А. Пысіна на зборнік вершаў Ю. Голуба «Дрэва навальніцы», я не здзівіўся яго патрабавальнасці. А, Пысін яшчэ больш патрабавальны да самога сябе. Патрабавальны да жорсткасці. Вось, скажам, што ён пісаў пра першы свой зборнік: «І вось праз колькі гадоў, прайшоўшы вайну, зноў вярнуўся да паэзіі. Здавалася б, столькі перажыў, столькі бачыў — маю што сказаць. А я, пераймаючы іншых паэтаў, пішу вершы наіўныя, надуманыя, не сагрэтыя пачуццём. З гэтых вершаў і склаўся першы мой зборнік «Наш дзень».

Я таксама цвёрда перакананы, што талент паэта, яго незвычайная лірычнасць асабліва поўна і свабодна раскрыліся на другім этапе творчасці. Менавіта ў гэты час лірыка Пысіна прыйшла ў найбольшую ўзгодненасць і суадпаведнасць з асабістым яго вопытам, з глыбіннай сутнасцю яго характару. Не дзіўна таму, што ў «Маіх мерыдыянах» ён звярнуўся пераважна да ваеннай тэмы, звязанай з галоўным у яго біяграфіі. Не скажу, што Пысін да гэтай тэмы не звяртаўся раней, але сённяшнія вершы пра вайну непараўнальна вышэй па ўзроўню і глыбіні паэтычнай думкі, па эмацыянальнаму напалу і мастакоўскай дакладнасці.

Пра А. Пысіна шмат пісалася. Р. Бярозкін і Ул. Калеснік адзначалі «дзве сілавыя трасы» паэзіі Пысіна: «адна бярэ пачатак у баразнах на родным полі, другая — у акопах і траншэях мінулай вайны». Гэтыя трасы — дзве грані духоўнага вопыту паэта, які, асабліва ў апошнія гады, усё больш і больш рассоўваецца ў розныя бакі, узбагачаецца.

Паэт вельмі востра адчувае дыялектычную еднасць традыцыйнага і наватарскага, сучаснага і вечнага ў жыцці. Гэта — адна з галоўных праблем яго лірычнага роздуму. У маральным, духоўным асэнсаванні для яго няма падзелу жыцця на цяперашняе і мінулае: «са мною ўсё, што не сплыве ніколі». Адсюль, думаецца, такія, на першы погляд, можа, нават і дзіўныя адчуванні: «Не знаю — многа альбо мала ў сваім стагоддзі я пражыў». З другога боку, усё пражытае «належыць на свеце не мне аднаму». Вечнае — усё тое добрае, што зрабіў ты для людзей, што пакідаеш ім у спадчыну.

Існуе вельмі шмат азначэнняў паэзіі. Апошнімі часамі яе часта завуць службай сувязі. «Кацер сувязі» — так адзін паэт назваў сваю чарговую кніжку вершаў. Падумаць, і сапраўды паэзія забяспечвае маральныя, эстэтычныя сувязі паміж людзьмі. І не толькі ў адной плоскасці — паміж сучаснікамі. А. Пысін у вершы памяці Я. Непачаловіча, думаючы аб чалавечых лёсах свайго пакалення, якому цяжка прыйшлося ў гады вайны, якое і зараз нясе галоўную службу («сёння зноў пад нябачным абстрэлам, толькі дзе той наш сёмы накат?»), гаворыць, звяртаючыся да сваёй паэзіі:

Пойдзеш не ад людзей — да людзей.
Мы радкі пакідаем з жывымі,
І паслужаць яны сувязнымі
Нашых дум і сумленных надзей.

І сябе самога паэт адчувае не інакш, як сувязным паміж былым і наступным. Адсюль і ўсведамленне сваёй адказнасці, і вострая памяць на пражытае, і ўпэўненасць, што лепш за яго аб перажытым ніхто не раскажа.

Бацькам, продкам мы абавязаны і тым, што карыстаемся створанай імі мовай. Паэт перапоўнены сыноўняй удзячнасці «маці — словатворчы». Ён шчыльна звязаны са сваім, родным.

Быў я нягодамі сечаны —
Яблыкі шрамамі мечаны.
Усё, з чым душа сутыкнулася,
У садзе, напэўна, адчулася.

Так можна сказаць і пра сад і пра радзіму — вялікую і малую. І гэтую сувязь паэт, у сваю чаргу, завяшчае нашчадкам: «яблык ад яблыні коціцца ў рукі таму, хто народзіцца».

Усвядомленая асабістая (але не толькі за сябе) адказнасць, думаецца, складае ідэйны цэнтр яго лірыкі і робіць паэзію А. Пысіна ў вышэйшай ступені цікавай і актуальнай. Чалавечнасць, дабрата, мужнасць, заклапочанасць зямнымі справамі — усё гэта ўваходзіць у грамадзянскі кодэкс паэта. Адзін з паэтаў, звяртаючыся да А, Пысіна, назваў яго «даверлівым, спагадным, летуценным», «дзіцём бездапаможнай дабраты». Калі меркаваць па вершах, то яго дабрата не бездапаможная, а разумная, мэтанакіраваная, дзейсная, душэўная актыўнасць паэта нясе ў сабе ўсю гаму чалавечых пачуццяў. Паэт вялікі і цікавы сваёй чалавечнасцю. Гэта яна ўзняла яго паэзію на тую эстэтычную вышыню, з якой добра відаць ва ўсе бакі — у мінулае і Ў будучае.

Былі б сягоння мы намнога
І прыгажэй, і маладзей,
Каб паважалі больш, чым бога,
Для нас народжаных людзей.

Трымаю споведзь, не маленне, Бо і сябе я не бярог. І мой суддзя — маё сумленне Прад даллю будучых дарог...

У апошніх кнігах асабліва выразна праступае маральна-філасофская канцэпцыя жыцця, якую паэт разумее як бясконцае і бесперапыннае дзеянне. Ён бачыць сваю задачу ў тым, каб злучыць мінулае і цяперашняе ў адзін тугі вузел, у якім чалавек — звяно з ланцуга пераемнасці пакаленняў, частка гістарычнага вопыту: «Шукаюць рукі тых зярнят, каб нас таксама дзесь пачулі». Паводле паэтычнай філасофіі А. Пысіна, жыццё чалавека не канчаецца з яго смерцю. Пры дарозе, на тым месцы, дзе загінулі салдаты, узышлі чырвоныя кветкі іван-чая.

Узышлі травой і гарыцветам,
Узышлі на радасць ці жальбу?
Вунь стаіць Іван па-над кюветам,
Галавой ківае: «Вось жыву.
Не здзіўляйцеся, што ўвесь чырвоны,
Восем куль было — крывёю сцёк.
Скора восень. Каркаюць вароны.
Жоўты каля ног маіх лісток.
Хочаш, пачастую нашым чаем,
Я ж цяпер навекі «вадахлёб».
Не, Іване, з чаем — пачакаем,
Закурыць не лішняе было б.

Мы цыгарку скруцім па-былому,
Пусцім шызы дым на правады;
Першая зацяжка — мне, жывому,
Бо занадта ў сэрцы гаркаты...
Чырвань, чырвань — колер праваты.

Гэты верш не толькі пра вайну. «Салдацкая правата — правата сучаснасці,— гаворыць паэт.— Правата дружбы і кахання, трывог і летуценняў, высокіх ідэалаў. Правата роздуму аб вечных катэгорыях. Кожная з'ява ў жыцці мае тры вымярэнні: мінулае, сучаснае, будучае...»

Сказана правільна.

Мастацкі свет паэта грунтуецца на трывалай маральна-філасофскай базе, на адзінстве «трох вымярэнняў», цэласнай канцэпцыі жыцця, за якое ён востра адчувае сваю адказнасць. Паэзія Пысіна, уласна кажучы, і ёсць мастацкае ўвасабленне гэтай адказнасці. У яго шмат вершаў, якія хочацца запомніць, зрабіць сваім душэўным набыткам. Вось як, напрыклад, гэты шырокавядомы шэдэўр яго лірыкі:

Забыта многае ў жыцці,
З дарогі змецена і змыта.
Мне ў жыта хочацца ўвайсці,
Мне вечнасцю здаецца жыта.

Вазьму шурпаты каласок
На чуйным провадзе саломы —
І адзавецца мне здалёк
Мой продак — сейбіт незнаёмы;

Жней невядомых галасы
Ўсплывуць над постаццю сухою.
Раскалыханы каласы
Густой паўдзённаю смугою.

Тут даспявае пад смугой
Зліццё надзей, жаданняў сумесь.
Гудзе жытнёвы провад мой —
Часоў былых і новых сувязь.

І даспявае далягляд
У трапяткім мембранным гуле.
Шукаюць рукі тых зярнят,
Каб нас таксама дзесь пачулі.

Залатая нітка гісторыі — той провад, які аб'ядноўвае, родніць нас з продкамі нашымі, каму мы больш абавязаны, чым часам думаем.

Пысін — паэт-філосаф.

Так, асноўнае ў яго асабістым вопыце, у біяграфіі,— вайна, пра якую ён найбольш піша. Якраз у сферы гэтай тэмы лірыка паэта вельмі моцна і натуральна спалучаецца з асабістым вопытам А. Пысіна.

Адчыняйце вокны — гром пялёснуў,
Маладая свежасць наплыла.
І няма ні сушы, ні нябёсаў,
І няма ні змроку, ні святла.

Перакатным валам б'е стыхія,
Круціць валуны і пер'е траў.
Ну, а хіба мы былі сухія
На любой з бяздонных пераправ!..

«Бяздонныя пераправы» — гэтым шмат сказана пра тых, каму давялося ў вайну пад ураганным агнём фарсіраваць рэкі. Колькі болю нарадясаюць у паэта гэтыя ўспаміны!

А няма ні лодкі, ні парома,
Ні абломка слізкага вясла!
Толькі быстрыні адной вядома,
Куды столькі юных панясла.

А. Пысін вельмі патрабавальны да тых, хто піша пра вайну. Вайна, заўважае ён, увайшла ў беларускую паэзію «палатамі мінёраў», «бязбацькавічамі», спляценнем жахлівых, трагічных сітуацый. Пра яе нельга пісаць «з лёгкасцю», як гэта робяць некаторыя.

Вершы Пысіна даносяць да нас франтоў «няроўнае дыханне», драматызм і героіку салдацкіх лёсаў, як, напрыклад, у вершы пра лётчыка, які не дацягнуў да сваіх і згарэў у сорак першым «на жалезным кастры самалёта». Ён, як, мабыць, ніхто з нашых сучасных паэтаў, умее выключна праўдзіва і дакладна маляваць ваенныя будні. Адзін з лепшых у зборніку — верш «Асвейскія ручнікі». Пярэдні край, ірвуцца варожыя снарады —

І выбухі ўстаюць бязлітасна,
Як марсіянскія кусты.

На тых кустах — кара зямная,
Цагліны, трэскі, сашнікі.
На тых кустах — бель ільняная:
У чырвоных пеўнях ручнікі.

Адкуль тут вышытыя ручнікі? Мо гэта толькі паэтычная метафара? Не, так было ў жыцці:

Байцоў на фронт паслалі сёлы,
І — закапалі сундукі:
Свой добры хлеб, гасціннасць солі
І вышытыя ручнікі.

І далей:

Таму чужынец азвярэлы
Снарады ўвінчвае ў пласты,
І выбухі ўстаюць, як дрэвы,
Як марсіянскія кусты.

Вайна супраць прыгажосці, гасціннасці, хлеба і працы.

Паэзія А. Пысіна вызначаецца пільнай увагай да чалавека, да яго боляў, клопатаў, трывог. У адным з вершаў ён прыгадвае, як байцы, вярнуўшыся з вайны, аддавалі маткам бушлаты: «У зялёным, нібыта салдаты, і касілі, і жалі яны». Але не ўсе дачакаліся сваіх бушлатаў:

Хоць бы цёплы бушлат той прымераць
Пасля ўсіх халадоў і трывог.
І сягоння яны яшчэ вераць,
Не спяшаюцца рана вячэраць,
Усё з надзеяй глядзяць на парог...

Вайна засталася ў памяці паэта з усімі падрабязнасцямі і рэаліямі сваёй жорсткай праўды. Пра адзін з ваенных вершаў Р. Няхая А. Пысін пісаў: «Мабілізаваны верш скідае з сябе ўсё лішняе, умоўнае і пакідае самае неабходнае, тое, што патрэбна ў баі». Гэтак жа можна было сказаць пра многія, і не толькі ваенныя вершы самога Пысіна. Канкрэтнасць — іх арганічная рыса. Яму, былому салдату, салдату-пераможцу, вядома горыч паражэнняў і страт. Ён памятае загінуўшых сяброў, равеснікаў так, быццам расстаўся з імі толькі ўчора.

Палім мы маршанскую махорку,
Бачым мы Дняпроўскую граду.
Будзе сёння бой. На тым узгорку,
Можа, я таксама упаду.

Будуць травы над курганам. Будуць
Адлятаць у вырай жураўлі.
Нас, напэўна, ў свеце не забудуць,
Ўспомняць, што на свеце мы жылі.

І апошняя, вельмі арганічная і натуральная для Аляксея Пысіна страфа:

Я гляджу на даўняе курганне,

На траву, на рыжых мурашоў.
Ведайце, калі мяне не стане —
Я ў сваю дывізію пайшоў.

Пры ўсёй канкрэтнасці ваеннай лірыкі Пысіна, яна сапраўды філасафічная. Тут ёсць роздум і шырокія абагульненні, што выраслі на трагедыйнасці ваеннага часу, гераізме і мужнасці народа, які не шкадаваў сябе на шляхах да перамогі.

У памяці паэта навекі засталіся і тыя Падгор'і, Селішчы, Вусці, Баркі, што сустракаліся яму на франтавых дарогах:

...А ў той варонцы верас, верас,
Дымяцца сны на тых гадах.
Жыве затоеная вернасць
Сержантам — маршалам атак.

«Тэма вайны,— прызнаецца паэт,— стала неадступнай. Брацкія магілы. Абеліскі. Абпаленыя плацдармы. Цені неданесеных штыкоў. Шчымлівы бой, журба па загінуўшых сябрах».

Адна з апошніх кніг «Да людзей ідучы» (1973) таксама сведчыць, як на дзіва трывала і выразна адбіліся ў свядомасці паэта будні вайны, адчуванні раненага, які ляжаў у гіпсе: «А цела так свярбела ў гіпсе, такога веніка хацела. Каб... і нашчадкі апякліся». У другім вершы паэт прама прызнаецца: «Дні мае — маўклівыя сапёры — усё ідуць яшчэ з вайны».

Пысін і ў жыцці, у штодзённым побыце, часта — у той ці іншай сувязі — успамінае пра тое, як часам па-рознаму паводзяць сябе людзі на вайне. Характэрны і сучасны па свайму пафасу «Успамін аб перабежчыку». Перабежчыка дагнала справядлівая кара — мера найкарацейшая — «Агонь!»,

Ды і пасля той самай меры
Ён будзе вечна вінават:
Хтось потым абмінуў даверам
Таго, хто быў сапраўдны брат.

Вайна са сваім трагізмам і героікай, драматызмам і самаахвярнасцю фарміравала жыццеўспрыняцце паэта і шмат у чым вызначыла яго сучасны погляд на рэчы. Яго лірычны характар — характар гераічны, бескампрамісны, гатовы на самаахвяраванне ў імя людзей і жыцця.

Больш таго, чалавечую прыстойнасць і чэснасць ён і сёння гатоў вымяраць меркай ваеннага часу.

Праўдзівы бой вядзе сумленне,
Ваюе сэрца не без страт.
І, можа, ў гэтым абнаўленне
Усіх подзвігаў, былы салдат!

Вастрыня маральнага стаўлення да жыцця параджае і вечную незадаволенасць самім сабою: «крычу, здаецца, а маўчу; спяшаюся,— а ўсё на месцы, раблю не тое, што хачу, і не магу бяду адвесці», «самых блізкіх дакараю, са зласліўцамі міруся». Вайна для Пысіна не толькі і сёння вызначае маральна-этычныя нормы, але і абумоўлівае патрабаванні да паэтычнага слова: «У бой не бралі халастых патронаў. Рознакаляровыя ўспышкі франтавых ракет былі патрэбны для баявых сігналаў...».

Паэт упэўнены, што тыя, каго сягоння ўжо няма з намі, узмацняюць нашу маральную адказнасць. «Усё прымаю, усю цаню па праву пабрацімства мёртвых і жывых»,— гаворыць ён у адным з вершаў. І гэта не проста гучныя словы, гэта важная грань светаўспрыняцця паэта, праяўленне яго душэўнай актыўнасці.

У нарысе «Вышыня майго камбата» («Маладосць», 1974, № 6), прысвечаным любімаму камандзіру капітану М. С. Гальпіну, што здзейсніў подзвіг пры ўзяцці вышыні і загінуў смерцю героя, Пысін піша:

«Тры дзесяцігоддзі мінула з часу майго апошняга развітання з камбатам. А ён жыве ў памяці маёй. Бачу капітана Гальпіна, бачу вышыню капітана Гальпіна, якую мы, яго радавыя, можам лічыць і сваёй. Зноў іду да гэтай вышыні.

Вайна тады рушыла далей, за вышыню, і туды яе пайшла наша перамога. Там — дзесьці за вышынёй — усё наступнае наша жыццё, усё, што намі зроблена, створана, праспявана, ды і самі мы, сённяшнія. І ёсць патрэба яшчэ і яшчэ раз узысці на гэтую вышыню; з яе лепей бачыцца наша мінулае і наша будучае».

Сучаснасць у разуменні Пысіна абавязкова ўбірае ў сябе мінулае, не можа існаваць без сувязі часоў, пакаленняў, чалавечага вопыту. Такая думка ўзнікае не толькі ў яго вершах пра вайну. Тэматычная сфера паэта шырэй: паэзія, на яго думку, павінна з найбольшай паўнатой выяўляць народныя інтарэсы ва ўсім багацці і разнастайнасці сканцэнтраванай у іх рэчаіснасці.

Творчая эвалюцыя Аляксея Пысіна — гэта, як у кожнага сапраўднага паэта, несупынны працэс пазнання жыцця, стварэнне арыгінальнага паэтычнага свету са сваімі мастацкімі і этычнымі законамі і суадносінамі ў багацці іх непаўторнай вобразнай канкрэтыкі. Лысіну даюцца самыя тонкія адценні душэўнага стану і самаадчування асобы.

У сэнсе ідэйных і эстэтычных вытокаў гэты свет мае свой адзіны «прататып» і крыніцу — жыццё, як яно адлюстравалася ў свядомасці паэта адпаведна з яго мастацкім успрыняццем. Логіка гэтага

ўспрыняцця — своеасаблівая: тут даволі часта можна сустрэць такую нечаканасць, якая патрабуе і эмацыянальнага кантакту, і дзейснага інтэлектуальнага напружання.

У адным з яго вершаў пра вайну гаворка ідзе пра тое, як птушкі — стрыжы — узняліся з камяніц над зруйнаваным горадам («білі ўнізе агню языкі, і стагнала зямля валунамі») і апынуліся высока ў небе, сярод зорак,— «луналі, бы счарнелыя маладзікі». Зрэшты, асабліва дзіўнага, у паэтычным сэнсе, тут нічога няма. Аднак паглядзіце, як развіваецца думка далей, калі гэтыя птушкі паснулі ў небе «на струмені маўклівым, як вечнасць».

Да людзей горад новы прыйшоў.
Толькі дзесьці высока ў блакіце
Спяць стрыжы... Не будзіце стрыжоў,
Душ адвеяных не разбудзіце.

Перад намі даволі незвычайны асацыятыўны вобраз — паснуўшыя ў небе стрыжы здаліся паэту «адвеянымі душамі» — душамі тых, што загінулі ў бамбардзіроўцы. Вайна з яе трагізмам і героікай, драматызмам чалавечых лёсаў і памяццю аб загінуўшых, аб ахвярах — адна з галоўных, скразных тэм Пысіна. Па-свойму яна прагучала і ў гэтым вобразе заснуўшых высока ў блакіце стрыжоў.

Ваенная тэма не перашкаджае ўспрыняццю жыцця ва ўсёй яго паўнаце. Аднак А. Пысін, як відаць, не «голы» аптыміст. Яму, быламу салдату, вядома горыч паражэнняў і страт. На думку паэта, тыя, каго сёння няма з намі, павялічваюць нашу маральную адказнасць («Не спіце, людзі! Узніме хтось ракету,— не кінешся за ёю наўздагон»).

Адказнасць за сучаснасць, якая сінтэзавала ў сабе і мінулае («Мінулае належыць нам так, як і будучыня»,— заўважыў неяк паэт),— арганічная для характару лірычнага героя, які не аддзяляе сябе ад народа, жыве з ім адным жыццём. Такое разуменне адказнасці шырока раскрывае творчыя магчымасці паэта, узнімае яго гуманізм на ступень сацыялістычнага гуманізму, аптымістычнага па сваёй сутнасці. Свет убачанага і перажытага, тое, што стала аўтарскім вопытам, цікава і своеасабліва люструецца ў вершах паэта.

Наўрад ці калі поўнасцю, да канца, будуць вывучаны ўсе заканамернасці чалавечага мыслення, у тым ліку мыслення паэтычнага. Заканамернасцю з'яўляецца ўжо адно тое, што рух паэтычнай думкі імпульсіўны; гэта заўсёдная змена настрояў, кантраснасць фарбаў, чаргаванне спакою і эмацыянальнай напружанасці, нечаканы паварот думкі. І сувязь паміж усімі гэтымі «імпульсамі» караніцца часам вельмі глыбока.

Чаму ў дадзены момант паэту ўспомнілася менавіта вось гэта, а не што іншае? Хто растлумачыць? Па асацыяцыі? Тады — з чым?

Бачу гулкае святло вакзала,
Толькі хачу ўспомніць не экспрэс.
Белы шалік маці мне звязала,
Еду ў студзеньскі марозны лес.

Чаму раптам узнік у памяці гэты шалік, што звязала маці? Можа, таму, што яна стаяла тут, побач, на пероне, праводзячы сына ў дарогу. Але ж пра гэта ў вершы не гаворыцца. Прыгадаўся, тым не менш, шалік, «што на прыкмечаным застаўся пні». Адна дэталь выклікае ў памяці другую, вобраз разгортваецца шырэй. Сувязь паміж звеннямі падтрымліваецца ў адным выпадку эмацыянальна, у другім — іншымі ўяўленнямі і ўспамінамі.

Шкадаваў бы менш тае прапажы,
Каб не ведаў я, не ўспомніў зноў,
Як вяла матуля танец пражы,
Як вязала ўцеху з дум і сноў.

Думка абрастае новымі падрабязнасцямі, робіцца больш і больш заклапочанай.

Дзяцел сеяў чорнае насенне,
А ў мяне журботны клопат быў...
Можа, матчына благаслаўленне
Недарэчна ў лесе я згубіў.

Вось да якіх нечаканых высноў-меркаванняў прывёў згублены шалік.

Амаль кожны верш Пысіна — арыгінальна разгорнуты асацыятыўны вобраз, які зближае і асвятляе новым сэнсам рэчы і з'явы, часам вельмі аддаленыя адна ад другой.

Бываюць вершы празрыстыя, як тая рачулка, у якой адразу бачыш дно і можаш нават палічыць каменьчыкі. Яны мілыя ў сваёй празрыстасці і яснасці і вабяць гэтымі сваімі якасцямі. Бываюць вершы другога гатунку — глыбейшыя, шматзначныя, наснажаныя мнагамернаю думкай. І гэта адна з абавязковых, адменных уласцівасцей сапраўднай паэзіі — яе невычарпальнасць. У добрым вершы не відаць дна, а мастацкі вобраз нельга вычарпаць, ён не перасыхае, само жыццё асвяжае яго змест.

Пушкін сказаў пра Баратынекага: «Ён у нас арыгінальны, таму што мысліць». Самае першае ўражанне ад апошніх кніг А. Пысіна — актывізацыя яго паэтычнага мыслення, яшчэ большая заглыбленасць у рэчаіснасць. Перажыванне робіцца па-сапраўднаму аналітычным, больш і больш спавядальным, арганічна звязаным з усім тым, што давялося зазнаць на жыццёвых дарогах.

Ключ, які можа адкрыць уваход у паэтычны свет Аляксея Лысіна, якраз і заключаецца, на мой погляд, у жыццёвым і душэўным вопыце паэта, у асаблівасцях яго мастацкага мыслення, ва ўсім аб'ектыўным і суб'ектыўным змесце яго асобы.

Што яшчэ і яшчэ раз заўважаеш у характары паэта — гэта яго дабрата, чалавечнасць, шырыня кроўных сувязей са светам — з людзьмі, падзеямі, прыродай. «Добрай чалавечнасці галінка ў кожным слове хоча вырастаць»,— гаворыць Пысін. Дабрата яго не паказная. Яна найбольш у самім стаўленні паэта да рэчаў, аб ёй можна меркаваць па тым, што пападае ў поле зроку, як ён бачыць свет. Дастаткова ўчытацца ў гэтыя вось радкі:

Плач дзіцяці —
Дождж і сонца ўперамешку.
Я пачуў замову ад імжы:
— Пакажы, сыночак мой, усмешку,
Хоць адну смяшынку пакажы!
Маці, незнаёмую матулю,
Сцішанай аглядкаю правёў,
Зноў адчуў пявучасць,
роднасць тую
Сказаных не мне сардэчных слоў.

Колькі замілавання і ласкі ў гэтых радках! Так непасрэдна і спагадліва мог сказаць толькі добры чалавек, які разумее другога. Дабрата паэзіі Пысіна — разумная і дзейсная, яна сцвярджаецца ўсімі сіламі сэрца і розуму. Адначасова яна ўключае і тую амаль дзіцячую непасрэднасць, якая дазваляе глядзець на свет шырока адкрытымі вачыма, бачыць незвычайнае ў звычайным. Грамадзянскасць, дзіцячая незамглёнасць погляду — гэтыя дзве грані ўспрыняцця спалучаюцца ў Лысіна ў вельмі арыгінальным сінтэзе. А паглядзіце, якім спачуваннем да старога дзеда — «ужо не свецяць яму мазалі» — напоўнены наступныя глыбока трагічныя радкі:

А бывала ж, гарэлі і грэлі.
Унукі лепей маглі б расказаць.
...Два сыны-танкісты згарэлі,
Не паспелі
унукам слова даць.

Паэта хвалююць розныя праявы сённяшняга дня. Вось хоць бы праблема выхавання моладзі. Пысін кранае яе глыбока і ў той жа час вельмі тактоўна, з павагай, нават з гумарам. Не сакрэт, што некаторыя ў нас даволі негатыўна ставяцца, скажам, да тых маладых людзей, што носяць бараду. Пакаленню Пысіна, па праўдзе сказаць, нехапала часу песціць бараду — позна яны адчулі сваю паважнасць —

Гляджу я — нежанатыя дзядулі
Ці не маю гадуюць бараду!
Ну хто яны, дзяды без пасвячэння,
Геолагі? Палярнікі?.. Ды не.
Вядзе руку па твары засмучэнне:
Вось так абезбародзілі мяне.
Нібы не я — яны ішлі ў атаку,
Не я з гранатай поўз — наадварот.
Заплакаць бы, ды нельга мне, салдату,
Не дазваляюць гонар і узрост.
Як быццам памяняліся мы ў чымсьці
Ды застаецца хтосьці у даўгу.
Вазьміце ж памяркоўна, па-мужчынску
Ўсяго, чым падзяліцца я магу.
Вазьміце добрай веры і спагады,
Цярплівасці і ўмення сябраваць.
Паверце, не такі ўжо я багаты,
Каб бараду без выгады збываць.

Дарэчы, даўно вядома, як клапатліва, ашчадна і добразычліва ставіцца А. Пысін да літаратурнай моладзі — сваіх калег — маладых паэтаў, якія, безумоўна, многім яму абавязаны.

Б. Пастарнак некалі сказаў: «Паэзія — ў траве», гэта значыць у самым будзённым «празаічным» жыцці. Можна здзівіцца і нават пазайздросціць тонкасці і нейкай, я б сказаў, першапачатковасці адчування прыроды: «Хітры карась затаіўся ў пастцы, мудрыя травы спяць у стагах». Паэту добра відаць, як вясновае адраджэнне прыроды ўплывае на чалавечыя душы: «прырода вучыць нас, яна ўмее заўсёды быць саўдзельнікам вясны». У пейзажных вершах Пысіна мне чуецца той «водгук неспазнаных настальгій», які ўладна цягне на жывое ўлонне — у поле, на луг, у лясныя нетры. «І штосьці ад дрэва ў мяне, і штосьці ад птушкі неурботнай»,— прызнаецца ён у адным з вершаў.

Чытаючы кнігу А. Пысіна «Мае мерыдыяны», я звярнуў увагу на паэтава шкадаванне, якое спачатку паказалася дзіўным:

І чаму не стаў я лесніком,
Лес мой, брат мой...
Быў бы я тваім замком
І тваёю брамай.

Адкуль у аўтара такое шкадаванне, што так шчыра прабілася з самай глыбіні душы? Такая любасць і адчуванне роднасці ў дачыненні да лесу? Адказ трэба, відаць, шукаць у натуры паэта, у яго чалавечнасці і гуманізме.

Прыгажосць лесу безабаронная, нехта «з помстаю ідзе да дрэў і сячэ без жалю іх на дровы», а лес варты таго, каб яго шкадавалі і берaглі, бо ён патрэбен людзям:

Ходзяць многія на твой парог
Па вясну, па радасць, па маліну.
Дрэва кожнае — маўклівы бог,
Што праклён прымае і малітвы.

Кожнае дрэва ў лесе поўнае для паэта вялікага значэння, у якім шмат ад фальклорных уяўленняў:

«Пад арэшынай — любімай быць,
Пад вярбінаю — ліць слёзы,
Пад рабінаю — чужых любіць,
Удавой застацца — лёс бярозы».

Гаварыла маці гэтак мне,
Калі сад скідаў ліству сырую.
Я глядзеў на дрэвы у акне,
Я глядзеў на маці нестарую.

Ізноў міжволі ўзнікае паралель: зялёнае дрэва і жывы чалавек, прыроднае адлюстроўваецца ў чалавечым, а чалавечае — у прыродным. А. Пысін прадстае ў гэтым вершы глыбокім чалавеказнаўцам, чалавекам мудрым і добрым. У мудрасці, кажуць, шмат смутку, але смутак не зніжае жыццесцвярджальнасці верша, наадварот, ён робіць гэту рысу больш праўдзівай і пераканаўчай.

І чаго журылася яна:
Можа, лісце тое шкадавала,
Ці яе дзявочая вясна
Белаю вярбою ашукала?

Гэта — пра маці і разам з тым пра сябе. Маладосць паэта ашукала вайна, яна і сёння яшчэ будзіць паэтаў сон «кананадамі ўсіх сваіх франтоў». Як бачым, у эмацыянальным вопыце А. Пысіна адлюстроўваўся вопыт іншых, вопыт яго пакалення, які паэт здолеў так дакладна і пранікнёна выявіць, тыпізаваць у цікавым чалавечым характары.

А. Пысін шмат і ахвотна піша пра лес. Тут паэту добра думаецца і сам душэўны стан нейкі незвычайны:

Я вучань, першакласнік я нясмелы,
Вучуся ў мудрых дрэў, а не ў магіл.
Хай упадзе мой дзень, як жолуд спелы,
З тугім запасам жыццядзейных сіл.

Аб вечным думаю, амаль цвярозы,
На імянінах векавых дубоў.

Ляпеча штось касцёр. Іскрынкі-восы
Мільгаюць ля маіх маўклівых броў.

А. Пысін праз вобраз лесу выяўляе сваё ўспрыняцце рэчаіснасці, свой унутраны свет, у якім празрыста адбіваецца аблічча нашага часу.

У большасці вершаў пра лес яму аддадзена частка сэрца, кавалачак самай патаемнай і шчырай любові, якая вядома чалавеку з дзяцінства, калі ён — сялянскі сын — хадзіў тут пастушком. Рэчка, луг, лес — гэта тое, што спадарожнічае нам з дзяцінства, фарміруючы свет нашых уражанняў.

Глыбокія і інтымныя тайны адкрывае стыхія чалавечых узаемаадносін. Пысін настроены на тую паэтычную хвалю, якая звязана з пазнаннем ледзь улоўных адчуванняў, што знаходзяцца, можа, у самых патаемных куточках чалавечай душы. Я быў надзвычай узрушаны нечаканым эмацыянальным жэстам паэта, якім ён закончыў адзін з выдатных сваіх вершаў «***Зноў гляджу, шукаю...». Пра што гэты верш? Пра жыццё чалавека, пра тую «дарагую зорачку вясны», якая спадарожнічае яму ад калыскі. І пераменнае яе святло — «то агонь устойлівы, то змрок» —

Незнаёмыя, усе непадобныя
У начным адчыненым акне.
Пасвяціце ж вы і мне па-добраму,
Ці для вас ужо няма мяне?

Зноў і зноў звяртаецца Пысін, як і ўся наша сучасная паэзія, да маральна-этычных праблем нашага грамадства. Маральная пазіцыя паэта ўдакладняецца ў новых і новых жыццёвых сітуацыях — «ці не трацім часам мы запас дабраты на бедненькіх і слёзных?».

Як жа ведаць, хто перад табою:
Сапраўды баліць яму
Альбо
Стогне, каб не ўчуць чужога болю?

Думаецца, што паэт, які прайшоў вайну на перадавой, мае права нават на такое вострае пытанне. Жыццёвы вопыт Пысіна загартаваў яго дабрату, зрабіў яе па-сапраўднаму гераічнай: «Пара самаахвяравання мінула», хтось даводзіць зноў. Адчуваеш дотык гэтых слоў — і даўнія заныюць раны»,— таму што для Пысіна гераізм — неад'емная частка чалавечай дабраты і прыгажосці.

Жыццёвасці пачуццяў, натуральнасці тону адпавядае мова паэта — простая, дакладная, без надакучлівых штампаў, інтанацыйна гнуткая. Яго ніколі не абмяжоўваюць «умовы паэтычнай гульні» — рыфма, строфіка, рытмы. Ён не толькі свабодна пачувае сябе сярод

гэтых (для некаторых і жорсткіх) патрабаванняў, яны дапамагаюць яму выражаць змест — пісаць рыфмай, гукам, колерам.

Пысінскі вобраз надзвычай маляўнічы і пластычны. Не магу ўтрымацца, каб цалкам не прывесці верш, ад якога так і вее лясной свежасцю:

Возера люляла хвалі
У чорным выграбе лясным.
А жанчыны паласкалі
Нешта белае у ім.

Потым купіну даілі
Пад маўкліваю сасной.
Журавіны ў донцы білі,
Бы ружовы сырадой.

Збоку там стаяла сонца.
Набягалі і плылі
Цені возера па соснах,
Цені сснаў па зямлі.

У адным з вершаў паэт гаворыць: «Пасля дажджу шумяць яшчэ нябёсы, яшчэ ў паветры пругкі цень вады». «Пругкі цень вады» — мяне літаральна паланіў гэты вобраз сваёй дакладнасцю і прыгажосцю.

Пысін з тых паэтаў, якія сапраўды ўмеюць «свет па-свойму ляпіць». Разам з тым яго лірыка не простая па ўспрыняццю. Гэта — паэзія, якая не спяшаецца адразу ж абдарыць чытача незвычайнай асалодай. Яе эстэтычныя і маральныя каштоўнасці ляжаць не на паверхні, а патрабуюць удумлівага ўжывання і непаспешлівага, зацікаўленага асэнсавання. Учытайцеся, і яна ўзнагародзіць вас за гэта.

## СПОВЕДЗЬ ПАКАЛЕННЯ

### *(Генадзь Бураўкін)*

Гэта запомнілася:

Сёння я незвычайна радасны,
Ну, не хлопец —
усмешка адна:
Цеплынёю дваццаціградуснай
Абагрэла мяне вясна.

І паветра здаецца мядовым,
І нябёсы —
чысцей і сіней,
Я іду — дваццацігадовы,
І дзяўчаты глядзяць на мяне...

Чаму яны запомніліся — простыя, крыху наіўныя радкі з верша «Я іду...», якімі адкрывалася першая кніга Г. Бураўкіна «Майская просінь», што ўбачыла свет ажно пятнаццаць гадоў назад — у 1960-м?

Запомніліся перш за ўсё, думаецца, сваёй непрыдуманасцю, непасрэднасцю, маладой прагай жыцця, незвычайнай паэтычнай узрушанасцю, здзіўленнем, што выліліся з самога сэрца дваццацігадовага хлопца (верш напісаны ў 1958 годзе). Словам, лірычны характар відаць быў адразу.

Тут жа, побач, былі вершы іншага тэматычнага плана, больш, калі можна так сказаць, сур'ёзныя па гучанню, сацыяльна-грамадзянскія па скіраванасці. Але ў той жа час такія ж шчырыя і паюнацку пранікнёныя. Яны паказалі нам другую грань таго ж самага лірычнага характару.

Я з твайго неспакойнага племені,
Партыя,
Хоць ля сэрца білет твой яшчэ не нашу.
Гэта ты разам з маці дала мне ўпартую
І няўрымслівую душу.
Гэта ты мне адкрыла прасторы шырокія
І ў дарогу ўручыла свой дапытлівы зрок.
І заўсёды
з тваімі ўладарнымі крокамі
Я знітоўваю кожны свой крок.

Так у паэзіі Бураўкіна, у яго самай першай кнізе намецілася ўзаемасувязь, узаемапранікненне гэтых двух пачаткаў — інтымнага і грамадзянскага, лірыкі асабістай і пачуцця грамадскага, прапушчанага праз душэўны вопыт паэта, насычанага страсцю і хваляваннем.

Я не знаходжу ў гэтых двух пачатках «антыномію» «я» і «мы», пра якую пісаў А. Вярцінскі, рэцэнзуючы кнігу выбраных вершаў Г. Бураўкіна («Бібліятэка беларускай паэзіі»), выдадзеную ім у 1969 годзе («Літаратура і мастацтва», 16 студзеня 1970 г.). Гэтыя два пачаткі — лірычны і публіцыстычны — існуюць у паэзіі Г. Бураўкіна ў больш складанай дыялектычнай узаемасувязі.

«Майская просінь» змясціла шэраг аўтабіяграфічных матываў. Як, скажам, было не расказаць паэту пра раку маленства, густыя сасняк і Расоншчыны, амаль паўдзённы блакіт яе неба. «Каб не быў чалавекам, я б жаўранкам жыў, і спяваў бы нястомней за ўсіх і званчэй, каб рабілася людзям ад песні лягчэй» — такія эмацыянальна-псіхалагічныя, маральныя вытокі і эстэтычныя ўстаноўкі паэтавай песні, якая пачыналася з закаханасці ў жыццё, са здзіўлення перад яго цудам, з незвычайнай душэўнай узрушанасці. Гэтыя рысы і потым застануцца стрыжнявымі асаблівасцямі паэтычнай і чалавечай (у дадзеным выпадку гэта, відаць, адно і тое ж) натуры Генадзя Бураўкіна.

Не сакрэт, што часта першая кніга не дае адказу на пытанне пра аўтара — паэт ён ці не. «Майская просінь» Бураўкіна, нават гэтыя працытаваныя намі радкі, не пакідалі сумненняў, што нарадзіўся малады паэт, які, як тая губка, убіраў свежыя жыццёвыя ўражанні, набываў веды.

Пачэснае месца занялі ў ёй вершы пра асваенне цаліны; аўтар пабыў там яшчэ студэнтам універсітэта. У вершы «Сашка» ён гераізуе працу маладога цаліннікa з-пад Полацка, які па сутках не здымаў са штурвала рук: мёрз у дашчаных вагончыках і пісаў вясёлыя пісьмы землякам. Выпадак, што й казаць, жыццёвы: чалавек малапрыкметны, «асцярожны і кволы», як гаворыцца пра яго ў вершы, знаходзіць і сцвярджае сябе ў працы, якая дае яму фізічную і маральную загартоўку.

Сучаснік і яго працоўныя здзяйсненні вабяць паэта. Ён закаханы ў будаўнікоў, якія пад калючым ветрам спяваюць на рыштаваннях, «схаваўшы пад пахі азяблыя пальцы». Можа, гэтаму малюнку і нестае поўнай «аб'ектыўнай» праўдзівасці, але паэт так бачыць, і паводле яго светаўспрымання гэта лагічна. Для маладога героя паэта вельмі важна і дорага адчуваць, «што нешта значыш на працавітай сваёй зямлі».

Савецкі вымпел на Месяцы і кніга Маякоўскага, дарогі студэнцкага лета і сустрэча з каханай, подзвіг партызан — пра ўсё ён пісаў з юнацкім запалам і шчыра.

Слабы бок гэтых вершаў — фактаграфічнасць, адносна неглыбокае пранікненне ў сутнасць з'яў, іх відавочная раздробленасць. Зрэш-

ты, усё гэта з лішкам кампенсавалася тым, паўтараю, юнацкім запалам, няўрымслівасцю, што вызначалі самаадчуванне маладога паэта.

Я іду з усімі
і смяюся,
Я іду з усімі
і пяю.

Калектывізм, дэмакратычнасць, душэўная адкрытасць перад сябрам, рамантычнасць — відавочныя рысы характару маладога героя паэзіі Генадзя Бураўкіна, які, здавалася, больш за ўсё жадаў быць зразуметым чытачом.

Такая акалічнасць не перашкодзіла зараджэнню і развіццю ў яго творчасці новага пазітыўнага працэсу — узмацненню ў другой палавіне 60-х гадоў асабовага лірычнага патэнцыялу. Яго заўважыў Ю. Свірка («Полымя, 1970, № 6), цытуючы прыведзеныя вышэй радкі («Я іду з усімі і смяюся...»), як доказ таго, што паэт (верш напісаны ў 1957 годзе) успрымаў людскі, чалавечы «натоўп» у яго, так сказаць, агульнасці, не надта пільна прыглядаючыся да кожнага паасобку. «А пройдзе восем гадоў,— пісаў далей Ю. Свірка,— і ён адчуе, што жыццё не прагулка, што людзі пазнаюцца не толькі на вясновай вуліцы. Паэт пільней прыглядзіцца да іх і не пабаіцца назваць сваім імем тупога мешчаніна, п'яніцу, скрытага нягодніка.

Адзін чытае газету
І ніяк зразумець не можа,
Чаму там усё так правільна,
А ў яго на рабоце
начальнік
Выпісвае тры газеты
(Усе як адна цэнтральныя)
І лаецца горш, чым рамізнік,
І зяцю дае кватэру,
І маніць штодзень «вярхам».

Ю. Свірка, на маю думку, правільна адзначыў творчае пасталенне свайго калегі, для якога паэзія была не забавай, а спосабам пазнання свету.

З цягам часу мы ўсё глыбей і больш будзем ведаць Бураўкіна як празаіка, журналіста, кінадраматурга, зрэдку — літаратурнага крытыка, але паэзія застаецца яго пастаяннай, сардэчнай — на ўсё жыццё — любоўю і захапленнем.

Песня Г. Бураўкіна пачалася на высокай хвалі паэтычнай актыўнасці, вельмі характэрнай для ўсёй нашай літаратуры канца 50 — пачатку 60-х гадоў. Яго, як і іншых, паклікалі ў дарогу бяскрайнія бальшакі, якім няма «ні канца ні краю». З першых кніг Генадзь

Бураўкін зарэкамендаваў сябе як паэт шырокага душэўнага жэсту, які ідзе ў яго ад закаханасці ў родную зямлю, яе людзей, у іх гераічную гісторыю і слаўны сённяшні дзень. Гэтай зямной закаханасцю народжаны любоў і нянавісць паэта.

Г. Бураўкін належыць да таго пакалення маладых беларускіх літаратараў, што ўвайшлі ў літаратуру ў канцы 50-х гадоў. Той жа ўзрост, тая ж праблематыка, той жа ідэйны пафас... Яго творчае станаўленне, інтэнсіўнае фарміраванне мастацкай індывідуальнасці прыпадае, як і ў іх, на 60-я гады. Няма нічога дзіўнага ў тым, што сваімі вершамі гэтае пары Г. Бураўкін нярэдка пераклікаецца з іншымі паэтамі свайго пакалення.

Другая кніга «З любоўю і нянавісцю зямною» (1963) па агульнай танальнасці мала чым адрознівалася ад першай. Пабудаваная на сцвярджальных інтанацыях, у якіх, аднак, часам адчувалася і запытанне, яна сведчыла, як паслядоўна паэт імкнуўся апраўдаць сваю ўрачыстую дэкларацыю, абвешчаную на самым пачатку творчага шляху («Я хачу прайсці па зямлі самым верным, любімым сынам»), не адмаўляючыся ад палкага слова, ад узнёслых пачуццяў, якімі яго, «грамадзяніна дваццатага стагоддзя» (так з гордасцю гаворыць ён пра сябе), шчодра надзяліла жыццё, уласная біяграфія.

Паэта цягне туды, дзе адбываюцца цікавыя і значныя падзеі камуністычнага будаўніцтва — на заводы, фабрыкі, у навукова-даследчыя лабараторыі, на новабудоўлі.

Часопіс «Маладосць» камандзіраваў яго на будаўніцтва нафтагіганта на Дзвіне. Так з'явіўся цікавы лірычны цыкл, ці, дакладней, лірычны рэпартаж «Полацк», старонкі якога запоўнілі вясёлыя няўрымслівыя шаферы і экскаватаршчыкі, верхалазы і цеслі... Як і кожны рэпартаж, ён крыху інфармацыйны, але ў ім шмат хвалюючых мясцін.

«Мазольныя рукі» застаюцца ў Бураўкіна адной з галоўных умоў павагі да чалавека. Такая думка вынікае з «лірычнага рэпартажу» пра машыніста Брэсцкага дэпо Фёдара Фадзеева і яго сяброў «Ляці наперад, паравоз!..».

У ліпені — жніўні 1962 года Г. Бураўкіну давялося быць у складзе савецкай дэлегацыі на Міжнародным маладзёжным фестывалі ў Хельсінкі. З «фестывальнымі» вершамі ў яго паэзію ўпершыню ўвайшла «замежная» тэма са сваімі малымі і вялікімі адкрыццямі.

Пазітыўныя ідэалы сацыялістычнага ладу паэт сцвярджае актыўна і разнастайна. І — у тым ліку — праз публіцыстычнае адмаўленне праяў старога, аджыўшага. Я б не сказаў нечага вельмі істотнага пра другую кнігу Г. Бураўкіна, каб не прыгадаў вядомы яго

верш «***Адышлі ў нябыт панегірыкі...». Гэта — адзін з лепшых вершаў, які яшчэ раз пераканаў нас у значным лірыка-публіцыстычным таленце паэта, у адмаўленні ім паэзіі рытарычна-параднай, паэзіі панегірыкаў.

Свет не просты — даводзіць яго паэзія. У другой кнізе сустракаліся даволі нечаканыя радкі:

Я часам сам сябе не пазнаю:
Разважлівы,
спакойны і цвярозы,
Пра маладосць бясхмарную маю
Усё часцей ка мне прыходзіць роздум.

Роздум прыходзіў, гэта правільна, але эстэтычна ён пакуль што рэалізоўваўся мала. А звязаны быў, безумоўна, з далейшым накапленнем у паэта грамадзянскіх якасцей, іх маральнай завостранасцю.

У кнізе «Культура творчасці» А. Адамовіч слушна і справядліва адзначаў: «Пісьменнік становіцца творчай індывідуальнасцю не раней, чым ён адчуе сябе грамадзянінам. Толькі ў тым выпадку, калі ў чалавеку абуджаецца вострае пачуццё асабістай адказнасці за ўсё, што адбываецца навокал, у жыцці, толькі тады проста таленавітая асоба ператвараецца ў сапраўды творчую індывідуальнасць: у мастака паяўляецца свой, змястоўны погляд на свет, узнікаюць свае адносіны да жыцця, а тым самым і свой стыль». Грамадзянскасць, накіраванасць таленту, яго маральнае напаўненне, эстэтычная і сацыяльная пазіцыя і вызначаюць творчую індывідуальнасць паэта.

Па вершах паэта 60-х гадоў бачна ўзмацненне пачуцця адказнасці, асабістай далучанасці да ўсяго, што адбываецца на зямлі.

Я дзякую за ўсё,
Зямля-карміліца...
Не вінавачу ў тым цябе ніколькі,
Што наш сусед
падскоквае на мыліцы,
Што бацьку
дождж прадказваюць
асколкі.

Праблема ставіцца пакуль што квола, няўпэўнена, але яна ўсё ж такі «намацваецца», існуе для паэта, паварочваецца ў яго творчасці рознымі сваімі гранямі. Яна ўзнікла яшчэ ў зборнічку «Майская просінь», і з цягам часу гучанне яе ўзмацнялася.

Аднагодак кожны мой раскажа,
Колькі меў у першым класе бед:
Як рабілі мы чарніла з сажы.
Як пісалі на лістах газет...

Я пазнаў тады акрайца хлеба
Самую суровую цану,
Палюбіў густую просінь неба,
Люта зненавідзеўшы вайну.

Паэзія Г. Бураўкіна — гэта, калі гаварыць сцісла, гісторыя духоўнага станаўлення яго пакалення, ранняга яго ўзмужнення. Ва ўсякім разе яна дае для гэтага надта цікавы матэрыял, вобразна сведчыць, што на жыццёвы вопыт і светапогляд Г. Бураўкіна, як і яго сяброў-равеснікаў, у вельмі значнай ступені паўплывала вайна. Заканамерна таму, што перажытае ў ваенныя, партызанскія гады і, можа, па-свойму не менш цяжкія і гераічныя пасляваенныя стала неад'емнай часткай мастацкага свету паэта.

Вельмі характэрную для пакалення равеснікаў гісторыю паэт расказаў у вершы «Бязбацькавічы», прысвечаным Р. Барадуліну. Гэта драматычны расказ пра тых аднагодкаў, каго вайна «сурова назвала бязбацькавічамі», даўшы права на максімальную маральную патрабавальнасць.

Важная і ўсё ўзрастаючая якасць другой кнігі Г. Бураўкіна — праблемнасць мастацкага мыслення, цікавасць да пытанняў няпростых. У вершы «*** Вучоныя — разумныя людзі...» ён усхвалявана разважае аб тым, да якіх вынікаў можа прывесці чалавецтва неабмежаваны рост узбраенняў.

У вершы «Дзень нараджэння ў генерала» (пачатак 60-х гадоў) паэт вядзе гаворку аб праблеме выхавання моладзі, паказвае духоўную спустошанасць «грывастых бамбізаў», якіх больш за ўсё вабіць «замежны джазавы гром».

Платы двухметровыя
на трэскі крышыць гатоў,
Калі, сыта ікаючы,
спаць кладуцца мяшчане,
А раз'юшаныя сабакі
салаўёў выганяюць з садоў.

Што ж, аўтар, магчыма, і правільна «намацаў» праблему, аднак вырашае яе празмерна абагульнена. Але гэта толькі пачатак. Тэма варожасці мяшчанства да хараства, прыгажосці, чалавечнасці будзе распрацоўвацца публіцыстычнымі сродкамі ў яго паэзіі.

Публіцыстычнай паэзіі заўсёды было шмат работы. І гэта добра адчувае Г. Бураўкін, для якога публіцыстычнасць, як неспакой і трывога, як любоў і нянавісць, больш чым блізкія. Пра гэта гавораць многія яго вершы.

Ды і сам паэт — у «Аўтабіяграфіі»:

«Я знаю, што два мае зборнікі вершаў («Майская просінь», 1961 год, і «З любоўю і нянавісцю зямною», 1963 год) не бездакорныя. Але ніколі я не пісаў несумленна і няшчыра — і таму я не саромеюся сваіх вершаў». Гэта шчырае і праўдзівае самапрызнанне мастака.

Адна з галоўных рыс мастацкага мыслення Г. Бураўкіна і яго паэтыкі — кантрастнасць фарбаў, супрацьстаўленне думак, падзей, эмоцый. І гэта бярэ пачатак у душэўнай актыўнасці паэта, яго грамадзянскасці, у той інтэнсіўнасці пазнання свету, якой жыве яго паэзія.

Зборнік «Дыханне» — чарговы, трэці па ліку — паказаў далейшае пашырэнне тэматычных і мастацкіх даляглядаў паэта.

Пра паэзію Г. Бураўкіна больш і глыбей пачала гаварыць крытыка, адзначаючы, што ў яго кнігах выразна адчуваецца пульс часу. І гэта ў многім сапраўды так. У вершах Г. Бураўкіна, адзначаў Дз. Бугаёў, гаворачы пра яго кнігу «Дыханне», «гулка б'ецца сэрца сучасніка, выразна праслухоўваецца напружаны пульс чалавека, заклапочанага ўсімі трывогамі нашага вялікага і грознага стагоддзя з яго практычнасцю, суровай цвярозасцю і складамі вадародных бомб».

Крытык меў рацыю: у кнізе «Дыханне» на новым узроўні спазнавалася супярэчлівая складанасць свету.

Тым не менш творчы шлях Г. Бураўкіна, як і кожнага сапраўднага паэта, нельга ўяўляць як суцэльны шэраг поспехаў і перамог. Не, мелі месца, на маю думку, і промахі. Нехта аднойчы заўважыў, што адчуванні лірычнага героя Бураўкіна часам бывалі занадта катэгарычныя, ім бракавала ўдумлівай засяроджанасці. Гэта можна заўважыць у некаторых вершах кнігі «Дыханне», у паэме «Чужая споведзь», у якіх выявілася аўтарскае непрыняцце споведзі «ціхенькага палахліўца», гэтакага «маленькага чалавечка» 60-х гадоў XX стагоддзя. Пафас паэта можна зразумець і, без сумнення, ухваліць, калі ён гаворыць:

Я проста
            ненавіджу палахліўцаў
І аб'яўляю «ціхенькім» вайну.
Я сэрца поўню лютасцю зацятай
Да іх —
            цішэй вады, ніжэй травы.
Далі нам век дваццаты,
                        з'езд дваццаты —
На смеласць чалавечую правы.

Але калі гаворка ідзе пра канкрэтнага героя, пра «чалавека сярод людзей», то чытачу абавязкова патрэбны падрабязнасці: хто ён?, адкуль?, чаму так сталася?, хто ў гэтым вінаваты? і г. д., словам, патрэбна сацыяльная «біяграфія» з'явы, відаць, вельмі цікавай і

актуальнай. Няма патрэбы спяшацца асуджаць, важна, каб абвінаваўчы прысуд «шэранькаму чалавечку» прагучаў абгрунтавана, аб'ектыўна і пераканаўча. Інакш кажучы, патрэбен аналіз усёй сукупнасці абставін, што прывялі да маральнага злачынства.

А ўвогуле кніга «Дыханне» сведчыць, што да паэта прыйшла сталасць — і жыццёвая і паэтычная. Запамінаецца трыпціх «Неба і зямля» з гэтай кнігі, твор асабісты, я б нават сказаў, аўтабіяграфічны ў тым сэнсе, што Г. Бураўкін раскрывае аўтабіяграфію свайго пакалення, як ён яе адчуў і перажыў. Кранае сваім публіцыстычным гучаннем верш «Пра сціпласць», дзе расказваецца пра нейкага «бойкага дзядзьку», што «пляваў на мой народ і край». Праўда, і тут сустракаюцца непрадуманыя радкі:

Глынуўшы ком абразы даўкі,
Мы дзядзьку «выдалі» з пляча.
А побач быў таварыш даўні
І...
акуратненька маўчаў...

Невядома, хто гэты «даўні таварыш», але наўрад ці правільны такі спосаб вырашэння канфліктаў — «выдаць з пляча» — і ў жыцці і ў паэзіі. Разумееш і падзяляеш непрыняцце паэтам усякага нейтралізму, усякага «мая хата з краю» і сімпатызуеш яго герою, які так страсна жадае сцвердзіць на свеце справядлівасць і дабро. Але такая паспешлівасць, як у вершы «Пра «сціпласць», усё ж такі мала прыймальная для нас. Да вырашэння падобных канфліктаў варта падыходзіць больш удумліва і больш грунтоўна, улічваць усе «пазіцыі». Зрэшты, гэта «накладныя выдаткі» нялёгкіх пошукаў паэта ў тонкай сферы маральна-этычнага, бо паэт сам добра ведае і раіць іншым (у вершы «Сябру, які заўсёды злосны»): «Не спяшайся людзей аблаяць, пастарайся іх зразумець».

Л. Гінзбург у сваёй кнізе «О лирике» пераканаўча гаворыць, што рэалізм у лірыцы далёка не тое, што рэалізм, скажам, у эпасе, прозе. Рэалістычны метад у лірыцы звязаны з паглыбленнем паэта ў «дыялектыку душы», з адкрыццём і сцвярджэннем пэўнай эстэтычнай самацэннасці працэсу духоўнага жыцця чалавека. У арсенале прыёмаў лірычнага абагульнення няма такога, якім карыстаецца проза,— разгорнутая знешняя характарыстыка. Яна прывяла б (і прыводзіць!) лірыку да апісальнасці. Адзіны для паэта шлях да стварэння паўнацэннага лірычнага характару ляжыць праз найбольш глыбокае і поўнае раскрыццё ўнутранага свету чалавека. Ён раскрываўся ў Г. Бураўкін ў такіх харошых, свежых вершах, напісаных, як гэта ўласціва паэту, на шырокім грамадзянскім дыханні :

Не шукайце красы за морамі,
Узбярэжжаў з крыштальнымі зорамі,—
Прыязджайце да нас на Полаччыну,
Пахадзіце яе прасторамі.

Або:

У любві да цябе я не раз буду клясціся.
Не таму,
каб ты помніла клятву маю,
Проста, дзе ні пабуду —
у Смаргоні ці Клясцінах,—
Я ўсё болей цябе пазнаю...

Г. Бураўкін заўсёды шмат працаваў. І не толькі як мастак. Вельмі дабратворна, плённа адбілася на творчым росце і грамадскім сталенні паэта яго праца карэспандэнтам «Правды» па Беларусі. Гэта была вялікая школа пазнання жыцця.

Паэзія Г. Бураўкіна стала разнастайней у жанравых адносінах, у ёй стыкуюцца лірыка і эпас, інтымныя матывы чаргуюцца з адкрытай публіцыстыкай, як у вершы «Ідзе працэс...». Паэт ведае патаемную мову лесу і ракі і горача выкрывае праявы мяшчанства ў нашым грамадстве («Зусім «бязгрэшным»).

Па праўдзе кажучы, Г. Бураўкін ніколі не імкнуўся ісці па шляху падкрэсленых фарматворных навацый. Не будзем гаварыць, добра гэта ці дрэнна, падкрэслім толькі, што больш за ўсё яго цікавілі і вабілі адкрыцці ў самім жыцці, у яго ідэйна-маральным змесце. З аднагo боку, лірычнае пераадоленне, паэтызацыя будзённай рэальнасці, з другога — заглыбленне ў яе надзённыя праблемы. Праблемнасць мыслення становіцца галоўным фактарам творчасці паэта, яе ўнутраным стымулам.

Наколькі паэт вырас, стаў самастойней і глыбей у ідэйных і мастацкіх адносінах, яскрава пасведчыла кніга «Жніво» (1971). Яна даказала, што мінула для Бураўкіна тая «пераходная пара» вызначэння таленту і асобы, якую прыходзіцца пераадольваць, відаць, кожнаму сапраўднаму паэту, што няспынна расце і мяняецца. Ён стаў больш строгім і патрабавальным да сябе, у нечым, магчыма, традыцыйней і прасцей. Паслухайце, як сам ён пра гэта гаворыць:

Хто раней,
хто пазней,
Толькі ўсе
Зноў і зноў
Мы прыходзім
Да простых,
як хлеб і паветра,

Высноў:
Што жыццё чалавеку —
Любому —
Даецца адно,
І што,
   як ні надточвай,
Кароткае вельмі яно.
І што праўда на свеце
Адна —
Без крупінкі маны,
І што шчасця на свеце
Няма
Без сваёй стараны...

Гэтыя радкі толькі знешне, «інтанацыйна» спакойныя, унутрана яны палемічныя, ідэйна завостраныя, ды і прастата іх зусім не ардынарная, таму што яна арганічна вынікае з перажытага, з асабістага вопыту. І справа не ў тым, што быццам бы раней паэт не разумеў гэтага, не, але цяпер ён глыбей пранік у жыццё, больш спасціг яго складанасць і прастату.

Рост кожнага мастака звязаны з рознага роду зменамі ў яго светаадчуванні, мастацкай сістэме, мове і г. д. Але нешта важнае ўсё ж такі застаецца пастаянным, быццам бы недаступным уплывам часу. У Бураўкіна гэтае пастаяннае, нязменнае — яго грамадзянскі тэмперамент, напорыстасць палеміста, зайздросная здольнасць мысліць смела і праблемна.

Страсна публіцыстычны, напрыклад, яго верш «Кампрамісы», у якім ён адстойвае бескампраміснасць жыццёвай пазіцыі свайго сучасніка.

Ты толькі збоч,
   ты толькі збойся,
Зняверся ў нечым хоць на міг —
І лоўка прашмыгне забойца
Тваіх сяброў, ідэй тваіх.

Апошняе дзесяцігоддзе ўзбагаціла голас паэта новым гучаннем, новымі адценнямі. Ён, мне здаецца, становіцца больш медытатыўным, філасофскім. Душэўная энергія паэта, якая ў першых яго кнігах, здаралася, выступала ў форме дэкларацый (яркіх і па-свойму цікавых), запэўненняў, цяпер усё часцей увасабляецца ў жывую матэрыю вобразаў і роздумаў. Такі верш пра родную «вясковую хаціну». Пра яе, пра родную вёску, лес, раку Г. Бураўкін шмат пісаў і ў ранейшых кнігах. Але цяпер голас яго загучаў з новым душэўным уздымам, на

новай эмацыянальнай хвалі. Яна выразна адчуваецца ў дэталях, вельмі прадметных па сваёй мастацкай фактуры:

Мая вясковая хаціна,
Пасляваенны горкі лёс!
Прымі мяне, бадзягу-сына,
У цёплы цень сваіх бяроз.
І дзверы, што выходзяць к лесу,
Не замыкай хварасціной,
Хай злосна зарыпяць завесы,
Даўно не мазаныя мной.
Хай у струхлелых сценах цесных
Сустрэнуць зноў мяне
                    спакой,
Старэнькі стол,
                    прапахлы цестам
І мокрай рыбінай луской.
Вуглы закопчаныя тыя,
Дзе ціха плакаў хлапчуком...

Вясковае пасляваеннае дзяцінства засталося ззаду, але сувязь з вёскай, з зямлёй не абрываецца. У адным з вершаў паэт успамінае бацьку-хлебароба, якога, на шчасце, ніякія хваробы не бяруць (не так, маўляў, як нас, гараджан), бо сілы дае яму «сівая доктарка — Зямля».

Вялікае замілаванне да роднай зямлі засталося назаўсёды. Бываць дома для паэта — маральны абавязак, а памяць аб мінулым — адна з форм духоўнага жыцця.

Ідэал паэта — усебакова развітая чалавечая асоба, чалавек «ва ўвесь рост», гаспадар «зялёнай зямлі», наследнік гераічных традыцый, улюбёны ў прыгажосць сацыялістычнай рэальнасці. Такі чалавек спалучае ў сабе любоў да працы і песню. Яго аблічча бачыцца паэту ў постацях сучаснікаў, у асобе Юрыя Гагарына, у абліччы гераічных камісараў грамадзянскай вайны, да канца адданых справе рэвалюцыі.

Пяру Г. Бураўкіна належыць яркі твор пра Юрыя Гагарына — «Паэма расстання». З самага пачатку аўтар звяртаецца да свайго ўлюбёнага прыёму супрацьстаўлення: вясенняе абуджэнне прыроды («раставаў сакавік, як апошняя снежка») і гібель Юрыя Гагарына. Бураўкін яшчэ раз паказаў сябе як пранікнёны лірык. Адно з лепшых месц паэмы — вобраз сонца ва ўспрыняцці Юрыя, гэтага вялікага жыццялюба:

Ён любіў сонца.
Ён сам быў падобны да сонца,
Якім яго дзеці малююць —
З шырокай усмешкай
І вачамі, поўнымі святла.

У паэме, як і ў жыцці, Гагарын паўстае звычайным, рэальным чалавекам і чалавекам з легенды адначасова. Яго гібель асэнсоўваецца як вялікая страта для. чалавецтва, як трагедыя. І неадступна б'ецца ў скроні думка: «не зберараглі!..». А з другога боку — «А ці захацеў бы ён, ці дазволіў сябе ад будзённых клапот берагчы?».

Хіба ён бы змог
стаць
жывым экспанатам,
Музейным дзівам,
цацкай для новых эпох,
Калі быў
чалавекам,
касманаўтам,
лётчыкам
І быць інакшым
не мог?

Намаганні чалавецтва на шляхах прагрэсу неад'емныя ад вялікага духоўнага і фізічнага напружання, ад рызыкі, ахвяр. У подзвігу Юрыя Гагарына праявілася неўтаймаванасць чалавечага пазнання, подзвіг гэты — адно з самых яркіх звенняў сусветнага прагрэсу, ён увесь — у будучыні.

У той жа кнізе «Жніво» змешчана другая паэма Г. Бураўкіна — «Хатынскі снег».

Паэма «Хатынскі снег» належыць, без сумнення, да лепшага, што ўвогуле напісана ў нас пра Хатынь. Паэт імкнецца ў поўнай меры адлюстраваць глыбіню і ўвесь жах трагедыі яе жыхароў, расказаць пра ўсё, нічога не ўпусціўшы. Карціны, намаляваныя ім, поўныя вялікай выяўленчай сілы:

Ужо не іскры,
а снапы пякельнага полымя
На галовы абрынуліся са страхі.
І людзі ад іх адбіваліся рукамі голымі.
І засквірчэлі на плячах кажухі.
Ад немага крыку
абвалілася пуня.
Грымнулі вобзем дзверы.
І ўпала,
як чырвоны куль.
Халоднага снегу шукала
сляпая бабуля,
А знайшла толькі жменю гарачых куль.
Страчылі кулямёты
па агню,

па стогнах і плачу.
Радзеў і падаў
ахрыплы пакутны крык.
І вось застаўся адзін толькі енк дзіцячы,
Але і ён
пахіснуўся
І знік.

Нас у аднолькавай ступені хвалюе ў гэтай рэчы Г. Бураўкіна праўда паказу падзей і праўда аўтарскага перажывання.

У паэме «Хатынскі снег» шмат праўдзівых дэталей гэтай жахлівай трагедыі. Вельмі рэльефна намаляваны асобнымі трапнымі мазкамі пакуль што яшчэ мірны ранак у Хатыні: зарыпеў калодзежны журавель, бухнула ў студні аб лядок вядро, грымнула каля прыпечка бярэмя бярозавых дроў, кукарэкнуў певень, дзвынкнуў аб даёнку струмень малака, смачна запахла над вёскай дымком... Гэтыя дэталі вясковага побыту перад нашэсцем карнікаў выглядаюць па-чалавечаму значна і цёпла. Яны падкрэсліваюць невіноўнасць жыхароў Хатыні і звярыную жорсткасць фашысцкіх катаў.

Многія творы Г. Бураўкіна расказваюць пра мінулую вайну, яе ахвяры, пакуты і гераізм народа, здзейснены ім векапомны подзвіг. Паэт ведае, як і сёння пакутуюць ветэраны ад старых асколкаў і куль, што заселі глыбока ў целе, ля сэрца, ад іх нічым не закрыцца — «ні акопам, ні бранёю, ні мінулай пераможнаю вайною».

Бураўкін нарадзіўся ў 1936 годзе, вайна прыйшлася на яго дзіцячыя гады, але многае — жудаснае — запомнілася і яму, малому...

«...Мы стаім на ўзгорку трыма радамі: першы, рэдзенькі — мужчыны, дзяды; другі, заплаканы, няроўны — жанчыны з малымі на руках і трэці — мы, каму шэсць-дзесяць-дванаццаць гадоў. На нас нацэлены кулямёт, за ім — як сёння помню — ляжыць здаравенны немец у даўгім шынялі. Стаяць на ўзгорку і паліцаі — там, за кулямётам, па той бок. Мы чакаем, чакаем стрэлаў. Плачуць жанчыны, маўчаць дзяды. А стрэлаў усё няма. Ідуць хвіліны, гадзіны. Мы дрыжым ад холаду. За кулямёт кладзецца ўжо другі немец. А стрэлаў усё няма...

Пад вечар нас сагналі ў лазню на ўскрайку вёскі. Было цёмна і цесна. Для малых адвялі палок, мы сагрэліся на ім і пачалі валтузню. А маці нашыя плакалі і чамусьці абдымаліся: «Ну, даруй, калі што не так было...», «Даруй, Рыпішка...». Я тады не ведаў, што дзверы лазні былі забіты цвікамі, што лазня абкладзена саломай і паліцаі пайшлі шукаць газы ці бензіну. Я тады многае не разумеў. Мне было сем гадоў...» (з аўтабіяграфіі Г. Бураўкіна).

Тое, што Г. Бураўкін піша аб вайне, скіравана супраць вайны, супраць чалавечых ахвяр і пакут. Ёсць загад сэрца, абавязак перад загінуўшымі, памяць пра іх — і ўсё гэта дзеля тых, хто жыве. І тут ён, думаецца, вельмі блізкі да Мікалая Маёрава — вядомага савецкага паэта, які загінуў на вайне. Тады, у 1941-м, ён сказаў:

...И пусть
не думают, что мертвые не слышат,
когда о них потомки говорят.

Следам за «Жнівом» з'явілася яшчэ адна кніга Г. Бураўкіна пад назвай «Выток» (1974). Думаю, што маюцца ўсе падставы гаварыць аб новай якасці лірызму ў паэзіі Г. Бураўкіна. Піша паэт быццам бы паранейшаму проста, але гэта, безумоўна, новая якасць прастаты, азоранай высокім маральным ідэалам.

Такая рыса сённяшняй літаратуры, як апалітызм, у апошніх паэтычных зборніках Г. Бураўкіна заявіла аб сабе досыць выразна. Паглыбіўся псіхалагізм ягонай лірыкі, значнае пашырэнне атрымала яе сацыяльна-філасофская аснова, гістарызм паэтычнага мыслення.

Стаю каля сівой красы,
Хаджу па гулкіх сутарэннях —
І чую продкаў галасы,
І бачу нашых дзён карэнні.

Нездарма апошнім часам у паэзіі Бураўкіна пабольшала такіх слоў і паняццяў, як «выснова», «выток». Думаецца, менавіта ў гэтым рэчышчы роздуму паэта нарадзіўся верш «Камісары», у якім сцвярджаецца духоўная, ідэйная роднасць сённяшняга пакалення моладзі з тым, якое прымала актыўны ўдзел у барацьбе з контррэвалюцыяй. Героі грамадзянскай вайны, мужныя бальшавіцкія камісары ўвасабляюць для паэта сумленне цэлай эпохі.

Мы іх перагналі па ўзросту,
Сягнулі да зорак сівых.
І ўсё ж, як падлеткі, зайздросцім
І лёсу, і пафасу іх.

І марай свяшчэннаю самай
У сэрцах надзея гарыць,
Што нас не ўпікнуць камісары —
Суровыя нашы сябры.

Маральны рыгарызм камісараў далёкай грамадзянскай імпануе сённяшняй моладзі, рыцарам абавязку, чэсці, высокай чалавечай годнасці.

«Паэт нашай эпохі,— пісаў нядаўна Яўген Вінакураў,— гэта мастак, які ўмее дыялектычна бачыць свет, разумець яго складанасць,

шматбаковасць з'яў». І далей: «Інфармацыі для паэзіі мала. Ёй павінна быць уласціва такая якасць, якую я назваў бы духаўздымнасцю» («Правда», 5 сакавіка 1974 г.).

Мне заўсёды імпанавала ў таленце Г. Бураўкіна «духаўздымная» страснасць палеміста, вострае маральнае бачанне жыцця, гатоўнасць ісці нават на рызыку, калі ён глыбока перакананы ў сваёй праваце. Перадаліся гэтыя якасці і кнізе «Выток».

Я не люблю людзей, якія
Не маюць ворагаў зусім
І носяць кулакі цяжкія
Не паспытаныя нікім.

За дабрату стаю сцяною.
І ўсё ж не давяраю ім,
Што абдымаюцца са мною
І з непрыяцелем маім.

Словам, перад намі паэт, якім ён быў і раней: заўсёды гатовы да спрэчкі, да сутыкнення думак, да бою. «Што паробіш, калі ціхманы я ніколі не быў эмалі»,— прызнаецца ён у адным з вершаў.

Калі ў сучаснай беларускай паэзіі шукаць сваякоў Г. Бураўкіна па творчаму духу і грамадзянскаму напалу слова, то гэта будзе, безумоўна, Пімен Панчанка з яго высокім «болевым парогам» і тонкім адчуваннем пульсу часу. Іх родніць смеласць, здольнасць і гатоўнасць кожную хвіліну ісці на бой за свае перакананні. У іх мы знаходзім тую разнастайнасць сацыяльных інтанацый, якія нязменна суадносяцца з жыццём, штодзённай стваральнай дзейнасцю нашага грамадства.

Юрась Свірка некалі правільна заўважаў, што «манера пісьма Г. Бураўкіна адкрытая. Ён свае думкі не хавае за глыбокія падтэксты, не абрывае недагаворкай. Таму яго вершы гучаць напорыста, публіцыстычна, набліжаючыся часам да палемікі» («Полымя», 1970, № 6). Аднак цяпер, думаецца, мы маем справу з новым узроўнем палемічнага стылю паэта. З аднаго боку, узбагацілася праблематыка паэзіі Г. Бураўкіна, абвастрыўся яе маральны максімалізм. А з другога — больш паслядоўным стаў працэс мастацкага пазнання. Цяпер у гэтым працэсе няма такіх «правалаў», якія траплялiся раней.

У лірыцы паэта значнае месца заняў аналіз самаадчування, роздум над сваім месцам у буднях жыцця.

Успамінаюцца шляхі ўсе,
І прызнаешся у цішы,
Што па-блазенску мітусіўся
І часта,
        як хлапчук,

спяшыў,
I нёс вядро сваё няпоўным,
I спатыкаўся шмат разоў,
I хваляваўся не галоўным,
А выпадковай драбязой...

Лірыка Г. Бураўкіна робіцца своеасаблівым дзённікам паэтавай душы, але гэта не толькі не выключае яго грамадзянскай актыўнасці, а наадварот — абумоўлівае яе.

Нялёгкі талент грамадзянскасці — у разуменні паэта — гэта ўменне бачыць і думаць над пытаннямі свайго часу, імкнучыся зразумець і вырашыць іх. Праўда, не ўсе і не заўсёды, вядома, яны бываюць падуладны пяру паэта — любога паэта. Але Г. Бураўкіна гэта не бянтэжыць: смеласці і энергічнасці ў яго хапае. Нават, паўтараю, там, дзе «паэтычнае» вырашэнне тэмы здаецца на першы погляд мала надзейным, паэт знаходзіць свой нечаканы, свежы паэтычны ход. Як, напрыклад, у вершы «Уцякаюць хлопцы ў гарады», дзе ён кранае актуальную праблему сённяшняй вёскі — міграцыю сельскага насельніцтва, разумеючы аб'ектыўную заканамернасць гэтай з'явы.

I без іх, хто пакінуў вёску, «на палях не ўзыдзе кураслеп..,,» — упэўнена зазначае паэт,

Ды пад старасць хлопцам
здасца дзівам,
Як гэта зямля
без іх
радзіла
Аржаны незамянімы хлеб.

У другім месцы паэт выказваецца яшчэ больш катэгарычна: «Колькі б нам за жар-птушкай услед не ганяцца, усё роўна прыблудзім назад у сяло...». З гэтым, вядома, можна спрачацца. Мяне асабіста не вабіць падобнае «почвенничество». Пад ім, на мой погляд, няма глебы.

У кнізе «Выток» роздум паэта над маральным абавязкам людзей, над іх узаемаадносінамі ўзмацняецца: «Мы слухаем маўклівае міжзор'е, а блізкіх нам не можам зразумець». У другім месцы ён усклікае:

Як многа ў нас звычайнасці!
Як мала ў нас адчайнасці!

Пазнаецца «адчайны», грамадска заклапочаны голас паэта ў вострым з'едліва-выкрывальным вершы «Сабакары», антымяшчанскім па свайму гучанню, скіраваным супраць тых «дзябёлых кабет» і «джынсовых дзецюкоў», што — у згодзе з модай ды каб, крый божа, не адстаць ад яе — абзаводзяцца сабакамі: «вязуць, вядуць, нясуць, як дзетак, сабак і сучак «прагуляць». I, павінен прызнаць, з пазіцыяй паэта

нельга не пагадзіцца: «Я б паважаў іх, каб не бачыў, што ім: дайсці няма калі ад клопатаў пра лёс сабачы да клопатаў пра лёс зямлі...».

Магчыма, у апошніх словах і гучыць рэха той фарсіраванасці прысуду, якая мела некалі месца ў некаторых вершах паэта, але, паўтараю, сказаны яны вельмі шчыра. Мастацкае пазнанне жыцця, асабліва такое інтэнсіўнае, як у Бураўкіна, не гарантавана ад супярэчнасцей, і гэта заўсёды трэба мець на ўвазе.

У кнізе «Выток» голас паэта гучыць паўнакроўна і шматгранна. Яго паэзія, безумоўна, пашырае свае геаграфічныя, інтэрнацыянальныя межы. Глыбокае ўражанне пакідаюць «Чатыры песні пра Эрнеста Чэ Гевару» і верш «Памяці Пабла Няруды», у якім выяўляецца погляд на месца вялікага чылійца ў сучасным свеце:

Ён быў паэтам.
І калі яго неслі на могілкі,
За ім
жанчынай няўцешнай
ішла эпоха.

Так, не слабее грамадская пранікнёнасць кніг паэта, не бяднее іх эмацыянальны спектр, рамантыка, захапленне жыццём!

Вы чуеце —
чаромха расцвіла?
Гайда ў лясы,
у веснавыя нетры,
Раз'ятраныя, халастыя ветры!
Гуляюць ад сяла і да сяла.

Такія радкі і вершы сцвярджаюць і наша ўспрыняцце свету, жыцця, прыроды, вучаць любіць і любавацца ёю.

Дыялектыка «інтыму» і «публіцыстычнасці», якія адно другога ўзбагачаюць, здавён характэрна для лірызму Г. Бураўкіна, для стылю яго паэтычнага мыслення. У кнізе «Выток» шмат такіх вершаў, дзе паэт дае прастор свайму лірычнаму пачуццю, сэрцам дакранаючыся да родных мясцін, пейзажаў, краявідаў...

Духоўнае, палітычнае пасталенне паэта станоўча адбілася як на росце майстэрства, ідэйнай, маральнай сталасці таленту, так і ў адчуванні эстэтычнай, моцы і сілы слова, уменні выкрасаць з яго дадатковую паэтычную энергію.

Тэхніка, як вядома, зусім не вычэрпвае паняцця майстэрства. Але ў добрага майстра і тэхніка на вышыні. Паглядзіце, як хораша інструментаваны наступны верш Г. Бураўкіна (аўтар назваў яго «Ціхі верш»):

Ціхая засень старэнькай альтанкі.
Ціхае шчасце —

Шэпат каханкі.

Ціхія гукі.
Цёплыя рукі.

Лісця чаромхі вячэрняя споведзь.
Вусны дыханне спалохана ловяць.
Сіняя ціша
Зоркі калыша.

Крылаў птушыных апошнія ўзмахі.
Святло патушылі шэрыя гмахі.

Чуеш,
Як б'ецца
Сэрца ля сэрца?

Паэту добра вядома, што рэалістычны мастацкі вобраз не проста адлюстроўвае аб'ектыўную рэальнасць, ён валодае ўласнай эстэтычнай рэальнасцю, і мастак не проста пазнае рэчаіснасць, ён умешваецца ў яе, тым больш праз лірычны вобраз, дзе суадносіны паміж асобаю і грамадствам выяўляюцца непасрэдна.

Рэдка, вельмі рэдка, але ўсё ж такі пракідаюцца яшчэ ў паасобных вершах паэта (нават у апошніх кнігах) выпадкі, калі яму здраджвае, на мой погляд, мастацкі густ. Размова ідзе аб наступных радках:

Не закрыць
ні радасцю,
ні бытам
Тых,
што ўпалі ніцма на лаўжы.
Колькі іх,
забітых
і забытых,
Пад нагамі нашымі ляжыць!

*(З кнігі «Жніво»)*

У апошнім радку ёсць непажаданае зніжэнне ўзроўню паэтычнай мовы, думка становіцца абездухоўленай, спрошчанай.

Аднак гэта — толькі асобныя дэталі, яны не парушаюць агульнага добрага ўражання ад яго работы.

Працэс пазнання, шлях да ісціны, у тым ліку да ісціны мастацкай, цяжкі і супярэчлівы. Г. Бураўкін яго адольвае настойліва і энергічна. Пажадаем яму поспеху.

## ЧАЛАВЕК — ГЭТА ЗАЎСЁДЫ ЦІКАВА

### *(Барыс Сачанка)*

«Сярод людзей, што мелі патрэбу ў той дзень наведацца ў Доўгі Мох і ішлі туды па дарозе з мястэчка, была і дзяўчына гадоў пад пятнаццаць-шаснаццаць, не надта прыгожая з твару, уся ў рабацінні, да таго ж цыбатая і худая. У руках у яе не было нічога, апроч звычайнага лазовага кошыка, старога, абшарпанага, на дне якога ляжалі чаравікі і вузельчык — старанна загорнутыя ў крамніну акрайчык хлеба і вараная бульба. Велікаваты, па ўсім відаць, матчын санак сядзеў на плячах мешкавата, нехлямяжа, босыя ногі былі запыленыя і парэпаныя...»

Гартаючы адну з апошніх кніг Барыса Сачанкі — тых, што «падсумоўваюць вынікі»,— я міжволі задумаўся над гэтымі вось, зрэшты даўно знаёмымі, радкамі з ягонай аповесці «Пакуль не развіднела». У іх падаецца партрэт партызанскай сувязной Юлі — чалавека высокага грамадзянскага абавязку, гераіні ў поўным сэнсе гэтага слова. Узор, мне здаецца, даволі паказальны для індывідуальнасці пісьменніка, для сучаснага ўзроўню яго творчай культуры і своеасаблівасці эстэтычнай пазіцыі. Знешне сціплы малюнак звязаны з добротным псіхалагічным грунтам, і гэтая сувязь прасочваецца на працягу ўсяго твора, забяспечваючы яго мастацкую ўдачу. Да цікавых абагульненняў, насычаных паэзіяй высокай духоўнасці, аўтар ідзе праз гушчар звычайнай жыццёвай прозы, якая каму іншаму можа паказацца малаістотнай,— а аналітычная думка пісьменніка адкрывае ў ёй цікавае і значнае ў вялікім чалавечым плане. Што ж, гэта сведчанне прафесійнай сталасці, якой даволі хутка — прынамсі, так здаецца нам, чытачам,— пісьменнік здолеў дасягнуць.

Добра помніцца незвычайна яркае ўражанне, якое зрабілі на мяне першыя кнігі Б. Сачанкі «Дарога ішла праз лес» (1960) і асабліва «Барвы ранняй восені» (1962). Было гэта — падумаць толькі! — цэлых пятнаццаць гадоў назад, а ўражанне свежасці, непасрэднасці, паўнагалосся жыцця засталося да сённяшняга дня. І сёння я з удзячнасцю думаю пра тое, што кнігі маладога пісьменніка з'явіліся для мяне своеасаблівым адкрыццём Палесся, яго зямлі, прыроды, людзей, іх думак і настрояў, побыту...

Час, калі ён упершыню заявіў аб сабе, запомніўся многімі падзеямі ў літаратуры і грамадскім жыцці, няўрымслівымі, хоць не заўсёды плённымі мастацкімі пошукамі ў галіне тэматыкі, вобразаў, стылю. Кожны па-свойму, з розным поспехам шукаў сябе. Шукаў і ён.

Мела значэнне, безумоўна, сама форма кароткіх вострасюжэтных навел, з якіх Сачанка пачынаў свой творчы шлях і якім здолеў надаць нейкае новае, арыгінальнае гучанне, звярнуўшыся — на новай, сучаснай аснове — да вопыту Чэхава і асабліва маладога Кузьмы Чорнага. Відаць было таксама, што яго часцей за ўсё цікавілі лёсы нялёгкія, пакручастыя, характары самабытныя і, як кажуць, непрычэсаныя, праз якія найбольш відавочна праглядваўся час. Асабіста я са здзіўленнем адчуў, што нібыта гэтых людзей — герояў сачанкаўскіх апавяданняў — ужо некалі ведаў, сустракаўся з імі і вось, нарэшце, знаходжу ў літаратуры і пазнаю. У гэтым была, вядома, заслуга маладога пісьменніка, у чыіх творах мне бачылася нейкая асаблівая «філасафічнасць» і разважлівасць палешука і разам з тым паэтычнасць яго натуры. Словам, знаёмства адразу абяцала быць прыемнае.

Аўтар настойліва скіроўваў увагу чытача на складанасць і шматмернасць жыцця, у якім мінулае жыве ў цяперашнім, з'яўляючыся яго неад'емнай часткаю.

Леанід Акімавіч, настаўнік (апавяданне «Дарога ішла праз лес»), увесь час засяроджана аб нечым думае, зусім незразумела для іншых ходзіць на працу за сем кіламетраў закінутаю дарогай, хоць яму даўно прапануюць школу бліжэй. Гэтая дарога — яго партызанскае мінулае. Па ёй немцы вялі на смерць каханую, чыя фатаграфія выпадкова, хоць і ўскосна па віне Леаніда Акімавіча, трапіла да іх у рукі... Душэўныя раны загойваюцца марудна, а то і зусім не загойваюцца, баляць усё жыццё. Зразумела, Леанід Акімавіч у мітусні штодзённых спраў даўно мог бы забыць сваё юнацкае каханне, дарогу і лес, але несумненна, што тады ён менш цікавіў бы пісьменніка, таму што ператварыўся б у асобу ардынарную, ці, як сказаў бы А. П. Чэхаў, пошлую і малацікавую.

Не ўсё ў жыцці, нават у звычайным, проста,— даводзіць пісьменнік,— ёсць у ім такія знешне не прыкметныя часам віры, якія тояць у сваіх глыбінях шмат загадак.

Па ўсім адчувалася, што ён не мае намеру коўзацца па паверхні з'яў, хоць апісанні яму і вельмі ўдаваліся, а імкнецца заглянуць у нутро жыцця, высветліць яго глыбока схаваныя канфлікты і супярэчнасці, якія часта бяссільны вырашыць нават сам час — гэты «найбольш магутны лекар».

Апісанні, замалёўкі, кароценькія навелы амаль заўсёды слухаліся яго пяра, а сёння ён асабліва па-майстэрску робіць іх. І ці не самая прывабная іх рыса — унутраная канфліктнасць, драматызм пісьменніцкага бачання. Гэта відаць у такіх вельмі настраёвых рэчах,

як «Прыкрасць», «Голас», «Нарцысы», «Конікі», «Хлеб», «Новая хата», «Цыганчук» і многіх іншых. Нездарма сам аўтар вызначае жанр некаторых падобных сваіх апавяданняў, як «прытчы», дзе вялікую ролю мае маральны вывад з усяго сказанага. Увага да сацыяльнай лініі паводзін чалавека ў яго навелах спалучалася з іх абавязковай маральнай ацэнкай. І найчасцей такую ацэнку сваім учынкам дае сам герой, судзячы сябе ў думках сваіх. Праўда, не ўсе здатныя на такі суд. Скажам, у Банадыся Плахі («Стажок сена») хапіла смеласці адстаяць сваю чалавечую годнасць, а Мірон («Ніхто не ведае...») адчувае толькі страх за свой брудны ўчынак. Таму ён і не можа заснуць, варочаецца з боку на бок, ахкае, уздыхае. Аўтар яшчэ і яшчэ раз з зайздроснай настойлівасцю і маладой бескампраміснасцю ставіць пытанне аб чалавечым сумленні, высакародстве.

Кнігі Сачанкі, як цікавая з'ява літаратурна-грамадскага жыцця, звярнулі на сябе ўвагу адразу ж пасля выхаду ў свет. Яны выклікалі шмат спрэчак (не абышлося, праўда, без крытычнай «мітульгі») і паставілі аўтара ў рад шматабяцаючых беларускіх маладых пісьменнікаў. Творы яго — на гэтым сыходзіліся амаль усе — дыхалі свежасцю жыццёвых першакрыніц, адкуль пісьменнік чэрпаў свой матэрыял і эстэтычныя «барвы». У яго прозе знайшлі адбітак многія сацыяльна-маральныя рысы таго пакалення, да якога належаў ён сам, да якога належалі В. Адамчык, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, У. Дамашэвіч, Ул. Караткевіч, І. Пташнікаў, Я. Сіпакоў, М. Стральцоў, І. Чыгрынаў і іншыя пісьменнікі, што на ўвесь голас, хоць і не з аднолькавым поспехам, заявілі аб сабе прыкладна ў другой палове 50-х гадоў. Прыход у літаратуру такой шматлікай генерацыі вельмі ўзбагаціў яе. Цяпер, здаецца, усе сыходзяцца на тым, што гэтае пакаленне пісьменнікаў унесла значны творчы ўклад у скарбніцу сучаснай беларускай літаратуры. І пытанне пра тое, хто каго «зацямніў» — старэйшыя малодшых ці наадварот,— пытанне, якое ў свой час многіх турбавала не на жарт, вырашылася само сабою. Шырокая літаратурная ніва дала неабмежаваныя магчымасці рэалізаваць свае творчыя патэнцыі. І ўсім хапіла месца. Пісьменнікі маладога пакалення раскрыліся вельмі шырока і цікава, у многім апраўдаўшы надзеі, якія на іх ускладаліся. Моладзь шырока звярнулася да важнейшых традыцый савецкай літаратуры, звязаных з праўдзівым і шматгранным паказам чалавека ў багацці сацыяльна-псіхалагічнага і маральнага зместу яго асобы.

Галоўнае месца ў творчых інтарэсах пісьменнікаў гэтай літаратурнай хвалі заняла сучаснасць, зразуметая, як імкненне адказаць на сацыяльныя і маральна-этычныя запатрабаванні свайго

часу, асэнсаваць мінулае ў святле сучаснага вопыту. Такі погляд на жыццё характэрны для многіх твораў вышэй пералічаных аўтараў, у тым ліку і для Барыса Сачанкі. Яго героі — амаль заўсёды людзі з нялёгкім грузам мінулага. Ён не аднолькавы на цяжкасці, але часам вельмі ўладна цягне назад.

Вяртаецца чалавек да сваёй сям'і, ці, правільней, хоча вярнуцца («Сляды»), кружыць вакол хаты, якую некалькі гадоў назад пакінуў, пакутуе, але не можа ўзысці на парог. Прастата звычайнага «сямейнага» выпадку тоіць у сабе маральную складанасць, ваганні, праблему выбару. Ёсць, мне здаецца, у гэтым падыходзе да жыцця нешта ад школы Кузьмы Чорнага, якому падуладны былі глыбіні чалавечага перажывання.

У невялікіх, звычайна вострасюжэтных апавяданнях Сачанкі заўсёды адчуваўся давер да рэальнага факта, асабісты вопыт, ставілася пэўная, мастацкі акрэсленая маральна-этычная праблема. З зайздросным уменнем і разам з тым вельмі тактоўна пісьменнік мог перадаць напружанасць, канфліктнасць у чалавечых адносінах.

Ноч, у хаце трое і ўсе не спяць («У хаце трое»). Напружана думаюць, што рабіць, як пазбавіцца бяды: сына могуць забраць у Германію... Пісьменнік нярэдка звяртаўся да пытанняў, якія да гэтага мала закраналіся літаратурай, ставіў іх адкрыта і востра.

У звычайным заўважыць патаемнае, у чалавеку — індывідуальнае і своеасаблівае, такі напрамак думкі маладога мастака. У адной з кніг было змешчана апавяданне «Канапляны чад», якое ў свой час выклікала рэзка адмоўную рэакцыю крытыкі галоўным чынам за тое, што аўтар не асудзіў «незаконнага» кахання сваіх герояў. Пытанне, мне здаецца, трэба было ставіць у некалькі іншай плоскасці, патрабуючы ад пісьменніка, каб ён глыбей асэнсаваў і растлумачыў самую з'яву, дакладней паказаў матывы чалавечых паводзін, іх залежнасць ад малых і вялікіх абставін і ўмоў жыцця. Але для гэтага патрэбны быў большы творчы вопыт, які прыйшоў пазней.

Малады пісьменнік разам з чытачом спыняецца перад жыццёвымі загадкамі: маўляў, паглядзі, як здараецца часам у жыцці, прывыкай вучыцца думаць. І пры гэтым шчодра дзеліцца сваімі жыццёвымі назіраннямі, якіх у яго было не мала. Шмат дало яму актыўнае супрацоўніцтва ў часопісе «Вожык», дзе за подпісам Сібарсач часта друкаваліся яго фельетоны, гумарэскі, сатырычныя замалёўкі, заўсёды востра надзённыя, цікавыя. Занятак гэты саслужыў пісьменніку добрую службу, моцна прывязаўшы яго да сучаснасці, выхаваўшы густ да яе пазнання.

Трэба сказаць, што некаторыя з крытыкаў ставілі ў дачыненні да першых кніг Сачанкі празмерна вялікія патрабаванні, нібыта прыспешваючы яго творчы рост. Водгукі крытыкі былі часам дыяметральна супрацьлеглыя: ад суцэльнай пахвалы амаль да абраз (сустракалася і такое). Запомніліся выступленні Т. Хадкевіча, В. Каваленкі, І. Навуменкі, Я. Брыля і многіх іншых, іх грунтоўныя, слушныя заўвагі. Але траляліся, на жаль, і іншыя. І потым, думаючы пра крытыку, Сачанка скажа: «Без узаемаразумення між тымі, хто крытыкуе, і тымі, каго крытыкуюць, не можа быць руху наперад. Літаратура — агульная кроўная справа» (з «Аўтабіяграфіі»).

Крытыка, аднак, мела рацыю, калі стымулявала даследчыцкі, аналітычны пачатак у рабоце пісьменніка, накіроўвала яго ў той ці іншай ступені на пошукі і адлюстраванне сацыяльна значнага, тыповага, што мае першачарговую важнасць.

Часам сапраўды, ідучы ад жыццёвага выпадку, ён занадта захапляўся драбнаватай фактаграфіяй, якая, як вядома, не заўсёды садзейнічае значным мастацкім адкрыццям і абагульненням. Не так даўно мне давялося прысутнічаць на выступленні аднаго даволі папулярнага маладога яшчэ паэта, які чытаў свае вершы. Кожны раз ён падрабязна спыняўся на той акалічнасці, факце, якія сталі матэрыялам ці паслужылі повадам для напісання верша. Потым чытаў верш, які, на жаль, быў не столькі мастацкім абагульненнем гэтага факта, колькі простым здымкам з натуры, вершаваным пераказам факта. Адчувалася, што паэту бракуе жывога вопыту, што ён дарэмна спяшаецца «заганяць» факты ў верш, не асэнсаваўшы іх як след. Самі па сабе яны гучалі часам нават лепш, чым верш.

Сучасны ўзровень развіцця літаратуры ва ўсіх яе жанрах патрабуе ад пісьменніка значных даследчыцка-аналітычных намаганняў і філасофскіх абагульненняў. Трэба сказаць, што спроба менавіта такога стаўлення да рэчаіснасці добра адчувалася ўжо ў першых творах Сачанкі. Можа, у гэтым якраз і заключалася тое новае, што нёс ён у літаратуру і што адразу прынесла вядомасць яго творчасці.

Першыя апавяданні Сачанкі, як ужо гаварылася, па асацыяцыі нагадвалі першыя апавяданні Кузьмы Чорнага. Малюючы чалавека і рэчаіснасць першых паслякастрычніцкіх гадоў, К. Чорны толькі распачынаў адну з галоўных традыцый савецкай літаратуры, намацваў шляхі стварэння вобраза новага героя. Таму ён вельмі шмат эксперыментаваў, вялікае месца адводзячы паказу псіхалогіі падсвядомага. Унутраны свет яго героя эмацыянальна быў вельмі рухомы, зменлівы, падуладны мноству настрояў, але ўсё гэта было мала падобна на мэтанакіраваную душэўную актыўнасць, Сачанка ж,

грунтуючыся на добра распрацаваных традыцыях, не адчуваў такой вострай патрэбы ў эксперыментаванні, але шукаў, па-свойму прагна захапляючыся прыгажосцю і складанасцю жыцця, яго свежасцю і навізною, радасны ад умення перадаць на паперы яго вобразы і формы...

Па меры таго як накапляўся літаратурны і жыццёвы вопыт, пісьменнік адчуў патрэбу звярнуцца да больш буйных рэчаў — у першую чаргу да апавяданняў з разгорнутым сюжэтам і ўскладненай кампазіцыяй і аповесцей, дзе шмат увагі аддаецца сацыяльна-псіхалагічнаму аналізу. Праўда, ад замалёвак, імпрэсій, прытчаў ён не адмовіўся і цяпер, але яго прываблівалі творы буйных жанраў. Пастулова знікала і барвістая стракатасць мастакоўскага бачання, выпадковае саступала месца галоўнаму, на першы план выступала патрэба глыбокіх абагульненняў.

Першыя дзве буйныя аповесці — «Мальвіна» і «Палон» — былі змешчаны ў кнізе «Барвы ранняй восені» (потым яны, здаецца, не перавыдаваліся). Гэтым творам уласціва вельмі характэрная для Сачанкі непаспешлівасць аўтарскай інтанацыі, імкненне да глыбіні, рэалістычнай дакладнасці ў паказе чалавека, увага да дэталей. Маладыя героі ў «Мальвіне» засяроджаны найбольш на сваіх асабістых перажываннях, звязаных, аднак, не толькі з каханнем, але і з іх грамадскімі паводзінамі. У поле іхняга зроку трапляюць многія тыповыя акалічнасці пасляваеннага жыцця, якія прымушаюць даваць ім ацэнку, выяўляць свае адносіны. Аповесць «Мальвіна» названа па імю гераіні, але лінія Мальвіны не атрымала дамінуючага значэння, як гэта, відаць, было на мэце ў аўтара. Галоўнае месца занялі іншыя вобразы і сітуацыі, у тым ліку вобраз Косці, закаханага ў Мальвіну. Пісьменнік імкнецца як мага паўней раскрыць свет чалавека, паказаць яго маральныя вартасці і хібы і іх сацыяльныя, псіхалагічныя вытокі. У «Мальвіне» аўтар зарэкамендаваў сябе і як неблагі бытапісальнік, побыт для якога, аднак, цікавы ў першую чаргу таксама сваім сацыяльным і маральным зместам, тым, як выяўляюцца ў ім чалавечыя калізіі свайго часу.

Адна з галоўных задач, якую ставіць перад сабой Сачанка, заключаецца ў тым, каб дабіцца ў творы вялікага маральна-псіхалагічнага напружання. Дзеля гэтага ў другой аповесці — «Палон» — ён ставіць свайго героя ў вельмі цяжкія абставіны. Чым такія калізіі вабяць пісьменніка ў мастацкім плане? Мне здаецца, магчымасцю да канца раскрыць меру чалавечага ў чалавеку. Узнікае нібыта эфект дадатковага «свячэння»: чалавек бачны наскрозь.

Першыя аповесці пацвердзілі таксама, што галоўная цікавасць для пісьменніка — чалавек з яго духоўным светам, яго ладам жыцця. Зрэшты, нешта падобнае можна сказаць пра кожнага сапраўднага мастака і пра ўсю літаратуру наогул, прадметам разгляду якой з'яўляецца ў першую чаргу чалавечая асоба і ўсё, што з ёю звязана. Сачанку перш за ўсё цікавілі людзі рэдкія, самавітыя, можна сказаць, загадкавыя, якіх трэба зразумець, разгадаць. У яго выразная схільнасць да філасофскай разважлівасці, роздуму. Якраз у гэты час — пачатак і сярэдзіна 60-х гадоў — ідзе асабліва інтэнсіўнае асэнсаванне жыцця, звязанае з пашырэннем грамадскіх даляглядаў пісьменніка, умацаваннем пачуццяў грамадзяніна сваёй краіны праз шматлікія далёкія і блізкія паездкі, знаёмствы з людзьмі і г. д. Вынікам адной з такіх паездак з'явіліся дарожныя дзённікі «Зямля маіх продкаў», якія пісьменнік вёў у час падарожжа на цеплаходзе па Сажы, Дняпры і Прыляці. Паводле сваіх жанравых адзнак, гэта і дарожныя нататкі, экскурсы ў гісторыю, успаміны, расказ пра пачутае і г. д. Ёсць тут і зерні будучых задум... Дзённікі — сведчанне павагі і ўдзячнасці пісьменніка землякам, роднаму Палессю.

«Даўняя гэта мара — паглядзець на ўсё Палессе адразу... І не толькі паглядзець, але і пахадзіць па плыткіх, тарфяністых берагах Прыляці, паблукаць па ціхіх вуліцах шматлікіх палескіх гарадоў і вёсак, пагаварыць з людзьмі, якіх нехта назваў некалі палешукамі,— цікава было і параўнаць тое, што ўбачу я, паляшук, цяпер, у другой палове XX стагоддзя, з тым, што бачылі некалі ў гэтым краі другія...

Было і яшчэ адно жаданне, таемнае, вельмі асабістае : мне чамусьці здавалася, што ўсё тое, што я ўбачу, пачую, паможа мне глыбей зразумець самога сябе, зразумець тыя змены, што за апошнія гады адбыліся ў жыцці маёй вёскі Вялікі Бор, у жыцці кожнага калгаса, горада, чалавека і ўсёй краіны наогул». Так, аўтара цікавяць не толькі гістарычныя мясціны, ён вельмі пільна ўзіраецца ў сённяшні твар роднай зямлі.

«Новае, савецкае трывала ўвайшло ў быт жыхароў майго краю, і іншы раз здаецца, што тут і не было іначай, заўсёды было так, пасавецку...» Позірк пісьменніка не мінае «слабых месц» у развіцці тагачаснай нашай сельскай гаспадаркі, складаных праблем меліярацыі Палесся, будаўніцтва канала. І людзі, людзі, людзі... Яны цікавяць у першую чаргу.

Барыс Сачанка родам з Палесся, яго радзіма — вёска Вялікі Бор Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці.

«На Палессі, на самым поўдні Беларусі, ёсць куточак зямлі, асабліва мілы, дарагі майму сэрцу. Дзе б ні быў я, куды б ні закінула

мяне доля, не-не дый згадаю яго. У радасці і ў журбе, з блізкіх і далёкіх дарог я вяртаюся зноў і зноў туды, дзе сярод старых пракаветных лясоў і вялізных, неабсяжных балот на пясчанай выспе раскінулася вёска, у якой я нарадзіўся, у якой жыве і сёння мая маці, жывуць браты»,— так расказвае сам пісьменнік...

Дзяцінства Б. Сачанкі прыпала на гады вайны. У чэрвені 1943 года яго родная вёска Вялікі Бор была спалена фашыстамі, і Барыс разам з бацькамі быў выгнаны ў Нямеччыну. Дадому, на радзіму, вярнуўся пасля вызвалення — летам 1945 года. Такім чынам, можна сказаць, што ў яго ёсць асабістыя разлікі з вайной. І зводзіць ён іх у многіх творах, пачынаючы з самых першых замалёвак і да такіх яго рэчаў, як аповесць «Апошнія і першыя» і іншых, над якімі пісьменнік працуе па сённяшні дзень.

Цікава, што перажытае ў дзяцінстве не пасеяла ў ім зерні расчаравання ў людзях, не замгліла яго зрок. Глыбокая любоў да чалавека бачна ў яго творах.

Вынікам умацавання сувязей з жыццём з'явілася далейшае фарміраванне асобы пісьменніка. Усё вастрэй ставіцца ён да жыццёвых праблем, выразней іх бачыць, спрабуе даследаваць. Яго творчая пазіцыя дастаткова смелая і рашучая, яна прасякнута камуністычнай ідэйнасцю, пачуццём грамадзянскай адказнасці. Вось, напрыклад, урывак з невялічкай замалёўкі пад назвай «Фашыст»: «Ён вельмі любіў сваю маці. І з нямецкай акуратнасцю раз на тыдзень, у суботу, заўсёды пісаў ёй доўгія-доўгія лісты, у якіх не забываўся паведаміць розныя дробязі. У канцы кожнага ліста ён напамінаў сваёй «лібэ муці», як ён яе любіць і што, як толькі скончыцца вайна, ён абавязкова вернецца зноў дадому, да яе...

Расстрэльваючы кожны дзень жанчын у партызанскім краі, куды ён быў камандзіраваны сваім вышэйшым начальствам, ён ні разу нават не падумаў, што гэтыя жанчыны — таксама маці...».

Потым, з цягам часу, літаратура, у тым ліку і Барыс Сачанка, усё глыбей і паўней будзе аналізаваць гэтую «хатынскую сітуацыю», але пастаноўка праблемы ёсць ужо ў гэтай замалёўцы...

Сярэдзіна 60-х гадоў для Б. Сачанкі — вельмі плённы час. Кнігі «Зямля маіх продкаў» (1964) і «Пакуль не развіднела» (1966) паказалі сталасць яго таленту і зайздросную працавітасць. У іх змешчаны такія цудоўныя рэчы, як «Дзік-бадзяга», «Не, не ўсё роўна», «Пакуль не развіднела», напоўненыя сталым роздумам аб сэнсе чалавечага жыцця. Як і ў ранейшых творах, мы сустракаем тут характары самабытныя, неардынарныя, нярэдка супярэчлівыя. Разам з тым пісьменніка ўсё больш цікавіла сацыяльная абумоўленасць жыцця чалавека, яго

грамадскі змест. Ён смела ставіць многія пытанні сацыяльнага, маральнага, бытавога плана. Чалавек, хто ты і для чаго ты? У чым сэнс і каштоўнасць твайго жыцця? Хто тыя, што вакол цябе? — вось грані пісьменніцкага роздуму. Роздуму грунтоўнага і непаспешлівага.

У цэнтры аповесці «Дзік-бадзяга» — вобраз маладога лесніка Анісіма, чалавека складанага, недаверлівага, нейкага «суглея». Анісім адзін, і ў адзіноце яму цяжка. Жонка Вера пакінула яго, з'ехала ў горад са студэнтам-практыкантам. І яе можна зразумець: з Анісімам нялёгка было зжыцца — сухі, чэрствы. Але каханне, дабрата, пяшчота патрэбны і яму, як кожнаму чалавеку. Думаючы над перажытым, Анісім паступова пачынае разумець, што перш чым патрабаваць і чакаць спагады ад іншых, самому трэба падабрэць, душэўна наблізіцца да людзей.

Прасвятленне душы, далучэнне да ісціны прыходзяць да Анісіма не адразу. Яму даводзіцца перажыць драму асабістых жыццёвых уяўленняў. Асабліва шмат і пакутліва думае ён над сваім жыццём, калі ідзе наўздагон за параненым зверам. Аўтар гаворыць аб суб'ектыўных і аб'ектыўных прычынах паводзін Анісіма, якога вайна пакінула сіратою... Паляванне на дзіка ў аповесці можна ўспрымаць і разумець як свайго роду разгорнутую метафару вялікіх фізічных і душэўных намаганняў чалавека з мэтай адстаяць і сцвердзіць сябе ва ўласных вачах перад жыццёвымі выпрабаваннямі.

Жыццё бачыцца мастаку ў багацці і супярэчнасцях псіхалагічных і маральных нюансаў, фарбаў, чалавечых паводзін і ўчынкаў. І такое ўспрыняцце робіцца адзнакай сапраўднай мастацкасці.

Напружаная, драматычная сітуацыя ў апавяданні «Не, не ўсё роўна». У ім зноў ідзе размова пра чалавека на сучасны погляд дык нават дзіўнага — па натуры кулака накшталт Лявона Бушмара. Жыў чалавек на свеце дзеля сябе аднаго, нікога не любіў, не грэў, як кажа пра яго ўнук, і так памёр, не пакінуўшы пасля сябе ні ў кім добрай памяці. Аўтар аналізуе, і даволі паспяхова, карэнні гэтага індывідуалізму, паказвае адносіны свайго героя да прыватнай уласнасці, да калгаснага ладу, да людзей — аднавяскоўцаў і родзічаў. Багатым ён ніколі не быў, але яго ўласніцкая, «зашчыпенная» натура ляжала ў аснове ўсяго яго светаразумення: «сваім ні за што не паступлюся». Вельмі важная прынцыповая ўласцівасць пісьменніцкага мыслення: жыццё, чалавек бачацца яму ў адзінстве сацыяльнага і маральнага. У апавяданні «Не, не ўсё роўна» гэта выразна відаць.

Мастацкая форма твораў Б. Сачанкі звязана ў асноўным з «формамі самога жыцця». Прынамсі, не заўважалася, каб мастак імкнуўся да яго дэфармацыі ў бок выкарыстання ўмоўнасці. Грунтоўная

сацыяльна-псіхалагічная школа дала станоўчы вынік. Развіццё творчай думкі ідзе па лініі паглыблення псіхалагізму. Апавядальная плынь разгортваецца паслядоўна ў часе, кола персанажаў, як правіла, даволі вузкае: пісьменніка больш вабіць паказ іх унутранага свету. Дзеля гэтага ён прымушае сваіх герояў звяртацца да самааналізу, шмат думаць пра сябе, пра абставіны жыцця.

«Чаму я быў такі грубы, чаму ніколі ні пра што не папытаўся ў Веры, не схадзіў, жаніўшыся, ні разу ні на танцы, ні ў кіно? Я ж таксама кахаў яе... Няўжо я помсціў ёй за тую прытворную цяжарнасць, праз якую не я браў замуж Веру, а як бы брала мяне яна... Але ж Вера і сама верыла, што цяжарнасць гэтая сапраўдная. Вінаваты, канечне, і мой характар, мая нялюдскасць...» — так разважае сам з сабою ляснік Анісім.

Пісьменнік прыходзіць да сучаснага ўзроўню культуры псіхалагічнага аналізу. Псіхалогія чалавека раскрываецца не толькі ў дынаміцы ўчынкаў, але і ва ўнутранай жыццядзейнасці яго духу.

Сачанка імкнецца адкрыць у жыцці яго непаўторнасць, самакаштоўнасць. Скажам, лес, паветра, снег, усё, што звязана з побытам, захоўвае ў яго творах усе свае жыццёвыя барвы, жыве сваім натуральным жыццём. І гэта сімпатычная рыса яго таленту. Творы, напісаныя ў сярэдзіне 60-х гадоў, засведчылі сталасць пісьменніцкага майстэрства і з'явіліся, на мой погляд, яго прынцыпова важным мастацкім дасягненнем.

Было б, відаць, памылкай разглядаць творчы шлях пісьменніка — любога пісьменніка! — толькі як рад суцэльных удач, ад перамогі да перамогі і далей да ўсё большых дасягненняў. Такога амаль што не бывае. І Б. Сачанку далёка не кожны раз спадарожнічалі аднолькава значныя мастацкія ўдачы. Але цяпер, калі перагортваеш тыя творы, якія ў свой час на той ці іншай падставе крытыкаваліся, дык бачыш, што іх вопыт быў вельмі павучальны для пісьменніка.

Нярэдка здаралася, што і крытыка не ва ўсім была справядлівая ў дачыненні да пісьменніка, як, скажам, у выпадку з аповесцю «Баравое рэха». Аўтар гэтых радкоў таксама быў сярод тых, хто крытыкаваў «Баравое рэха» за недастатковую глыбіню раскрыцця некаторых жыццёвых праблем, якія закранаюцца ў аповесці, лічачы яе толькі традыцыйнай гісторыяй няўдалага кахання. «Баравое рэха» — сапраўды аповесць пра каханне, але не толькі пра яго. Паміж ёю і «Мальвінай» даволі вялікая розніца. «Баравое рэха» ўяўляецца нам сёння творам больш праблемным, насычаным жыццём, новым для свайго часу.

Галоўны герой аповесці Змітрок — гараджанін, які па сваёй псіхалогіі, адчуваннях і ўяўленнях яшчэ не перастаў быць вяскоўцам. Такая дваістасць — прыкметная і вельмі тонка заўважаная асаблівасць яго характару, у якой заключалася пэўная рыса часу.

Будучы студэнтам Змітрок вяртаецца на канікулы ў родную вёску і выпадкова сустракае сваё юнацкае каханне — дачку лесніка Марту, якая паспела да таго часу (тут была і яго віна) выйсці замуж і застацца адной — муле паехаў некуды ў Сібір, пакваліўся на доўгі рубель. У Змітрака ў горадзе таксама засталася дзяўчына, але сустрэча з прыгажуняй Мартай зноў усхвалявала яго. Праходзіць некаторы час, і Змітрок пераконваецца, што па-ранейшаму кахае Марту, але паводзіць сябе неяк двухсэнсоўна, вагаецца, каго выбраць: Марту ці Валю. Маральная раздвоенасць — характэрная ўласцівасць яго характару. Тып, трэба сказаць, вельмі цікавы, жыццёвы. Змітрок гаворыць пра сябе так: «...дзіўна неяк у мяне бывае: у горадзе я нуджуся па дамоўцы, па вёсцы; варта ж толькі пажыць тыдзень дома, у вёсцы, ірвуся назад у горад... Цела тут — душа там, цела там — душа тут...». Можа, таму і яго каханню не хапае цэласнасці, натуральнасці і смеласці. Жывое пачуццё часам саступае месца рэфлектыўнаму роздуму, сухому рацыяналізму.

Не думаю, аднак, каб Сачанка, працуючы над аповесцю, меў на ўвазе менавіта такую задачу — прасачыць рух і дзеянне сіл адчужэння ў свядомасці, адчуваннях і самім ладзе жыцця яго героя. Жыццёвая праблема ўсплыла на паверхню, бо аўтар праўдзіва ўзнаўляе праўду жыцця. Пагэтаму тэма «дваістасці» не атрымала поўнага аўтарскага асэнсавання і не спалучылася з унутранай, маральнай ацэнкай паводзін героя... І ўсё ж такі паралельна з любоўнай лініяй Сачанка спрабуе зачапіць і некаторыя праблемы з жыцця калгаснай вёскі, але спыняецца на іх менш, чым яны гэтага заслугоўваюць.

Відавочнага поспеху дасягнуў пісьменнік у аповесці «Пакуль не развіднела», з якой мы пачалі гаворку пра яго творчасць. Сваю гераіню, партызанскую сувязную Юлю, аўтар ставіць у выключна цяжкія абставіны: падполле даручае ёй, пятнаццацігадовай дзяўчыны, адказнае заданне — пранесці партызанам праз узмоцнены паліцэйскі кардон важныя весткі. Партызанскі атрад акружаны, на світанні фашысты пачынаюць карную экспедыцыю... Такая сітуацыя часта ставіць аўтара перад спакусай захапіцца чыста сюжэтнай вастрынёй апавядання, аднак Сачанка ідзе па іншаму, больш складанаму і разам з тым больш плённаму шляху. Галоўны канфлікт аповесці — паміж чалавечнасцю і фашызмам — раскрываецца ў

псіхалагічным плане. Аўтар уважліва ўглядаецца ва ўнутраны свет сваёй гераіні, перад намі праходзяць яе ўспаміны пра даваенныя гады, пра лёс яе родных і блізкіх.

Паралельна з перажываннямі Юлі ў аповесці раскрываецца іншы свет — змрочны свет адшчапенцаў, чые блытаныя сцежкі прыводзяць да здрады. Прасочана гісторыя аднаго з іх, даносчыка і паклёпніка, які ў час суровай ідэйнай і маральнай праверкі становіцца на шлях здрады. Аповесць «Пакуль не развіднела» ўспрымаецца як унутраны маналог гераіні, як плынь яе думак, ручай самых разнастайных пачуццяў, абуджаных успамінамі. Аднак аўтар не ўсё перадаверае гераіні, яе маналог суправаджаецца каментарыямі; пісьменнік не толькі хоча як мага паўней і глыбей зразумець маральныя і ідэйныя ўстоі, выхаваныя ў чалавеку савецкім ладам, але і робіць спробу па-мастацку даследаваць меру яго псіхалагічных магчымасцей у неймаверна цяжкіх абставінах. Пачуццё адказнасці, ідэйная перакананасць, імкненне ў што б то ні стала дапамагчы таварышам па барацьбе — гэта такая сіла, якая дзяўчынку, амаль дзіця, робіць мацней за карнікаў, захопнікаў, мацней за фашызм. Гэтая думка паслядоўна і пераканаўча даводзіцца ўсёй вобразнай сістэмай твора. Яна падкрэслена і ў канцоўцы. На першы погляд здаецца, быццам намаганні Юлі былі дарэмныя. Здарылася так, што яе апярэдзіла другая такая ж непрыкметная з выгляду дзяўчынка і перадала партызанам звесткі, з якімі ішла да іх Юля. Але гэта толькі на першы погляд, таму што на самай справе тут падкрэсліваецца заканамернасць перамогі гуманістычнага пачатку, яго непазбежнасць.

Тэме барацьба партызан і падпольшчыкаў Палесся з акупантамі прысвечана і аповесць «Гісторыя аднаго падполля». Гэта аповесць-даследаванне, у цэнтры яе вобраз чалавека-аналітыка, які ў імя загінуўшых, дзеля праўды і справядлівасці гатовы ахвяраваць многім асабістым, што гарантавала яму спакой, душэўную раўнавагу, выгаду. Ён пераадольвае перашкоды, якія ставіць на яго шляху рэдактар газеты Іван Пракопавіч, чалавек старога кансерватыўнага ладу мыслення, і дамагаецца свайго — разгадвае тайну Вепраўскага падполля.

Кола творчых пошукаў Б. Сачанкі робіцца ўсё болей шырокім. У аповесці «Агліцкая сталь» ён уваскрашае забытую гістарычную старонку з жыцця беларускага Палесся, малюе вольналюбівыя характары палешукоў, якія дружна ўздымаюцца супраць паноў, калі тыя захацелі прадаць англічанам палескі лес.

Як ужо гаварылася, у творах Барыса Сачанкі шмат перажытага. Дадуманага мала. Ёсць матывы, якія даволі часта, з твора ў твор, паўтараюцца. Скажам, тое, як іх, велікаборцаў, фашысты ўлетку 1943

года пагналі ў Германію, як спалілі роднае гняздо — вёску. Жорсткая памяць вайны чакала свайго часу, падзеі адстойваліся ў свядомасці, шукалі сваёй мастацкай формы. Пісьменнік не надта спяшаўся. «Апошнія і першыя» ўпершыню былі надрукаваны ў 1967 годзе, «Аксана» — у 1970-м.

Аповесць «Апошнія і першыя» крытыка прызнала адным з самых значных дасягненняў празаіка. Жудасна чытаць гэтую рэч, у якой узноўлена трагедыя адной са шматлікіх беларускіх Хатыняў, спаленых фашыстамі ў вайну. Пісьменнік задумаў своеасаблівы рэквіем у прозе. «Апошнія і першыя» — гэта і памяць пра загінуўшых, і праклён фашызму і вайне, і папярэджанне жывым, каб трагедыя не паўтарылася. Твор прысвечаны роднай вёсцы Вялікі Бор, жыхары якой былі вывезены ў Германію.

Напісаць усё, як было, расказаць пра ўсю трагедыю — значыць, яшчэ раз яе ўнутрана перажыць. І пісьменнік пайшоў на гэта, расказаўшы з непаспешлівасцю летапісца пра падрабязнасці перажытага, перапакутаванага.

Героі Б. Сачанкі, землякі, пра якіх ён з такой любасцю піша,— мірныя людзі, працаўнікі, вялікія добразычліўцы. «Думалася — вось мінецца гэтая повалач, дадому прыеду і сякеру ў рукі... Адраблю, думаў, за ўсе тыя гады, што сякеры ў рукі не браў... Уяўляю, бывала, як смольны сучок пахне, калі па ім рубанкам правядзеш, ці як гліна, густа замешаная, бы ўсё адно рошчына, між пальцаў плыве, калі яе на цагліну кладзеш, печ лепіш... І за адно тое, што немец адарваў мяне ад работы, гатоў быў горла яму перагрызці». Псіхалагічная бездакорнасць гэтага і іншых падобных унутраных маналогаў, відаць, якраз тым і абумоўлена, што пісьменніку давялося ўсё перажыць самому.

Мяркуючы па апошніх творах, тэма памяці, перажытага робіцца адной з вядучых у творчасці Сачанкі. Час ад часу, праўда, з'яўляюцца асобныя апавяданні, не звязаныя з ёю. І сярод іх трапляюцца такія, якія смела можна залічыць да творчых дасягненняў Сачанкі. Скажам, апавяданне «Соль», у якім пісьменнік адкрывае новыя грані геразму чалавечага характару.

Не заўважаецца, каб Сачанка імкнуўся ўскладняць мастацкае бачанне жыцця. Але што, аднак, відаць, і даволі выразна,— дык гэта стылёвыя эксперыменты. Яны адчуваюцца і ў аповесці «Апошнія і першыя», дзе выкарыстоўваюцца розныя моўныя пласты і адценні, зварот да біблейскіх інтанацый, да пэўных фальклорна-рытарычных фігур: «І прасіў я Ветра», «І прасіў я Сонца» і г. д., а таксама зварот да лірызаванай прозы, у прыватнасці да маналагічных форм, споведзі... А часам прaглядваюцца інтанацыі эпічныя: «Свая родная вёска стала

мне няміла. Я не мог быць у ёй болей ні дня... Успаміны маленства гналі мяне далей ад дзедаўскіх магіл...». Праўда, не ўсюды пісьменнік дабіваецца значнага стылёвага адзінства. Часам адчуваецца пэўная эклектычнасць.

Сёння за плячамі ў Сачанкі больш за дзесятак кніг, яго творы перакладаюцца на мовы народаў СССР і зарубежных краін. Барыс Сачанка добра памятае пра сваю пісьменніцкую адказнасць. «Адчуваю,— прызнаваўся ён у аўтабіяграфіі,— каб пісаць сапраўдную прозу, трэба яшчэ шмат вучыцца, калі толькі можна навучыцца таму, што даецца прыродай... Тыя словы, здаецца, Тургенева, што да трыццаці гадоў мала каму ў прозе ўдавалася напісаць што-небудзь значнае,— слабое суцяшэнне: Лермантаў у 27 гадоў стаў класікам рускай літаратуры, а Максім Багдановіч у 26 — беларускай... Міхаіл Шолахаў у 23 гады напісаў першую кнігу «Ціхага Дона», а Кузьма Чорны ў 28 гадоў — раман «Зямля» і лепшыя свае апавяданні «Сосны гавораць», «Вераснёвыя ночы» і інш. Прыклады можна было б прыводзіць бясконца...»

Творчасць Барыса Сачанкі, зазначым яшчэ раз, шчыльна звязана з Палессем. Гісторыя літаратуры ведае выпадкі, калі пісьменнік у пошуках матэрыялу для сваіх кніг не выходзіць за межы роднай вёскі, мясцовасці, акругі. Гэта не замінае яму выходзіць на вялікія агульначалавечыя абагульненні. У беларускай літаратуры з Палессем звязана творчасць Івана Мележа, Івана Навуменкі, некаторых іншых. І ў кожнага з іх, у тым ліку і ў Сачанкі,— свая песня...

© OCR: Камунікат.org, 2013
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2013
© PDF: Камунікат.org, 2013

## ЗМЕСТ

*І АРТЫКУЛЫ, ЭСЭ*
З Леніным у сэрцы (Беларуская паэтычная Лeнініяна)
Людзі рэвалюцыйнага гарэння (Вобраз камуніста ў беларускай літаратуры)
Паэзія высокага абавязку (Пра публіцыстычную лірыку)
Каб перамагла гармонія (Паэзія і некаторыя аспекты НТР)
«Яны прыходзяць самі...» (Нататкі аб маладой паэзіі
Будні і святы паэзіі для дзяцей

*ІІ ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТАЎ*
Праз усё жыццё (Пятрусь Броўка)
Дзень сённяшні (Максім Танк)
«Што я люблю...» (Кастусь Кірэенка)
Сучаснае і вечнае (Аляксей Пысін)
Споведзь пакалення (Генадзь Бураўкін)
Чалавек — гэта заўсёды цікава (Барыс Сачанка)

**Гніламёдаў Ул.**

Упоравень з векам. Мн., «Маст. літ.», 1976 г. 272 с.

У новай кнізе беларускага крытыка і літаратуразнаўцы разглядаюцца многія пытанні: які адбітак у літаратуры знаходзяць праблемы навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, як фарміруецца духоўнае і маральнае аблічча героя сучаснай беларускай паэзіі, што вызначае ягоную ідэйную пераконанасць, грамадзянскую годнасць і патрыятызм, шляхі творчых пошукаў мастакоў слова.